
АН-1926
Арх 13

В Словарную Комис

Академии Наук

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ІНСТЫТУТ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ
INSTITUT DE LA CULTURE BLANCHE-RUTHÉNIENNE
АДДЗЕЛ БЕЛАРУСКАЕ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ
SECTION DE LA LANGUE ET LITTÉRATURE BLANCHES-RUTHENIENNES

Аддзел першы. Сэрыя IV. Кніга I

МАТАР'ЯЛЫ ДА ВЫВУЧЭНЬНЯ БЕЛАРУСКАЕ МОВЫ, ЭТНОГРАФІІ І ЛІТАРАТУРЫ

Аляксандар Сержпутоўскі

КАЗКІ І АПАВЯДАНЬНІ БЕЛАРУСАЎ

З СЛУЦКАГА ПАВЕТУ

MATÉRIAUX POUR L'ÉTUDE DE LA LANGUE, ETHNOGRAPHIE ET LITTÉRATURE BLANCHES-RUTHÉNIENNES

Alexandre Seržputowski

CONTES ET RÉCITS DES BLANCS-RUTHÉNIENS

DISTRICT DE SLOUTSK

КОШТАМ ІНСТЫТУТУ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ

1926

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Ленинградский Гублит № 12836 — 16½ печ. л. — Тираж 500
Государственная Академическая Типография В. О., 9 лин. 12.

БИБЛИОТЕКА
Академии Наук БССР

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ІНСТЫТУТ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ
АДДЗЕЛ БЕЛАРУСКАЕ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

Аддзел І. Сэрыя IV. Кніга І.

МАТАР'ЯЛЫ ДА ВЫВУЧЭНЬНЯ БЕЛАРУСКАЕ МОВЫ, ЭТНОГРАФІІ І ЛІТАРАТУРЫ

Кніга І

1926

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ІНСТЫТУТ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ
АДДЗЕЛ БЕЛАРУСКАЕ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

Аляксандар Сержпутоўскі
Правадзейны Член Інстытуту
Беларускае Культуры

КАЗКІ І АПАВЯДАНЬНІ БЕЛАРУСАЎ

З СЛУЦКАГА ПАВЕТУ

НАДРУКАВАНА КОШТАМ ІНСТЫТУТУ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ
Ў ДЗЯРЖАЎНАЙ АКАДЭМІЧНАЙ ДРУКАРНІ Ў ЛЕНІНГРАДЗЕ
1926

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Надрукавана ў ліку 500 паасобнікаў паводле ухваленага Навуковай Радай Інстытуту выдавецкага пляну на 1925—26 год.

Адказны Рэдактар,
Правадзейны Член Інстытуту *А. Смоліч.*

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Прадмова.

Сабраныя тут галоўным чынам жыцьцёвыя апавяданьні, кароткія байкі ды зрэшта даўнейшыя казкі запісаў я па працягу 1890—1923 гадоў у Слуцкім Палесьсі, амаль што толькі ня ў дзьвюх суседніх вёсках — Чудзіне ды ў Вялікім Рожане.

З таго матар'ялу, які мне тут ўдалося сабраць, частка ўжо надрукавана ў маім першым зборніку казак і апавяданьняў,[1] а затым гэты сшытак трэба лічыць працягам першага, бо ў ім ёсьць казкі і апавяданьні тых самых баечнікаў, творы якіх ужо ўбачылі сьвет, напрыклад: Рэдкага, Савіцкага, Болбата ды Кулеша.

Запісаўшы так шмат казак ды апавяданьняў амаль што толькі ў дзьвюх вёсках, я думаў, што сабраў тут ужо ўсё, але пабываўшы ў гэтых самых вёсках у вясну 1915 году, калі грымела вялікая вайна, — пачуў новыя і новыя казкі ды апавяданьні. Тыя самыя баечнікі, ад якіх я 20 год таму назад запісваў казкі, цяпер казалі мне то адменьнікі даўнейшых казак, то ўсё новыя ды новыя. Вельмі шкада, што тады час быў неспакойны, і мне нельга было запісаць больш адменьнікаў і новых твораў, а то лёгка можна было-б пазнаць, як складаюцца народныя творы, як яны множацца і як родзяцца іх адменьнікі. З гэтага мы бачым, які багаты скарб захованы ў думках і ў сэрцы нашых вясковых людзей, бачым, што крыніцы народных твораў ніколі нельга вы-

[1] Сержпутовскій, А. К. Сказки и разсказы Бѣлоруссовъ-Полѣшуковъ. СПб. 1911.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

чарпаць і што гэтыя творы растуць і шырацца. Ды яно так і мае быць, бо людзі, як і ўсё жывое, растуць і целам, і духам, ідуць наперад, шырацъ сваю здольнасьць і твораць усё новае і новае. Праўда, кожны народ жыве сваім асобным жыцьцём; адзін творыць больш, другі — менш, але кожны мае сваіх мастакоў, якія твораць тое, што само цячэ з думкі, што родзіцца на сьвет разам з пачуцьцём сэрца і потым доўга жыве ў памяці людзей. Тыя творы хутка разыходзяцца па сьвеце, растуць, прыгажэюць і так зьліваюцца з думкамі людзей, і так напаўняюць іх сэрца, што, здаецца, быццам яны там век былі, ці аж там і радзіліся. Тых мастакоў, якія тварылі казкі, прыказкі, ці што іншае, мы ня ведаем, бо такіх, мабыць, і ня было; мабыць народныя творы, якія мы чуем ад баечнікаў, складаліся супольна: мастакі тварылі толькі нарыс, а потым баечнікі дапаўнялі, апрацоўвалі, каб было хораша ды складна, ды падганялі да думак грамадзянства. Мабыць мастакі былі разам і баечнікамі, або наадварот, баечнікі больш усяго і тварылі казкі, апавяданьні, ці што іншае. Як-бы яно там ні было, а баечнікі на вёсцы — самыя разьбітныя людзі. Яны ўмеюць хораша ды складна гаварыць і маюць добрую памяць. Добры баечнік, кажуць, «як пачне выдумляць, плесьці ды хлусіць, дык толькі слухаў-бы яго». Лічу ня лішнім памянуць добрым словам тых удалых мастакоў-баечнікаў, ад якіх і запісаны сабраныя тут творы.

Самым лепшым баечнікам, якога я толькі сустракаў на сваім вяку, — быў стары дзед Рэдкі. Але аб ім я ўжо шмат гаварыў у сваім першым спытку казак, а тут скажу аб іншых.

Сасноўскі таксама быў ужо стары чалавек. У яго, кажуць, яшчэ ззамаладу памерла жонка, якую ён так любіў, што трэйчы парываўся накласьці на сябе рукі, але ўсё неяк людзі ратавалі. Да сьмерці жонкі ён быў вясёлы ды гаваркі, якіх мала трапляецца сярод гарапашнікаў, а пасьля свайго няшчасьця — спрэсу зьмяніўся: стаў якісь папуры ды маўклівы, так, што часамі ад яго нельга было дабіцца слова. Але затое, як ужо пачне штонебудзь расказваць, дык ужо будзе гаварыць доўга, доўга, ды

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

так гожа, што, здаецца, слухаў-бы ўсю ноч і не захацеў-бы спаць. Праўда, ад яго вельмі цяжка было запісваць казкі, бо невядома, калі ён будзе ў гумары, каб баяць. Заўсёды трэба было лавіць такую часіну, калі ён ужо разгаворыцца і забудзе і сам сябе, і што кругом яго.

Старэнькі дзед Болбат быў бортнік, ён амаль заўсёды сядзеў ля сваіх пчол, ці каля перавозу. Бывала, пляце сабе лапці, ці які-небудзь кашэль і ціханька ды памаленьку кажа казку. Пазьбіраюцца людзі, пасядуць кругом, ці палягуць на траве, слухаюць казку, маўчаць, а пра дзела і забудуцца, пакуль іх хто-небудзь не пагоніць. Гожа гаварыў Болбат.

Стары дзед Савіцкі жыў у Бохаве недалечка ад в. Чудзіна. Свае гаспадаркі ён ня меў, а жыў так-сяк у свайго зяця на ласкавым хлебе. Вядома, што ласкавы хлеб горкі, але старэнькі дзядок Савіцкі ня тужыў: зімою сядзеў сабе ў запечку, рабіў з лучыны забаўкі дзецям, ды баяў ім казкі, а ўлетку пасьвіў перш гаўяда, а потым авечкі або коні. Ён быў дзед капрысны, яго цяжка было ўламаць, каб ён пачаў баяць казкі, але затое, калі, бывала, пачне ён баяць, дык ужо гатоў на цэлую ноч. Гаварыў ён ціха, роўна і памаленьку. Бывала, супыніцца на часінку, пакурыць люльку, або адкашляеца ды зноў пачне: ду-ду-ду, бы вада пад колам у млыне. За сваё доўгае жыцьцё ён шмат павалачыўся па сьвеце і трохі паслужыў па дварох. Мабыць затым і яго гаворка трохі была якаясь інакшая, а ня гэткая, як у чудзінцаў.

Даніла Кулеш жыў у Чудзіне. Ён быў добры, старанны гаспадар; збудаваў новыя сьветлыя дзьве хаты, разьвёў шмат гаўяда, выгадаваў і ажаніў сына,— адным словам, быў харошы чалавек, якіх мала ва ўсёй акрузе. Ужо яго сын быў старастаю, як вось наш Даніла задурыў, пачаў учашчаць у карчму, а нарэшце так запіў, што рэдка бываў цьвярозым. Але затое ўпіўшыся, Даніла Кулеш вельмі хараша баяў казкі, а цьвярозы, бывала, сядзіць ды толькі паплёўвае,— з яго нельга выцягнуць ні воднага слова.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Самы цікавы з усіх баечнікаў — гэта Лявон Лебедзік. Ён жыў у Чудзіне і празываўся неяк інакш, але як — я не памятаю, а прадражнілі яго Лебедзікам затым, што пры гутарцы ён усім гаварыў «мой лебедзіку». Лявон Лебедзік быў добры гаспадар і вельмі харошы чалавек. За ўсё сваё жыцьцё ён, як кажуць, ня скрыўдзіў і малога дзіцяці. Ён, мабыць, толькі адзін быў з усяго сяла, што ніколі ня піў гарэлкі, ні з кім не сварыўся і нікога ня кляў і ня лаяў. Часта ён гаварыў: «Калі садзішся за стол, дык зірні перш, ці няма тут каго галоднага, каб уперад яго накарміць, а калі няма, дык першы кавалак кінь сабаку, бо ня ведаем, праз чыю ласку жывом, дык трэ і сабацы дагадзіць». Лебедзік сам любіў слухаць казкі і верыў, што яму кажуць праўду. «Багі яго сьвятыя ведаюць, — казаў ён, — мо гэта калі была і праўда». Ён сам рэдка баяў казкі, бо ня любіў, што маладзічкі ня шчыра слухалі, ці слухаючы пасьмейваліся. — «Няма чаго дарма гаварыць, — у такім разе казаў ён, — бо толькі сабака брэша на зьві-вецер». Другія баечнікі як убачаць, што я запісваю казку, дык саромяюцца, пачынаюць мыляцца, а то і зусім змаўкаюць. А Лебедзік ня то, што не сароміўся майго запісваньня, але яшчэ больш рупіўся, каб лепш расказаць. Сваю гаворку Лебедзік заўсёды перасыпаў усялякімі прыказкамі, якіх ён ведаў больш ад усіх.

Больш усяго казкі ды апавяданьні я запісваў ад мужчын, бо яны менш саромяюцца, як жанкі, якія доўга штурхаюць адна другую, ды ўсё кажуць, што нічога ня ведаюць. Толькі некалькі малых апавяданьняў мне ўдалося запісаць ад старое Бохмачыхи ды ад Умінскае. Бохмачыха ўсё адпіралася, кажучы, што ў яе шмат клопату ды працы, дык затым яна ўсё перазабыла, што ведала змоладу. Затое-ж Умінская, якая лічыда сябе шляхцянкаю, перш вельмі шмат расказвала пра сваё жыцьцё, пра тое, як яна лечыць людзей зельлямі і замовамі і як тое вельмі добра памагае. Урэшце расказала мне дзьве-тры казкі, дый стала гаварыць замовы. Пакуль я толькі слухаў, а ня пісаў замовы — яна гаварыла, а як толькі я хацеў тое запісаць, дык яна кінулася вон

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

з хаты і ўжо больш не захацела нічога гаварыць, каб не загубіць моцы знахаркі. Бо ёсьць такое павер'е, што калі знахар ці знахарка навучыць знахараваць каго-небудзь другога, дык ужо сам загубіць моц, і яго шэпты нікому не памогуць.

Кожны вясковы чалавек ведае дзесятак-другі казак ці якіх-небудзь апавяданьняў, а мастакі-баечнікі дык ведаюць іх сотню ці яшчэ і больш, але ўсяго ня могуць спамятаць, а расказваюць толькі тое, што пападзецца на памяць, аб чым загавораць іншыя людзі, ці чым-небудзь напомняць. Запісваць народныя творы ня цяжка, калі ёсьць добрыя мастакі-баечнікі, трэба толькі прызвычаіцца хутка пісаць. Больш цяжка падыйсьці да баечнікаў так, каб яны не сароміліся ды даверчыва адкрылі свае думкі, сваё сэрца. Перш чым запісваць народныя творы, я доўга жыў на вёсцы, знаёміўся, як кажуць, з старымі і малымі, гаварыў з імі пра гаспадарку, пра іх дзела, пра тую бяду, якая заўжды трапляецца сярод людзей. І толькі тады, як людзі пачнуць гамаміць са мною, як з сваім братам, я распытоўваюся, хто там добра бае казкі. З тым казачнікам я сустракаюся нібы ненарокам і сам расказваю яму якое-небудзь апавяданьне. Ён паслухае і пачне сам баяць. Перш я толькі слухаю казку, але не запісваю, а стараюся запомніць яе так. Бо калі адразу запісваць, дык кожны баечнік саромяючыся шмат што прапусьціць, скамечыць, пачне варочацца назад ды блутаць, і выйдзе штосьь нікчэмнае, а не мастацкі твор. І толькі тады пачынаю запісваць, як баечнік добра пазнаёміцца і ўдругае пачне расказваць тую байку. Калі байка кароткая і добра запісана, дык я яе так і застаўляю, а калі-ж яна даўгая ды блытаная, дык я яе слухаю яшчэ трэці раз ды сачу свой запіс. Тут часамі мастак-баечнік дабаўляе ўсялякія прыказкі, прымоўкі ды жарты, што і робіць яго твор мастацкім.

Запісваў я, як толькі мог запісаць у кароткі час і як чула маё вуха, слова ў слова так і тою самаю гаворкаю, якою гаварыў баечнік. Транскрыпцыя запісаў ясна кожнаму, хто толькі чытае па-беларуску і не патрабуе асаблівага тлумачэньня. Усюдых паставіў я націскі так, як іх стаўляў у жывой гаворцы кожны

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

баечнік. Калі-ж адзін і той самы баечнік гаварыў неаднакова, дык там так і застаўлена. Зроблена гэта дзеля таго, каб запісаць на паперы жывую гаворку як можна вярней.

Разабраны ў зборніку казкі і апавяданьні па баечніках. Творы аднаго і таго самага баечніка паложаны ў тым самым парадку, у якім іх мне апавядалі баечнікі.

Выявіць, якія распаўсюджаны на Палесьсі асновы казак і дзе ўжо надрукаваны іх адменьнікі — гэтая праца адложана мною да другога разу, як набярэцца больш матар'ялаў.

А. Сержпутоўскі.

Петраград, 1923.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

КАЗКІ І АПАВЯДАНЬНІ

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

1. Цуд.

Было̀ гэто я̀кась у лі͡етку. Лю̀дзі збу͡ольшаго пакасілі сі͡ено на берагу͡ох, а муру͡ожныі͡е сенажàці яшчэ̀ не вы̀расьлі да й жы̀то не пасьпі͡ело. Немà чаго̀ рабіць, а тут нахапіўса якісь сьвято̀к; не то, каб ужэ̀ яко̀е велікае сьвя̀то, алѐ ўсе-ж сьвято̀к; трэ сьвяткавàць, бо часàмі малы̀ нарòбіць гары͡эй, як велікі, ці вàрто, ці ні͡е, а трэ шанавàць. Хаць якòе там шанавàне, — адзін прыклёп: сабі͡е рабіць нему͡ожна, бо яшчэ̀ зашкòдзіць, а лю̀дзі не наймàюць, бо сàмі абрабіліса й нікòму не трэ. От хібà йці на рабòту ў дву͡ор. Дак дòбрэ, калі там е рабòта. У двары̀ му͡ожна рабіць не то, што ў малы̀ сьвятòк, алѐ й у сàмае велікае сьвя̀то, бо тагды̀ гры͡эх бу̀дзе пàну, а бедà кашы̀цца на ягò галаві͡е. Дак от у такі малы̀ сьвятòк павыхòдзілі лю̀дзі на ву̀ліцу, пасі͡елі на бервѐне калà плу͡оцьця, пакурваюць сабі͡е люлькі да гамòняць пра між сабòю да распытòўваюць, што чувàць на сьві͡еці, што кàжуць паны̀ да жыды̀. Ві͡едамо, паны̀ чытàюць газэты да ксёнжкі, та яны̀ пѐўне ўсе ві͡едаюць. А жыды̀ цягàюцца па сьві͡ету да ўсю̀ды сòваюць сваѐ ры̀ло, дак яшчэ̀ лі͡епш пану͡оў усѐ бàчаць, усѐ чу̀юць. Да й куды̀ там пану͡ом да жыду͡оў. Паны̀ мо й знàюць, алѐ маўчàць зу̀бы сця̀ўшы, спаганя̀юць пàньські гòнар, а жыд, калі што знàе, дак на языку̀ не затрымàе, немажэ̀ ні і͡есьці, ні піць, ні спаць, каб другім не сказàць. От так сьвербіць у ягò язы̀к, бы ў карòсьце, му̀сіць ягò пачасàць. От гэ жу̀пяць мужчы̀ны: хто бàе а пагòдзе, а хто а прыгòдзе. Адзін скàжэ, а другі прыскàжэ. Седзя̀ць радкòм і гамòняць ладкòм, пасьмею̀цца, пашуткуюць ціхо да й забу̀ду̀ць ліхо, бо кà-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

жуць людзі, што часам трэ што небудзь сьплесьці, каб душу атвесьці. Адны гамоняць, выдумляюць, а другіе слухаюць да на вус матаюць, потым скажуць бабе да прыбавяць; тая дзянне да сусіедцы. Так маленькая прачутка ходзіць з хаты ў хату да ўсе расьце, ўсе харашыэе і датуль яна гуляе, пакуль казкаю стане, а як устарыэе, дак і саўсім будзе праўда. Пачнуць старые казаць, а бабы слухаць да ўздыхаць, бо часам стары кажэ на глум, а малады берэ на вум. Кажуць-жэ, што добрэ багатаму красьці, бо е к чаму прыкласьці. Добрэ старому хлусіць да плеткі насіць, бо як тут дагадацца, калі ніельга спраканацца. Эгэ-ж, дак от і тое даўніей было, — пачаў казаць стары дзіед. — Я чуў ат старых людзей. А хто старых неслухае, той і бога небаіцца. Яны казалі, што самі бачылі. Седзяць людзі ў сьвято, от бы мы, раздабарваюць сабіе аж да змроку. Мо ўжэ й сонейко зайшло, на небе анелы запалілі сьвіечачкі, туолькі ось штось загуло да загрукаціело, от бы перун. А на небе ні хмаркі. Хрысьцяцца людзі да азіраюцца, аж з заходу леціць зьміей, леціць над самым ліесам да просто й садзіць на село. Галава велізазная бы стуог, блішчыць, баццэ сіено гарыць, а іскры дакола й сыплюцца. Леціць, разявіўшы горло, а хвуост цягнецца мо на трое гануоў. — Прапалі мы, — думаюць людзі да туолькі хрысьцяцца. Не зьлюбіў ён мабыць таго, пралеціеў мімо села да як трыэсьне, дак аж земля задрыжала. Разсыпаўса ён на друобныіе кускі да й упаў у балото. Седзяць людзі да й неварухнуцца, бы акаменіелі, так яны спалохаліса. Туолькі ось узышоў міесячык, павіеяў віетрык. Ачухаліса людзі да й кажуць: гэто божы цуд. Прапалі-б мы ўсіе, пажраў-бы нас агністы зьміей, каб не перахрысьціліса. Хрэст-буоская муоц, уселякае ліхо перамагае. На другі дзень пашлі людзі на балото шукаць кускуоў таго зьміея. Куолькі ніхадзілі яны, куолькі ні шукалі, дак от кажы, німа нічого да й туолькі. Пагаманілі людзі да й пачалі ўжэ забываць, туолькі ось з тых часаў быў хворы адзін пастух. Ен тагды, як леціеў той зьміей, шукаў у ліесі згубленую карову. Туолькі ён вышаў на прагаліну да як убачыў зьміея да як учуў грымоты, дак так спа-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

лòхаўса, што й захварыэў. Чагò лю̀дзі ні рабілі, якìх зельеў ні давàлі, к якім шаптунуом да шаптўхам ні ўдавàліса, нічòго не памагàе. Туолькі ось прыцêгса з местэчка жыд да й кàжэ: у нас нарадзіўса месіяш, то бўдзе буог наш. — Пèўне гэто ён лепіеў, — кàжуць лю̀дзі, — да мàбыць гэто ягò прарўок Іллѧ̀ перунòм трыэснуў. — Ну, ніхтò невіедае, дзіе ён, туолькі ось падымàецца кітаёвец, — кàжэ жыд. — А ён як падымецца, та ўвесь сьвіет заваѓе. — А хто-ж гэто такі кітаёвец? — Хто? Зьвіесно, нàсі кітаёўцы, сто нòсяць дòўгііе лапсардакі й дòўгііе пèйсы. — Эй, пархàтыіе, кудЫ вам увесь сьвіет заваявàць, калі вы баіцèса й стрэлбу ў рукàх дзержàць. — На сто нам стралѧ̀ць, калі гòі бўдуць сàмі себè забівàць, а мі туолькі дабрò іх спажывàць. — Не дачакàпе вàшэ, пòгань! Прыдзе прарўок Іллѧ̀, та ён звас нарòбіць гнілля̀. А ваш масіяш ужэ даўнò ў балòці седзіць да чартуом слўжыць. — Пачўў тое хвòры пастух да й прыпòмніў, што як лепіела святòго Іллі стрàла, лак пèрад ягò ачў павалìла таўшчэразны дуб да й самà ў ём засіела. От і прòсіцца ён, каб ягò павезлі на тòе міейсцэ, та мо ён і выачуняе. Кàжуць лю̀дзі, — як тòпішса, та й за салòму хòпішса. Так і ў бедзіе трэ ўсягò папрòбуваць. От павезлі тагò пастухà ў ліес. Туолькі яны прывезлі ягò к тамў дўбу, як ён усхапіўса з вòза, бàцпэ й не хварыэў, да й пачàў аглядàць пень тагò дўба. Аж бàчыць, седзіць там каміенная стралà, ўся чòрная да глàдкая, аж палыскўецца. Убàчылі лю̀дзі той цуд, памаліліса тут яны бòгу да й пастàвілі там крыж. І да тых час е там прòшча. Усякую пèршую недзіельку зьбіраюцца тудЫ лю̀дзі да мòляцца бòгу. Дак от які там быў цуд. Я сам яшчэ падшпàркам хадзіў тудЫ з мàткаю, як у менè баліелі вòчы. Дак от, дзякуй бòгу, памаглò, да тых час бàчу бòжы сьвіет. Тагды ўжэ дўба не былò, туолькі ў капліцы ляжыць, от бы цепèр бàчу, чòрны, веліні кàмень, мо з лòкаць даўжынèю, а на ём гарàць сьвіечачкі.

Лявуон Лебедзік.

Чудзін.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

2. Кальвінські пуост.

Пашоу адзін пан у ліес на палеване. Доуго хадзіу ён, заблутауса у гушчэчы да й заблудзіуса. Дзень быу хмурны да ціхі. Ні сонейко не блісне, ні расліна не калыхнецца, німа жуоднаіе прыкміеты, куды йці. Ужэ такі добрэ прагаладауса пан, утаміуса, лазячы цераз выскаці да каладзье, а тут і зверыны німа ніякаіе да й супачыць ніедзе. Стау ён і думае, што тут рабіць. Але ось уваднуом боцы забрахау сабака. Абрадавауса пан да й пашоу у той буок. Ужэ добрэ сьцемніело, як ён прыцегса у хату к стражніку. Віедамо, стражніка хата адна-адзінюшачка стаяла на палянаццы серуод ліесу, а кругом мо на якіх дзесяць верстуоу не было жывоіе душы. Застауса пан у стражніка начаваць. Просіць пан іесьці, а стражнік кажэ: німа у нас, паночак, нічого сягонячы, апрыч бульбы, бо у нас пуост. — Які-ж гэто пуост, — кажэ пан, — калі у вас і німа нічого скаруомнаго. Гэто й усякі дурэнь так папосьціць, калі скаруомнаго німа. От ты тагды папасьці, як усяго мнуого, а іесьці не муожна. От то, дак пуост. Наіеуса пан печанаіе бульбы да й лёг спаць на цьвордуй лаве, падклаушы пад голау шапку. Сьпіць ён бы после маку, бо віедамо, за дзень нахадзіуса, як пацук. На заутрэ запруог стражнік сваю кабылку да й пауёз пана у яго маёнтак. Прыіехалі яны туды, зауеу пан стражніка к сабіе у пакоі. Бачыць стражнік, што там сабралосо мнуого пануоу да паней; у куожнуй станцаі панастаулено сталуоу, а на іх руозных патравак, што аж не прыдумаць, чаго там не было. Ідзе пах ат тых патрау па усіх пакоях, што аж сьліна цечэ з рота. Чакае ён, калі-ж гэто будзе абіед. Тым часам ужэ дауно пара абіедаць, а пані да паны ходзяць кала тых патравак да туолькі сьлінку каутаюць да аблізваюцца, бы сабакі. От сустракае ён таго пана да й кажэ: пара мніе, паночку, іехаць да гасподы, бо яшчэ хто ліес пакрадзе. — Пачакай, каханы, я-ж цебе пачастую за тое, што прыняу мене на нач, — кажэ пан. Застауса стражнік. Тым часам ужэ й дау

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

буог вѐчар, а абіеду німà. У стрàжніка ўжэ даўнò ў жываціе перабурчàло й урòце перасхлò, бо ўсю сьлìну пакаўтàў, пазірàючы на смàчныіе патрàўкі. От і пытàе ён у лѐкая, калì бýдзе абіед. — Заўтра аб гэтуй пары̀, — адмаўляе лѐкай. — Бàчыш, маіе пані̀ кальвіні̀, а ў кальвінуоў сягòдне пуост. Дак гэто яні̀ так пòсьцяць, бо, — кàжуць яні̀, — то не пуост, калì німà чагò іесьці, от то пуост, калì ўсягò мнуого, а іесьці немуожна. — Не вы̀трымаў стрàжнік, ускòчыў на сваю̀ кабы̀лку да ва ўсю̀ нуоч папѐрса да гаспòды, каб хучэй наіесьціса хаць пуоснаіе бýльбы. Прыіехаў дамуоў да й дýмае: мò й прàўда. Не дзіво не зграшыць у намастыры̀, дзіе немàшака грахý, а от ты ў жы̀цці не саграшы̀, дзіе грахì на кòжнум крòку — як ступіў, та й саграшы̀ў.

Лявуон Лебедзік.

Чудзін.

3. Сабака й грошы.

Быў у ваднагò чалавіека вѐльмі разýмны сабàка. Тагò сабàку не кармілі, хібо калì-не-калì гаспадàр кідаў ямý скары̀нку хліеба да агры̀зеную куосць. У тагò чалавіека былà вѐльмі пагàная жуонка; яна заўжды выганяла сабàку з хàты міешалкаю, абò качаргòю, ці аблівàла вадòю. Той чалавіек быў жàласлівы нàват да ўселякага жыўѐла. Ён чàсто гавары̀ў жуонцы, што трэба сабàку карміць, бо кàа, — мо не праз чыю̀ лàску жывуом. Пачуўшы тòе, пагàная жуонка туолькі зневажàла свайгò гаспадарà да ешчэ гарэй біла сабàку. — Сабàка, як куот, — крычàла янà, — павінен сам сабіе знайсцì корм. І прàўда, біедны сабàка цэлы дзень біегаў туды̀-сюды̀, шукàючы сабіе кòрму. Буольш усегò любіў ён грабціса ў землì, каб злавіць мыш, абò кратà. От пашòў раз той чалавіек у пòле, гдзіе на межы̀ стаяла йгрýша, каб натрасцì дзікіх ігрýш. Ідзе ён і дýмае сабіе: натрасý пòвен кашэль ігрýш, занесý ў гумнò, вы̀сыплю ў муруог. Яны там сапрэюць і хýтко пагнію̀ць. Бýдзе дòбрэ іесці дзіе-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

цям, рэ̀шту ба̀ба вы̀сушыць да нава̀рыць узва̀ру.—Падхо̀дзіць ён к ігру̀шы, аж ба̀чыць—яго̀ саба̀ка грабѐцца тут на межы̀. Падыйшо̀ў ён туды̀. Саба̀ка ўба̀чыў хаджа̀іна, вы̀скачыў з я̀мы, ла̀шчыцца, кі̀даецца на гру̀дзі да ўсе зноў ска̀чэ ў я̀му. Зірну̀ў чалаві͡ек у я̀му, аж там стаі̀ць по̀вен гаршчо̀к гро̀шэй. Блішчы̀ць зо̀лато, бы слеза̀. Забра̀ў той чалаві͡ек гро̀шы ў кашы͡эль, натру͡ос ігру̀ш наверх і папёр да гаспо̀ды. Ужэ быў пу͡одвечарак, як ён прышо̀ў даму͡оў. Жу͡онка падаі̀ла кару͡ову. От той чалаві͡ек налі̀ў у мі̀су малака̀, накрышы̀ў туды̀ хлі͡еба да й даў саба̀цэ. Жу͡онка дава̀й ла̀яцца, дава̀й зневажа̀ць да праклiна̀ць на чу͡ом сьві͡ет стаі̀ць. Насі̀лу гаспада̀р сутрыма̀ў тро̀хі шалёную ба̀бу. На другі̀ дзень ён велі͡еў ба̀бе ку͡ожын дзень вары̀ць стра̀ву саба̀цэ да кармі̀ць яго̀ малако̀м.—Ашалі͡еў гаспада̀р—ду̀мае ба̀ба,—дай-жэ я хі̀ба̀ атручу̀ саба̀ку, а то ён ско̀рміць ім усѐ малако̀. Побѐгла ба̀ба к сусі͡едкам, жа̀лілася на сваю̀ гу͡оркую до̀лю, праклiна̀ла гаспадара̀ да й вы̀прасіла атру̀ты. Навары̀ла яна̀ стра̀вы, усы̀пала туды̀ атру̀ту да й атруці̀ла таго̀ саба̀ку. Верну̀ўса з рабо̀ты гаспада̀р да як даві͡едаўса, што саба̀ка здох, дак чуць не запла̀каў, так яму̀ шко̀да было̀ ві͡ернаго слугі. Німа̀ чаго̀ рабі̀ць, даста̀ў ён харо̀шых до̀шак, збі̀ў вѐльмі го̀жую труну̀, насла̀ў у яі͡е пу̀ху да й палажы̀ў туды̀ саба̀ку. По̀тым вы̀капаў на мо̀гліцах я̀му, прынёс туды̀ труну̀ да й пазва̀ў папа̀ хава̀ць зма̀рлаго. Прышо̀ў пу͡оп і велі͡еў атчыні̀ць дамаві̀ну. Зняў той чалаві͡ек з труны̀ ві͡ено. Убача̀ў тут пу͡оп, што ў дамаві̀не саба̀ка, а не чалаві͡ек, закрыча̀ў і ка̀жэ, што за гэтакі абма̀н сашлѐ да Сібѐру, ці згно̀іць у вастро̀зе. Насы̀паў той чалаві͡ек папу̀ по̀ўную ша̀пку гро̀шэй і просіць, каб пахава̀ў саба̀ку. Паглядзѐў-паглядзѐў пу͡оп у сваёй ксёнжцы да й ка̀жэ: «уся̀кае стварэ̀не да хва̀ліць го̀спада»,—і пахава̀ў саба̀ку. Іду̀ць яны з мо̀гліц, а пу͡оп і ка̀жэ: «шко̀да, што бу͡ольш не хава̀юць сабак».

Ляву͡он Лебедзік.

Чудзін.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

4. Закалдо̀ваная ша̀пка.

Быў сабі͡е адзі̀н нікчэ̀мны мужычы̀на да такі̀ нескла̀дны, плюга̀вы, што звыча̀йныі͡е лю̀дзі не хаці͡елі на яго̀ й плю̀нуць. Ніхто̀ з і̀м не зна̀ўса, ніхто̀ не зваў к сабі͡е ў го̀сці, ві͡едамо пакі̀дзішчэ. Сто̀яло ту͡олькі зірну̀ць на яго̀, як ужэ̀ чалаві͡ека браў смі͡ех, така̀я то была̀ пачвѐра, а не бо̀жае стварэ̀не. Алѐ ён, як і другі̀е мужыкі̀, мі͡еў сабі͡е яку̀юсь слімаза̀рную гаспада̀рку й на̀ват нашо̀ў сабі͡е жу͡онку, таку̀ю-ж раскіра̀ку, як і сам. Бо ка̀жуць, што жанчы̀на гэ меркуе: неха̀й сабі͡е мужы̀к як ла̀пець, абы з ім не пла̀каць. Усі͡е яго̀ лічы̀лі ду̀рням, а ў яго̀, ма̀быць, чорт ро̀зуму не зъі͡еў, — ён быў дага̀длівы й вѐльмі хі̀тры мужы̀к, да̀рам, што ўсі͡е яго̀ зва̀лі раскіракаю. От раз гэ̀стая раскіра̀ка паўѐў у мі͡есто на кірма̀ш прадава̀ць я̀лавіцу. Прыўѐў ён сваю̀ дыхля̀ціну, прывеза̀ў к слу̀пу да й чака̀е, паку̀ль хто ку̀піць. Падбі͡ег жыдо̀к, мацну̀ў я̀лавіцу кала̀ за̀ду, памата̀ў галаво̀ю да й пабі͡ег да̀лей. Падышлі̀ мужыкі̀, аглядзі͡елі я̀лавіцу да й пыта̀юць: ку͡олькі хо̀чэш за гэ̀стую казу̀. — Яку̀ю казу̀? Гэ̀сто-ж каро̀ва, — адмаўля̀е той нікчэ̀мны мужы̀к. — Така̀я гэ̀сто каро̀ва, як і ты, — ка̀жуць мужыкі. — У цебѐ пыта̀юць, па чу͡ом прадаѐш казу̀? — Каза̀, дак каза̀, неха̀й сабі͡е й каза̀, ту͡олькі дава̀йце харо̀шые гро̀шы. — У нас гро̀шы но̀венькіе, харо̀шые, ту͡олькі гавары̀ сэ̀с. — Старгава̀ліса мужыкі̀ да й купі̀лі ту̀ю каро̀ву. Заплаці̀лі мужыкі̀ гро̀шы й хо̀чуць весьці̀ каро̀ву. Ту͡олькі яны̀ ўзялі̀са за по̀вад, а гаспада̀р і ка̀жэ: я вам прада̀ў жыўѐло без по̀вада, бо на казу̀ злыгача̀ не трэ. — Нема̀ чаго̀ рабі̀ць, заплаці̀лі мужыкі̀ яшчэ̀ за по̀вад і павелі̀ каро̀ву. От той раскіра̀ка накупі̀ў сабі͡е ў кро̀мках, што яму̀ было̀ патрэ̀бно, по̀тым зайшо̀ў у ка̀рчму, купі̀ў дзві͡е пля̀шкі гарэ̀лкі да й ка̀жэ ландару̀: Неха̀й яны̀ пабу̀дуць у цебѐ, паку̀ль я зайду̀. — По̀тым зайшо̀ў у другу̀ю ка̀рчму да й там так са̀мо купі̀ў дзві͡е пля̀шкі гарэ̀лкі да й аста́віў у жы̀да да тых час, по̀кі за̀йдзе. Зрабі̀ўшы то̀е, пашо̀ў шука̀ць тых мужыку͡оў, што купі̀лі ў яго̀ каро̀ву. Па нема̀лым ча̀се

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

нібыто ненарокам сустракае ён тых мужыкуоў і кажэ: заплацілі вы мне добрые грошы, дак хадзем хіба выпъем барышу. — Добрэ, — кажуць яны. — От наш раскірака паўеў мужыкуоў у карчму й заказаў дзвіе бутэлькі гарыэлкі. Выцяглі яны з кішыэнь акрайцы хліеба й сала, выпілі гарыэлку да й закусілі. Узяўса наш раскірака за шапку да й кажэ ландару: за гарыэлку табіе заплачано. — Заплачано, — адмаўляе жыд. Подняліса мужыкі й пашлі з карчмы да туолькі перагледаюцца па між сабою, чаму гэто іх сябер не плаціў жыду за гарыэлку, а той кажэ, што заплачано. Паўеў ён мужыкуоў у другую карчму да й зноў веліеў падаць дзвіе бутэлькі гарыэлкі. Выпілі яны й тую. Зноў сябер узяўса за сваю шапку да й пытае жыда, ці заплачано за гарэлку. Жыд адмаўляе, што ўсе заплачано. Тут ужэ нашы мужыкі дзіву даліса да атразу дагадаліса, што ў гэстаго нікчэмнаго чалавіека закалдованая шапка. От, як туолькі вышлі з карчмы, дак і прысталі яны да таго мужыка, каб ён прадаў ім сваю закалдованую шапку. Але той нехочэ, кажэ, як-же ён будзе жыць без гэтакаіе шапкі. Яны прасіць, яны благаць. Упіраўса, ўпіраўса наш нікчэмны мужык, нарэшце падаўса да й прадаў мужыкуом за сто рублеў сваю старую шапку, што была бы вароны гнездо. — Ну, — кажэ, — шкада мне гэстаіе шапкі, ні за якііе грошы не аддаў бы яіе чужым людзям, а гэто туолькі, што сябруом. Ну, насіеце па здарове да памінайце Раскіраку. Прашчавайце, сябры! Трэ да гасподы цягнуцца, а то баба качаргою сперыэсьціць мазгаўню да скажэ, што пъяны загубіў шапку. — Пашоў наш раскірака сваею дарогаю, а мужыкі зайшлі яшчэ ў адну знаемую карчму й заказалі дзвіе пляшкі гарыэлкі. Пъюць яны да радуюцца, што такі купілі такую дзіўную шапку. От выпілі яны гарыэлку, адзін узяўся за тую шапку да й кажэ да жыда: заплачано! — А той усмехнууса да й атказвае: ну, калі німа грошэй, та я запішу. — Пашлі яны ў другую карчму й там выпілі пляшку гарыэлкі. Узяўса ужэ другі за шапку й кажэ ландару, што заплачано, але ландар і слухаць не хочэ. — Сто ві пъяніцы, валацугі, мене дурням робіце!.. Я ліепш ат вас памя-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

то̀ю, сто запла̀цано, а сто ні͡е. Заплаці̀лі мужыкі̀ за гары͡элку, кі̀нулі на зѐмлю ту̀ю ша̀пку да й дава̀й яі͡е тапта̀ць нага̀мі да рваць, на сабі͡е гі̀ры. Ото̀ж абману̀ў, хвары͡эць яго̀ ма̀тары. І пацяглі̀са даму͡оў, бы мо̀крыі͡е ку̀ры.

Чудзін. Ляву͡он Лебедзік.

5. Лі̀хо абхо̀дзь, а дабра̀ не міна̀й.

Ішо̀ў па сві͡еце Хрысто̀с з Па̀ўлам-Петро̀м, до̀ўго яны̀ хадзілі, патамі̀ліса й шука̀лі, дзі͡е-б ім супачы̀ць. Абхадзі̀лі яны нѐмаль усю̀ вѐску, ніхто̀ не прыма̀е на̀ нач. Усі͡е адмаўля̀юцца та сім, та тым. Пачу̀ла аб гэтум адна̀ бі͡едная ўдава̀, ў като̀раі͡е ляжа̀ў вѐльмі хво̀ры апу͡ошні сын. Яна̀ так сказа̀ла сабі͡е, што калі̀ к ёй за̀йдуць на̀ нач гэтые падару͡ожные, та яі͡е сын вы̀здаравее. Прыбі͡егла яна̀ з са̀маго канца̀ вѐскі да й про̀сіць іх к сабі͡е. Тым ча̀сам Петро̀ й Па̀вел зайшлі̀ ў вадну̀ бага̀тую ха̀ту, дзі͡е было̀ весі͡елье, да й залі͡езлі на пі͡еч. Ві͡едамо, на весі͡елы за̀ўжды людзѐй мну͡ого. Таўку̀цца яны̀ ў хацѐ, бы ўюны̀ ў ры͡эшаці. Прасі̀ла, прасі̀ла іх удава̀ к сабі͡е, каб у ха̀це былі̀ чужы̀е лю̀дзі, як бу̀дзе памі̀ра̀ць яі͡е каха̀ны сыно̀чак, прасі̀ла жывы̀м бо̀гам, аж у зѐмлю кла̀няласа, але Па̀ўло-Петро̀ не ўва̀жылі яі͡е про̀зьбы, расьцеглі̀са с кра̀ю на пѐчы да й гры͡эюць стары̀і͡е ко̀сці. Ту͡олькі Хрысто̀с зжа̀ліўса да й пашо̀ў па гразі̀ ў са̀мы канѐц вѐскі к бі͡еднуй удаві͡е. Ту͡олькі ён улі͡ез у ку̀рную ха̀тку ўдавы̀, як сын яі͡е ачу̀няў і ўста̀ў з пасьцѐлі. Падзя̀дувала ўдава̀ Хрысту̀, пакланіласа яму̀ ў но̀гі, а той і знік. Тым ча̀сам на весі͡елы хло̀пцы захадзі̀ліса кала̀ Па̀ўла-Петра̀ да й пачалі̀ лупцава̀ць іх паплі̀скамі. Кру̀цяцца на пѐчы Па̀ўло-Петро̀, бы ўюны̀ на скаварадзі͡е, а хло̀пцы лу̀пяць іх да прыка̀зваюць, — не чапа̀йце на̀шых дзі͡евак, не лі͡езьце на чужо̀е весі͡елье... Тут прышоў Хрысто̀с і велі͡еў Па̀ўлу-Петру̀ лѐгці на другі̀ бу͡ок пѐчы. Зайшлі̀ хло̀пцы на другі̀ бу͡ок пѐчы да й ка̀жуць: Цепѐр трэ правучы̀ць і гэстых валацу̀гаў і дава̀й іх перы͡эсціць, дава̀й лупіць так, што аж па̀ра з іх павалі̀ла.

Чудзін. Ляву͡он Лебедзік.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

6. Каму̀ грыэх, а каму̀ ніе.

Разу̀мные лю̀дзі ка̀жуць: грыэх у міех, а спа̀сеньне ў то̀рбу; хто ка̀жэ — грыэх, таго̀ ў мо̀рду. Я чуў яшчэ ат свайго̀ дзѐда, калі я ешчэ быў малы̀м падшпа̀ркам, а ён ужэ тагды̀ сго̀рбіўса, змо̀ршчыўса бы по̀рхаўка. Ба̀ло седзіць на пры̀збе ўліетку ў кажушку̀ да грыэецца на со̀нейку, а мы біегаем бо̀сые ў вадны̀х саро̀чках, і пуот з нас ва̀ліць, біегаем, ці слу̀хаем ба̀йкі старо̀го дзіеда. А ён вѐльмі любіў каза̀ць ба̀йкі. Шмат я пераня̀ў тых ба̀як, алѐ, ба̀чыце, сам ужэ састары̀эўса, здурніеў і мнуогае запа̀мятаваў. От, — дай бо̀жэ па̀мяць, — дзіед раска̀зваў, як Хрысто̀с з святы̀м Петро̀м хадзілі па сьвіету да вучы̀лі людзѐй. До̀ўго яны̀ хадзілі піешкі, пазбіва̀лі но̀гі, абадра̀ліса да ніткі, а ўсе хадзілі да вучы̀лі дабру̀, зго̀дзе да братэрскуой жы̀ццэ на сьвіеце. Уба̀чыў раз Петро̀, што ба̀бы павіесілі на пло̀це вѐльмі мнуо̀го руознаго пла̀ця. Надаіело Петру̀ хадзіць у тра̀нцах, а мо̀жэ яго̀'й во̀шы заіелі, от і паза̀рыўса ён на чы̀стае пла̀це да й укра̀ў сабіе адну̀ саро̀чку, туолькі абмыліўса, ўзяў не мушчы̀ньськую, а жано̀чую. Ба̀чыце, даўнѐй мушчы̀ны насілі саро̀чкі до̀ўгіе па са̀мые пя̀ты. Надзіеў ён ту̀ю саро̀чку, аж каўніер несхо̀дзіцца, а рукавы̀ туолькі па ло̀кці. Апрану̀ў ён навѐрх сваѐ ла̀пікло, алѐ ніельга закры̀ць саро̀чку. Абернуўса Хрысто̀с к Петру̀ да й пыта̀е: скуль ты ўзяў жано̀чую саро̀чку? — Укра̀ў, го̀спадзі, ў бага̀тых, дару̀й бо̀жэ ця̀жкі грыэх. — Лядзі, каб не абѐрну̀цца ў жанчы̀ну. — Злека̀ўса Петро̀, скінуў саро̀чку да й панёс на то̀е міейсцэ, дзіе яіе ўзяў. Падхо̀дзіць ён туды̀ да й чу̀е, аж там ба̀ба крычы̀ць, клінѐ, чуць не гало̀сіць, што хто̀сь укра̀ў ту̀ю саро̀чку, като̀рую яна̀ хава̀ла сабіе на смѐрць. — Чаго̀ ты крычы̀ш і турбу̀ешса, ба̀бко? — пыта̀е Петро̀. — Як-жэ мніе не турбава̀цца, — адмаўля̀е ба̀ба, — калі хтось укра̀ў у менѐ ту̀ю саро̀чку, яку̀ю я згато̀віла сабіе на смѐрць. Як-жэ цепѐр я памру̀, калі ў менѐ німа̀ на смерць саро̀чкі. — Дак ты, ба̀бко, не памірай, — ка̀жэ Петро̀. — Ой, муой сако̀ліку, — адмаўля̀е ба̀ба, — на што-ж я бу̀ду сьвіет

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

займàць, калì я ні на ву͡ошто не патрэ̀бна. — А ты сабі͡е жывì самà ля себè. — Ой, ні͡е, му͡ой ру͡одненькі, ля себè вàжко жыць, так вàжко, што лі͡епш памèрці. — Як ні ўгавòрваў Петрò бàбу, тàя адмаўля̀ласа, а нарэ̀шце пачалà галасìць. Аддàў ёй Петрò сарòчку й пашòў дàлей. Ідзè ён да йдзè, аж бàчыць, вісіць на плòце калè растанцòў бі͡елая бы сні͡ег мушчы̀ньськая сарòчка. Палядзі͡еў ён давокала, укрàў тỳю сарòчку, надзі͡еў яі͡е пад сваè лàпікло да й хучы͡эй пашòў дàлей. Прыхòдзіць ён да Хрыстà й кàжэ, што аддàў бàбе сарòчку жанòчую, а ўзяў сабі͡е мушчы̀ньськую. — А ві͡едаеш, якỳю сарòчку ты ўзяў? — пытàе Хрыстòс. Ні͡е, гòспадзі, — адмаўля̀е Петрò. — Гэ̀то два багàтые браты̀ дзелìліса да нія̀к не маглì падзелìць гэ̀стую сарòчку; дòўго яны̀ свары̀ліса, калапìліса, бìліса, а пòтым паві͡есілі тỳю сарòчку на растанцу͡ох, каб янà не ўвадзìла іх у гры͡эх. — Што-ж мні͡е рабіць? — Пытàе Петрò. — Насì гэ̀тую сарòчку, хаць ты яі͡е ўкраў, бо гэ̀тым ты рòбіш лю̀дзям дабрò — мìрыш іх, а хто мìрыць людзèй, з тым і бу͡ог памìрыцца.

Леву͡он Лебедзік.

Чудзін.

7. Прамỳдры Салìму͡он.

Жыў кòлісь прамỳдры Салìму͡он. Быў ён мудры͡эйшы ат усìх людзèй. Цары̀ з далёкіх цàрств прыезджàлі к ямỳ, каб паслỳхаць яго мỳдрасці да павучы̀цца ў ягò рòзуму. І пачàў дỳмаць Салìму͡он: кèпьско бу͡ог сатвары̀ў сьві͡ет, бо рàзам з дòбрым пазвòліў жыць і ліхòму. От Салìму͡он вы̀даў такі заку͡он, каб ку͡ожнаго ві͡ешаць, кагò злòвяць на зладзі͡ействе. Убàчыў бу͡ог ты̀е дỳмкі Салìму͡она й зрабіў так, што той пазнàў сваю̀ амы̀лку. От як тòе былò. У Салìму͡она былà вèльмі гòжая дачкà. Ён яі͡е так му͡оцно любіў, што чагò-б янà ні папрасìла, ні ў чу͡ом ёй не аткàзваў. От раз папрасìласа янà, каб Салìму͡он узя̀ў яі͡е з сабòю на ахвòту. Салìму͡он узя̀ў. От паахвòціўса Салìму͡он з сваìмі

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

прыбліжòннымі, налавìлі яны̀ мну͡ого ўселя̀каі͡е зверыны̀, нагатòвілі там і пачалì балявàць. Ту͡олькі ось хапіла дачкà Саліму͡она кусòк вèльмі смàчнаго мя̀са, ці мо янà вèльмі му͡оцно прагаладàласа на ахвòце, ту͡олькі кусòк у гòрле й перасі͡еў. Што тут ні рабìлі, як ні ратавàлі, нічòго не парàдзяць. Падавìласа Саліму͡она дачкà да й ту͡олько. Засмуцìўса Саліму͡он, гòдзі балявàць, паўёз з ахвòты любìмую дачкỳ хавàць. От убрàлі яі͡е ў зòлато й дарагòе адзі͡ене. Апры̀ч тагò Саліму͡он павязàў ёй на шы̀ю дъямантòвые пàцеркі, якìх яшчэ̀ ніхтò не бàчыў. От адзìн чалаві͡ек пабàчыў на ту͡ой змàрлуй зòлато й дъя̀мант і задỳмаў тòе ўкрàсці. От як пахавàлі Саліму͡она дачкỳ, засы̀палі землёю да ўсі͡е разышлìса з мòгліць, от той злòдзей хỳценько раскапàў магілу, вы̀цяг дамавіну навèрх да й хаці͡еў атчыніць ві͡еко, алè янò былò му͡оцно прыбіто гваздàмі. Як ён ні мỳчыўса, нічòго не мажэ̀ зрабіць, каб аткры̀ць ві͡еко. От ён вы̀вернуў з аднаі͡е магìлы велìзны кàмень, прынёс ягò да як уды̀рыць па труні͡е, дак ві͡еко й атчыніласо. Зірнỳў ён, аж дачкà Саліму͡она ажылà да й падымàецца з труны̀, бо мỳсіць, як ён уды̀рыў тым кàменям, дак ат тагò рỳху мя̀со ў гòрле й праскòчыло й дзеўчы̀на ажылà. Не ві͡едаючы, што з ею̀ рòбіцца й чагò янà лежы̀ць у гэстуй скры̀ні, пачалà янà звàць к сабі͡е тагò злòдзея, алè ён так спужàўса, што не мажэ̀ ні варухнỳцца, стаìць, бы акамені͡еў. От на крык збі͡егліса лю̀дзі, ўбàчылі тỳю дзеўчы̀ну, забрàлі яі͡е й тагò злòдзея да й прывелì к Салімòну. Абрàдаваўса ён, што ажылà дачкà, а як даві͡едаўса, што яі͡е спас той злòдзей, та вèльмі засмуцìўса й зразумі͡еў ён, што не ямỳ вỳчыць бòга, бо бу͡ог зрабі̀ў так, што чàсам і ліхòе рòбіць дòбрае, што без ліхòго, мо й сьві͡ет пераўёўса-б.

Ляву͡он Лебедзік.

Чудзін.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

8. Хлапѐц удалѐц.

Жылі̀ сабі͡е дзі͡ед да ба̀ба. Пражылі̀ яны̀ нѐмаль усю̀ жы̀тку й не было̀ ў іх дзецѐй. Чаго̀ яны̀ не рабілі, які̀х пры̀мхў не спраўля̀лі, які̀х зельёў ба̀ба не піла̀, які̀х варажбіту͡оў не прасі̀ла. Хадзі̀ла яна̀ па про̀шчам, дава̀ла на хва̀лу бо̀жую на цэ̀ркаў, на касцёлы й на̀ват на жыду͡оўськую шко̀лу. Нічо̀го не памага̀е. Ту͡олькі ось ішо̀ў які̀сь ста̀рац да й заначава̀ў у тых людзѐй. Дала̀ яму̀ ба̀ба вечэ̀раць, а сама̀ стаі̀ць кала̀ пѐчы да ўздыха̀е. Зірну̀ў ста̀рац да й пыта̀е, чаго̀ яна̀ ўздыха̀е. — Як жэ мні͡е неўздыха̀ць, калі̀ бу͡ог прагні͡еваўса на нас за грахі̀ да й не да̀е нам дзецѐй, — ка̀жэ ба̀ба. — Чым-жэ вы яго̀ прагневі̀лі? — А бу͡ог яго святы̀ ві͡едае! Ці-ж мы ві͡едаем, што гры͡эх, а што не гры͡эх? Цёмныі͡е мы лю̀дзі, му͡ой сако̀ліку. Мы й не ві͡едаем, мо грашымо̀ ку͡ожную часі̀ну. — Уздыха̀е ба̀ба да жа̀ліцца, што німа̀ каму̀ заста̀віць сваѐ дабро̀, што не бу̀дзе каму̀ памі̀на̀ць іх ду̀шачкі, бо ўсі͡е ру͡одные паўмі̀ра̀лі, ту͡олькі яны̀ ліпя̀ць. — Не турбу̀йса, ба̀бко, мо яшчэ̀ бу͡ог змі̀луецца над ва̀мі да й дась вам дзі͡етак, — ка̀жэ ста̀рац. — Ой, му͡ой лѐбедзіку, пара̀дзь, што мні͡е рабі̀ць? — Папасьці̀, ба̀бко, шчы̀рым по̀стам двана̀ццаць пъя̀тніц, — ра̀дзіць ста̀рац. Падзя̀кувала ба̀ба таму̀ ста̀рцу да й пачала̀ пасьці̀ць шчы̀рым по̀стам пъя̀тніцы. Яшчэ̀ не адпасьці̀ла яна̀ ўсіх пъя̀тніц, як чу̀ецца, што ўже то̀ўстая. Сказа̀ла яна̀ гаспадару̀. Той здзіві̀ўса, але ра̀дуецца ра̀зам з ею. От прышо̀ў час і радзі̀ла та̀я ба̀ба хлапчука̀, да тако̀го малѐнькаго, як мі͡езены па̀лац. Хаць малѐнькі хлапчу̀к, алѐ-ж ві͡едамо, сваѐ дзіця̀, гаду̀е яго̀ ба̀ба, пі͡есьціць, про̀сто й не атхо̀дзіць ат калы̀шкі. Узгадава̀ўса той хлапчу̀к, пача̀ў хадзі̀ць да бі͡егаць, ста̀ў такі̀ праву͡орны да жва̀вы, што дзі͡ед з ба̀бою й не нара̀дуюцца на яго̀ гля̀дзячы, ту͡олькі які̀м быў малѐнькі, такі̀м і заста̀ўса. Седзя̀ць яны̀ за стало̀м да сі̀лку̀юцца, а хлапчу̀к бі͡егае па сталу̀ да пераско̀квае цѐраз ло̀жкі. От надаі͡ело яму̀ бі͡егаць у ха̀ці па ла̀вах да па жо̀рдках і пача̀ў ён прасі̀ць ба̀цька, каб пасла̀ў яго̀ на рабо̀ту. До̀ўго

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

дзіед адмаўляўса, нарэшце паслаў яго ў ліес па дрова. Запруог гэто дзіед кабылку ў сані да й кажэ: ну, іедзь муой сынок, прывезі мацца дроў. Ускочыў хлапец кабылцы ў вухо, шапнуў ёй куды біегці, да й паіехаў. Прыіехаў ён у ліес, дзіе былі зложаны ў высокі стуос дрова, падвёў к самаму стосу сані. Тым часам віецер як махне, дак і вывернуў тую дзераўляку, кала якое быў зложан стуос, той і абернуўса просто па сані. Шапнуў хлапчук кабылцы ў вухо, а тая й павезла дрова ў вёску просто на свуой двуор. Падзівіліса дзіед з бабою да й кажуць: хаць малы хлапец, да ўдалец. І празвалі яго з тых часаў хлапец удалец. От пашоў раз дзіед у ліес па грыбы да ўзяў з сабою й хлапчука. Пакуль дзіед убачыць грыба з высока, дак хлапец удалец ужэ й знайдзе да й цягне ў кашыэль. Назьбіраў ён грыбуоў повен кашыэль, так што дзіед чуць пліэчыць. Тым часам пан выпаў ў ліес на паляване да й сустракае таго дзіеда. От пан суняўса да й пытае, ці мнуого назбіраў дзіед грыбуоў. — Нічого, паночку, — адмаўляе дзіед. Тут пан падышуоў к дзіеду, глянуў у кашыэль да й кажэ: — што-ж ты хлусіш, стары псюка, а гэто-ж хто назбіраў? — Гэто муой хлапчук, — кажэ дзіед. — Дзіе-ж ён? — Ой, сцеражыса, паночку, — закрычаў дзіед, — бо затопчэш майго хлапчука. — А яж думаў, што гэто грыб. — Узяў пан хлапчука к сабіе на далоню, а той і давай там скакаць да вычвараць уселякіие штукі. Вельмі спадабаўса пану той хлапчук. От і просіць ён, каб дзіед аддаў яго яму на службу. Нехаціеў аддаваць дзіед, але хлапчук шапнуў яму, каб не баяўса, бо ён хутко вернецца. Наняў пан таго хлапца ўдальца, даў за яго дзіеду сто рублёў да й панёс дагасподы. Паказаў пан яго пані, а тая дзівіцца й з рук яго не пускае. От сабраў пан мнуого гасцей, каб яны падзівіліса на таго хлапчука. Сіелі яны за стуол. Віедамо паны, пъюць, едзяць, балююць сабіе да дзівяцца, як хлапчук скачэ на сталіе. От скакаў ён да скакаў паміж таліерак, потым ускочыў да давай скакаць на паньськіх лысінах. Крычаць паны да абганяюць яго як мух. Але ён скачэ, бы скуочка ат аднаго пана да другого, ат аднаіе пані ці панёнкі да другоіе. Спалохаўса пан да й прагнаў

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ягò з сталà на дуол. От размаўляюць сабіе паны да пàні а туом, а сём, а хлапчỳк ціхенько забрàўса к пàні пад сỳкню да й давàй там слыкатàць. Рагòчэ пàні, аж пỳкаецпа ат сміеху, а ўсіе пазірàюць да дзівяцпа, чагò янà рагòчэ. Ужэ дỳмалі янỳ, што янà памешàласа. Алè ось пàні схапіла сваю сỳкню да й задрàла яіе да вèрху, каб абараніцца, бо янà дỳмала, што там мыш. Алè ось аттỳль вỳскачыў той хлапчỳк. Абазліўса пан і давàй ягò чвàліць сабàкамі. Спусціль сабàк цыэлую свòру, яны за хлапчукòм, а той ускòчыў на катà да й трымàецца за шэрсць. Сабàкі за катòм, а той ускòчыў на дзèраво, з таго на другòе да за плот і ўцёк у пòле. Саскòчыў хлапèц маладзèц з катà, абернỳўса верабъём да й прылецієў к бàцьку й матцы. Рàды старыіе, што сын вернỳўса дамуоў і не знàюць, чым ягò паціешыць. От бàба спеклà яèчню, наварыла сàла да й частỳе сынкà, бы гòсця, а ён дзюбанỳў крыхỳ да й гòдзі, бо віедамо, куолькі ямỳ трэ, мо меньш як верабъю. Алè старый кàжэ: ось мы паіедзем у міесто, нехàй ён сам сабіе выберэ гасьцінцы. Сказàў старый да запруог сваю кабылку да й паіехаў з хлапчукòм купляць ямỳ гасьцінцы. От іедуць янỳ да й сустракàюць якогòсь пàна. Хлапчỳк і кàжэ бàцьку: я абернỳса вỳжлам, ты прадàй менè пàну, туолькі не аддавàй ланцужкà, та я зноў вернỳса. Перакінуўса ён, абернỳўса вỳжлам да й бежыць за вòзам. Убàчыў пан, што гэто вèльмі харòшы вỳжал да й прыстàў к старòму, — прадàй да прадàў. Злупіў старый з пàна за вỳжла дòбрые грòшы, зняў ланцужòк да й аддàў. Туолькі трòхі адъіехаў пан, аж з лòму вỳскачыў зàяц. Вỳжал за тым зàйцам цèраз палянку да ў кусты, да ў ліес і прапàў. Зваў, зваў пан, шукàў, шукàў вỳжла, а таго й сліед прастыў. Не так ямỳ шкòда грòшэй, як тагò сабàкі, алè нічòго не парàдзіш, — паіехаў сваèю дарòгаю. Тым чàсам вỳжал дагнàў старòго, обернỳўса хлапчукòм да й седзіць на вòзе. Ось прыіехалі янỳ ў міесто, вỳбраў сабіе хлапчỳк дòбрую адзèжу, бòты да шàпку й накупіў усягò, што трэ хлòпцу. — На што табіе такàя вялікая адзèжа? — пытàе бàцько сына, — калі ты сам ось які малèнькі, — пакàзвае старый свуой міезены пàлац. Тут сын абер-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

пу̀уса ў такòго малайцà, што ту͡ольки ў кàзцы сказàць. Убрàўса ён у тỳю адзèжу, накупіў бàцьку й мàтцы ру͡озных падàрункаў, да й па͡іехалі яны̀ да гаспòды. Хỳтко вы̀сватаў ён сабі͡е сàмую гòжую дзі͡еўку, а за не дòўгім чàсам яны̀ й пабрàліса. Спрàвілі бацькі̀ сваймỳ сы̀ну вèльмі гỳчнае весі͡ельлье да й пачалі̀ балявàць. Аж ось і прыхòдзіць на весі͡ельле той сàмы стàрац, што парàіў бàбе пасьціць дванàнцаць пъятніц. Пазнàла ягò бàба да й злекàласа. — Не бу͡ойса, бàбко, — кàжэ стàрац, — а закажы̀ другі̀м, каб яны̀ пъятніцу пасцілі да паважàлі, а сам і знік. Мо пъянỳй бàбі͡е тòе прычỳдзіласо, а мо й прàўда. Дак от якòе здарэне.

Лявỳ͡он Лебедзік.

Чудзін.

9. Нехàй так бỳдзе.

Служы̀ў сабі͡е ў ваднагò гаспадарà малады̀ да вèльмі ўдàлы хлòпец. З малèнства астàўса ён сіратòю да так і вы̀гадаваўса на чужы̀х лю̀дзях. Ця̀жко былò ямỳ служы̀ць, ця̀жко глядзі͡ець у чужы̀ рот да чакàць, пакỳль і ямỳ дадỳць асỳшак хлі͡еба, ці пагры̀сці якую̀-нèбудзь ку͡осьць. Нарэшце ён пачàў служы̀ць у ваднагò вèльмі багàтага гаспадарà. А ві͡едамо, калі̀ мужы̀к багàты, та ён гары͡эй пагàны да скупы̀, а калі̀ не сам, дак ягò жу͡онка. Лі̀хо былò тамỳ пàрабку ў багàтага гаспадарà, да нехаці͡еласо ягò пакідàць, бо ў ягò былà вèльмі гòжая дачкà, што так спадабàласа, як ніхтò на сьві͡еці. Як ні ця̀жко пàрабку, як не і͡есь ягò, не піліць пагàная гаспады̀ня, а ён слỳжыць, рòбіць дзі͡ело бы чòрны ву͡ол да яшчэ грàе на скры̀пацце, ці паè сабі͡е так гòжэ, што ту͡олькі заслỳхацца. І закахàласа ў ягò хаджàйськая дачкà. Ві͡едамо, маладòсь, не лядзіць па тòе, што бàцько да мàці не аддадỳць яі͡е за безду͡омнага парабчукà, ў катòрага й партòк сваі̀х німà, а лядзі̀ць на ўрòду да слỳхае ягò пі͡есьні, ці йгру на скры̀пцы. От злюбіліса яны̀, да тòяцца ат бацьку͡оў, — баяцца, каб тые не прагнàлі пàрабка. Сустры͡энуцца яны̀ на йгры̀шчы,

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ці абыдзіе пры людзях, дак дзеўчына таго парабка к сабіе й блізко не падпускае: чмыхане да й атвернецца. Алеш кажуць, што шыла ў мешку не схаваеш, так і кахане людзі заўжды пранюхаюць. От пашлі бабы сакатаць, што багача дзіеўка любіцца з тым парабкам. Дачуласа маці да й пачала ў яіе дапытоўвацца. Круціла дзіеўка, круціла, а нарэшце й прызналаса мацы. Яна думала, што матка не вораг ля свайго дзіцятка, да й ашукаласа: тая сказала бацьку. А ён быў вельмі хітры мужык. Нічого ён не сказаў дзіеўцы, а штось задумаў. Мо цераз тыдзень, ці цераз два пасылае ён парабка на плыты — мо аж у самы Кралевец. Цяжко парабку раставацца з дзеўчынаю, але німа чаго рабіць, трэ слухаць, бо як наняўса, дак бы запрадаўса. Пагнаў ён плыты да й узяў з сабою сваю скрыпачку. Гоніць плыты, утоміцца, от ён сядзе на калодзе, пайграе трохі, дак і сам аддыхае, да й у другіх ульє сілы. От і зноў яны хопяцца за работу, дак плыты бегуць уперад, туолькі бурчаць. Хучыэй усіх загналі яны сваіе плыты, а за тое далі ім буольш грошэй. І пачалі яны купаваць сабіе гасьцінцы: хто шапку, хто чобаты, хто пояс, хто люльку, ці што другое, а той хлопец пашоў на кірмаш, сустрыэў там вельмі біеднаго старца да й аддаў яму ўсіе сваіе грошы. Падзякуваў той да й кажэ: бачу, што ты й сам біедны, а не пашкадаваў мніе даць апуошняе, дак за тое я дам табіе, што я маю. От муой саколе, што-б ты ні рабіў, ці неўбачыў, да як скажэш — нехай так будзе, та яно гэ й зробіцца. Падзякуваў той парабак за добрае слово да й пашоў да гасподы.

Тым часам пакуль ён гнаў плыты, гаспадар хучыэй намовіўса з жуонкаю да й пачалі та просьбаю, та гросьбаю прымушаць сваю дачку, каб яна йшла замуж за таго багача, што пачаў заляцацца. Што яна ні рабіла, як не ўбіваласа, чуць на себе рук не налажыла, нарэшце мусіла нібы згадзіцца, туолькі весіелле ўсе аткладвала, каб прыждаць свайго ненаглядняго да хаць яшчэ разік зірнуць яму ў вочы. Знаюць бацькі, што плыты хутко не пагониш, што парабак яшчэ не хутко вернецца, дак яны й не рабілі яшчэ ладу. — Нехай, — думаюць, — дзеўчына буольш па-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

знаёміцца з сваім жаніхом. — Ходзіць той да дзеўчыны кўожын дзень, носіць ёй уселякііе падарункі да ўсе наровіць, каб з ёю пераначаваць, але дзеўчына й слухаць не хочэ. — Нехай, — кажэ, — тагды, як косу расплетуць. — А сама й зальецца слёзкамі, лежыць у клёці да плачэ, аж разліваецца, а жаніх стаіць над клёцью кала дзверэй да просіцца, каб яна ўпусціла хаця ў кліець. От раз ён гэ стаяў кала клёці, аж той парабчук неспадзіенкі вернуўса да гасподы да хучыэй і пабіег у кліець да сваіе дзеўчыны. Зірнё ён, аж хтось стаіць; і падумаў ён, што гэто злодзей. — Ну, — думае, — стуой. — Да й кажэ ціхенько: нехай будзе так. Як туолькі ён гэто прамовіў, дак той багач і прыліп да клёці, баццэ прыруос. Нарабіў парабчук крыку, збіегліса людзі, пачалі таго багача атрываць ат клёці, да нічого не парадзяць. Даў буог дзень, пашлі бацькі прасіць папа, каб прышоў з сьвятою вадою да пакрапіў таго жаніха, та мо яму атробіць. Прышоў пуоп зь дзяком туды. Паблагатаў, паблагатаў пуоп, пакрапіў сьвятою вадою да й узяўса за таго багача, каб атарваць яго ат клёці, а парабчук ціхенько й шэпчэ: нехай так будзе, от і пуоп прыруос. Дачуласа матулька, бежыць ратаваць папа да й сама прыстала к яму, бы прырасла. Сунуліса туды бацькі таіе дзеўчыны да хростная матка багача, але ўсіе там і засталіса. Дагадаліса людзі, што гэто ўдзіеяно да й пабіеглі па бабу-шаптуху, што ўселякііе чары атрабляда. Усхапіласа баба, зьліезла зь печы да хучыэй пашла туды. Кандыбала яна цераз грэбельку на загумечы на клацці, пасьлізнуласа да й упала ў воду. От яна, каб не замачыцца, падняла андарак да сарочку аж да поляса да й прыдзе. Зірнуў на яіе парабчук да шапнуў, — нехай так будзе, — дак баба й не мажэ апусьціць свуой падуол да так і кандыбае кала гумна. А ў гумніе чалавіек зсыпаў шуплям збуожэ, зірнуў ён праз варота да як убачыў тую бабу, што й сарама ёй німа, дак выскачыў з гумна да й пляснь шуплям бабу па азадку. — Нехай будзе так, — шапнуў парабак, от шупель і прыстаў да бабы. Рагочуць людзі з таіе бабы, аж пукаюцца да кажуць, што ось і невіеста прышла к таму багатаму жаніху. Націешыўса па-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

рабчу̀к да й адрабіў тòе. От пуоп і кàжэ бацькуом таіе дзеўчыны, што гэто буог пакарàў за тòе, што яны прымушàлі сваю дачку̀ йці зàмуж за нелю̀багo, — бо, — кàжэ, — туолькі там буог, дзіе любоў. — Па немàлум чàсе парабчу̀к і тàя дзеўчына пабрàліса да й зрабілі лад. Было̀ гу̀чнае весіельле, ўсіе веселіліса да рàдуваліса, на маладых глядзячы, туолькі адзін той багàты пу̀каўса ат злòсьці.

Лявуон Лебедзік.

Чудзін.

10. Чорт перарабі̀ў.

Было̀ гэто тагды, як ящчэ буог туолькі тварыў сьвіет. Зтварыў буог нèбо й зèмлю, наставіў ясное сòнейко, каб янò сьвецілo ў дзень да грыэло зèмлю й уселякае жыўèло да расьлі̀ну. Сьвіеціць да грыэе янò й рàдуе ўселякае стварэне. Схавàўса чорт ат сòнейка пад зèмлю ў пèкло да ціхенько й пазірàе аттуль. Але ось утамі̀ласо сòнейко за дзень да й спусціласо за зèмлю трòхі адды̀хаць, і стàло цёмно на землі̀, хаць ты воко вы̀каль. Бàчыць чорт, што на землі̀ стàло цёмно, вы̀лез ён з пèкла да й пашòў перараблÿць тòе, што буог зрабі̀ў. Ідзè ён праз ліес, вываро̀чвае дзераўлякі да грабè ат злòсьці лàпамі зèмлю й павыгрыэбаў ямы да панасыпàў гуоркі. Пабіегла вадà ў ямы, от і зрабі̀ліса там выжары, пèлі да такàя тхлàня, што й не праліезьці. Трàпіў ён у дзèраве слèпат, паглядзіеў, што пчòлы збірàюць мёд на патрэбу лю̀дзям, да вуоск на хвàлу бòжую, от ён наплевàў у дуплè, дак аттуль і вы̀сыпалі шаршні̀ да вòсы да й пачалі̀ ягò рыэзаць, пачалі̀ слепі̀цаю ліезьці ў вòчы. Схапіў ён жмèню віецця, ашмаргну̀ў лісьце да давàй махàць, давàй абганяцца ат шаршнёў і вуос. Як марськанè ён руоскамі, дак і паразсекàе шаршнёў і вуос на друобныэ кускі̀, а з тых парабі̀ліса мòшкі, камары̀ да ўселякі гнюс. Грызè ён чòрта, аж на ём шку̀ра пу̀каецца. Абганяўса ён, абганяўса, вы̀скачыў на пòле да давàй хватàць да сыпацца пескòм. Пàдае песòк на зèмлю, а зь ягò й прарòстаюць уселякіе пагàныіе

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

зельй. Так насіеяў ён гэстаіе пошкудзі па ўсёй землі, але ніельга яму абаранііцца ат гнюса, от і схаваўса ён у воду да й зрабіў сабіе там лагво. Пагнаўса гнюс за чортам, лётае над вадою, але не мажэ яго аттуль выкурыць. Паседзіеў чорт там да й запаганіў усю воду, пакуль людзі не пачалі свяцiць яіе да выганяць аттуль чорта. Убачыў буог, што зрабіла паганая сіла, пашкадаваў, што сатварыў туолькі адно сонейко, каторае немажэ заўжды сьвецiць на нёбе, да й даў яму на помач міесяц, каб ён сьвеціў у нуочы. Убачыў тое чорт да й думае сабіе: пачакай-жэ, я яго згрызу ці саўсім скіну зь нёба. Палецiеў чорт к міесяцу да й пачаў зь ім барукацца да грызьці яго зубамі. Грызе, грызе, от ужэ здаецца астаўса туолькі вузенькі агрызачак. Бачыць міесяц, што яму цяжко барукацца з чортам, от ён памаленьку ўсе атступае к сонейку, каб яно абараніло яго ат чорта. Тым часам чорт от ужэ здаецца пракаўтне й апуошні агрызак міесяца, як той падыдзе к самаму сонейку. Не вытрымае чорт сьвіету сонейка да й пусьцiцца наўцекача. Тым часам сонейко пахукае на міесяц, нагрыэе яго сваім бляскам, і той зноў памаленьку пачне ачуняць да абрастаць цiелам да йці на сваё міейсцо, каб сьвецiць у нуочы. Так заўжды міесяц дзьвіе недзіелькі расьце да набіраецца сілы, а дзьвіе недзіелькі барукаецца з чортом.

Лявуон Лебедзік.

Чудзін.

11. Сусіецкая справа.

Была адзін руок вельмі цяжкая зіма. Першы сніег выпаў скоро после Ўзьвіжаня да так і астаўса лежаць, а на Пакровы ўжэ стала сусім зіма. Да хвацілі, чуеце, такіе марозы, што хаць ты дванаццаць лысых лічы. Не было ні аднаіе адліегі, трымае траскун, куожын дзень такая кудаса, што хаць з печы не ліезь. На двуор ніельга паказаць нуос. Тут ужэ блізко Благавіешчанне, а гуры руоўно з харомамі. Не хапіло ў людзей ґаўяду сіена, бо ліецячко было кароткае да такое гарачае, што ўсе выгарало.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Сенажàці яшчэ пèрад Івàнам пачарнi͡eлi бы землỳ. Мо' яшчэ да калỳд стравiлi не то, што сi͡eно, алѐ ўсю заваляшчую салòму. Ужэ на Ўлàса лю̀дзi пазьдзiрàлi стры͡эхi на корм, алѐ нiчòго не парàдзяць,— гаўя̀до равѐ галòднае да хапàе сьнi͡eг. От пачалì лю̀дзi сi͡eкцi тòнкае вi͡eце, вазiць ягò зь лi͡eсу да давàць гаўя̀ду. От гэ бiлiса лю̀дзi, каб дачакàць цеплà да вы̀гнаць гòвядо на пàшу. Былì тут i багàтые лю̀дзi. Яны мi͡eлi мну͡oго сi͡eна дòма й у стажку͡oх на балòце, алѐ яны̀ не хацi͡eлi прадавàць, як iх нi прасiлi сусi͡eдзi, бо, кàжуць, i нам не хòпiць да весны̀. От аслабi͡eлi ў аднàго чалавi͡eка карòвы да ўжэ саўсiм здыхàюць з гòладу. — Пайдỳ, — дỳмае к багàтаму сусi͡eду Нiчы̀пару, папрашу хаць берэ̀ме сi͡eна. — Вi͡eдамо, — сусi͡eдцкая спрàва, — трэ памагàць у бедзi͡e адзiн другòму. От прышòў ён да й прòсiць: Нiчы̀пар, браткò, атступì хаць ахàпак сi͡eна, а то гаўя̀до дòхне. — Трэ̀ былò ў лi͡eтку завiхàцца, а не ў ценькỳ прахладжàцца, — кàжэ той. — У менѐ й сабi͡e не хòпiць. Усямỳ сьвi͡eту не надаѐшса, — замармытàў Нiчы̀пар, насỳнуў на вòчы шàпкỳ да й папъѐрса сабi͡e ў гумнò. Пастая̀ў той бi͡eдны чалавi͡eк, штось успаменỳў, яшчэ раз сказàў — сусi͡eдцкая спрàва — да й пацѐгса да гаспòды. Даў бу͡oг вѐчар, от ён цiхенько запру͡oг валу͡oў, паi͡eхаў на балòто, дзi͡e былà Нiчы̀пара сенажàць, наклàў ву͡oз сi͡eна да й прыплiшчыў даму͡oў. — Сусi͡eдцкая спрàва, — кàжэ ён сам сабi͡e, — нехàй бу͡oг прабàчыць.

Мо' прайшлò з ты̀дзень, прыхòдзяць к Нiчы̀пару лю̀дзi прасiць сi͡eна бы згаварыўшыса. — Ото-ж прыстаю̀ць бы смалà, — кàжэ ён сам сабi͡e, — атступì да атступì. Сусi͡eдцкая спрàва. А сàмi што рабiлi ўлi͡eтку? Чамỳ не накасiлi бу͡oльш? — Тут ён схаменỳўса, што даўнò не быў на балòце. — Трэ̀ паглядзi͡eць свайгò стажкà. А то лi͡eпш забрàць даму͡oў, а то яшчэ хто ўкрàдзе... Атступì. Трэ', каб да Юр'я было й у дỳрня. Алѐ ў менѐ пѐўне хòпiць i да Мiкòлы. А той стажòк трэ' забрàць. — I пашòў ён запрагàць валу͡oў.

Седзiць сабi͡e Нiчы̀пар разваліўшыса на сàнях да паганя̀е валу͡oў, а тут страчàе на дарòзе, як лю̀дзi згры͡эбаюць пòвалач

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

да складваюць у рэдзгіны, каб прынесьці дамуоў хаць ахапачак сіена. Нічыпар іедзе да туолькі пасміейваецца сабіе. — Ото-ж пазавідуюць сусіедзі, — думае ён, — як убачаць, што я везу зелёненькае сенцэ, бы рута. — От ён выехаў з ліесу на чыстае балото. — Атсюль павінно быць блізко да маіе сенажаці, — думае Нічыпар. — Але зімою мейсцовась так меняецца што й не пазнаць. А мо заблудзіўса. Але, здаецца, ніе. Эгэ-ж ніе. Ось і верба, а там куст лазы. Тут калодзісік, радам бабравіна. Онь і гаёк. Што за дзіво! Дзіе-ж муой стажок. Ой, кроўная гадзіна, куды-ж ён дзіеўса!? От Нічыпар супыніў валы, зліез з саней і пачаў шукаць тое міейсцо, дзіе павінен быць стуог сіена. Не доўго ён шукаў, цераз двадцать ці мо трыдцать крокаў убачыў ён туолькі куол, а сьцежар занесло сніегам. — Я-ж гуоркі да нешчасны, — закрычаў Нічыпар, — прапала-ж мая галуоўка! Гэто-ж укралі мае сіено. Да бадай-жэ цебе забралі немачы, да бадай-жэ ты выхвараў да выстагнаў!.. Мо' з паўгадзіны лаяўса да праклінаў Нічыпар таго, хто забраў яго сіено. Нарэшце кажэ: Пана клінуць, а ён таўсціее. — Плюнуў тут Нічыпар сабіе на бораду да й падышоў к сьцежару. Зірне ён, аж у анучцы к калу штось прыўязано. Адвезаў ён, аж там папіерак. Забраў ён той папіерак за пазуху да й папхаўса дамуоў з пустымі санямі. — Куды ты, Нічыпар, іезьдіў, што нічого не везеш? — пытаюць людзі. — Да от хтось, хварыэць яго матары, украў мае сіено на балоце. — Тут Нічыпар дастаў з-за пазухі папіерак да й дае чытаць. Нашоўса тут грамаціей, той самы біедны чалавіек, што прасіў у Нічыпара сіена, разгарнуў ён папіерак да й прачытаў: Мая жонка Варка. Касіць сіено было жарка. Я наклаў на вуоз да й паўез. Прывезьці была забава, бо гэто сусіецкая справа. — Эгэ-ж сусіецкая справа, — сказалі мужыкі да й пакаціліса ат сміеху. — Нічыпар, гэто-ж у цебе жуонка Варка, дак от табіе й зімою жарка. —

Лявуон Лебедзік.

Чудзін.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

12. Сьвяты чалавіек.

Жыў дауніей на землі сьвяты чалавіек. Жыў ён не то, што багато й не саўсім біедно, а так сабіе, як буог даў. Е хліеб, та іесь, а немашака, та й так абойдзецца. Жыў ён у вёсцы на самум канцы. Хто ні йдзе, та к яму заходзіць на нач. Усіх то ён прымае, добрым словам прывітае, накорміць, напоіць, чым мае, часам квасам, а часам вадою, да не бедою. Паважаюць да кахаюць яго старцы ўбогіе да людзі падаруожные, бо любіць увесь сьвіет лагуодны прывіет. Прышоў к яму раз убогі старэнькі храменькі, пасілкаваўса, переначаваў да й збіраецца ў дарогу. — Аддыхай, божы чалавіечэ, — кажэ яму той сьвяты чалавіек, — даў буог недзіельку, пуойдзем у цэркву. — Падзякуваў той старaць да й астаўса. Пашлі яны разам у цэркву маліцца богу, пакуль баба згатовіць абіед. А цэркаў была за ракою. Віедамо, якіе на ўесках масты: зімою буог мосьціць, а ў ліетку вада высыхае, та й бруодзькі муожна перайці. Падышлі яны к рацыэ да й спускаюцца з берага к вадзіе. Пляснуў старац па вадзіе сваёю кавенёю, от вада й расступіласа да самаго дна. Перайшлі яны па сухому дну на другі бераг, от і пазнаў той сьвяты чалавіек, што гэто не просты старац, а святы ўгуоднік божы. От ён пакланіўса яму да самаіе зёмлі да й кажэ: — я бачу, што ты сьвяты угуоднік божы, не стою я таго, каб разам з табою йці ў божую цэркву. Ідзі ты адзін, а я хацяў пастаю ў дзверах. — За тое, што ты такі ціхі перад богам і перад людзямі, даў табіе буог муоц— сказаў той старац і зьнік. Уліез той святы чалавіек у цэркву адзін, памаліўса Богу да й хаціеў іці да гасподы, туолькі зірнуў ён у вадзін вугал, аж там стаіць два страшэнных чартуоў; трымаюць яны валовую шкуру да запісваюць на ёй тых людзей, што ў цэркві не моляцца з шчырым сэрцам, а думаюць пра сваю гаспадарку й тым грыэшаць богу. Падышоў ён к чарцям, а тые як атскочаць ат яго, дак чуць не парвалі тую шкуру. Перахрысціўса ён да й вышаў з цэркві. Ідзе ён кала людзей, здымае пе

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

рад імі шàпку да ківàе галавòю, як заўжды вітàўса, алè тые ягò не бàчаць і йдуць сабі͡е, быццам тут нікòго немàшака. Здзівіўса ён і пашòў к рацы͡э. Падышòў ён к вадзі͡е й хаці͡еў брысьці ўбру͡од, алè нòгі йдуць па вадзі͡е, бы па лёду. Прышòў ён даму͡оў саўсім сухì. Здзівілаcа жу͡онка, чамў ён сухì й дзі͡е ён быў, чамў не хадзіў у цэркву. Сказàла янà аб ту͡ом сусі͡едцы, а тàя другу͡ой, другàя трэйцюй. Так зàрас даві͡едаласа ўся ўёска, што святы чалаві͡ек перастàў хадзіць у недзі͡ельку ў цэркву. Прайшлò так мо' ку͡олькі недзі͡ель і пачалì людзі казàць, што мàбыць гэто гры͡эшны чалаві͡ек, калì мы нікòлі не бàчым, каб ён хадзіў у цэркву маліцца бòгу. А ён як хадзіў, так і хòдзіць, ту͡олькі ну͡ог не мòчыць да й ніхтò ягò не бàчыць. От прыхòдзіць гэтак ён у цэркву да й зноў бàчыць, як чэрці запісваюць люцкìе грахì на валòвуй шкуры. Сьпісàлі яны ўсю валòвую шкуру, а ўсіх граху͡оў немòгуць зьмі͡есьціць, от давàй яны расцягваць тую шкуру. Учапіліса яны за шкуру рукàмі й зубàмі да й цягнуць з усìх сіл той к сабі͡е, а той к сабі͡е. Як напьяўса адзін чорт, дак не вытрымаў і зрабіў пшык. Пачўў тòе святы чалаві͡ек да як зірнўў, як чэрці крыўляюцца, пнуцца ат натўгі да аж прысядàюць да залупліваюць хвасты, дак такì ягò апанавàў сьмі͡ех, што не вытрымаў да й усьміхнўўса сабі͡е ў бòраду. Мо' гэто чарты зрабілі знару͡ок, каб спакусіць сьвятòго чалаві͡ека. От ту͡олькі ён усьміхнўўса, як адзін чорт шамеляг да й запісàў ягò на валòвуй шкуры. — Ну, — дўмае святы чалаві͡ек, — такì папàўса на зўбы гэстуй пòгані. — От вышаў ён з цэркві, пачàў сустракàць знаёмых людзèй да вітàцца з імі, тые здымàюць шàпкі да й пытàюць аб здарòвейку. — А мы цебè, — кàжуць яны, — даўнò не бàчым у цэркві. Мы дўмалі, што ты захвары͡эў. — От падышòў ён к рацы͡э, пачàў перахòдзіць цèраз яі͡е ўбру͡оцькі да й замачыўса нèмаль па сàмы пòяс. Дагадàўса ён, што гэто саграшыў Бòгу тым сьмі͡ехам. Зірнўла бàба, што ён увèсь забрындàўса да й дагадàласа, што пèўне хадзіў у цэркаў. Шапнўла янà аб ту͡ом сусі͡едцы, тàя другòй, другàя трэйцюй і хўтко нèмаль уся ўёска загаварыла, што святы чалаві͡ек дзесьвіцелно святы, бо зноў хòдзіць у цэркву. Ві͡едамо,

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

лю̀дзі зàўжды ту͡олькі тагды̀ лі̀чаць чалаві͡ека сьвяты̀м, як ён саграшы̀ць, бо сэрцэ чалаві͡ека — пацёмкі, ягò сòвесьці ніхтò не бàчыць, апры̀ч бòга

Лявуо͡н Лебедзік.

Чудзін.

13. Упàртая жанчына.

Былì ў бàцькі да ў мàткі тры дачкì; дзьві͡е ўдàлыі͡е да старэнныі͡е, а трэйцяя хаць гòжая як мàкаў цьві͡ет, алè такàя леніваая да сварлівая, што мо' такòі͡е й сьві͡ет не бàчыў. Набралìса зь èю бацькì клòпату: ні ў лю̀дзі не аддàць, ні ў себè дзержàць. Ві͡едамо, якì гэто тавàр, што як сьві͡ежаго не прадàў, та лі͡епш бы й не маў. Падрасьлì ўдàлыі͡е дзеўчàта, дак іх наперабуо͡й пачалì свàтаць да й пабрàлі зàмуж. А тàя ўпàртая дачкà асталàса седзі͡ець у бацькуо͡ў на кàрку. Алè яшчэ гары̀эй усягò тòе, што зь èю німà нія̀каго злàду, што зхòчэ, тòе рòбіць, а не зхòчэ, дак бы тàя наравістая кабы̀ла, што ні ўзад, ні ўпèрад. Нагаравàліса зь èю бàцько з мàткаю, алè нічòго не парàдзяць, бо, ві͡едамо, сваè дзіця̀ не кацянѐ, — за плуо͡т не вы̀кінеш. Седзіць янà ў дзі͡еўках, а ніхтò й не дўмае пасылàць к ёй сватуо͡ў, бо ўсеі͡е дòбрэ даві͡едаліса, якàя гэто цàпа. Туо͡лькі ось быў там адзìн багàты да вèльмі харòшы чалаві͡ек. Ён рàно аўдаві͡еў, алè не жаніўса другі раз, бо вèльмі муо͡цно кахàў сваю̀ жуо͡нку. Быў у ягò адзìн-адзінюшаньки сын, гэтак дзецю̀к гадуо͡ў пъятнàнцаці, ці мо' й буо͡льш. От і дўмае бàцько, — нехàй ужэ падрасьцè сын да жэніцца, та й бўдзе ў нас хаджàйка, а я й так дабўду ві͡еку. — Вы̀рас сын, ужэ парà-б ягò й жанìць. Гòжы хлòпец; паслушны̀, старэнны, да не хòчэ малады̀м жанìцца. Ягò равèсьнікі ту͡олькі тòе й рòбляць, што дрàжняцца з дзеўчàтамі, а ён туды̀ й не пазірàе. А дзеўкì дўжа любілі ягò, хаць ён іх не чапàў. Пачалì бàбы сакатàць, што за тагò хлòпца пуо͡йдзе сàмая лі͡епшая дзі͡еўка, абы̀ туо͡лькі ён яі͡е браў. Кèпсько жыць без гаспады̀ні, бо прàўду-ж кàжуць лю̀дзі, што гумнò плàчэ без гаспадара, а хàта без гаспады̀ні.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Ї пачàў той чалаві͡ек гаварыць сыну, каб ён наглядàў сабі͡е дзі͡еўку. — Я ўжэ даўнò наглѐдзяў, — аткàзвае сын, — ту͡олькі баюса, што ты, бàцько, не схòчэш. — А той дўмаў, што сын выбраў сабі͡е харòшую дзі͡еўку да й кàжэ: — Чамў я не схачў? Табі͡е, сынòк, с жу͡онкаю жыць і ві͡ек векавàць, а не мні͡е. Выбірàй, якàя люба, а я цебѐ змушàць не бўду. — Ну, дак от, бàцько, пасылàй свату͡оў к ту͡ой дзі͡еўцы, што ўсі͡е люддзі цурàюцца. — Здзівіўса той чалаві͡ек, алѐ німà чагò рабіць, — згадзіўса на выбар сына, алѐ ўсе-ж дўмае, атгаварыць сына, каб ён не рабіў глўпства. — А ты ві͡едаеш, якàя янà наравістая? — Ві͡едаю, затым і хòчу яі͡е ўзяць, бо наравістыі͡е сьві͡етам ўладàюць, а паку͡орныі͡е да ціхіі͡е нікòлі шчàсьця не мàюць. — А ці-ж ты з ѐю саўладàеш? — Людзі й медзьвѐдзя вўчаць. — Медзьвѐдзя вўчаць, алѐ-ж вѐльмі мўчаць. — Німà чагò бòльш казàць, пашòў той чалаві͡ек у прòведы. Прыхòдзіць ён к бàцьку таі͡е ўпàртаі͡е дзі͡еўкі да й кàжэ: так і так, му͡ой сын хòчэ з ѐю пабрàцца. — Што ты гавòрыш, дòбры чалаві͡ечэ? За твайгò дзецюка пу͡ойдзе сàмая лі͡епшая дзі͡еўка, а мàя гультàйка ту͡олькі такàя ўпàртая, да наравістая, што з ѐю ён нічòго не парàдзіць. Ён малады хлòпец, ад бòга грыэх ямў сьві͡ет заўязваць. — Калі-ж ён сам тагò хòчэ. — Мàло, што блазны хòчуць, а нам імі трэ кіравàць, бо бу͡ог нас запытàе, які мы дзі͡ецям далі спòсаб. — Пачўла з-зà печку тàя дзі͡еўка да й кàжэ: — А я пайдў за ягò, бо ён гòжы хлòпец. — Маўчы, дурнàя! — крыкнуў на дачкў бàцько да й кàжэ тамў чалаві͡еку: — От скажы ты сваймў сыну, што калі ён саўладàе з маѐю нарàвістаю жарабіцаю, та мо' саўладàе й з гэстаю упàртаю дзі͡еўкаю, тагды нехàй берэ. — Пашòў той чалаві͡ек і ўсе расказàў сыну. — Дòбрэ, — кàжэ сын, — я спрàўлюса з тòю жарабіцаю. От пашòў ён к тамў чалаві͡еку, зірнўў на тўю жарабіцу, аднòж янà стаіць у зрўбе без вару͡от да ту͡олькі храпѐ да капытàмі грабѐ зѐмлю. Ніхтò к ёй падступіцца не мажэ, а кòрм і вòду ту͡олькі спускàюць цѐраз верх. От той хлапѐц закінуў жарабіцы на шыю петлю, зацёг верòўку да й запру͡ог жарабіцу ў сàні. Прывязàў ён на сàні млынавы кàмень, сі͡еў сам да й па-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

пёр жарабіцу па ралі. А дзі͡ело было̀ па лі͡ету. Ры͡эжуць палазы̀ зѐмлю бы паро̀шу, жарабіца несѐ, лецiць бы мала̀нка, а хлапѐц яшчэ̀ пу̀гаю паддае ёй ахво̀ты. Насіла яна̀, насіла па ралі, спаці͡ела, аж шум з яі͡е куска̀мі па̀дае, нарэ̀шце ста̀ла така̀я мья̀кенькая, што хаць дава̀й дзіця̀ці, дак і то̀е паі͡едзе. — Ну, зду͡олны ты хло̀пец, — ка̀жэ той чалаві͡ек, — дак пѐўне спра̀віссай з маѐю дачко̀ю. — Пабра̀ліса яны̀, спра̀вілі весі͡елейко, алѐ ось захвары͡эў ба̀цько маладо̀го да праз ты̀дзень і памёр. Пагарава̀ў сын, патужы̀ў, алѐ з бо̀гам не паспо̀рыш. Ён ві͡едае, што ро̀біць. Пахава̀ў ён ба̀цька да й дава̀й пра̀віць гаспада̀рку адзін з маладо̀ю жу͡онкаю. Клапаціцца ён цы͡элы дзень, ро̀біць за двох, а прыдзѐ да ха̀ты, дак там німа̀ ні абі͡еду, ні куска̀ хлі͡еба, сьмі͡еце не вымецяно, ў пѐчы не па̀ляно, каро̀вы раву̀ць, сьвіньне скрыгі̀чуць, хаць беры̀ да й уцека̀й. А жу͡онка седзіць сабі͡е да глядзіцца ў ідэлко, ці го̀жая. Маўчы̀ць ён да ўсе ро̀біць сам. А ёй ту͡олькі то̀е ї трэ̀ба, — наі͡есца гато̀ваго да й кача̀ецца па палу̀, ці прастары͡экуе з языка̀тымі жанка̀мі. — Кѐпсько, — ду̀мае гаспада̀р, — гэ нѐ бу̀дзе ніякаго ладу̀, бо, ві͡едамо, гаспада̀р без гаспады̀ні не чалаві͡ек, а паў чалаві͡ека. — І дава̀й ён прывуча̀ць да заахво̀чваць да рабо̀ты гультаева̀тую жу͡онку. Алѐ чаго̀ ён ні рабіў, нішто̀ не памага̀е, бо жу͡онка не цiка̀віцца гаспада̀ркаю, а ўсе наро̀віць, абы̀ ёй наі͡есьціса да палежа̀ць. Даў бу͡ог недзі͡ельку, от і ка̀жэ гаспада̀р: — хадзі͡ем к ся̀бру ў го̀сьці. — Хадзі͡ем, — адмаўля̀е жу͡онка да й пачына̀е апрата̀ць на себѐ лі͡епшае пла̀цьце. Сабраліса яны̀ да й пашлі. Ся̀бер жыў у сусі͡еднюй вёсцы мо' за версту͡оў дзьві͡е, або̀ тры. Трэ̀ба было̀ ім іці праз лі͡ес. Уба̀чыла жу͡онка ў лі͡есі я̀гадкі да й пачала̀ іх рваць. Рве да сыпле сабі͡е ў рот. Атышліса яны̀ ат даро̀гі ў гушчэ̀чу, жу͡онка й закружылаcа да й неві͡едае куды̀ йці. От гаспада̀р пасадзіў яі͡е на муравѐйнік да й ка̀жэ: — паседзі тут, а я пашука̀ю даро̀гі. — Ту͡олькі маладзіца сі͡ела на муравѐйнік, як мура̀шкі налі͡езлі к ёй пад андара̀к да дава̀й ры͡эзаць за што папа̀ло. Яшчэ̀ мо гаспада̀р атышо̀ўса на паўгану͡оў, як яна̀ падняла̀ крык, што бло̀хі куса̀юць. Верну̀ўса ён, залупіў жу͡онцы андара̀к на го̀лаў да й звеза̀ў яго̀

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

вероўкаю, а канцы вероўкі прывезаў к хвоі. Тупае жанчына па муравейніку да яшчэ гарыэй дражніц мурашак, а тыіе секуць упартую бабу да палівающь сваім спірытусам. Раве яна ніемым голасам. — Такі й сякі, атвяжы мене да ратуй, а то я жыва не буду! — А ці будзеш мене слухаць да гаспадарку даглядаць? — Хачу — буду, хачу — ніе, — атказвае яна да круціць задам. — Ну, та нехай цебе тут мурашкі вучаць, як трэба дзіело рабіць, каб на сьвіеці жыць. — А сам атышоўса да й збірае ягадкі. Круціласа яна, круціласа, але нарэшце не мажэ вытрымаць да й кажэ, што будзе й варыць, і печы, прасьці й ткаць, шыць і мыць да й гаспадарку даглядаць, а яго слухаць да шанаваць. От закляласа яна да забажыласа, што пакіне сваё гультайство да нораў. Туольки тагды атвезаў ён яіе ат дзэрава да аслабаніў голаў. Падаўеў гэто ён яіе к выжару, да й веліеў уліезьці ў воду. Стала жуонка мяккая, хаць ты яіе у вухо ўлажы. От абмыла яна мурашак, да й пашлі яны да гасподы. С таіе пары людзі не надзівяцца, што гэто стало з маладзіцаю, што яна й гнуой возіць і разьбівае, не то, што жне, але й косіць. Гаспадар яшчэ сьпіць, а яна ўжэ каровы падоіць, у печы выпаліць, стравы наварыць да й будзіць яго сьніедаць. Дачуўса аб туом яіе бацько, прышоў к дачцы ў госьці да й дзякуе зяцю, што наўчыў яго дачку, як буог веліеў на сьвіеці жыць.

Даніло Куліеш.

Чудзін.

14. Мужык, цыган і жыд.

Жыў сабіе адзін мужык. Ён не то, што-б быў вельмі багаты чалавіек, а так сабіе сякі-такі гаспадар. Гараваў да працаваў круглы гуод, дак і міеў кавалак хліеба да й асьмакі на беду. Не слухаў ён людзей, што тыіе кажуць: як буог пашле напасьць, та грошы чорт дасьць. Не слухаў, а зьбіраў грошык да грошыка да й хаваў у стрыэху. Панадзіўса к яму хадзіць цыган. Віедамо, цыгану заўжды мнуого часу, ён куожын дзень ходзіць у госьці.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Дзіе баба пачастуе кавенёю або міешалкаю, дзіе гаспадар сперажэ пугаю, або сьвісне цыэпам, а яму хаць-бы што, — сьлепіцаю ліезе ў вочы. — Дай, батю, сало, каб цебе ліхо не знало. Дай, хаджаячка, круп, каб здарова была, як дуб. — Напрыкрае добрым людзям, дак тыіе, каб аткаснуцца, й дадуць цыгану штонебуць, а ніе, дак ён і сам возьме. — У цебе, хаджаячка, мнуого, а ў мене німа. Падзіелімса, бо буог дае на ўсіх долю. — Ото-ж прычапіўса, хварыэць тваёй матары, — крычаць жанкі да й сунуць цыгану атчапного блінцуоў, ці аладак, а каўбасу да пуодмазку ён і сам схопіць. Прыходзіць раз цыган к таму чалавіеку да й кажэ: — От, батю, я табіе прыўеў руой пчуол; абірай да садзі ў вулей, — нехай будуць палавічныіе. — Зірнуў чалавіек, аж сапраўды ў садочку зьвіўса руой пчуол. Не знае таго чалавіек, што той руой вышаў з яго вулья. От абабраў ён руой да й пасадзіў яго ў свуой вулей. — Цепер мы сябры, — кажэ цыган. — Але-ж сябры. — Ну, дак частуй, батю, сябра. — Пачаставаў мужык цыгана раз-другі да й пытае: — А калі-ж ты, сябрэ, мене пачастуеш? — Пачакай, пачастую, як вырастуць у мене грошы. — Гамоняць яны тое, але й не бачаць, што тут ціхенько падышоў жыд да й слухае, бо ўчуў, што яны гаворапь пра грошы. — Ну, вазьміеце мене ў хаўрус. — Чаму-ж ніе, — кажэ цыган, — сябра поле, а тваё пасіеньне, а я буду зьбіраць. Што зародзіць, та падзіелім паруоўну. — Рэхт, — кажэ жыд. От прынёс жыд цыгану да мужыку жменю асьмакуоў. Пабаранаваў мужык у вагародзе да й пасіеяў тыіе асьмакі, а цыган і кажэ: — сябрэ, ці нема ў цебе буольш? — Дастаў мужык з страхі сваіе асьмакі да й пасіеяў там-жэ ў вагародзе. Пашоў дож, прыплескало тыіе грошы да вымыло, дак яны й блішчаць. Пазваў цыган жыда да й пашлі ўсіе яны разам зьбіраць тыіе грошы.Назьбіралі цыэлую шапку, прынеслі ў хату да й пачалі дзеліць. Бачыць жыд, што яму досталосо грошэй буольш, як тры жмені, загарыэліса ў яго вочы, от так стаіць і трасецца поганъ, бы асіна. — Ну, цепер зрабілі прахтыку, давайце сіеяць буольш.— Рад жыд, аддаў тыіе грошы да прыдубіў яшчэ цыэлы мешок,

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Пасі͡еяў мужы́к ты͡іе гро̀шы, а цыга̀н сі͡еў на агаро̀дзе вартава̀ць іх, каб ку̀ры не паклева̀лі. Пу͡ойдуць лю̀дзі на рабо̀ту, а цыга̀н пілну̀е да зьбіра̀е сабі͡е ты͡іе гро̀шы. Так усі͡е й пазьбіра̀ў. Прыбега̀е жыд да й пыта̀е: — Ну, сто, гро̀сыкі ўзыслі̀? — Ні͡е, яшчэ̀ не ўзышлі̀, бо вѐльмі засушы́ло. Неха̀й, ось пру͡ойдзе дож да прыгры͡эе со̀нейко, дак яны̀ пу͡ойдуць расьці̀, бы на дро̀жджах. Чака̀ў, чака̀ў жыд, паку̀ль узы́дуць гро̀шы да так і не дачака̀ўса. Дагада̀ўса й мужы́к, што абману̀ў яго̀ цыга̀н, надава̀ў яму̀ ў ка̀рак да й вы́гнаў з вагаро̀да. З тых ча̀саў і німа̀ ў мужыка̀ сяброўства̀ з цыгано̀м.

Даніло Кулі͡еш.

Чудзін.

15. Дзі͡еўкі й чорт.

Жыў сабі͡е адзі̀н чалаві͡ек. Ён ра̀но заўдаві͡еў і аста̀ўса ту͡олькі з малѐнькаю дачко̀ю. Прыго̀жая да зда̀тная на ўселя̀кую рабо̀ту была̀ сіру͡отка, алѐ, ві͡едамо, дзіця̀, — не мажэ̀ ўпра̀віцца ў даму͡оўцы, не то, каб яшчэ̀ даглѐдзяць гаспада̀рку. Ду̀маў, ду̀маў чалаві͡ек да й наду̀маўса жані̀цца ў дру̀гаі͡е. Запрабава̀ў ён пасва̀тацць сабі͡е дзі͡еўку, алѐ куды̀ там, — жу͡одная не хо̀чэ йці̀ за ўдаўца̀. Німа̀ чаго̀ рабі̀ць, пача̀ў ён шука̀ць удаву̀. Алѐ бездзі͡етны͡іе ўдо̀вы выбіра̀юць сабі͡е хло̀пцаў да яшчэ̀ жва̀вых да го̀жых. Ї ўзя̀ў ён нарэ̀шце адну̀ ўдаву̀ да яшчэ̀ з дачко̀ю. Па нема̀лум ча̀се пашла̀ ў яго̀ ха̀це калатня̀ да сва̀рка. Дачка̀ жу͡онкі была̀ така̀я дзераза̀, така̀я языка̀тая да пага̀ная, што про̀сто бяда̀. Німа̀ таго̀ дня, каб яна̀ не скры́ўдзіла яго̀ дачу̀хны. Да й жу͡онка не ўзьлюбіла па̀ччарыцу, пачала̀ яі͡е зневажа̀ць да папіка̀ць, што яна̀ та то, та сё не так ро̀біць, як трэ̀ба. Ці̀сьне да пі̀ліць па̀ччарыцу, і͡есь яі͡е, бы йржа̀ жалі͡езо, а сваю̀ дачку̀ пі͡есьці̀ць да балу̀е. Пазіра̀е той чалаві͡ек, шко̀да яму̀ дачу̀хны, аж сѐрцэ кро̀ўю аблі-ва̀ецца, алѐ нічо̀го не пара̀дзіць з пага̀наю ба̀баю. От адзі̀н раз паі͡ехаў ён дзі͡есь далѐко тралява̀ць на рум дзѐраво да й замару̀дзіў там мо з ты́дзень. Тым ча̀сам до̀ма нема̀шака на хлі͡еб

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

мукі. От і пасылàе тàя жанчы̀на пàччарыцу на вадзяны̀ млын змалòць збу͡ожэ. Узвалìла тàя мешòк на плèчы да й папèрла ў млын. Ту͡олькі янà засы̀пала збу͡оже ў ку͡ош, як ось і падбегàе к ёй якìсь панічòк у капелю̀шыку. — Хадзì, красу͡отка, к нам на йгры̀шчэ, — прòсіць ён дзеўчы̀ну. — Як жэ я пайду̀, — аткàзвае янà, — калì я бòсая. — Я дам чаравìкі, — сказàў чорт. А гэто, бàчыце, быў чорт і намі͡ерыўса ён загубіць дзі͡еўку. Пàлеці͡еў чорт да й прынёс дзі͡еўцы гòжыі͡е чаравìкі. Абу̀ла янà чаравìкі да ўсе пазірàе на сваі͡е нòгі. — Ну, хадзі͡ем на йгры̀шчэ. — Ой, што ты кàжэш? Як же я пайду̀ ў чаравìках без панчу͡ох. Гэто-ж менè дзеўкì засьмею̀ць, скàжуць: якàясь прасталы̀тка. — Я дам панчòхі. — І пабі͡ег чорт па панчòхі. Паку̀ль ён бі͡егаў, дзі͡еўка й змалòла збу͡ожэ да й зсы̀пала муку̀ ў мі͡ех. Прынòсіць чорт панчòхі да й падганя̀е дзі͡еўку, каб янà хучы͡эй пераабувàласа. А янà пераабувàецца, бы мòкрае гары̀ць да ўсе пазірàе, ці ху̀тко дась бу͡ог дзень. Янà дагадàласа, якì гэто панічòк, алè бàчыць, што папàласа, дак трэ хітравàць. — Ну, цепèр дòбрэ, хадзі͡ем. — Што, ты кпіш, ці што? Як я пайду̀ ў бесі͡еду, калì ў менè спаднìца, бы зàткало. — Ну, гэто не бедà! Ду̀хам прынесу̀ табі͡е спаднìцу. — І пабі͡ег чорт з млынà. Тым чàсам засьпевàлі пеўні͡е. Рàда тàя дзеўчы̀на. От узвалìла янà на сьпìну муку̀ да чуць не бегòм папèрла да гаспòды. Зьдзівìласа мàчаха, што пàччарыца не загìнула на заклятум млыні͡е да яшчэ̀ аб таку̀ю пòру верну̀ласа даму͡оў. — Ну, што, гу̀нсват, змалòла збу͡ожэ? — пытàе янà. — Аджэ̀ змалòла, — аткàзвае тàя. Зірну̀ла тут мàчаха на пàччарыцу да як убàчыла на ёй такòе гòжаі͡е адзі͡еньне, дак аж рукàмі сплеснула. — Дзі͡е ты ўзелà гэстае плàце! — кры̀кнула янà. Тàя й расказàла, што на млыні͡е яі͡е пазвàў панìч на йгры̀шчэ танцавàць да за тòе падаравàў ёй у͡опратку. Сердзìта мàчаха, бы гадзю̀ка, аж пражэ̀цца, не мажэ̀ дачакàцца вèчара. — Отò-ж мая̀ дачу̀хна яшчэ̀ не такіі͡е дастàне шàты, — кàжэ янà да й пасылàе сваю̀ дачку̀ ў той млын малòць збу͡ожэ. Даў бу͡ог вèчар, і пашлà дзеўчы̀на ў вадзяны̀ заклятый млын малòць муку̀. Ту͡олькі янà прыпхàласа туды̀, як ось і падбегàе к ёй той сàмы панічòк і завè

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

на йгрышчэ з сабою паскакаць. А яна кажэ: — дай мніе самае гожае плаціце да чаравікі, та пайду. — Добрэ, дам, — атказвае чорт, да й пабіег ў карчму, дзіе была багатая жыдуовачка. От ён злупіў з яіе уопратку да й прынёс туой дзіеуцы. Апранулася яна да хучьіэй пашла на йгрышчэ. Вывеў гэто яіе чорт пад коло, дзіе мітусіцца вада, и здалосо ёй, што гэто там скачуць панэнткі, сунуласа яна туды да й загібла. Насілу на заўтрэ тая баба пазьбірала яіе куостачкі да шмацьце. А паччарыца выбрала сабіе гожаго хлопца да й пабраліса яны. Мо' й да тых час яны яшчэ жывуць, як усіе добрыіе людзі да хваляць буога.

Даніло Куліеш.

Чудзін.

16. Смачно.

Жыў сабіе адзін чалавіек. Быў ён не то, каб сказаць вельмі багаты, а так сабіе замуожны гаспадар. Так як усіе жыў ён сьціслo, а як дась буог сьвято, та любіў з добрымі людзьмі смачно паіесьці да выпіць так, каб іці, за плуот дзержаўшыса. Адзін раз паіехаў ён у міесто зь якімсь то панам, камуорнікам, ці што. Заіехалі яны ў карчму. Пан уліез у алькіерык і веліеў жыдуом падаць сабіе выпіць да закусіць. Віедамо, пан грошэй не шкадуе, выпіў гарыэлкі, закусіў да й пачаў піць гарбату. А просты чалавіек, віедамо, шкадуе траціць грошы да дастае сабіе з торбачкі сухі хліеб да кіслыіе агуркі да й іесь. Пабачыў пан, што той чалавіек пазірае на яго, бы сабака з пад стала, да й даў яму шклянку гарбаты. Узяў ён гарбату да й хаціеў яіе выпіць обмегам, бы чарку гарыэлкі. Гарбата яшчэ была гарачая, й ён чуць не спёкса да так пырхнуў, што аж пану забрыскаў вочы, а шклянку кінуў далуоў. — Нехай яна згарыць гэстая гарбата, — кажэ ён, як трохі ачухаўса, — гэто добрэ пануом, а нашаму брату гарапашніку яна шкодзіць. — Усьміхнуўса пан да й даў таму чалавіеку даедаць абъіедкі якоесь вельмі смачнаіе рыбкі. Тая рыбка яму вельмі спадабаласа. Ён зъіеў яіе з куостачкамі,

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

а сàмую блешанỳю карòбачку, у якуо̑й яна лежàла, вы̀мазаў хліе̑бам да й вы̀лізаў языкòм. — Ну, — дỳмае ён, — пачакàй-жэ, я зраблю̀ дзіво, — й пашòў ён к жы̀ду да й купіў сабіе̑ карòбачку таіе̑ смàчнаіе̑ ры̀бы. — Цèраз ты̀дзень у нас хвэст, дак трэ пачаставàць папà, та мо' ён не бỳдзе лàяцца, як пайдỳ лàдзіць весіе̑лье. А ўжэ парà даць спòсаб майму̀ хлапчуку̀. Эгэ-ж, пачастỳю папà. Пèўне ён яшчэ нікòлі й не каштавàў такòіе̑ смàчнаіе̑ ры̀бы. Ото-ж здзìвяцца лю̀дзі!

Прыўѐс ён карòбачку таіе̑ ры̀бы да й нікòму й не паказàў, чакàе сьвя̀та. Ось падышлò сьвя̀то; набрàлі лю̀дзі гары̑элкі, навары̀лі, напеклì да насмàжылі ўселя̀каіе̑ ўселя̀чыны. Прыіе̑хаў пуо̑п з дзякòм і пачалì служы̀ць у цэркві. Паапратàлі лю̀дзі ліе̑пшую адзѐжу да й пашлì пад цэркаў, хто памалìцца, пастàвіць сьвіе̑чку да даць папу̀ саракуо̑ўку на абіе̑дню, а хто людзѐй паглядзіе̑ць, ці себѐ паказàць, абò сустры̑эць сябруо̑ў да знаѐмых і пазвàць іх к сабѐ на пачòстку. Пашòў у цэркаў і той чалавіе̑к, алѐ не малìцца, а туо̑лькі папрасìць папà, каб ён прышòў к яму̀ на пачòстку. Пуо̑п абецàў зайцì прòсто з цэркві. От той чалавіе̑к пабіе̑г да гаспòды, прынѐс у хàту тỳю блешàнку, разсіе̑к яіе̑ сакіе̑раю да развернỳў дòлатам, дак аттỳль так гòжэ запàхла ры̀ба, што ён аж пачàў аблìзвацца. От пакры̀ла бàба стуо̑л да й настàвіла на ём уселя̀каіе̑ ўселя̀чыны, а ён на сàмум пòкуці, дзіе̑ седзìць ці пуо̑п, ці дỳрэнь, пастàвіў тỳю ры̀бу, а сам знòў пашòў у цэркаў. От стаìць ён у цэркві, шэпчэ малìтвы, а сам усѐ дỳмае пра тỳю ры̀бу, дỳмае, якàя янà смàчная й як спадабàецца папỳ, як усіе̑ сусіе̑дзі бỳдуць яму̀ завìдуваць да дзівìцца, скуль ён дастàў такỳю смàчную ры̀бу. Схаменỳўса ён, пачàў хрысьцìцца да атбівàць паклòны, алѐ як ён ні хрысьцìўса, як ні стỳкаўса йлбòм аб грàзкую да мòкрую падлòгу, а смàчная ры̀ба нія̀к не выхòдзіць з галавы̀. Што ён ні рабìў, а не муо̑г вы̀трымаць, каб не зьбіе̑гаць да гаспòды. Тут ён нібы̀то ўспаменỳў, што яшчэ не ўсѐ сказàў жуо̑нцы, што трэ' прыгатавàць такòму велìкаму гòсьцю, а тым чàсам не вы̀трымаў, каб не зірнỳць да не панюхаць вѐльмі смàчнаіе̑ ры̀бы. От ужэ дзяк заўѐў «харуìмы», зрабìў куо̑лькось

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

выкрутасаў, выцягнуў бы журавель доўгую шыю, стаў на пальчыкі й так увесь падняўса ўгору, бацца хацеў палецець, каб прапеець такім тоненькім галаском, як паюць на небе анелы. Людзі пачалі хрысьціцца да кланяцца. Зірнуў той чалавек, што усе моляцца, што на яго не звернуць увагі, дак ён бокам, бокам паўз сьцену да й выплішчыўса ціхенько з цэркві. Тут ён падумаў, што яго ўжэ ніхто не прыкмеціць, але як па ліхо насустрэк чорт несе кума. Ён хацеў увільнуць ат кума да й павернуў на агароды, але там было вельмі гразко, так што ён мусіў рукамі чапляцца за платы, каб прайці. Затым ён замарудзіў. Тым часам кум мабыць дагадаўса, шалыгнуў шырокім крокам да й загарадзіў яму дарогу.

— Дабрыдзень, куме! — насілу вымавіў той, выняўшы з зубоў люльку й сплеўваючы, каб пачаць гавурку.

— Здароў быў, куме!

— Куды гэто ты прэсса цераз агароды?

— Хачу збегаць да гасподы. Штось асца сьліну гоніць, — схлусіў ён і пачаў плеваць.

— Брэшэ, — падумаў той да й кажэ:

— От і ў мене штось кала сэрца завіло, — тут ён пачаў рукою круціць на грудзях.

— Хіба хадзем, куме, да заморым чарвъяка, — бо гэто мабыць рабакі, — прыбавіў ён.

— Куды цепер іці? Будуць людзі сьмеяцца.

— Чаго-ж нам, куме, йці ў карчму? Хадзем лепш ка мне.

— Чаго к табе? Та ўжэ-ж хадзем лепш ка мне. — Тут ён спомніў пра рыбу й немог вытрымаць, каб не пахваліцца перад кумам.

— А гарэлка е?

— Трохі е. Хадзем. Я штось табе пакажу.

— Хадзем.

От улезлі яны ў хату як раз тагды, як баба пекла блінцы. От яна накінуласа на гаспадара, чаго ён пашоў з цэркві да й давай яго страміць да зневажаць. Лаецца баба, на чом сьвет

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

стаіць, а ён маўчыць да туолькі чмыхае носам, віедамо, як вінаваты.

— Ось штось сьліну гоніць. Мабыць асца, — кажэ ён. Тут баба яшчэ гарыэй пачала крычаць і крычала да лаяла патуль, пакуль аж ахрыпла, от туолькі тагды замоўкла. От гаспадар зняў з паліцы пляшку гарыэлкі да й наліў добрую чарку.

— Дай жэ божэ за гуод дачакаць да здаровенькім дар божы спажываць, — сказаў гаспадар, перахрысьціўса й чуць-чуць хлебануў з чаркі, алё выцяр рукавом мокрыіе вусы, даліў чарку й даў куму.

— Дай жэ божэ, каб усё было гожэ, каб здаровы былі да багаты да гаршком грошы міералі. Будзь здарова кума! От ён перахрысьціўса, абернуў у рот чарку да туолькі плюнуў, што вельмі добрэ.

— Алё-ж і гарыэлка ў кума добрая, — сказаў ён дзеля хвасону, падняў палу сьвіты да й выцер вусы й бораду.

— Закусі, куме, чым буог паслаў.

— А што-ж ты хаціеў мніе паказаць?

— Эгэ-ж, а я чуць не запаметаваў. Ось гэстую рыбку. Ці бачыў ты, кум, такую, ці ніе?

— Не віедаю, ці бачыў. Ось закаштую, — й пачаў ён смакаваць тую рыбу.

— Ото-ж і смачно, ото-ж і смачно, — гаворыць ён да ўсе іесь тую рыбу. Бачыць гаспадар, што ўжэ хутко папу нічого не застанецца да й намекае куму, каб ён дагадаўса й буольш не іеў.

— Бо й дораго-ж.

— Звіесно, дораго, дак затое й смачно. Алё от скажы, куме, — гаворыць ён, падставіўшы к сабіе блешанку з рыбаю, — чаму яна такая смачная?

— Бо й дарагая-ж, на яіе ўсё ліхо! — чуць не крыкнуў гаспадар, як убачыў, што кум ужэ даедае тую рыбу.

— От затым то й смачно, што вельмі яна дарагая, — сказаў кум да й вымазаў начысто каробку.

Даніло Куліеш.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

17. Не тут, дак там.

Жыў сабі̑е адзін вельмі скупы чалавіе̑к. Ён быў такі скарэда, што не то, каб другім, алè й сам сабі̑е шкадаваў давòлі наі̑есьціса. От і прадражнілі ягò скупердзягаю. Бàло цыгае ён па пòлі бы бусел да зьбірàе каласы пэ йржышчы. Убàчаць ягò дзі̑еці да й крычàць, — лядзі, лядзі, онь цыгае Скупердзяга. — Ніхтò не ві̑едае, ат кагò тòе пашлò, ту̑олькі усі̑е пачалі гаварыць Скупердзяга да й Скупердзяга. — Перш ён кідауса на дзецèй да лàяў іх, а пòтым і прывык. Дась бу̑ог сьвято; зьберуцца лю̀дзі дзі̑е нèбудзь на вуліцы, закураць люлькі да й гамòняць сабі̑е пра тòе, пра сèе, шуткуюць да рàдзяцца, калі што сі̑еяць, ці зьбірàць, калі пачынàць касіць, або што другòе. А Скупердзяга яшчэ да сòнейка схòпіць тòрбу да веслò, пераліе̑зе цèраз платы, каб ніхтò не убàчыў да й сунè на ры̑эку лавіць рыбу. Камары, ці авады ры̑эжуць ягò бы нажэм, мòшкі вòчы сьлі̑епяць, а ён і не варухнèцца, седзіць на бèразі да й не дышэ, каб не спалòхаць рыбіну. Пакуль лю̀дзі гамòняць да кураць люлькі, дак Скупердзяга нацягàе пòўну тòрбу акунёў да язёў. Убàчаць лю̀дзі, як ён прэ дамуо̑ў рыбу да й пачнуць на кпінкі прыставàць, каб даў ім закаштавàць таі̑е рыбы, а ён бежыць сагнуўшыса й не пазірàе на людзèй, алè хучы̑эй сунè да гаспòды, бы воўк у лі̑ес. — Скупердзяга, дай хаць якòго нібудзь бабурà, або ментузà, — чуе ён збòку, алè прэ мòўчкі й не азірàецца. — Скупердзяга, дак скупердзяга й есь, — сьмеюцца лю̀дзі, а ён хаць бы што, маўчыць бы пень. А дòбрэ ён умі̑еў лавіць рыбу. Бàло цы̑элае лі̑ецячко лòвіць да сушыць, а сабі̑е шкадуе й закаштавàць. От выдауса дòбры гу̑од, налавіў да насушыў Скупердзяга рыбы цы̑элы ву̑оз, запру̑ог кабылку да й паўёз у мі̑есто прадавàць. — Куды ты, Скупердзяга? — пытàюць лю̀дзі. — У мі̑есто. — Везèш на прòдаж рыбу? — Нехàй сабі̑е й так, — кàжэ ён да сьцёбае кабылку пугаю, каб не слухаць, што там гавòраць. — Прывезі нам абарàнкаў, Скупердзяга! — леціць за ім насьмі̑ешлівы гòлас, а ён сьцёбае кабылку

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

да тузае лейцамі. — Усе дай да дай, — мыркае ён сабіе пад нуос. — На гатовае куожын разявае халяву... А ты не выскаляй зубуоў з маладзіцамі да йдзі сам сабіе налаві. Мо трасцу схопіш, а не рыбу. Ну, старое падло, каб цебе ваўкі зарыэзалі, цягніса ваўкарыэзіна, а то як сперажу, дак і ногі выпруціш, — пужае ён кабылку, а тая целюхкае памаленьку цераз гаек кала ракі, дзіе маскалі пабудавалі сабіе на ліето буданы з палатна да й дужаюцца сабіе ці качаюцца на травіе. — Здраствуй, хаджаін! Дай агню прыкурыць сабачую нуожку, — просіць Скупердзягу адзін маскаль. — Здрастуй, служывы! — атказвае ён і супыняе кабылку. Абступілі яго маскаліе, закурылі сабачые нуожкі, гамоняць да распытоўваюць, куды ён іедзе й што везе на прадане. Рад Скупердзяга, што такіе важные маскалі гавораць з ім за пане брата да й вушы разьвіесіў. Тым часам адзін маскаль штось шапнуў другому. Той павернууса на падборах да й пабіег к рацыэ. Там ён прывезаў к вероўцы долато да й пачаў яго швыраць у воду. — Што гэто ён робіць? — пытае ў маскалеў Скупердзяга. — Ловіць рыбу, — атказваюць яны. — Чым-жэ ён ловіць? — Долатам. — Што за дзіво, — думае Скупердзяга, — здаецца, я добрэ ўміею лавіць рыбу, а ніколі не бачыў, як гэто ловяць рыбу долатам. — Ї добрэ берецца? — пытае ён. — Вельмі добрэ. Ён сегодня мнуого наловіць. — Зацікавіўса Скупердзяга, зліез з воза да й пашоў к рацыэ глядзіець, як маскаль долатам ловіць рыбу. Падходзіць ён туды, аж маскаль швырне долато ў рыэку да й прыкажэ: — берыса рыба малая й велікая! — Выцягне ён долато да зірне, што на ём нічого немашака, атойдзецца далей да й там швырне долато ў воду. Выцягне памаленьку вероўку — пусто, от ён швырне ў другое міейсцо да й кажэ: — не тут, дак там, не тут, дак там! — Ведзе ён Скупердзягу паўз рыэку ўсе далей да далей да злуе, што не берэцца рыба. — Не пачуом! Не тут, дак там... — Кідаў, кідаў ён долато, пакуль надаіело. — Ніе, мабыць затым не берэцца, што вельмі горачо печэ сонцэ, — кажэ маскаль, — хіба-ж ліепш пакупаюса. — Раздзіеўса маскаль да й паліез у воду. Купаецца маскаль да паказвае, як

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ба̀бы плыва̀юць. Паба̀чыў Скупердзя̀га ту̀ю пра̀хтыку да й вернуу̀са к во̀зу. Зірнѐ ён, аж іміа̀ маскалёў, німа̀ й яго̀ ры̀бы. Ён туды̀, ён сюды̀, — німа̀шака ры̀бы, ба̀цпэ яна̀ ў во̀ду плю̀хнула.

Даніло Кулі͡еш.

Чудзін.

18. Нехàй панічу͡ом лаго̀дкі.

Жыў у нас пархàты жыдо̀к. Паку̀ль ён седзі͡еў у карчо̀мцы да шынкава̀ў гары͡элку, дак шо̀лудзі нікòлі не зхо̀дзілі з пага̀наі͡е мазга̀ўні. Алѐ, ві͡едамо, по̀гань, — не седзіцца яму̀ ў карчо̀мцы, бі͡егае бы непрыту͡омны та на ўёску, та ў дву͡ор, та да млына̀, та на рум. Бі͡егаў ён, бі͡егаў, круці̀ўса бы ўюн у рэшаці, нарэсце прычапіўса ша̀парам у бага̀таго купца̀ на ру̀ме. Пача̀ў ён там аблiча̀ць ву͡ошчыкаў да круці̀ць лю̀дзям пла̀ту за рабо̀ту, дак тым вѐльмі спадаба̀ўса купцу̀. От і зрабіў той яго̀ са̀мым ста̀ршым ша̀парам да й пасла̀ў у Кралѐвец прадава̀ць лі͡ес. Зарабіў той паршы̀вы жыдо̀к мну͡ого гро̀шэй, наглядзі͡еўса, яка̀я кары̀сь з лі͡есу да й пача̀ў сам купава̀ць пу̀шчы. Загу̀біць адзі̀н лі͡ес, дак хучы͡эй закупля̀е другі̀, а праз гаду͡оў пъяць нѐмаль зпля̀жыў лі͡ес ва ўсёй акру̀зі. Ба̀чыць по̀гань, што бу͡ольш німа̀ кары̀сьці з лі͡есу, от ён і ўзя̀ў арандова̀ць велікі маёнтак у аднаго̀ па̀на, като̀ры за̀ўжды дзі͡есь круці̀ўса заграніцаю, ці мо ў Арша̀ве. Алѐ, ві͡едамо, жыд нікòлі гаспада̀ркі не ўёў, дак і неўмі͡ее дагляда̀ць земѐльку. Папро̀бuваў адно̀ лі͡ецячко гаспадарава̀ць сам, аж тра̀сца яму̀ зрадзі̀ла на по̀лі, а не збу͡ожжэ; от ён на другі̀ гу͡од ужэ̀ наймàе сабі͡е акамо̀на да й даѐ яму̀ по̀ўную ўла̀дзу рабі̀ць, што зхо̀чэ й як зна̀е, а сам заста̀ўса ў мі͡есьце весьці̀ га̀ндаль. Маёнтак быў вѐльмі до̀бры. Акаму͡он так паўёў дзі͡ело, што ў дары̀ ўсяго̀ мну͡ого: ўзгадава̀ў ён гаўя̀до, развёў уселя̀кіх пту̀шак да сьвінѐй цы͡элую чэраду. І͡еж, што зхо̀чэш, хаць распаражы̀са. Дачу̀ўса жыд, што ў ту͡ом дары̀ вѐльмі до̀брэ жыць улі͡етку й захапі͡еў ён прывезьці̀ туды̀ на лі͡ето сваю̀ балабо̀сту да бахуру͡оў, алѐ перш паі͡ехаў сам. Бахуры̀ ўжэ былі̀ нелапы̀е

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

хлопцы й вельмі хапіелі пажыць ліето ў паньськум маентку, бацэ панічы. От прыіехаў жыд, аглёдзяў двуор і вельмі яму не спадабаласо, што акамуон развёў там мвуого сьвінёй да ўселякаго птаства. Пашоў ён у вагаруод, аж там якурат жуонка акамона нарвала цыбулі да й несе да станцаі.—На сто ты рвес цыбульку?— пытае ён. — Віедамо, на што, — атказвае тая. — От зтаўку да зраблю квас, та будзем палунуваць, бо буольш німа чаго іесьці.— Пабіег жыд к акамону да й наваліўса на яго, бы жыды на Гамана. — Сто ты, сто ты робіс, на сто пазваляес рваць цыбульку? Цаму ты не рыэзес гусей, індыкаў? На сто табіе сьвіне? Калі да іес хаць усіе, а лагодкі нехай, паніцуом. — Якііе лагодкі?— пытае акамуон. — Ведомо, якііе, цыбулька, рэцька да часнок. Іес усе, а нехай лагодкі маім паніцуом.

Даніло Куліеш.

Чудзін.

19. Цесьля.

Сабраўса адзін стары чалавіек будаваць сабіе хату.—Я ўжэ не доўго пажыву,—думае ён,—але збудую добрую хату. Нехай мене памінають унукі да праўнукі. — Наняў ён цесьлю да й пачаў з ім выбіраць міесто. Аблюбавалі яны харошае міесто на ўзгуорачку, дзіе з даўніх часаў лежаў велікі камень. Цесьля аснаваў хату так, што камень як раз застаўса на покуці пад вуглом. От ужэ чуць не саўсім гатова хата, як ось прышоў к таму старому другі малады цесьля. Пачалі яны аглядаць хату. Пазайздросьціў той новы цесьля сваіму таварышу, што ён вельмі добрэ збудаваў хату да й пачаў дурыць старому голаў, пачаў яму гаварыць, што тое не добрэ, тое не гожэ, камень не на міесьці да так падбухтэрыў старого, што той і сам пачаў думаць: а мо й сапраўды хата кепсько пабудована. — Што тут рабіць?— думае ён, — малады цесьля гожэ меле языком, але нічого яшчэ не будаваў да мабыць і неўміее будаваць. А калі ён такі гойстры да такі здатны, як сам себе хваліць, дак нехай памагае старому

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

цѐсьлі, нехàй вỳчыцца да рòбіць, як ліепш. — І наня̀ў ён маладòго цѐсьлю, каб ён памагàў старòму. І пачàў тут малады̀ цѐсьля перарабля̀ць да псавàць та тòе, та ѝньшае да ўжэ такуоўськаго нарабѝў, што бры̀дко й лю̀дзям паказàць. Бàчыць ён, што кѐпсько да й кѝнуў тỳю будòву. Тым чàсам стары̀ чалавіек памѐр. Гаспадарòм застàўса ягò малады̀ сын. З гэстым сы̀нам ужэ даўнò таварышавàў той малады̀ цѐсьля. От ён і давàй падбухтэрваць маладòго гаспадарà, што трэ хучыэй дабудавàць хàту, алѐ што янà так кѐпсько будòвана, не мàе жуоднаго харацтвà, што яіе трэ хібà саўсѝм перарабѝць. Слỳхаў той, слỳхаў, німà як плю̀нуць таварышу ў вòчы, але каб атчапѝцца, наня̀ў ягò рàзам з стары̀м цѐсьляю дабудавàць тỳю хàту. От малады̀ цѐсьля перш зьвернỳў дах да зрабѝў нòвую стрыэху з цàцкамі да з піеўнікамі. Алѐ пачалѝ лю̀дзі сьмея̀цца да казàць, што гэто не хàта, а якàясь бỳдка. От і пачàў ён з рòку ў руок перарабля̀ць у туой хàці та аднỳ сьціену, та другỳю, та вымàць падвалѝны, та прасекàць нòвые дзьвѐры, нарэшце вы̀вернуў з-пад вуглà той велѝкі кàмень. Пахілѝласа хàта на адзін буок да так і стаѝць на сьміех дòбрым лю̀дзям.—Тут мàло дòбраго матарыя̀лу,—кàжэ вѐльмі разỳмны малады̀ цѐсьля, — трэба навазѝць ліепшаго. — От і пачàў ён выбірàць да вазѝць ліепшы матарыя̀л. Навазѝў ён ліесу цыэлую гỳрбу руоўно з хàтаю. От вы̀кіне з сьцяны̀ бервінò, палòжыць туды̀ нòвае, паглядзѝць — не гòжэ, знòў вымàе да закладàе нòвае. Так і не дабудавàў ён хàты.

Даніло Куліеш.

Чудзін.

20. Два камені.

Лежы̀ць на шляхỳ вялѝзазны кàмень. Хто ні йдзе, та супы̀ніцца калà ягò, пасядзѝць, супачы̀не, а то й пасілкỳецца трохі. Мо са ўсяіе-акрỳгі знàлі лю̀дзі той кàмень і шанавàлі ягò. Забудавàў сабіе адзін чалавіек млын, алѐ німà дзіе ўзяць каменёў. Паіехаў ён у міесто да й купѝў там вѐрхні кàмень, узвалѝў ягò

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

на вуоз, запруог пàру валуоу да й везè па шляхỳ. Падъежджàе ён к тамỳ міейсцу, дзіе лежàу той кàмень, туолькі ось прыгрыэло сòнейко, напàлі на валуоу авадзы, сьлепнì да здракì да як пачалì іх рыэзаць, дак на тых аж шкỳра лòпаецца. Матàюць валы хвастàмі да крỳцяць галавàмі, аж кульбàкі да занòзы трашчàць. Лежыць на вòзе кàмень да дỳмае: от якì я вàжны да патрэбны людзям, што менè вязỳць як пàна. Вèльмі я слàуны да высòкі, не такì, як ось той, што валяецца онь на шляхỳ. Набуок з дарòгі, бо расцісну як пòрхаỳку! — Тут валы як закруцілі, дак і зачапілі за кàмень: вуось зламàласа, вуоз пахілiỳса, гàрдны кàмень шусь далуоў да так рыэзнуỳса аб той кàмень, што аж печанцы ў ягò трыэснулі. Лежыць ён і не варухнèцца да туолькі злỳе, што прышлòсо лèгці рàзам з такім брыдкім кàменям. Пабедавàў чалавіек да й пацёгса з валàмі да гаспòды. Пòтым дагадàуса ён, што гэто так буог даў, каб зьвернỳць ягò увàгу на той кàмень. От пазвàў ён мàйстра, аглèдзяў той да й выкавàў у млын спуодні кàмень з тагò вялізазнаго кàменя, што дàрам валяỳса на шляхỳ. Прыỳёз той чалавіек абỳдва каменì да млынà да й палажыў іх як трэ ў пуод. Лежыць спуодні кàмень да туолькі рàдуецца, што хаць нарэшце дачакàуса тагò, што мажэ паслужыць людзям, мажэ малòць ім мукỳ, каб яны з яіе пеклì сабіе дар бòжы. А вèрхні кàмень скрыгìчэ зубàмі ат злòсьці да лàе спуодняго тавàрыша. — Куды табіе да менè! Як захачỳ, дак я цебè задушỳ. Не ты, а я мелю мукỳ да й мелю туолькі тагды, як сам хачỳ. От пабàчыш, як я замелю. — Пры гэтум ён так закруцiỳса, так зашуміеў, што аж распàуса на кускì. Пабедавàў мèльнік да й выкінуў тыіе кускì ў грàзь, як ні на вуошто не патрэбные. Купіў чалавіек нòвы вèрхні кàмень, дòуго малòў, алè й той змалòуса. А спуодні кàмень папàуса такì дòбры, што мèле мо й да тых час.

Даніло Куліеш.

Чудзін.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

21. Стралѐц і рыбàк.

Прàўду людзі кàжуць, што ў стралцà дым гỳсты, да абі͡ед пустỳ, а рыбàк як памòчыцца, та і͡есьці й нехòчэцца. Былì ў бàцька два сынỳ. Вỳрасьлі янỳ як дубỳ, а бàцьку ўсе палёгкі німà. Бу͡ольшы старэнны быў хлòпец, алѐ з сàмаго малѐнства ту͡олькі рабіў пàсткі да ўселякіі͡е лавỳшкі, а як падру͡ос, дак дастàў сабі͡е стрэлбу да й пачàў з ѐю пі͡еступацца. Людзі йдуць на рабòту, а ён ускіне стрэлбу на плечò да й шмык у лі͡ес, абò ў балòто. Цягàецца там увесь дзень, а прỳдзе да гаспòды з пустỳмі рукàмì да галòдны бы воўк. Перш сварỳўса на ягò бàцько, алѐ пòтым і замаўчàў, бо бàчыць, што нічòго не парàдзіць, калì такàя ў сына ахвòта. Цягàецца стралѐц, аж у ягò жылы рвỳцца, а прыбỳтку німà ніякаго, бо ён пук, дзѐсяць грòшэй з рук; дым густỳ, а абі͡ед пустỳ. А часàмі злòвіць зàйца за яйца дак і тагò хучы͡эй несѐ пàну, каб той даў пòраху. А мѐньшы сын прыдàўса такì гультàй, што хаць вазьмì да й вỳгань вон. Не хòчэ ён ні зà што ўзяцца ў гаспадàрцы, ту͡олькі дзень і ну͡оч седзìць на рацы͡э да вỳдзіць рыбу. Налòвіць ён шàпку бабуру͡оў ці плу͡отак, — якàя там у хаджàйству карỳсь? Пачàў і на ягò бàцько сварỳцца, што ту͡олькі марнатрàвіць час, а не рòбіць дзі͡ела. Алѐ й меньшы сын не слỳхае бàцька, бо, ві͡едамо, ахвòта гары͡эй невòлі. Як ямỳ рабìць дзі͡ело, калì ягò цягне на ры͡эку? Дỳмаў, дỳмаў старỳ, як тут атвучỳць сыну͡оў ат ліхòго налòгу, алѐ нічòго не мажэ прыдỳмаць. Ту͡олькі ось прыхòдзіць к ямỳ якìсь дзедòк да й застаѐцца нàнач. Жàліцца старỳ тамỳ дзедкỳ на саàіх сыну͡оў, жàліцца, што нагадавàў дзецѐй, а не мàе на стàрасьці падмòгі. Вỳслухаў дзед да й парàдзіў ямỳ, што зрабìць. От на другì дзень сабралìса сынỳ ў хàту, сі͡елі вечэраць да й пачалì раскàзваць, якìі͡е з ìмі за дзень былì прыпàдкі. Бу͡ольшы сын кàжэ, што яшчэ з сàмаго рàна натрàпіў ён цы͡элую чэраду ку͡оз. Былà там казà з казенятамі да старỳ барадàты казёл, алѐ от ту͡олькі ён злажỳўса, каб вỳстраліць, аж у казлà ў ну͡оздрах закруцілі вòсы. Казёл як чмыхнѐ,

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

як вы̀леціць з ну͡оздраў цы͡элы ру͡ой ву͡ос да як пачнѐ ры͡эзаць казу̀ з казеня̀тамі, дак яны̀ ўсі͡е й су̀нулі ў гушчэ̀чу. Пашо̀ў ён, ка̀жэ, сачы̀ць па сьлі͡еду да й спатка̀ў ло̀ся да тако̀го рагаля̀, што было̀-б мя̀са на паўго̀да. Прысі͡еў гэто ён за пень да й чака̀е, паку̀ль лу͡ось падыдзе бліжы͡эй. Са̀дзіць рага̀ль про̀сто на ягò, са̀дзіць, аж земля̀ сто̀гне да ту͡олькі рага̀мі алѐшнік ло̀міць. Падышо̀ў ён мо̀о ўжэ на паўго̀ні ці мѐньш, алѐ ось прыгры͡эло со̀нейко, й закруцілі ў ягò ў ну͡оздрах шаршні. Трыма̀ўса, трыма̀ўса лу͡ось да як чмыхнѐ, дак і вы̀лецяў з ну͡оздраў цы͡элы ру͡ой шаршнѐў. От лу͡ось верць галаво̀ю да й суну̀ў у вы̀жар купа̀цца, каб абагна̀ць шаршнѐў. Ён вы̀скачыў з пад ку̀ста да за ім, алѐ куды̀ там дагна̀ць гэ̀стакую цыгля̀тую махіну. Німа̀ чагò рабіць, пашо̀ў ён да̀лей да й хаці͡еў прайці̀ праз алѐс. Ту͡олькі ён праплішчыўса праз гушчэ̀чу да вы̀лез на прага̀ліну,—зірнѐ, аж там стаіць на за̀дніх ла̀пах велі̀зазны, бы ву͡ол медзьві͡едзь, чмы̀хае да абганя̀ецца перы͡эднімі ла̀памі ат чмелѐў. Дагада̀ўса ён, што гэто ту͡олькі што чмелѐў ру͡ой вы̀шаў з ну͡оздраў медзьвѐдзя, дагада̀ўса, што ў такі̀ час медзьві͡едзь вѐльмі драпі͡ежны да й пабая̀ўса страля̀ць, а скары͡эй узлі͡ез на алѐшыну. Да̀к от, ка̀жэ, й седзі͡еў там мо̀о гадзін пьяць, каб не сустры͡эцца з медзьвѐдзям. А шко̀да, што не стральну̀ў, — до̀брая-б была̀ шку̀ра. Пача̀ў разка̀зваць і мало̀дшы сын, як ён лаві̀ў ры̀бу̀. От,—ка̀жэ,—от-от хо̀піцца на кручо̀к велі̀зазная ры̀біна, падцягну̀ я яі͡е к бѐрагу, а яна̀ віль хвасто̀м да й адарвѐцца. Адну̀ я ўже чуць не ўхваці̀ў рука̀мі, ту͡олькі не утрыма̀ўса да й шабулды̀х у во̀ду. Насі̀лу вы̀карапкаўса. Слу̀хаў, слу̀хаў ба̀цько да й ка̀же.—Му̀сіць сынкі̀ зьверына̀ ў лі͡есі, а ры̀ба ў рацы͡э да не ў руцы͡э. Стралѐц страля̀е, а гаспада̀рка гуля̀е. Рыба̀к ры̀бу ву̀дзіць да ві͡ек ну̀дзіць. А гаспада̀р на сваём агаро̀дзе раўня̀ ваевòдзе. Я ўже стары̀, мо̀о ско̀ро памру̀. Пара̀ ду̀мацць пра сваю̀ ду̀шу, бо сьмерць не за гара̀мі да за плеча̀мі. Жыві͡еце сынкі̀, як зна̀еце, а я пайду̀ ў сьві͡ет, паклан̀юса сьвяты̀м угу͡однікам да памалю̀са бо̀гу за сваю̀ гры͡эшную ду̀шу.—Сказа̀ўшы то̀е, пача̀ў стары̀ зьбіра̀цца ў даро̀гу. Па нема̀лум ча̀се пашо̀ў стары̀ ат цэ̀ркві да цэ̀ркві, ат про̀шчы

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

да прòшчы. Засталіса сынЪ̀ без бàцька, а гаспадàрка без гаспадарà, дак хỳтко ўвесь дву͡ор запусьці͡еў. Не пасьпі͡елі стралèц да рыбàк азірнỳцца, як німà чагò й у рот палажЪ̀іць. От і пачалі янЪ̀ спрачàцца, хто вінавàт. Спрачàліса, спрачàліса, алè прàўды не даканàліса. Ту͡олькі ось прыхòдзіць к ім той сàмы дзедòк, што захòдзіў к іх бàцьку, да й застàўса ванач. Трэ пачаставàць падару͡ожнаго, а тут ні͡ечым. Стралèц кàже брàту, — нехàй-бы ты наловіў рЪ̀бы, каб былò чым прынѧ̀ць бòжаго чалаві͡ека. — А рыбàк адмаўлѧ̀е брàту, — нехàй бы ты настралѧ̀ў зьверынЪ̀, каб пачаставàць стàрца. — Дзѧ̀куй вам на дòбрум слòве, — кàжэ стàрац, — у менè е хлі͡еб, што дòбрыі͡е лю̀дзі далі. — От дастàў ён з тòрбы хлі͡еба, сàла, сЪ̀ра да яѐц і пачàў частаевàць стралцà да рыбакà. Як ні сòрам былò ім прымàць пачòстку ат бі͡еднаго стàрца, алè гòлад не сву͡ой брат, забỳдзеш і сòрам. Накінуліса галòдныі͡е стралèц да рыбàк, дак чуць не ўсю тòрбу апрастàлі ў стàрца. Наі͡еліса янЪ̀, дак і пытàе іх стàрац, чамỳ янЪ̀ такіі͡е бі͡едныі͡е, — хібà, — кàжэ, — вам бу͡ог даў якòе нешчàсцье, ці што. Перш сòрам былò ім прызнавàцца, а нарэшце такі прызнàліса, што ў іх прапàла гаспадàрка. — А як-жэ вы ўпèрад жылі? — пытàе стàрац. — Бàцько гаспадаравàў, — аткàзваюць янЪ̀. — А ён маладЪ̀, ці старЪ̀? — СтарЪ̀. — Дак от бàчыце, ён старЪ̀ да гаспадàркаю карміўса сам і карміў вас, а без гаспадàркі вы й маладЪ̀іі͡е да здарòвыі͡е не мажэцè пражЪ̀іць. — Дагадàліса братЪ̀, што ні зьверынòю, ні рЪ̀бою без гаспадàркі ні͡ельга жыць да й узялiса янЪ̀ за хаджàйство. От хỳтко янЪ̀ напрàвілі гаспадàрку, а тым чàсам вернỳўса старЪ̀ бàцько. Зірнỳў ён тудЪ̀-сюдЪ̀ да й пазнàў, што ягò сынЪ̀ набрàліса рòзуму, што стралѧ̀юць тагдЪ̀, як зьві͡ер набежЪ̀іць, а рЪ̀бу лòвяць, як янà самà ў ку͡ош лі͡езе. — От ён і кàжэ, — цепèр я спаку͡ойно памрỳ, бо бàчу, што маі͡е сынЪ̀ ні стралцЪ̀, ні рыбакі, а гарапàшнікі гаспадарЪ̀, як і я сам.

Даніло Кулі͡еш.

Чудзін.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

22. Пан і мужы̀к.

Быў адзін вѐльмі дѐбры маёнтак. Землі як вѐко схваціць, а земля̀ дѐбрая, зраджа̀йная, от здаѐцца, пасадзі дзіця̀, дак і тѐе вы̀расьце. А сенажа̀ці мурýожные да берагі, — сіе̑на ніе̑куды дзева̀ць. Двуо̑р кала̀ са̀маіе̑ ракі. Будынак — пала̀цы. Дабра̀, аж будуоўля лѐміцца. Кругѐм сад, бацца ў раю. Така̀я па̀ну жы̀тка, што й паміра̀ць не трэ. Алѐ што паны̀, яны̀ за̀ўжды ат дабра̀ крýцяцца. Так і той пан. Прыіе̑дзе ба̀ло ў двуо̑р, біе̑гае бы шалёны да крычы̀ць на камыса̀ра, ла̀е двуо̑рню, а тыіе̑ жа̀ляцца на на̀шаго бра̀та-мужыка̀. А, віе̑дамо, так за̀ўжды, што калі што не так, дак віна̀ва̀т мужы̀к. — А даць яму̀ сто гара̀чых, — крычы̀ць пан. От табіе̑ і ўся спра̀ва. Туо̑лькі тагды̀ трѐхі супакѐіцца пан, як пры̀дуць к яму̀ ў двуо̑р тыіе̑ дзеўкі, катѐрых хѐчуць лю̀дзі браць. Там была̀, ба̀чыце, така̀я павядэ̀нцца, што пакýль дзіе̑ўка не схѐдзіць к па̀ну, датýль немуо̑жне рабіць весіе̑льля. От ба̀ло нагѐняць к па̀ну дзевѐк цы̑элую чэ̀раду бы авѐц, а ён бер̀э ці к сабіе̑, ці гасьця̀м. От пакрýціцца пан з ты̀дзень ці буо̑льш да й зноў паіе̑дзе чорт віе̑дае куды̀. Ка̀жуць ён усѐ іе̑здзіў у Аршаву, ці за граніцу. Ягѐ лёкай раз падвы̀піў, дак казаў, што ў па̀на быў такі другі маёнтак, алѐ ён прайгра̀ў ягѐ ў ка̀рты. Мѐо хлусіў, а мѐо й пра̀ўда. Туо̑лькі ось адзін раз вѐльмі дѐўго не было̀ па̀на. Руо̑зно гада̀лі лю̀дзі. Другііе̑ пашлі гаманіць, што ужэ̀ саўсім небýдзе па̀на, што нас вѐзьмуць у казну̀, ці саўсім пýсьцяць на вѐлю. Туо̑лькі быў у нас адзін пъяньчýжка, дак той пра̀ўду каза̀ў, што балѐто без чѐрта не бýдзе; адзін загіне, дзѐсяць бýдзе. Дак тѐе на пра̀ўду й вы̀шло. От я̀кась пѐрад Сёмухаю сагна̀лі людзѐй у двуо̑р. Сышлі̀са яны̀ на дзедзінец, седзя̀ць пакýрваюць сабіе̑ люлькі да гамѐняць аб туо̑м, аб сём. Ужэ̀ сѐнейко падня̀лѐсо да й пачало̀ каціцца дѐлу, а яны̀ ўсе седзя̀ць да чака̀юць вядамѐсьці, на што іх сагна̀лі. Усхапіўса той пъяньчýшка да й ка̀жэ: хаць-бы далі па ча̀рцы гары̑элкі чарвяка̀ замары̀ць, а то штось кала̀ сѐрца от так і завіло̀. Пачалі лю̀дзі шуткава̀ць

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

да сьмеяцца, от дзень і хучы͡эй прайшо̀ў. Зірну̀лі яны̀, аж ужэ̀ й со̀нейко нізко, вѐчар блізко. Вы̀шаў камыса̀р да й веліе͡ў прыхо̀дзіць на за̀ўтрэ ра̀ненько. — Ото̀-ж да̀рам прапа̀ў дзень, ба̀ццэ сьвіне зы͡іелі, — ка̀жуць лю̀дзі да й цягнуцца хто ў ка̀рчму, а хто да гаспо̀ды, бо ўжэ духі̀ падвело̀. Хадзілі так лю̀дзі без дайра̀цы мо̀о ку͡ольки дзён, нарэшце ось і прыпі͡ехаў асэсар і зь ім якісь незнаёмы пан. Пашлі̀ яны̀ ў пако̀і да й пачалі̀ сабі͡е сілкава̀цца. Ві͡едамо, пану͡ом ча̀су мну͡ого, а што лю̀дзі да̀рам петры͡эюць, дак ім кло̀пату ма̀ло. Алѐ ось ужэ̀ пѐрац са̀мым вѐчарам вы̀шаў к лю̀дзям асэсар з камыса̀рам і но̀вым па̀нам, перачыта̀ў якісь папі͡ерак да й ка̀жэ: От вам но̀вы пан. Слу̀хайце яго̀ да шану̀йце, та й ён не пакіне вас, а бу̀дзе вам як ба̀цько. Тут падалі̀ ко̀ней. Асэса̀р сі͡еў да й паі͡ехаў, а но̀вы пан забра̀ў камыса̀ра да й пашо̀ў з на̀мі на по̀ле. Ту͡олькі вы̀шлі мы з вару͡от, от і пача̀ў пан аглядаць по̀ле да рахава̀ць, які̀ гату̀нак гру̀нту. А по̀ле было̀ ўзо̀рано там яшчэ̀ аб во̀сень на зяб да так і застало̀со не засі͡еянэ. Ві͡едамо, за̀ зіму раля̀ зраўняласа, ба̀ццэ й не го̀рано. Уско̀чыў пан у сваі̀х ляксава̀ных бо̀тах на кратаві͡ене да й правалі̀ўса па са̀мые ку͡остачкі. — От до̀брая земля̀, — ка̀жэ ён камыса̀ру. — Алѐ до̀брая, — атка̀звае той. Пача̀ў пан пыта̀ць стары̀х людзѐй, яко̀е тут лі͡епш сі͡еяць збу͡ожжэ, а ты̀е ка̀жуць, што як бу͡ог дась, дак уселя̀кае заро̀дзіць. Схілі̀ўса тут пан, узя̀ў у жмѐню землі̀ да й палажы̀ў яі͡е ў губу̀, нібы̀то смаку̀е, на яко̀е збу͡ожжэ яі͡е лі͡епш абернуць. Пазіра̀юць лю̀дзі, што пан языко̀м выбіра̀е зѐмлю да па сма̀ку про̀буе, што на ёй до̀брэ заро̀дзіць да ту͡олькі сьмею̀цца з дурно̀го па̀на. Яны̀ ду̀маюць, што пан ту͡олькі чму̀ціць, нібы̀то па смаку̀ мажэ̀ пазна̀ць до̀брую зѐмлю. От закаштава̀ў пан землі̀ да й зну͡оў пыта̀е людзѐй, яко̀е збу͡ожжэ тут лі͡епш заро̀дзіць. Маўча̀ць лю̀дзі, да ту͡олькі пазіра̀юць адзі̀н на друго̀го. Алѐ ось вы̀скачыў той пъяньчу̀жка да й ка̀жэ: Ні͡е, пано̀чку, дарэ̀мная хваты̀га! Ту͡олькі тагды̀ ат землі̀ пазна̀ць смак мо̀жэш, як на яі͡е . . . . . (гно̀ю) пало̀жыш.

Даніло Кулі͡еш.

Чудзін.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

23. Безнòгі багаты̀р.

У ні͡еякум цàрстве, ў ні͡еякум гасудàрстве жыў-быў кавàль да кавалìха. Спарадзìла кавалìха, на яі͡е лìха, гòжаго хлапчукà да безнòгаго. Расьцè хлапчу̀к не на рàдась, а на гòрэ. Ві͡едамо, калі͡ека зрòду, якàя рàдасьць бацьку͡ом. Гаду̀ецца ён як пакìдзішчэ. Упрàвіцца кавалìха калà пèчы да й бежы̀ць у пòле, ці ў вага-ру͡од, а хлапчу̀к валя̀ецца па землì да смòкчэ скары̀нку, абò жуè пàраную картòплю. Кìнула ягò раз кавалìха на дзедзìнцы, дàк чуць ягò сьвìне не зьі͡елі. Не шкаду̀е кавалìха, на яі͡е лìха, свайгò дзіця̀ці, бо, — кàжэ, — якàя зь ягò кары̀сьць. Калі͡ека — не памòга, а ту͡олькі абу̀за. Хаць-бы ягò бу͡ог з сьві͡ету прыбрàў. — А тут ён напераку͡ор рàсьце да таўсьці͡ее. Вы̀рас ужэ̀ хлапчу̀к нелапы̀, алè не хòдзіць, да ту͡олькі пòўзае. Кармìць ягò кармì, а кары̀сьці з ягò нія̀каі͡е німà. Яшчэ̀ гары͡эй пачалà ягò праклінàць мàтка да наракàць на бòга, што даў ён сы̀на не на ўці͡еху, як лю̀дзям, а на беду̀. Слу̀хаў, слу̀хаў кавàль праклёны дурнòі͡е бàбы, алè нічòго не мажэ̀ парàдзіць. Шкòда яму̀ хлòпца, алè ат бàбы жы̀ткі німà. От нарэ̀шце не вы̀трымаў ён запру͡ог кабы̀лку, пасадзìў на ву͡оз сы̀на да й паўёз ягò ў лі͡ес. Заўёз ён далèко ат вёскі да й хаці͡еў там пакìнуць сы̀на на стрàту, алè ўбàчыў у лі͡есі малèнькую хàтку. Улі͡ез ён у хàтку, аж там нікòго німà. Зірну̀ў ён туды̀-сюды̀, — у хàцы ўсе е, а гаспады̀ні німà. От ён унёс сы̀на ў хàтку да там і пакìнуў, а сам сі͡еў на ву͡оз да па кабы̀лцы, да па кабы̀лцы. Патарахці͡еў ён хучы͡эй, не аглядàючыса, каб ніхтò не дагнàў. Седзìць хлапчу̀к адзìн у хàцы да разглядàе, што там е. Ту͡олькі ось прыхòдзіць якìсь старэ̀нькі дзедòк і прòсіць напìцца. — Рад-бы я даць табі͡е напìцца, — кàжэ хлапчу̀к, — да немагу̀ хадзìць. — Прàшкі, — кàжэ дзедòк, — зачарпні да перш закашту̀й сам, ці харòшая вадà. — А хлапчуку̀ даўнò піць хаці͡еласо, хлебану̀ў ён да й вы̀дундзіў нèмаль пòўны ку͡орчык. Як вы̀піў, дак атрàзу пачу̀ў у сабі͡е таку̀ю сìлу, што здаèцца ўсю зѐмлю пераверну̀ў-бы, каб ту͡олькі былò аб што

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ўпѐрціса нагàмі. Напìўса дзедòк да й кàжэ: ні буольш, бо табіе трэ велìкая сìла,—да й зьнік, бàцпэ ягò й не былò. Падзівìўса хлапчỳк, дỳмаў, што гэто ямỳ прысьнìласо, алѐ бàчыць, што ў ягò здарòвые нòгі, што ён так ідзè, што пад сабòю й землì не чỳе. Напìўса ён яшчэ̀ таіе вадьі̀, дак і чỳецца, што ямỳ німà раўнì на ўсём сьвіеці. Хапіеў ён яшчэ̀ буольш налìць вадьі̀ да як узя̀ўса за збан, дак і разгнѐў ягò, а вадà вьі̀лілася. Схапìў ён ведрò да й пабіег да крынìцы. Шукàў ён яіе, шукàў,—німà, от бы ў зѐмлю правалìласа. Варòчаецца ён да хàткі, аж і тàя прапàла. Ён тудьі̀, ён сю̀ды да так заплỳтаўса у гушчэ̀чы, што не віедае кудьі̀ йці. Пастая̀ў ён трòхі да й пашòў прòсто. Ідзè ён, а сьпѐраду пападзѐнца тòўстая хвòя, абò дуб, як піеч. От схòпіць ён аднòю рукòю дзѐраво, дак тòе й хрỳсьне бы салòміна. Ідзè ён да варòчае дзераўля̀кі, бàцпэ там вìхар пралеціеў. А ён лòміць ліес дзеля̀ тагò, каб зрабìць міетку да ў дрỳгае тудьі̀ не прыйцì. Дòўго ён так ішòў, пакỳль вьі̀шаў на дарòгу. А там па-абàпал дарòгі лежàлі велìзазные каменì, бàцпэ вальі̀. От і пачàў ён перакідàць тòе каміеньне на дарòгу, бы картòплю. Туолькі ось іедуць багатырьі̀. Падъіехалі яньі̀ да й супыпìліса, бо ніельга іехаць дàлей, каміеньне мешàе.—Здаруоў, дзецю̀к,—кàжуць багатырьі̀,—што ты рòбіш?—Грàю сабіе,—кàжэ той хлапчỳк. От багатырьі̀ зьліезьлі з кòней да хаціелі апрастàць дарòгу; ўзелìса яньі̀ за адзìн кàмень, алѐ немòгуць ягò й крэ̀нуць. Падышòў тут хлòпец да й згруоб тòе каміеньне ў руоў.—Паіедзем з нàмі,—кàжуць багатырьі̀.—Як-жэ я паіеду, калì ў менѐ німà каня̀,—аткàзвае хлòпец.—Выбірàй сабіе каня̀ з нàшых.—Пашòў хлапѐц выбірàць сабіе каня̀, алѐ туолькі палòжыць каню̀ на сьпіну рỳку, дак той і ўпадзè на перэ̀дніе каліенкі. Перабрàў ён так усіх кòней, а сабіе не вьі̀браў ні гòднаго. От пашòў ён з багатырàмі, тьіе на кòнях, а ён піешкі. Туолькі ось бàчыць ён, што калà дарòгі мужьі̀к скарòдзіць пòле. Кабьі̀лка ў ягò худàя, малѐнькая, алѐ жьі̀лістая. Палажьі̀ў ёй хлòпец рỳку на сьпìну, а янà й не ўхмылìласа. От пачàў ён таргавàць тỳю кабьі̀лку, алѐ мужьі̀к не хòчэ аддавàць ні за якііе грòшы.—На вуошто мніе

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

гро̀шы, — ка̀жэ ён, — яшчэ̀ хто забъѐ, а без каня̀кі, як я ўпра̀ўлюса з гаспада̀ркаю. Без каня̀кі й чалаві͡ек не чалаві͡ек. — Паменя̀й сваю̀ кабы̀лку на каня̀, — ка̀жуць багатыры̀, — беры̀ сабі͡е на вы̀бар, яко̀га хо̀чэш. — Хто меня̀е, ў таго̀ хаму̀т чуля̀е, — ка̀жэ мужы̀к. Насілу багаты̀ры ўлама̀лі мужыка̀ да за па̀ру са̀мых лі͡епшых ко̀ней вы̀менялі хло̀пцу тую̀ кабы̀лку. Сі͡еў ён на кабы̀лку, й паі͡ехалі яны̀ да̀лей. Ту͡олькі ось падъі͡ехалі яны̀ к ту͡ой вѐсцы, дзі͡е жыў хло̀пца ба̀цько, да й ста̀лі кала̀ ку̀зьні кава̀ць ко̀ней. Непазна̀ў кава̀ль сы̀на, так ён зьмені̀ўса, да падкава̀ў і яго̀ кабы̀лку. От і про̀сіць кавальчу̀к, каб ба̀цько вы̀каваў яму̀ була̀ву. Сабра̀ў кава̀ль усѐ залі͡езо да й вы̀каваў таку̀ю булаву̀, што ў трох насілу яі͡е варо̀чаюць. Узя̀ў кавальчу̀к ту̀ю булаву̀, пакруці̀ў яі͡е адно̀ю руко̀ю да як шыбану̀ў уго̀ру, дак яна̀ неві͡едамо дзі͡е й дзі͡еласа. Стая̀ць багатыры̀ да дзіва̀цца. Алѐ ось панема̀лым ча̀сі͡е й гудзѐ та̀я булава̀, бы гру͡ом грымі̀ць, леці̀ць уні̀з. Падста̀віў кавальчу̀к калі͡ено. Уды̀рыласа булава̀ аб калі͡ено да ту͡олькі скрыві̀ласа. Прыба̀віў кава̀ль яшчэ̀ з пуд залі͡еза да й вы̀каваў мацні͡ейшую булаву̀. Падзя̀куваў кавальчу̀к, узяў ту̀ю булаву̀ да й паі͡ехаў з багатыра̀мі ў сві͡ет. Прыі͡ехалі яны̀ к аднаму̀ цару̀ й нанелі̀са на слу̀жбу. Па нема̀лым ча̀се абъяві̀ўса там вѐльмі ду̀жы зьмі͡ей і пача̀ў прылета̀ць да цяга̀ць к сабі͡е людзѐй. Бага̀цько пахвата̀ў ён людзѐй да й паі͡еў іх. Нарэ̀шце захаці͡еласо яму̀ ца̀рськаго мя̀са, от і схапі̀ў ён царэ̀ўну да й запъѐр к сабі͡е ў лѐху, алѐ не і͡есь, а трыма̀е на заку̀ску. Абъяві̀ў цар па ўсему̀ ца̀рству, што дась таму̀ паў ца̀рства й адда̀сь за̀муж царэ̀ўну, хто яі͡е вы̀бавіць ат зьмі͡ея, а яго̀ забъѐ. Мну͡ого парыва̀ласо сі̀лных багатыро̀ў бі̀цца з тым зьмі͡еям, алѐ ўсі͡е яны̀ там загубі̀лі сваі͡е ку͡остачкі. Нарэ̀шце вы̀зваліса й ты̀е багатыры̀, што прыі͡ехалі з кавальчуко̀м. — Паі͡едзем з на̀мі, — ка̀жуць яны̀ кавальчуку̀. — Ты яшчэ̀ малады̀, пара̀ й табі͡е шука̀ць сла̀вы. Паі͡едзем, та мы цебѐ навучым як бі̀цца. Згадзі̀ўса кавальчу̀к і паі͡ехалі яны̀ ра̀зам. От і͡едуць яны̀ да і͡едуць і падъі͡езджа̀юць, аж растанцы̀ на даро̀зе й стаі̀ць слуп, а на ём штось напі̀сано. Быў з іх адзі̀н пісьмѐнны, от і пача̀ў ён чыта̀ць. От і перачыта̀ў ён, што хто

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

паі͡едзе напрàво, той дабу̀дзе сабі͡е слàву, хто налі͡ево, знàйдзе багàтство, а хто прòсто, тагò спаткàе сьмерць. І пачалì тут багатыры̀ выбірàць, куды̀ хто ахву͡оч і͡ехаць. Вы̀бралі яны̀ ўсі͡е дарòгу напрàво й паі͡ехалі шукàць слàвы, ту͡олькì адзìн кавальчу̀к кàжэ, што ат сьмèрці не атпèрці, дак лі͡епш і͡ехаць прòсто. Як ні адмаўлялі багатыры̀, а кавальчу̀к упѐрса да такì адзìн паі͡ехаў прòсто. Праі͡ехаў ён трòхі да й трàпіў на ту̀ю сàмую хàтку, куды̀ ягò заў̀ёз бàцько безнòгаго. Прывезàў ён кабы̀лку да й улі͡ез у хàтку. Зірну̀ў ён у кут, аж там у зàпечку седзìць вѐльмі старэнькая бàба. — Здарòва была̀, бàбко! — Дзя̀куй табі͡е дзецючòк. Куды̀ бу͡ог несè? — пытàе янà. — Паі͡еду, бàбко, прòсто. — Не і͡едзь, дзі͡еткі, бо загìнеш. Там зьмі͡ей зъі͡есь. — Ні͡е, бàбко, паі͡еду, хаць загìну. — Шкòда мні͡е цебè, дзі͡еткі. Ты быў у маѐй хàтцы, дак ты мні͡е, бàццэ ру͡одны ўнук. Дак от-жэ слу̀хай менè. Што ты ні сустры̀энеш на дарòзі, дак не забівàй, та янò табі͡е ў дарòзі да ў бедзі͡е паслу̀жыць. — Падзя̀куваў хлòпец бàбе да й паі͡ехаў дàлей. Ту͡олькі ён атъі͡ехаў ат хàткі, аж вы̀скачыў зàяц. Хаці͡еў ён швырну̀ць у ягò булавòю, алѐ той кàжэ: не бі менѐ, я табі͡е ў бедзі͡е паслужу̀. Паі͡ехаў ён дàлей, а зàяц бежы̀ць за ім нàзіркам. Ту͡олькі ось вы̀скачыў воўк. Ён за булаву̀. А воўк кàжэ: не бі менѐ, бу̀ду табі͡е патры̀эбен у бедзі͡е. Апусьцìў ён булаву̀ да й паі͡ехаў дàлей. Бежы̀ць воўк нàзіркам. От падъі͡ехаў ён к камі͡еннуй гары̀. Німà як і͡ехаць дàлей. Зьлі͡ез ён з кабы̀лкі, пусьціў яі͡е на пàшу, а сам пашòў шукàць дарòгі. Тым чàсам зьмі͡ей вы̀лез з лёху жыравàць да як раз трàпіў туды̀, дзі͡е была̀ кабы̀лка. Бàчыць вòўк, што зьмі͡ей зы͡есь кабы̀лку, от ён як напалòхаў яі͡е, дак янà й пусьцілася наўцекачà сусіх ну͡ог да тым чàсам і ўцекла̀ ат зьмі͡ея. Пажыравàў зьмі͡ей да й верну̀ўса к сабі͡е ў лёху. От прыбі͡ег к хлòпцу зàяц да й паказàў яму̀ ту̀ю шчы̀ліну, дзі͡е зьмі͡ей зачыніў царэ̀ўну. Пагру̀каў хлòпец булавòю ў камі͡енную сьці͡ену, от там і паказàласа царэ̀ўна да й кàжэ: уцекàй, бо зьмі͡ей зы͡есь. А тут хлòпец размахну̀ўса да як трэ̀сьне булавòю аб сьці͡ену, дак яі͡е й вы̀садзіў. Кìнуласа к яму̀ царэ̀ўна на шы̀ю да давàй прасìць, каб даў̀ёз яі͡е к мàтцы да к бàцьку. Тым чàсам

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

зьмі͡ей вы̀сунуў го̀лаў праз шчы̀ліну да й хаці͡еў зьі͡есьці таго̀ хло̀пца. Тут хло̀пец схваціў булаву̀ да як рыэзне па галаві͡е зьмі͡ея, дак з яі͡е й маскі̀ пацеклі̀. От атрыэзаў ён у зьмі͡ея язы̀к да й палажы̀ў ягò сабі͡е ў ка̀йстру. Тым ча̀сам зьмі͡ей вы̀сунуў другу̀ю го̀лаў. Хло̀пец і ту̀ю размажджы̀ў да вы̀разаў язы̀к. Такі̀м пара̀дкам расква̀сіў ён зьмі͡ею ўсі͡е дванàнцаць галу͡оў. Ра̀да царэўна, што такі̀ знайшо̀ўса багаты̀р да й стра̀ціў ліхо̀го зьмі͡ея. Спадаба̀ўса ёй той хло̀пец і абеца̀ла яна̀, што пу͡ойдзе за ягò за̀муж, як ён завезè яі͡е к ба̀цьку да к ма̀тцы. А што гэто пра̀ўда, дак яна̀ разарва̀ла ху̀стачку да й дала̀ хло̀пцу адну̀ палаві̀нку. Палажы̀ў хло̀пец ху̀стачку за па̀зуху да й лёг спаць, бо вѐльмі ўтамі̀ўса, паку̀ль ухадзі̀ў зьмі͡ея. Сьпіць хло̀пец багаты̀рскім сном і не чу̀е, што беда̀ блі̀зко. Тым ча̀сам ты̀і͡е багатыры̀ падъі͡ехалі туды̀, ўба̀чылі царэўну да й пачалі̀ яі͡е пыта̀ць, як то̀е ўсе было̀. Расказа̀ла яна̀ ўсе, як было̀ да й ка̀жэ, што пу͡ойдзе за̀муж за таго̀ хло̀пца. Пазаві̀дувалі яны̀ хло̀пцу, падбі͡еглі к яму̀ со̀ннаму да й забі̀лі ягò. По̀тым пачалі̀ яны̀ спрача̀цца, каму̀ паві̀нна даста̀цца царэўна. До̀ўго спрача̀ліса яны̀, нарэшце пачалі̀ бі̀цца, паку̀ль пазабіва̀лі адзі̀н другòго. Заста̀ўса ту͡олькі адзі̀н са̀мы ду̀жы да спры̀тны. От ён прыму̀сіў царэўну, каб яна̀ сказа̀ла ба̀цьку да ма̀тцы, што гэты багаты̀р забі̀ў зьмі͡ея й вы̀бавіў яі͡е з нево̀лі. Німа̀ ёй чаго̀ рабі̀ць, трэ згаджа̀цца, бо яі͡е каха̀наго хло̀пца німа̀ ў жывы̀х. От той багаты̀р пасадзі̀ў царэўну на сваймо̀ каня̀ да й паўёз яі͡е к цару̀. Тым ча̀сам за̀яц пабі͡ег да крыні̀цы, набра̀ў там жывоі͡е ваду̀ ў рот, прынёс да й пы̀рснуў хло̀пцу ў во̀чы. Ажы̀ў той да й прахапі̀ўса. Зірну̀ў ён, аж царэўны ўжэ німа̀. Дагада̀ўса ён, што тут было̀ лі̀хо, да чуць не запла̀каў ат жа̀лю. Хаці͡еў ён хучы͡эй бі͡егці к цару̀ да расказа̀ць там усю̀ пра̀ўду, дак, ві͡едамо, пі͡ешкі далѐко не забежы̀ш ху̀тко. Тым ча̀сам воўк пабі͡ег па лі͡есі да й тра̀піў ягò кабы̀лку. Напужа̀ў ён яі͡е да й прыгна̀ў туды̀. Сі͡еў гэто хло̀пец на кабы̀лку да й паі͡ехаў хучы͡эй к таму̀ цару̀. Прыезджа̀е ён туды̀, аж там ужэ ўсі͡е гато̀вяцца к весі͡ельлю. Пашо̀ў ён к цару̀ да й расказа̀ў яму̀ ўсю пра̀ўду. Не ма̀е цар ві͡еры да й пыта̀е ў дачкі̀. Алѐ ві͡едамо, та̀я ка̀жэ

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

туолькі тое, што ёй веліеў казаць той багатыр. От цар веліеў за паклёп павіесіць таго хлопца. Тут туолькі пачалі яго пытаць, хто ён такі. — Я, — кажэ, — безногі багатыр, а буольш я вам нічого не скажу. От ужэ ведуць таго безногаго багатыра віешаць. А тым часам царэўна пашла ў сад гуляць. Ідзе хлопец да й бачыць, што кала плуоцьья туляецца заяц. От ён выняў з-за пазухі тую хустачку да й кінуў зайцу. Схапіў заяц хустачку да й прымчаў царэўне. Зірнула тая да чуць не абамліела. — Чаго ты, — пытае цар. Тут яна кінулаcа цару-бацьку ў ногі, расказала ўсю праўду да й пачала прасіць, каб не віешалі таго хлопца, каторы збавіў яіе ат зьміея. От цар веліеў не віешаць таго хлопца, а прывесьці яго ў палацы. Прышоў ён з сваею кайстраю да й стаіць. Пачаў тут цар пытаць яго, як тое было. Расказаў ён усе, як было. А той багатыр кажэ, што гэто непраўда. Тагды безногі багатыр выцяг з кайстры зьмеіныіе языкі да й пытае: а гэто што? Зьмешаўся той багатыр, а царэўна паказала бацьку абіедзьве палавінкі хустачкі. Тагды ўсіе павіерылі. Таго ліхого багатыра павіесілі, а безногі багатыр жаніўся з царэўнаю да й заўладаў палавінаю царства. Справілі гучнае весіельле. Я там быў і мёд піў, па барадзіе цекло, а ў рот не папало.

Даніло Куліеш.

Чудзін.

24. Мужык дурэнь як варона, а хіцер як чорт.

Было тое даўно, як сьвіет яшчэ не быў такі хітры, як цепер. Жыў сабіе адзін мужык да такі дурны, бы варона. Пакуль стары бацько правіў, датуль яшчэ веласа секая-такая сьлімазарная гаспадарка. Але ось бацько занепаў, з тыдзень пакачаўса да й аддаў богў душу. Застаўса дурэнь адзін. Німа ў яго дроў, от ён паліез на хату, паскідаў з страхі дошкі да й навалачыў іх у хату цыэлы ворах. Напрэ тых дошак поўную піеч да й запаліць. Тырчаць дошкі з печы, так што й прайці ніельга. — Чаму ты іх не

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

пасі͡ек, — кàжуць сусі͡едзі, — гэто-ж ты яшчэ селò спàліш. — Яны й сàмі згарàць, на што іх сі͡еч, — аткàзвае дỳрэнь да паграваe сабі͡е чэраво пèрад пòламъям. Даў бу͡ог вèсну, прыгры͡эло сòнейко, пачалò зганяць сьні͡ег, палілàса звèрху вадà да так, што дурнòму ні͡егдзе й схавàцца ў хàці. От ён увалу͡ок у хàту кадỳшку, палажыў яі͡е бòкам, да й залі͡ез у яі͡е. Сагнàло з пòля сьні͡ег, пачалì людзі лàдзіць сòхі да бòраны, пачалì гатòвіцца абраблять зèмлю. Пашòў і той дỳрэнь рапаравàць сабі͡е сòху. Бàчыць ён, што ў сасі͡е астàўса ту͡олькі адзìн рагàч, от ён узлі͡ез на дуб, сі͡еў на галìну да й сечэ яі͡е. — Што ты рòбіш? — пытàюць лю̀дзі, — гэто-ж ты ўпадзèш. — Аткỳль вы знàеце, — аткàзвае дỳрэнь да й не кìдае сі͡екці. Сі͡ек, сі͡ек ён, пакỳль і грымануў на зèмлю рàзам з галìнаю. Землà былà яшчэ мяккая, от ён ту͡олькі трòхі атсадзіў азàдак. Пашлì лю̀дзі арàць да сі͡еяць. Сабрàўса й дỳрэнь. Ён перш пасі͡еяў, пабаранавàў да давàй тагды арàць. — Дỳрэнь, што ты рòбіш? Гэто-ж трэ перш арàць, а пòтым сі͡еяць. — Не кìям, а пàлкаю, — кàжэ дỳрэнь да й рòбіць, як сам хòчэ. — Ты чòрта хрысьцì, а ён кàжэ: ў вòду пусьцì, — гавòрàць лю̀дзі да й гòдзі вучыць дурнòго. Алè, ві͡едамо, дỳрню сам чорт памагàе. Вы̀даласо вèльмі сухòе лі͡ето, дак у дỳрня на пòлі зрадзìло лі͡епш як у людзèй. Нажàў дỳрэнь хлі͡еба паўню̀сьсенько гумнò, намалаціў збу͡ожа цы͡элую клі͡ець. — Цепèр у цебè мну͡ого хлі͡еба, — кàжуць жанкì, — дак чамỳ ты, дурны̀, не жэ̀нісса? — Я чакàю, пакỳль жу͡онка самà менè ажэ̀ніць, — аткàзвае дỳрэнь. Пасьмеялìса жанкì да й пашлì раскàзваць, што дỳрэнь чакàе, пакỳль бàба самà ягò ажэ̀ніць. От былà там аднà маладàя ўдавà — бездзі͡етуха да такàя пагàная бàба, што яі͡е гаспадàр не вы̀трымаў да й засілìўса. Прышлà тàя бàба к дỳрню да й кàжэ: дурны̀ ты, дурны̀, чагò ты жывèш бы пень? Давàй пажэ̀німасо. — Гі-гі-гі! А чамỳ ні͡е? Жанìса са мнòю, — аткàзвае дỳрэнь. Пашлà бàба к папỳ, назьбірàла людзèй да й зрабìла лад. Ту͡олькі пабрàліса яны̀, як і пачалà бàба пілìць дỳрня да біць ягò кавенèю. Цèрпіць дỳрэнь, дỳмае, што так трэ̀ба, ві͡едамо, на тòе-ж ён і гаспадàр, каб былò бàбе на ку͡ом пачасàць рỳкі. Зьневажàла ягò, зьневажàла бàба,

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

біла, біла, а ён хаць бы што, — маўчы̀ць бы пень. Яшчэ гары͡эй злу̀е пага̀ная ба̀ба да лу̀піць яго̀ абі͡еручкі та мі͡ешалкаю, та качарго̀ю. Шко̀да ста̀ло дурно̀му ба̀бу, што яна̀ саўсім атсадзіла сабі͡е ру̀кі, от і пабі͡ег ён ат яі͡е наўцекача̀. А ба̀бе ту͡олькі то̀е й трэ̀ба было̀. Паба̀чыла яна̀, што гаспада̀р уцека̀е, дак яна̀ за ім. — Я-ж табі͡е пакажу̀ сякі̀-такі̀, які̀ ты гаспада̀р, што з сваі͡е ха̀ты ўцека̀еш, я-ж табі͡е пакажу̀. — Бежы̀ць ба̀ба з-за̀ду да перы͡эсьціць яго̀ па чу͡ом папа̀ло. Пабі͡ег ён цѐраз агару͡од да й пераско̀чыў цѐраз стары̀ кало̀дзесь, а ба̀ба разагна̀ласа да шусь туды̀ на са̀мае дно. Як леці͡ела яна̀, так і сі͡ела чо̀рту на ка̀рак. Не пасьні͡еў той аглѐдзецца, як яна̀ дава̀й яго̀ лу̀піць мі͡ешалкаю па чу͡ом папа̀ло. Круці̀ўса, круці̀ўса чорт, не ві͡едае, што рабі̀ць з пага̀наю ба̀баю, прысі͡еў на ку͡ортачкі, прыгну̀ў між калі͡ень го̀лаў, каб ба̀ба не пазьбіва̀ла раго̀ў, седзі̀ць да аж пішчы̀ць. Зірну̀ў ду̀рэнь, што ба̀ба чорт ві͡едае, куды̀ дзі͡еласа да й паглядзі͡еў у стары̀ кало̀дзесь. Нахілі̀ўса ён туды̀, тым ча̀сам ба̀ба здаво̀ліласа муштрава̀ць чо̀рта, да глядзі̀ць, як-бы атту̀ль вы̀лезьці. Уба̀чыў чорт, што ду̀рэнь нахілі̀ўса над кало̀дзісям да й дава̀й яго̀ прасі̀ць, каб адратава̀ў ат ба̀бы. — Што хо̀чэш дам, — ка̀жэ чорт, — ту͡олькі аслабані̀ ат пага̀наі͡е ба̀бы. — Кі̀нуў ду̀рэнь чо̀рту веро̀ўку. Той схапі̀ўса за яі͡е да й палі͡ез, а ба̀ба зноў шамеля̀х яму̀ на ка̀рак. Вы̀лез чорт і вы̀нес на сабі͡е й ба̀бу да як сунѐ, дак ту͡олькі хву͡ост зацеляпа̀ўса. Баі̀цца чорт варо̀чацца ў стары̀ кало̀дзесь да й залі͡ез к па̀ну ў пако̀і. Гру̀кае чорт у пако̀ях усю̀сеньку ну͡оч, не даѐ пану͡ом супако̀ю. Пашла̀ прачу̀тка, што ў па̀на ў пако̀ях атубава̀ўса чорт да й недаѐ пану͡ом жыць. Яко̀е ту͡олькі ра̀ды ні дава̀ў пан: ён і прасі̀ў ксендза̀ да сьвяці̀ў пако̀і сьвянцо̀наю вадо̀ю, куры̀ў ру͡озымі сьвянцо̀нымі зѐлкамі, прасі̀ў знахару͡оў, — алѐ нічо̀го не памага̀е, — седзі̀ць чорт да ку͡ожную ну͡оч спраўляе там ігры̀шчэ. Саўсім вы̀ракса пан пако̀яў. От ду̀рэнь пашо̀ў да па̀на да й ка̀жэ, што ён умі͡ее, як чарцѐй выганя̀ць. Рад пан. Абеца̀ў ён заплаці̀ць ду̀рню мно̀го гро̀шэй, каб ту͡олькі ён вы̀гнаў чарцѐй з пако̀яў. Заста̀ўса ду̀рэнь адзі̀н у пако̀ях на̀нач, ту͡олькі ўзяў с сабо̀ю во̀жыка. От падышла̀ глу̀пась,

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

пачалі зьбірàцца чэрці, а дўрэнь і кàжэ: ой, уцекàйце, бо сюды йдзе бàба, та задàсь янà вам пèрцу. — Дзякуй табіе, — кàжэ той чорт, — што ты перасьцеруог. На-ж табіе за тòе гасьцінца. — І даè чорт дўрню цыэлую жмèню грòшэй. Схавàў дўрэнь грòшы за пàзуху да й кàжэ: — чўешь, онь ідзè бàба. — А то тўпаў да скруобса вòжык. Спужàўса чорт, падагнўў хвуост, да й не віедае, як ат бàбы ўцекці. — Заплаці мніе, як ты абецàў, — кàжэ дўрэнь, — та я цебè схавàю. — Дòбрэ, — кàжэ чорт, — там і там закòпаны грòшы, вазьмі іх сабіе, туолькі схавàй менè ат бàбы. — Дастàў дўрэнь з кішэні ражòк з табàкою, атчыніў ягò да й кàжэ: — ліезь сюды. — Паліез чорт, насілу зьміесьціўса. Зачыніў дўрэнь ражòк да й палажыў у кішэню. Тым чàсам убàчылі чэрці, што гаспадарà німà, дак і сўнулі, хто цèраз кòмін, а хтò цèраз шчыліну да й чорт віедае, куды дзіеліса. Заплаціў пан дўрню цыэлую кòпу грòшэй да яшчэ даў гасьцінца. Пашòў дўрэнь да й выкапàў там пòвен гаршчòк срыэбла, бы лускі. Забрàў ён грòшы да гаспòды да й захавàў пад піеч. Туолькі ось знòў зневажàе ягò бàба. От ён атчыніў ражòк, а чòрт аттўль і выскачыў. Убàчыў ён бàбу да так спалòхаўса, што й акаменіеў. А бàба спалòхалася чорта да й гòдзі зневажàць. З тых чàсаў пачалі яны дòбрэ жыць да грòшы спажывàць.

Даніло Куліеш.

Чудзін.

25. Дзевòчы набуор.

Вы хòчэце, каб я вам сьплёў кàзку, а я от здаèцца ўсіе казàў, а якіiе яшчэ знàю, дак вы гавòрыце, што гэто так напісано ў ксёнжках. Я чалавіек цёмны, неўміею ні чытàць, ні пісàць, а туолькі змàлку наўчыўса хлусіць тòе, што сам чуў ат людзèй. Дак от бàчыце, як развàжыць, та я й не хлушў, а туолькі кажў тòе, што сам чуў, бо то не хлусьня, што мніе хлусілі. Алè ось сегòднячы раскажў вам саўсім прàўду, бо гэто былò ўжэ за маю

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

памяць, а мо й вы самі паметаеце. Эгэ-ж, мусіць паметаеце. Гэто было якурат посьле таго, як змокло сусіеднее село, бо я тагды жаніў сына. Ён, бачыце, ўзяў сабіе жуонку з сусіедняго села. Дак от паслухайце туолькі, як гэто было. От гэто якась на Велікдзень, ці што. А мо й ніе. От віечным правам забыў. Старась, ужэ пачаў забываць. Бачыце, не паметаю, што я сегоннячы абіедаў, а мо й саўсім нічого не абіедаў, бо які цепер ліха абіед. От калі падсуне невіехна якое небудзь бульбы, та й за тое дзякуй, а калі ніе, та й так добрэ. Дак ось гэстую невіехну муой сын узяў тагды так штучно, так штучно, што просто сьміех і людзям казаць. Дак што-ж гэто я хаціеў расказаць? Запаметаваў... Эгэ-ж, от і ўспомніў. От гэтак седзімо мы на Юръя з бабаю, — каб ёй на туом сьвіеці лёгенько ікнуласо, — седзімо мы на Юръя. Яна яшчэ наварыла чырвоных яец, каб іці на могліцы, а бачыце Юрэй быў як раз на Радуніцу. От седзімо мы, а нябуошчыца й кажэ, — ці не пара нам свайму Кузёмцы рабіць лад? — А я кажу, што ён яшчэ малады хлапчук, што яму яшчэ не запах хвартух, да й нам яшчэ напрыкрае цацкацца з невіехнаю. А яна кажэ: Ой, Данілко, баюса я, каб не было гарыэй. Да й кажэ ціхенько: хібаж ты не чуў, што кажуць людзі. А што? — пытаю я, — мало чаго наплетуць людзі. — Ой гэто мабыць праўда, — гаворыць яна, — баюса я каб мы не засталіса без невіехны. Што ты, бабо, — я ку, — хібаш наш сын неўдаль, ці што, што яму дзіеўкі не знайдзецца. Гэстаго тавару шмат. — Дак ты не чуў, — кажэ яна, — што людзі гавораць, бацэ будзе на дзіевак набуор. — Да што ты, перахрысціса, каму гэстыіе дзіравыіе гаршкі патрэбны? Ось у Сымона аж пъяць, дак пеўне ён рад, каб іх хаць разам забралі, але німа такіх дурных людзей. — От мы гэ пагаманілі да й пашоў я папаіць кабылу, ці што да й высунуўса на вуліцу пабалакаць з добрымі людзьмі. От пачаў я закурваць люльку, аж чую, ўсіе як у бубен бъюць, гамоняць, што Біелы рускі цар заваяваў якоесь чужое царство, але там усе чорные людзі, арапы, ці што, а моо то й саўсім не людзі, а палпы, ці якое ліхо. От кажуць, каб развесьці там біе-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

лых людзѐй, цар веліеў зрабіць на дзіевак набуор да й паслàць тудѝ на прыплуод. Алѐ мàбыць з гэстаго нічòго не бỳдзе, калѝ не нагòняць тудѝ маскалёў, — шуткỳюць дзецюкі. Алѐ-ш, кàжуць, тудѝ завỳць ахвуотнікаў і з нàшаго брàта. А Мікіта Гаравѝ й кàжэ: я пѐршы пайдỳ ахвуотнікам. Да пачалѝ тут дзецюкі шуткавàць да сьмеяцца, што Мікіта хòчэ быць над бàбамі, бы певỳн над курàмі. Пагаманілі мы, мужчѝны да й гòдзі, а бàбы пашлѝ ляскатàць, пашлѝ бòжкаць да так напалòхалі дзіевак, што тыіе хòдзяць, чуць жѝвы. От тагдѝ к нам заявілаcа самà свàцьця да давàй свàтаць за нàшаго Кузёмку сваю дачкỳ. Янà вѐльмі баялаcа, каб яіе неўзелі ў маскалѐ да не загнàлі к тым арàпам. Не хаціеў я, каб Кузёмка маў такỳю жуонку, алѐ небуошчыца, мая бàба, — сьвіетлы ёй рай, — началà й так, і сяк гаварѝць да й угаварѝла. От тагдѝ й зрабілі мы лад. Дак о то кажѝэце, — наш Кузёмка ўцёк з цэрквы, як веньчàлі да й схавàўся ў лòзу. Насілу ягò там трàпілі да сілкòм прыцяглі ў цэркву. Туолькі гэто мы зрабілі весіельле, як ось і прыежджàюць к нам пісар з старшынòю перапісваць дзевòк. Седзіць пісар да ўсе пішэ, да ўсе пішэ, аж перò скрыпіць, бы зімòю лàпаць. Мàткі ў слёзы, а дзіеўкі ўсіе й разбіегліса ў ліес да й пахавàліса ў лòзу. Седзяць там і ні чхнỳць. Пачалѝ гэто мàткі хадзіць да пàна пісара да да старшыны, пачалѝ насіць яйца, сàло, палатнò, абò што другòе да прасіць, каб не запісвалі іх дзевòк. Налàдувалі пісар да старшына дабрà два вазѝ да й паѐхалі сабіе. А дзіевак насілу з лазѝ дамуоў залучѝлі. Дак от вам не кàзка, а прàўда.

Даніло Куліеш.

Чудзін.

26. Цікàвасць.

Жыў сабіе адзін чалавіек і былà ў ягò вѐльмі гòжая жуонка да такàя пагàная, такàя языкàтая, што бедà. Ты ёй скàжэш аднò слòво, а янà табіе дзèсяць да як пачнѐ сыпаць, пачнѐ верашчàць, дак і свіет не міл, хаць берѝ да й тапіса. Бàло маў-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

чыць гаспадàр, бы вады ў рот набрàўшы, маўчыць, сцеражэцца паганаіе бàбы, алè не ўмòўчыць, бо, віедамо, ў гаспадàрцы ўсе трапляецца, трапляюцца руозные прыгòды да й бàба не ўцèрпіць, слепіцаю ў вòчы ліезе, прыстаè, чàму гаспадàр маўчыць. Кàжуць-жэ, што ліхòму не ўгòдзіш: маўчыш — кèпсько, загавòрыш — яшчэ гарыэй. Намучыўса той чалавіек з пагàнаю бàбаю, да нічòго не парàдзіш, трэ жыць, як набежыць, трэ церпіець, калі хòчэш гаспадаравàць. Бо, віедамо, гаспадàр без бàбы не гаспадàр, а пустòго двара зàтычка. А тут якòе ні е, а ўсе такі слімазàрнае хаджàйство, свая хàта, свуой кутòк, асўшак хліеба на сталіе, стрàва ў пèчы. Зірнèш на двуор, — там свінка скрыгічэ, кўрыца кудàхчэ, куот мяўкае — дамуоўка, бы ў людзèй. А што бàба лапòчэ, дак што яіе слўхаць, — дўмае той чалавіек, — абы быў абіед, каб лàнтух наледавàць. — А тут яшчэ бàба гòжая, румъяная, бы кроў з малакòм. А вòчы чòрные, празрыстые. Як гляне, дак аж у сèрцэ закòле і зрòбіцца цёмно ў вачў. Што ні вымышляе тàя ліхàя бàба, а мужык пагнèцца трòхі да такі яіе слўхае, рòбіць тòе што янà зхòчэ. Алè ось пачалі другіе зàрыцца на тўю бàбу, пачалі к ей прыставàць та акамуон, та правантòвы пісар, та дзяк. Віедамо, бàба гòжая, ў сакў — зàўжды кòле вòчы тым лю̀дзям, у катòрых ат гультàйства шкўра пўкаецца. Алè куды там, — бàба бы крамèнь, ні з якòго бòку яіе не ўкўсіш. Далà янà атпуор не аднамў малайцў: акамòна выхрысьціла качаргòю, правантòваго пісара абліла памыямі, дзякў вырвала кòсу, а ямў хаць-бы што. От прыстàў, бы смалà: цягàецца, нòсіць гасьцінцы да гавòрыць так гòжэ, от бы ў ксёнжцы чытàе. Буольш усягò спадабàласо бàбе, як дзяк пачнè благатàць да спевàць бы ў цэркві. Спевàў, спевàў дзяк да й знюхаўса з тою жанчынаю, туолькі гаспадàр мешàе: ўсе аціраецца калà дòму. От і надўмаласа бàба, каб ат гаспадарà аслабаніцца да й пасылàе ягò ў сьвет, прынесьці ёй цікàвасць. — Надаіела, — кàжэ, — мніе такàя жытка, ніякаіе цікàвасці я не бàчу. Сегòдня тòе, што ўчòрэ, зàўтрэ тòе, што сегòдня. Дай мніе такўю цікàвасць, якòіе я нікòлі не бàчыла, а то я пайдў ў пруочкі. —

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Німа̀ чаго̀ рабі̀ць, пашо̀ў той чалаві͡ек у сьві͡ет шука̀ць ціка̀васц°. Ці до̀ўго, ці ма̀ло ён хадзі̀ў, ту͡олькі ўтамі̀ўса, накла̀ў калѐ лі͡есу агню̀, сі͡еў і паграва̀ецца сабі͡е да падкла̀двае дро̀вы. Ту͡олькі ось чу̀е, хтось крычы̀ць у лі͡есі. Уско̀чыў ён і пабі͡ег на той гук. Прыбега̀е да й ба̀чыць, аж аберну̀ўса цяжкі ву͡оз, а пад ім ле-жы̀ць чалаві͡ек і нѐмажэ з пад яго̀ вы̀лезці. Узя̀ў гэто ён вагу̀, падва̀жыў ву͡оз і аслабані̀ў таго̀ чалаві͡ека. — Дзя̀куе той, абеца̀е, што памо̀жэ ў прыго̀дзе. От паднелі̀ яны̀ ву͡оз, падъі͡ехалі к агню̀ да й заначава̀лі. Пагрэ̀ліса яны̀ кала̀ агню̀, от той нѐзнаёлы ча-лаві͡ек і пыта̀е: куды̀ ты, чалаві͡ечэ йдзѐш? — У сьві͡ет, — адмаў-ля̀е той. — Чаго̀-ж ты йдзеш у сьві͡ет? — Таго̀ й таго̀, — ка̀жэ ён. От мая̀ ліха̀я жу͡онка пасла̀ла менѐ ў сьві͡ет, каб я даста̀ў ёй ціка̀васць, яко̀і͡е яна̀ яшчэ̀ не ба̀чыла. І ка̀жэ, калі̀ я не даста̀ну тако̀і͡е ціка̀васці, та яна̀ пу͡ойдзе ў пру͡очкі. А што я бу̀ду рабі̀ць у гаспада̀рцы без ба̀бы? — Эй, братко̀, ві͡едаеш што, хаць ціка̀-васцей вѐльмі мну͡ого на сві͡еце, ту͡олькі трэ̀ба ўмі͡еючы іх шу-ка̀ць. Куды̀ ні зірні̀, — ўсю̀ды ціка̀васць, да не ку͡ожын яі͡е ба̀-чыць. Ось і я пакажу̀ табі͡е ціка̀васць. — Сказа̀ўшы то̀е, пашо̀ў ён к во̀зу, даста̀ў з яго̀ го̀ршчык, пі͡еўня й пры̀гаршчы круп. Потым налі̀ў у го̀ршчык з бікла̀гі вады̀, зары͡эзаў пі͡еўня, аску̀б яго̀, апалі̀ў на агні̀, вы̀патрашыў, абмы̀ў і палажы̀ў у гаршчо̀к, пасы̀паў туды̀ круп і тро̀хі со̀лі да й прыста̀віў к агню̀. Па не-ма̀лум ча̀се кру̀пнік звары̀ўса, тагды̀ ён прынёс дзві͡е ло̀жкі, да-ста̀ў з варэ̀нькі бо̀хан хлі͡еба й ка̀жэ: садзі̀са, бу̀дам вечэ̀раць.— Павечэ̀ралі яны, а ён і ка̀жэ: ці-ж гэто не ціка̀васць? Пагля-дзі͡еў на яго̀ наш гаспада̀р і ка̀жэ, што ў гэтум ён не ба̀чыць ні я̀каі͡е ціка̀васці, бо й яго̀ ба̀ба гэтак са̀мо ва̀рыць кру̀пнік. Тагды̀ той падару͡ожны сабра̀ў ко̀сьці пі͡еўня, палажы̀ў іх наза̀д у го̀р-шчык, і атту̀ль вы̀скачыў жывы̀ пі͡евень.—От гэто ціка̀васць!— закрыча̀ў наш мужы̀к. — Хіба̀-ж то мѐньшая ціка̀васць, — адмаў-ляе яму̀ падару͡ожны, — што з яйца выхо̀дзіць кураня̀? — Аджэ̀ мѐньшая, бо й мая̀ жу͡онка са̀дзіць ку̀рыцу на я̀йца, дак з іх выхо̀дзяць кураня̀та. — Ну, до̀брэ, — ка̀жэ той падару͡ожны, — ты менѐ атратава̀ў ат сьмѐрці, дак за то̀е я дам табі͡е гэсты го̀р-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

шчык і твая жуонка сама зробіць тое, што я рабіў, от ёй і будзе цікавасць. — Падзякуваў той чалавіек, палажыў горшчык у кайстрачку да ва ўсю нуоч пусціўса хучыэй да гасподы, дарам, што ногі баліелі. Біег ён да біег. Нахапіўса вечар, стало цёмно, хоць воко выкаль. Ідзе ён цераз поле, нагамі дарогу мацае; а кругом ціхо, баццэ ў вусе. Сумно яму аднаму серуод поля от і пачаў ён сьвістаць, да туолько сьвіснуў, як чорт віедае аткуль узелосо ўселякаіе нечысці: та яна скавычэ, бы совы, та перагукваецца, от нераўнуючы рыхтык пуоп з дзяком у цэркві, та верашчыць ці скігічэ ў расліне кала самаіе дарогі, та здалёк рагочэ, бы кабыла, як убачыць сваё жарабъя, та плачэ, сіеўшы на йгрушы, аж заліваецца. Годзі ён сьвістаць, страх яго апанаваў; хаціеў біегці, да ногі падкасіліса, а тут валасы на галавіе сталі торч, аж шапку падымають. Хаціеў ён паправіць шапку, падняў руку ўгору да лап рукою ў павіетры за штось мяккае, бы пух. Яшчэ гарыэй спужаўса ён і сунуў са ўсіх нуог, сам не віедаючы куды. Біег, біег і туолькі тагды ўтаймаваўса, як убачыў, што ўперадзе бліснуў агеньчык. От ён трохі атдыхаўса да й пачасаў просто на той агеньчык. А тут купъё да карчы. Блутаўса ён, блутаўса, нарэшце прыцёгса к хлопцам па начліег, дзіе яны пасьцілі коней. Разглёдзяўса ён кала агню, ажно гэто хлопцы з яго вёскі. От ён і пытае хлопцаў, ці не віедаюць яны, што ў яго робіцца дома, як там адна жуонка спраўляецца з гаспадаркаю. — А якое ёй ліхо, — кажуць хлопцы, — як цебе не было, дак дзяк зрабіў там піечкі й лаўкі. — Кепськая справа, — думае сабіе ён, — пачакай-жэ, правучу я гэстаго даўгагрываго. — От ляглі яны ўсе спаць кругом агню да й разам захраплі, а яму не спіцца. Усхапіўса ён чуць сьвіет, узяў сваю кайстрачку да й сунуў да гасподы. Прыбегае ў вёску, аж яшчэ ўсіе спяць. Падышоў да сваіе хаткі, — агонь свіеціцца, а нічого не чуваць. — Дай, — думае, — папілную, ці невыдзе хто з хаты.—От зняў ён з себе кайстрачку, выняў з яіе той горшчык, павіесіў яго кала дзверэй на плуот, а сам пашоў у гумно, лёг на салому да й цікуе, ці не выдзе хто з хаты. Праз недоўгі час выскачыла да віетру яго жонка, зірнула на плуот

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

да й убачыла незнаёмы горшчык. І падумаласо ёй, што гэто хлопцы прыгатавалі горшчык, каб ім грукнуць у сціену і спужаць, як яна ляжэ спаць з дзяком. Схапіла яна той горшчык і хаціела закінуць яго ў вагаруод, дак куды там, — рука к горшчыку й прырасла. Забыла яна й асцерогу да як закрычыць ат страху, аж дзяк спужаўса. Выскачыў ён і хаціеў атарваць ат яіе той горшчык, да туолькі ўзяўса, як і яго рукі прыраслі. Збіегліса тут на крык людзі да хто хопіцца, дак і прырасцё. На рэшце падышоў і сам гаспадар. Атчапіў ён усіх, апрыч дзяка, да давай лупцаваць та жуонку, та дзяка да прыказваць: от гэто цікавасць, дак цікавасць. Датуль лупіў, пакуль здаволіўса, тагды атняў іх рукі.

Даніло Куліеш.

Чудзін.

27. Першы бровар.

От так, як цепер, яшчэ за даўніейшые часы людзі забылі бога й так грашылі, што буог абазліўса да й задумаў загубіць людзей патопам. З усіх людзей аставаўса туолькі адзін праўдзівы чалавіек, Ной. Ён баяўса бога й чыніў яго волю. Буог любіў Ноя за яго пакуорпась і веліеў яму збудаваць каўчэгу. Туолькі буог веліеў Ною рабіць гэто ціхенько, каб ніхто не знаў і не зрабіў сабіе гэстакаіе каўчэгі. От Ной, як настане дзень, возьме сабіе за пояс сакіерку да й пуойдзе ў ліес будаваць каўчэгу. Зацікавіласа жонка Ноя да й пытае яго, куды гэто ён усё ходзіць. Але Ной чыніць божую волю й нічого не гаворыць жуонцы, а куожны дзень ходзіць сабіе з сакіеркаю ў ліес. Не ўкрыласо гэто ат чорта. Дагадаўса ён, што праўдзівы Ной штось замышляе, але чаго ён ні рабіў, ні як не мажэ давіедацца. От і падкаціўса ён к Ноявуй жуонцы да й намаўляе яіе так і сяк выпытаць у Ноя, куды ён ходзіць і што ён там робіць. Папробувала жуонка Ноя яшчэ раз папытаць яго, куды ён ходзіць і што робіць, але Ной саўсім замоўк і нічого не гаварыў. Жуонка ў слёзы, давай упікаць Ноя, што ён ходзіць к другім жанчынам, што ўжэ даўно яіе не любіць,

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

а туолькі падманьвае. Слепіцаю баба ліезе ў вочы, лаецца, крычыць, кідаецца біцца, але нічого не памагае, — маўчыць Ной, бы рыба. А як ужэ вельмі захoдзіцца жуонка, та Ной возьме сакіерку да й у ліес. Шукай яго там. Біегае, біегае баба, лазіць, лазіць церăз каладзьё, утоміцца да й з плачам варочаецца да хаты. Думаў, думаў чорт, што тут зрабіць, выпятраў як сухар, нічого немажэ парадзіць з зацятым чалавіекам. Ужэ не так ён думае аб туом, каб распазнаць, што робіць Ной, як аб туом, каб заставіць яго гаварыць. Віедамо, калі чалавіек мнуого гаворыць, та й прагаворыцца. От і прыдумаў чорт яшчэ адзін спосаб, як зрабіць, каб чалавіек мнуого гаварыў. Падкаснуўса ён к Ноявуй жуонцы яшчэ раз і просіць, спрабаваць новы спосаб. А тую й прасіць не трэ, бо яіе такая злосць узяла на Ноя, што яна гатова й чорту душу запрадаць, абы паставіць на сваём. Рад чорт, што баба ўсімі спосабамі гатова памагаць яму, рад, аж хвастом круціць бы сабака да капыт аб капыт пастуквае, бы гусар шпорамі. — Што-ж ты прыдумаў, — пытае яна чорта, — каб зламаць упартасць майго гаспадара? — А ось што, — кажэ чорт, нахіліўшыса к самаму яіе вуху. — Слухай да рабі, як я буду табіе казаць. Бачыш, якая сіла ў хліебе. Хліеб усему галава. Як чалавіек галодны, та ён маўчыць, а як наіесца хліеба, та й язык у яго развяжэцца. Гэто такая е сіла ў хліебе, туолькі трэба гэтую сілу згусціць. — А як-жэ яіе згусціць? — Пачакай, не спешы на шыбеніцу ўперуод бацька, бо хто спешыць, той людзей насмешыць. Гэстая сіла льецца ў цебе з носа, як ты міесіш хліеб. — От пачала жуонка Ноя месіць хліеб, а чорт падставіў ёй пад нуос пасудзіну, дак туды па капельцы нацекло якоесь вады чуць не поўная пасудзіна. — Што-ж гэто такое? — пытае баба. — Гарыэлка, — аткăзвае чорт, — яна так называецца затым, што з гары падае да й за тым, што хто яіе много выпье, та згарыць. Яна ў хліебе рыэдкая, а ў жанчыны густая, муоцная. От затым, калі мужчына паседзіць кала жанчыны, та хутко апъяніее, як ат хмелю. От ты напуой свайго гаспадара гарыэлкаю, та ён як апъяніее, пачнё гаварыць і скажэ табіе, куду ён хoдзіць і што

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

там ро̀біць. — А гэто яму̀ не зашко̀дзіць? — пыта̀е ба̀ба. — А хіба̀-ж ты яму̀ шко̀дзіш? — атка̀звае чорт, вы̀скаліу̌шы зу̌бы. Палеціеу̌ чорт па сваиму̌ дзіелу, а жуонка Но̀я нагато̀віла до̀браіе стра̀вы ра̀зам з гарыэлкаю да й пачала̀ частава̀ць свайго̀ гаспадара̀ як ён вернуу̌са з рабо̀ты. Сама̀ сіела насу̌працію̌ да у̌се у̌гава̀рвае: іеж, муой го̀лубе, іеж, ты-ж так утаміу̌са да прагалада̀у̌са... Наіеу̌са Ной і чу̌еща, што апъяніеу̌: от так і чэшэцца язык, каб пагавары̀ць з жуонкаю, туолькі ба̀чыць ён, што зза̀ду яіе хтось хава̀еща бы ціень. Дагада̀у̌са ён, што гэто чорт прычапіу̌са да ба̀бы, каб яіе да й яго̀ ра̀зам спакусіць. От ён павечэраў̌ да хучыэй мо̀у̌чкі лёг спаць. На за̀у̌тра яшчэ чуць свіет узяу̌ ён сакіерку да й пашо̀у̌ у ліес. Падхо̀дзіць к каў̌чэзі, аж ба̀чыць, — мышы папраеда̀лі дзіркі у̌ дніе, і вада̀ у̌ каў̌чэгу прасачы̀ласа. Зірнуу̌ ён у тые дзіркі, аж ба̀чыць, — туды̀ пазала̀зілі жа̀бы, каб сабо̀ю заткну̌ць дзіркі. Дагада̀у̌са Ной, што буог яго̀ перасцерага̀е, каб не піу̌ гарыэлкі да й нічо̀го не каза̀у̌ жуонцы. Ба̀чыць чорт, што нічо̀го не зро̀біць з Но̀ям, от ён навучы̀у̌ жуонку Но̀я й яго̀ сынуоу̌, як з хліеба гнаць гарыэлку. До̀у̌го Ной не піу̌ гарыэлкі, бая̌у̌са бо̀га, алѐ у̌се такі̀ раз неу̌трыма̀у̌са. Было̀ гэто тагды̀, як ко̀нчыу̌са пато̀п, Ной вы̀шаў̌ з каў̌чэгі да як паглядзіеу̌ на зѐмлю, як на ёй усе го̀жэ, як ра̀дасно свіеціць со̀нейко, як яно̀ атбіва̀еща у̌ расінках, дак яму̀ так ра̀досно зрабіласо на сѐрцы, што ён пача̀у̌ спева̀ць і скака̀ць. Алѐ стары̀е но̀гі нехаціелі служы̀ць яму̀, а жуонка ка̀жэ: вы̀пі да вы̀пі, та памаладзіееш. Вы̀піу̌ ён да не до̀у̌го паскака̀у̌ і зваліу̌са у̌ кана̀ву, а сын Но̀я хаць і бо̀льш напіу̌са, алѐ яшчэ̀ дзержа̀у̌са на нага̀х. Уба̀чыу̌ ён пъя̌нага ба̀цька й дава̀й смеяцца з яго̀ да пака̀зваць братуом, які̀ ба̀цько пъя̌ніца. А чо̀рту гэто й трэба. Рад ён, што такі̀ спакусіу̌ праў̌дзіваго Ноя. І пача̀у̌ чорт з таіе пары̀ памага̀ць лю̀дзям гнаць гарыэлку. Навучы̀у̌ іх, як будава̀ць бро̀вар і як гнаць гарыэлку, каб яна̀ была̀ муоцная. Дак от хто вы̀думаў̌ пѐршы бро̀вар.

Даніло Куліеш.

Чудзін.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

28. Дурнàя жу͡онка.

У аднагò бі͡еднаго гаспадарà былà вèльмі дурнàя жу͡онка. Як ён ні старàўса, як ні гаравàў, нічòго не мажэ̀ зрабіць, каб завезцì якòе ні на ѐст слімазàрнае хаджàйство. Даглѐдзіць гаспадàрку, та ў хàце нічòго німà, бо ві͡едамо, што гаспадàрка плàчэ без гаспадарà, а хàта без гаспады̀ні. А тут ягò дурнàя жу͡онка такàя гаспады̀ня, што лі͡епш, каб яі͡е саўсім не былò, бо янà не то што зрòбіць якòе нѐбудзь дзі͡ело, а й то, што е, псуѐ. Не разарвѐцца гаспадàр: та на гумні͡е, та ў хàце, та ў хлеві͡е, — ўсю̀ды трэ самòму даглѐдзяць. От прышлò жнìво. Пашлì ўсі͡е лю̀дзі жаць. Пашлà ў пòле й тàя дурнàя жу͡онка жаць жы̀то, да забы̀ла ўзяць серп. Смѐюцца з яі͡е лю̀дзі, шуткỳюць, а янà хаць бы што, — самà смеѐцца. Пòле далѐко ат вѐскі, не вàрто йці па серп. Злітаваласа тут аднà маладзìца да й далà дурну͡ой жу͡онцы сву͡ой запàсны серп. Нажàла тàя тры снапкì, паставіла іх да й леглà ў ценькỳ аддыхàць. Жнуць лю̀дзі, бы мстỳць сваі͡е пòстаці, аж пу͡от грàдам льѐцца да паю̀ць пі͡есні, каб веселі͡ей былò рабіць. А дурнàя жу͡онка храпѐ на ўсі͡е застàўкі. Ужэ̀ сòнейко нізко, парà каньчàць рабòту, а янà спіць сабі͡е, бы медзьві͡едзь у ку͡отле. Убàчылі яі͡е хлопцы-пастушкì пад снапàмі да й захаці͡елі пасмея̀цца. От яны̀ ўкрàлі на смаля̀рні ры̀эдкаі͡е смалы̀, спусьцìлі з таі͡е дурнòі͡е жу͡онкі сарòчку да й вы̀мазалі ўсе ці͡ело смалòю, а звѐрху абсы̀палі мі͡елкімі вугля̀мі. Спіць бàба, бы зары̀эзаная. Алѐ ось падхòдзіць к ёй тàя маладзìца па сву͡ой серп, зірнỳла да й ачу͡ом не ві͡ерыць, насìлу яі͡е пазнàла. Разкатỳрхала яна тỳю бàбу. Насìлу янà ачỳхаласа, зірнỳла на себѐ да й не ві͡едае, ці гэ̀то янà, ці ні͡е. От усхапìласа янà да й бежы̀ць па пòлі. Убàчылі лю̀дзі, спужàліса й дỳмалі, што гэ̀то ці чорт, ці ві͡едзьма. А бàба бежы̀ць да ўсе пытàе: ці гэ̀то я, ці ні͡е? Дòўго янà бі͡егала па пòлі, ўжэ сцемні͡ело, нарэ̀шце пашлà да гаспòды. Прыхòдзіць янà ў вѐску да й лìчыць хàты па пàлцах на рукàх. А яі͡е хàта былà дзіся̀тая з аднагò канцà. От налічы̀ла янà дзѐсяць, па-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

дышла к вакну й пытае: ці жуонка дома? А гаспадар, каб правучыць дурную жуонку, адмаўляе, што дома. Памацала яна себе да й пытае: ці гэто я, ці ніе да й пабіегла ў канец удругае лічыць хаты. Пералічыла яна дзесяць і зноў пытае ў свайго гаспадара, ці дома жуонка. Той зноў атказвае, што дома. — Мабыць я не з таго канца прышла, — думае яна да й пабіегла ў другі канец шукаць сваіе хаты. Біегала яна, біегала та ў вадзін канец, та ў другі, нарэшце гаспадар сказаў, што жуонкі німа дома. От яна ўбіегла ў хату да й пытае гаспадара: ці гэто я, ці ніе? А той як убачыў, дак і пакаціўса са сьміеху да й пытае: да дзіе-ж гэто цебе чэрці так аздобілі? Хіба-ж ты на смалярні ў чуоп з смалою ўваліласа. — Не віедаю, мо й уваліласа, але ці гэто я, ці ніе? — пытае яна, пазіраючы на сваю аздобу. Запаліў гэто гаспадар у печы, нагрыэў вады да насілу адмыў збуольшаго сваю дурную жуонку. Скоро падышоў сараковы дзень, як памер бацько гаспадара й трэба было спраўляць памінкі. От закупіў гаспадар, што трэба да й веліеў жуонцы прыгатовіць усе, як робляць людзі на памінках, а сам заказаў абіедню й запрасіў на памінкі папа, дзяка, руодных і знаемых. Пашоў гэто гаспадар у цэркаў, а яго дурная жуонка смешала разам усіе прыпасы да й зварыла ўсе ў вадну̑ом саганіе. Прышоў наперад гаспадар з цэркві да як зірнуў, чаго жуонка навычварала, дак аж рукамі сплеснуў. — Ой, мая-ж гуоркая часіна, — заскавытаў ён, — што-ж я буду цепер рабіць?! Як я буду вачамі сьвеціць перад гасцямі! — Пабіег ён хучыэй назад да давай перапрашаць гасцей, каб не гніеваліса, што немашака пачосткі. Нахлусіў ім, што зрабіласо сякое-такое нешчасце. Ці павіерылі тые, ці мо й недалі віеры, але німа чаго рабіць, аблізаліса, як сабака перад нечняю да й пасунуліса да гасподы. Прыкро гаспадару седзіець дома да пазіраць на тое дабро, што жуонка папсавала (змарнатравіла), от і пашоў ён капаць на абміежку хрыэн, каб нашмараваць ім скарынку хліеба да зъіесці, бо быў яшчэ ватшча. Туолькі ён убіў заступ, як штось зазвініело. Раскапаў ён, аж там повен горшчычак грошэй, от так бы луска й сыплюцца.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Абернуў ён палòю той гòршчычак, прынёс у хàту да й закапàў пад пі͡еч. — Што ты там схавàў? — пытàе жу͡онка. — Не чапàй, — аткàзвае ён жу͡онцы, — гэто злы̀дні. Я закапàў іх, каб у нàшуй гаспадàрцы ніякаго лìха не былò. — От жывỳць яны̀ сабі͡е дàлей. Алѐ ось пашòў гаспадàр арàць, а дурнàя жу͡онка асталàса дòма аднà, аж прыхòдзіць у хàту цыгàн, на галаві͡е сагàн, у рукàх пỳшка-жывỳжка да й дакòло пазірàе, штоб украсці выбірàе. — Дай мні͡е гаспады̀нька кусòк сàла, каб свінка не прапàла, лы̀чко каўбàс і я пайдỳ ат вас, — прыгавòрвае цыгàн да тòхціць ён крỳпы ў сагàн. — Німà ў нас ні сàла, ні каўбàс, ту͡олькі ў падпі͡ечку злы̀дні седзяць ужэ тры дні, — кàжэ дурнàя бàба. Дагадàўса цыгàн да палі͡ез пад пі͡еч і дастàў аттỳль грòшы. — Гэто-ж злы̀дні, — кàжэ бàба. — Дòбрэ, — кàжэ цыгàн, — я вазьмỳ гэтые злы̀дні да й утаплю̀ ў вòду, та вам лìха не бỳдзе. — Забрàў цыгàн пад палỳ грòшы да наўцекачà, каб чàсам гаспадàр не нахапìўса. Тым чàсам ось на вỳліцы сабàкі апанавàлі тагò цыганà. От і пачàў ён махàць кругòм себѐ пỳжкаю-жывỳжкаю, махàе, а грòшы памалѐньку сы̀плюцца да сы̀плюцца з гаршкà да так усі͡е й вы̀сыпаліса. Насìлу ўцёк цыгàн ат сабàк да хучы͡эй пабі͡ег у лі͡ес. Алѐ ось якрàз па том слі͡еду цыганà йдзе той гаспадàр. Прыглядàецца ён, аж гỳсьценько раскìданы грòшы. От сабрàў ён ты̀е ўсі͡е грòшы за пàзуху да й прыхòдзіць да гаспòды. А тут ягò стракàе жу͡онка да й кàжэ: быў цыгàн, на галаві͡е сагàн, у рукàх пỳшка-жывỳшка. Прасìў сàла й каўбàс, а я кажỳ, — німà ў нас. Ї забрàў ён злы̀дні, што пад пі͡ечкам седзі͡елі тры дні. Алѐ гаспадàр прамаўчàў і бу͡ольш жу͡онцы нічòго не казàў. З таі͡е пары̀ стàло пòўно на двары̀, стàлі яны̀ дòбрэ жыць.

Даніло Кулі͡еш.

Чудзін.

29. Прàўда й кры̀ўда.

Жылì два браты̀. Адзìн быў вѐльмі праўдзìвы чалаві͡ек і ягò называлі Прàўдаю, а другì завìсны да ліхì, дак ягò празвàлі Кры̀ўдаю. Прàўда як ні старàўса, як ні гаравàў, а ўсе-ж жыў

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

у велікуй нèндзы й беднаціе, бо кàжуць лю̀дзі, што прàўдаю жыць, дабрà не нажы̀ць. А Кры̀ўда нічòго сам не рабіў, а туолькі галавòю круціў да кагò муог кры̀ўдзіў, дак ён сабрàў багàтство і жыў сабіе як пан. Німàшака ў Прàўды хліеба, німà за што рук заця̀ць і пашòў ён к брàту прасіць, каб пазы̀чыў міерку хліеба. А той, віедамо, кры̀ўда да й кàжэ: дай я вы̀калю табіе еднò вòко, каб ты не ўсю прàўду бàчыў, тагды̀ пазы̀чу. — Німà чагò рабіць, гòлад не свуой брат, а тут плàчэ жуонка да папікàе прàўдаю, — і згадзіўса ён астàцца без вòка, абылèп не галадàць. Не на дòўго хапіло таіе міеркі хліеба, й зноў ідзè той біедны к багàтаму брàту прасіць яшчэ хліеба. Туолькі той згаджàецца на тых вару̀нках, каб Прàўда вы̀калаў сабіе апуошняе вòко. Прасіў, прасіў Прàўда, каб брат забрàў што нèбуць другòе, а заставіў яму̀ вòко, бо без ягò ён не ўбàчыць прàўды, алè той заця̀ўса бы краміень і слу̀хаць не хòчэ. Шкòда вòка, а тут жывуот падвелò, хаць сам себè грызі. — На вуошто мніе вòко, калі я, жуонка й дзіеткі памірàюць з гòладу. — Згадзіўса біедны брат і спрэсу астàўса слепы̀м, за тòе жуонка й дзіеткі вы̀жылі, дачакàўшы нòваго зраджàю. Прышлà рабòчая парà, ўсіе лю̀дзі йду̀ць на сенажàць касіць сіено, ці на пòле жаць хліеб, туолькі біедны Прàўда седзіць дòма без дзіела. Пачалà ягò жуонка ўпікàць да назывàць дармаіедам, дак яму̀ так гуорно зрабіласо, што ён не мог буольш вы̀церпіець да й пашòў жабравàць. Узя̀ў ён сабіе кіёчак, мàцае ім дарòгу да йдзе паціхеньку ўпèрад. Ішòў ён, ішòў, падышòў к ду̀бу да й сіеў супачы̀ць. Седзіць ён ціхенько да бòга хвàліць, што хаць жыў астàўса, не памёр з гòладу, алè чуе, што хтòсь на ду̀бе гамòніць. Пачàў ён прыслухòўвацца, а віедамо, ў слепòго зàўжды дòбрае чу̀це. Ось і чу̀е ён, што на ду̀бе седзя̀ць нèчысцікі да й кàжуць, дзе ў землі грòшы захòваны. Закміеціў ён тòе міейсцо, паседзіеў яшчэ трòхі, атды̀хаў да й пашòў туды̀, дзіе былі захòваны ты̀е грòшы. Прышòў ён да тагò міейсца да й пачàў кіёчкам разграбàць песòк. Капну̀ў ён два-тры рàзы да й абмàцаў там цы̀элы кацёл грòшэй. Налядавàў ён тòрбу грòшэй, як панесці да й пашòў да гаспòды. Убàчыла жуонка

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

тые грошы, годзі ўжэ ўпікаць сваймў гаспадару да скарыэй пабіегла к багатому Крыўдзе пазычыць міерку, каб паміерапь тые грошы. Той пазычыў. Зміералі яны грошы, жанчына й атносіць тую міерку назад. Узела завіснаго Крыўду цікавасць, якое-такое збуожэ яны міералі, калі людзі яшчэ не намалаціді. Узяў ён тую міерку да й давай яіе трасці, каб з пад абручуоў выкалаціць зернята, аж аттуль і пасыпаліса асьмакі. — Дак гэто-ж яны міералі грошы, — прамовіў сам да себе Крыўда да аж затруосса ат хцівасці. Не вытрываў ён і хучэй пабіег к брату пытаць, аткуль ён узяў так мнуого грошэй, што аж міеркаю міерыў іх. Віедамо, праўдзівы брат і разказаў яму ўсю праўду, як тое было, як яму гуорно было слепому седзіець дома, як ён пашоў жабраваць, як падышоў пад дуб, як пачуў, што нечысцікі кажуць, дзіе схованы грошы, як пашоў туды да й выкапаў іх. От жыве Праўда па праўдзе да бога хваліць, што яму й сліепому жабраку пасляў спосаб да жыцця. А багаты Крыўда й міейсца сабіе не находзіць, так яго распаляе зайздрась. Церпіеў ён, церпіеў да й не ўцерпіеў. Хочэцца яму найці грошэй яшчэ буольш, як у брата. От ён выкалаў сабіе вочы да й пашоў жабраваць. Але ніхто нічого не дае, бо ўсіе яго пазналі да й віедаюць, што ён і так вельмі багаты. Насілу ён дацёгса галодны да таго дуба, сіеў пад ім да й прыслухоўваецца, што гавораць на дубе нечысцікі. Але ось адзін і кажэ, што мабыць хтось іх падслухаў, як яны казалі, дзіе схованы грошы, да й забраў. А другі й кажэ: гэто мабыць той жабрак, што седзіеў пад дубом як мы гаманілі. — Але-ж гэто ён. Да ось ён і цепер тут седзіць, — сказаў адзін нечысціць, зірнуўшы ўніз. Кінуліса нечысцікі на таго хціваго багача да й разарвалі яго на кавалкі. Праўду кажуць, што крыўдаю свіет пройдзеш, да назад не вернесса. От і асталаса с таіе пары праўда па сьвіеце без ачуоў і нічого яна не бачыць.

Даніло Куліеш.

Чудзін.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

30. Палешукі й палевікі.

Было̀ ў ба̀цька дванаңцаць сынуоў да ўсіе яны̀ былі̀ вѐльмі ўда̀лые хло̀пцы. Жылі̀ яны̀ ў цё̀мнум ліесе, дзіе вадзі̀ласо мнуого ўселя̀каго зверъя̀, па̀сцілі сваѐ гаўя̀до да лаві̀лі зверыну̀. Сусіедзі жылі̀ далѐко й рыэдко рабі̀лі ім шко̀ду, бо бая̀ліса ўда̀лых хло̀пцаў, каб не нагрыэлі ім па заты̀лку. Жылі̀ яны̀ ра̀зам і слу̀халі старо̀го ба̀цька, а ён ужэ сі̀веңкі̀ бы лунь, седзіеў сабіе ў кажу̀шку й па ліету да камѐндуваў. І быў у іх лад і ўсім было̀ до̀брэ. — Яны̀ ўсіе пажані̀ліса, й было̀ ў іх мнуого дзецѐй, алѐ ўсіе слу̀халі старо̀го й куожын рабіў сваѐ дзіело. Туолькі ось памё̀р стары̀ ба̀цько й пачалі̀ жанкі̀ свары̀цца па між сабо̀ю, пачалі̀ калаці̀цца да падбухтэ̀рваць сваі̀х гаспадаруоў. І така̀я ў іх пашла̀ калатня̀, што й жы̀ткі німа̀. Віедамо, калі̀ ба̀бы чаго̀ захо̀чуць, та й сам чорт іх не пераста̀віць. А тут яны̀ ў вадзі̀н го̀лас крыча̀ць: дзелі̀цца да дзелі̀цца. Пачалі̀ браты̀ дзелі̀цца. Калаці̀ліса, калаці̀ліса яны̀ паку̀ль дзелі̀лі гаўя̀до да ўсе дабро̀, а як пашлі̀ дзелі̀ць зѐмлю, дак так пачалі̀ бі̀цца, што чуць адзі̀н друго̀го не пазабіва̀лі да так і не падзелі̀лі мо да тых час. Кало̀цяцца браты̀ па між сабо̀ю за зѐмлю, захва̀тваюць чужы̀е дзеля̀нкі й ніко̀лі ў іх німа̀ш спако̀ю. Туолькі два мало̀дшые браты̀ жылі̀ па між сабо̀ю вѐльмі згуодно: куды̀ адзі̀н, туды̀ й другі̀. Не захаціелі яны̀ калаці̀цца з брата̀мі, кі̀нулі сваю̀ ба̀цькаўшчыну да й пашлі̀ ў сьвіет шукаць сабіе землі̀. От занялі̀ да й пагна̀лі яны свуой ста̀так, зрабі̀лі з двух дубуоў з кары̀энямі велі̀зные са̀ні, запраглі̀ дваңна̀цаць пар валуоў, накла̀лі ўселя̀каго дабра̀ да яшчэ̀ пасадзі̀лі жано̀к з дзецьмі̀ да й паіехалі па песку̀. Працяглі̀ тро̀хі валы̀ да й ста̀лі, не мо̀гуць цягці̀ са̀ні па песку̀. От буольшы брат дава̀й падкла̀дваць упо̀перак пад палазы̀ кру̀глые калуодкі. Ко̀цяцца калуодкі, і са̀ні паўзу̀ць упѐрад. Надаіело мѐньшаму бра̀ту падкла̀дваць кало̀дкі пад палазы̀, от ён і ка̀жэ: дава̀й, братко̀, зро̀бім таку̀ю пры̀ла̀ду, каб кало̀дкі цо̀нѓле круці̀ліса пад палазамі, — да й зрабі̀лі яны̀ ко̀лы. Лё̀гко пацяглі̀ валы̀, так што

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

яшчэ й яны̀ са̀мі сі͡елі на ву͡оз. І͡едуць яны̀ да і͡едуць і падъі͡езджа̀юць к велікуй рацы͡э. Шука̀лі яны̀, шука̀лі, нідзіе не знайшлі̀ плы̀ткаго мі͡ейсца, каб пераі͡ехаць у бру͡од. А тут захадзі̀ласа велікая бу̀ра. Лі͡ес равѐ бы зві͡ер. Ві͡ецер ло̀міць дзераўля̀кі, бы ба̀ба кастры̀цу да й кі̀дае на зѐмлю й у ры͡эку. Плывѐ па вадзі͡е дзѐраво бы плыты̀. Зірну̀ў на то̀е мало̀дшы брат да й дагада̀ўса, як перабра̀цца цѐраз ры͡эку. От дава̀й яны̀ з бра̀там лаві̀ць на рацы͡э дзѐраво да звя̀зваць яго̀ ра̀зам, навяза̀лі да й зрабілі плыт. От суняла̀са бу̀ра, падагна̀лі яны̀ той плыт шчы̀лно да бѐрага ракі̀, запраглі̀ валу͡оў да й узвезлі̀ ву͡оз на плыт. Стая̀ць яны̀ на плы̀це да кіру̀юць до̀ўгімі жардка̀мі, а плыт і сам плывѐ з вадо̀ю. Аднесло̀ плыт далѐко з вадо̀ю, алѐ ось ён і прыста̀ў к друго̀му бѐрагу. Паба̀чыло го̀вядо, што валы̀ паплылі̀ па рацы͡э да й вы̀шло на другі̀ бу͡ок, кі̀нуласо яно̀ ў во̀ду да й пераплыло̀ цѐраз ры͡эку. Паі͡ехалі яны̀ да̀лей і забра̀ліса ў такі̀ лі͡ес, што й канца̀ я̀му нема̀шака. Нямо̀гуць да̀лей і͡ехаць, — лі͡ес меша̀е. Пачалі̀ яны̀ церабі̀ць даро̀гу да масці̀ць грэблі. Алѐ дзі͡е там, чым да̀лей, тым лі͡ес усе гусці͡ее, а ў ём стаі̀ць така̀я тхлань да нѐтра, што й вы̀брацца ні͡ельга. От і ка̀жэ бу͡ольшы брат: астаўу̀са я тут, бо немагу̀ вы̀брацца з лі͡есу. І аста̀ўса ён серу͡од таго̀ лі͡есу. І назва̀лі яго̀ й дзецей яго̀ палешука̀мі. Мало̀дшы-ж брат працэ̀рэбліваў даро̀гу, масці̀ў грэблі да клаў кла̀дкі й і͡ехаў усѐ да̀лей. Мо й да тых час на палі͡есі яшчэ е ты̀е прасі͡екі да грэблі, што нарабі̀ў той чалаві͡ек. Не до̀ўго яны і͡ехалі на сваі̀х ко̀лах, як уба̀чылі, што лі͡ес пача̀ў радзі͡ець, пачалі̀ трапля̀цца прага̀ліны, паля̀нкі да паля̀, дак яны̀ атаўбава̀ліса там і пачалі̀ разрабля̀ць по̀ле, за тым-то й назва̀ліса яны̀ палевіка̀мі. По̀тым размну͡ожыліса як палешукі̀, так і палевікі, занелі̀ пусты̀ лі͡ес да й пачалі̀ жыць адны̀ кала̀ другі̀х ра̀дам. Праз нема̀лы час у палешуку͡оў і палевіку͡оў развело̀со мну͡ого гаўяда да й уселя̀каго зверъя̀ ў іх лясо̀х было̀ бу͡ольш, чым у ту͡ом мі͡ейсцы, дзі͡е атаўбава̀ліса ты̀е дзѐсяць брату͡оў. От яны̀ пашкадава̀лі, што пусцілі сюды̀ мѐньшых брату͡оў і што далі̀ ім мну͡ого гаўя̀да, пашкадава̀лі да й узду̀малі атабра̀ць назад. Даві͡едаліса палешукі̀ й пале-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

вікі̀, што тьі̀е падхо̀дзяць к ім з разбо̀ям, нарабі̀лі ў лі͡есе зава̀лаў да накапа̀лі глыбо̀кіх я̀маў да й зацэпенілі іх мо̀хам, а са̀мі пахава̀ліса ў гушчэ̀чы да й ціку̀юць, што бу̀дзе да̀лей. Алѐ ось падышлі̀ тьі̀е разбу͡ойнікі — да й пачалі̀ па̀даць у я̀мы, а ў іх была̀ вада̀. Адньі̀ патапіліса, а другі̀е заплу̀таліса ў засі͡еках да й загі̀нулі ў нѐтры без яды̀. От атагна̀лі апу͡ошніх разбу͡ойнікаў палешукі̀ й палевікі̀ да й дава̀й выхваля̀цца адньі̀ пѐрад другі̀мі. Палешукі̀ ка̀жуць, што гэто яньі̀ сваі̀мі засі͡екамі ў лі͡есе загубілі разбу͡ойнікаў, а палевікі̀ ка̀жуць, што разбу͡ойнікі загі̀нулі ў тых я̀мах, што палевікі̀ вьі̀капалі. Пашлі̀ яньі̀ выхваля̀цца да спрача̀цца. Спрача̀ліса, спрача̀ліса да за чубьі̀, да за кальі̀... І пашла̀ тут така̀я перапа̀лка, што гарьі͡эй як ат разбу͡ойнікаў. Бъю̀цца палешукі̀ з палевіка̀мі, па̀ляць вѐскі, ні̀шчаць дабро̀ да парыва̀юцца спрэ̀су загубіць адньі̀ другі̀х, гарьі͡эй як са̀мые лю̀тые варагі̀. До̀ўго бі̀ліса яньі̀, алѐ немо̀гуць адалі͡ець адньі̀ другі̀х, ту͡олькі што да̀лей, та ўсе бу͡ольш і бу͡ольш слабі͡еюць як тьі̀е, так і другі̀е. Дачу̀ліса варагі̀, што палешукі̀ й палевікі̀ кало̀цяцца па між сабо̀ю, што яньі̀ не баро̀няць сваі͡е рубежьі̀, от яньі̀ зноў сабра̀лі велі̀кае ву͡ойсько да й пашлі̀ палі̀ць вѐскі да забіва̀ць як палешуку͡оў, так і палевіку͡оў. Ачу̀халіса палешукі̀ й палевікі̀, го̀дзі калапі̀цца са̀мі з сабо̀ю, дава̀й бі̀цца з во̀рагам. Бі̀ліса яньі̀, бі̀ліса, мо ўжэ палаві̀на іх палягло̀, а нічо̀го не мо̀гуць зрабі̀ць, бо варагі̀ лі͡езуць усѐ но̀вые й но̀вые. Мну͡ого палягло̀ й варагу͡оў у чьі̀стом по̀лі, мну͡ого заблудзі̀ласо ў лі͡есе да ў бало̀тах і там загі̀нуло ат го̀ладу, ат хо̀ладу, ці патапі̀ласо ў гразі̀, алѐ яшчэ̀ мну͡ого астало̀со. Лі͡езуць яньі̀ як сві̀не ў вагару͡од, лі͡езуць да забіра̀юць палешуку͡оў і палевіку͡оў у палу͡он, забіра̀юць іх зѐмлю, гаўя̀до й усѐ дабро̀, а старьі̀х і мальі̀х забіва̀юць, ці тра̀вяць саба̀камі. Забі̀лі яньі̀ ў калу͡одкі ўсі̀х палешуку͡оў і палевіку͡оў да й велі͡елі сабі͡е служьі̀ць. Нічо̀го не пара̀дзіш. Слу̀жаць палешукі̀ й палевікі̀ тым варагу͡ом, бо не свая̀ во̀ля, слу̀жаць гу͡од, слу̀жаць два, а мо̀жэ й бу͡ольш. Працу̀юць яньі̀ на варагу͡оў бы чо̀рны ву͡ол і нія̀каі͡е палѐгкі не ма̀юць, працу̀юць, гару̀юць да праклі̀на̀юць сваю̀ жьі̀тку. А варагі̀ пану̀юць да здзі͡екуюцца з про̀стых

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

людзѐй, а ты̀е рàды, што хаць засталìса жывы̀мі. Бàчаць паны̀, што прòстые лю̀дзі сміры̀ліса, от і скìнулі з іх калòдкі. Рàды прòстые лю̀дзі, дзя̀куюць бòгу й за тòе. Ì пачалì яны̀ працавàць на пану͡оў так шчы̀ро, як сàмі сабі͡е. А пану͡ом тòе ту͡олькі й трэ̀ба. Працỳюць прòстые лю̀дзі, а паны̀ ту͡олькі камѐндуюць да падганя̀юць. Ì атучы̀ліса паны̀ ат уселя̀каі͡е рабòты, да так атучы̀ліса, што без прòстых людзѐй не мòгуць і жыць, бы тàя птỳшка, як яі͡е вы̀пусцяць з клі͡еткі на вòлю. Бàчаць тòе прòстые лю̀дзі да ту͡олькі смею̀цца з пану͡оў. Яны̀ смею̀цца, а паны̀ хаць бы што, балю̀юць сабі͡е да яшчэ̀ бу͡ольш прыбаўля̀юць рабòты. — Бо яны̀, — каа, — рагòчуць бы жарабцы̀ затым, што мàло дзі͡ела. — Яшчэ̀ гары͡эй стàло лю̀дзям і пачалì яны̀ рабìць пану͡ом зэ̀мсту: та свìран спàляць ці гумнò, та кару͡оў загòняць у такỳю тхля̀нь, што яны̀ там і пагìнуць, та свінѐй патòпяць, алѐ ат тагò й сàмі не мàюць чагò і͡есці, бо, ві͡едамо, жывỳць па ардынàръі: пàна чорт не бярэ̀, — ён у сусі͡еда дастàне, а лю̀дзі падыхàюць да пỳхнуць з гòладу. Што тут рабìць, што парàдзіць? Ні з якòго бòку ні͡ельга пазбàвіцца ат тых пану͡оў. Алѐ ось прыхòдзіць туды̀ якісь старэ̀нькі дзедòк да й кàжэ: — лю̀дзі, лю̀дзі, вас мну͡ого, а пану͡оў жмѐня і гэ̀тая жмѐня здзі͡екуецца да і͡ездзіць у вас на кàрку. Ці гэ̀то-ж вы лю̀дзі, а не авѐчкі. — Пагаманіў ён гэ ў ваднy͡ом мі͡ейцы да ў другу͡ом, от і схаменỳліса лю̀дзі да й пачалì варушы̀цца. Знайшлìса ỳдàлые хлòпцы, сабрàлі сабі͡е шàйку дòбрых малайцу͡оў да й пашлì перы͡эсцìць да месìць тых пану͡оў. Бàчаць ты̀е, што гэ̀то не пэрэ̀ліўкі да й пусцìліса наўцекачà: хто ў лі͡ес, а хто ў чужы̀і͡е краì. От аслабанìлі палешукì й палевікì сву͡ой край ат тых варагу͡оў, алѐ не ві͡едаюць, як ім жыць, бо ку͡ожын хòчэ быць бу͡ольшым, ніхтò не хòчэ гаравàць, а ку͡ожын лѐзецца панавàць. Ì стàла ў іх жы̀тка гары͡эй як пад панàмі. Што тут рабìць, рòзуму не прылòжаць. Зъявìліса тут жыды̀ з уселя̀каю ўся̀чынаю да й пачалì яны̀ крычàць як на кірмàшы: «мі купцы̀ з мі͡еста слàўнаго Брэ̀ста, мàем тавàры, — па чàрцы гàры, ру͡озные зѐлкі, стỳжкі да гу͡олкі; што хто захòчэ вòзьме за клòччэ. Вòзьмем мы смỳшкі, збу͡ожэ з кадỳшкі, дак вам за тòе плàцім мі

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ўдвое перцам, імберцам, гарыэлкаю, чэрцам» — Аступілі бабы жыдуоў, цягнуць з хаты да з клеці ўселякае дабро да беруць сабіе голкі, каснікі, жуковіны, чэрвец да руознае зіелье. А мужыкі як навалііса на гарыэлку, дак гатовы й апуошнюю сермягу з себе знянь, абы яшчэ кварту дастаць. От с таіе пары атаўбаваліса жыды ў куожнуй весцы да й збудавалі сабіе карчмы да круомкі. От жывуць сабіе жыды да і кажуць: от цепер ві будзеце ўсіе бы паны, бо мі так зробім, сто вам усім будзе весело й работа не будзе карціець. Пъюць мужыкі да веселяцца, а пра работу й забылі. Тым часам аглёдзеліса паны да рум назад. Схаменуліса людзі да ўжэ пуозпо. Падзякувалі яны жыдуом, што тые памаглі ім вернуцца ў сваіе дворы да зноў угібаць у сваіе рукі пъяных мужыкуоў, падзякувалі да й абецалі, што заўжды будуць жыць з жыдамі ў згодзе й нічого не будуць рабіць без іх рады. От з таіе пары мо й да тых час паны й жыды разам седзяць у тых палешукуоў і палевікуоў на карку, мучаць іх як сваё гаўядо да яшчэ й плакаць не даюць. Я там быў, жыдуом служыў, пануом падслужваўса. Але пана груом забіў, а жыда чорт ухапіў. Я пачуў волю, шукаю долю; аттуль сам прышоў к вам і што сам знаю, тое й баю.

Даніло Куліеш.

Чудзін.

31. Шчодрая й скупая жанчына.

Паслухайце, што было даўніей, як яшчэ Хрыстос і Божая Маці хадзілі па землі да вучылі людзей. Моо гэто было й не далеко атсюль, бо вось пад Тычынамі [1] й цепер яшчэ лежыць камень з сліедам Буоскаіе Маткі. У куожную першую недзіельку туды збіраюцца людзі, моляцца богу й даюць на хвалу буоскую

---

[1] У Слуцкум павіеце мніе знаёмы тры такіе прошчы, дзіе лежыць велізны камень, а на ём ямачка, каторую людзі лічаць за сліед Багародзіцы. Гэто кала Вызны, пад Тычынамі і пад Узбіскім Борам.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

хто свіечку, хто лён абò вòўну, хто грòшы, а дзіеўкі да малады̀зіцы прынòсяць рушнікì абò палатнò. От ідзе раз Хрыстòс з Бòжаю Мàткаю праз аднỳ вѐску. Яны̀ йдуць бòсые бы старцы̀ й прòсяць пад вуокнамі. Падышлì к аднуой хàце. Убàчыла старцуоў шчòдрая жанчы̀на да й кінуласа шукàць хліеба, каб хучыэй даць ім. Зірнỳла янà на стуол, аж там лежы̀ць туолькі невелічкі акрàйчык. От янà й кàжэ: — пачакàйце трòхі, я збіегаю ў стòпку па хліеб. Пабіегла янà з хàты на двор, аж бàчыць, што свіня̀ цягàе на дзедзінцы палатнò, што янà праслàла беліць. Схапіла янà борждж ыэй тòе палатнò, забіегла ў стòпку, ўзелà бòхан хліеба да й прынеслà ў хàту. От аткрòіла яна велікі акрàяц да й дàе стàрцам. А Хрыстòс і кàжэ: — Насіць табіе, не перанасіць, — а сам і пашòў. От тàя жанчы̀на давàй насіць у хàту палатнò й хліеб, насіла янà, насіла, ужэ запòўніла ўсю хàту пад сàмую стуоль, а ўсе не мажэ перанасіць усягò палатнà з дзедзінца й хліеба з стòпкі, бо пòкуль янà вѐрнецца, та там ужэ зноў е. Забіегла к ёй аднà сусіедка. Янà былà вѐльмі завідўшчая жанчы̀на. Пабàчыла янà, куолькі палатнà й хліеба ў таіе шчòдраіе маладзіцы да й пытàе, аткỳль янà ўзелà. А тàя й расказàла, як тòе былò. — Пачакàй-жэ, — дỳмае янà, — зраблю й я яшчэ ліепш. — Падзівіласа янà цỳду да й пабіегла дамуоў. Алѐ ось па немàлум часе Хрыстòс з Бòжаю Мàткаю прыхòдзяць і к туой жанчы̀не. А янà як раз саджàла ў піеч хліеб. Зірнỳла яна па старцуоў да й кàжэ: пачакàйце, ось я спекỳ вам свежаго хліеба, бо той ужэ чòрствы. — А на сталіе лежы̀ць велізны бòхан хліеба, алѐ жанчы̀на пашкадавàла дòбраго хліеба, а паскраблà ў дзежы̀ да й пасадзіла ў піеч пòскрабак, каб ягò аддàць старцòм. От атсланіла тая жанчы̀на піеч, аж пуодскрабак вы̀рас больш усіх бахануоў. Пашкадавàла яна даваць той пуодскрабак атрыэзала ат ягò акрàец да бàчыць, што ён вѐльмі гарàчы, віедамо туолькі з пѐчы, от і ўздỳмала янà перш абліць ягò халòднаю вадòю. Зірнỳла, аж у ведры̀ німаш вады̀. От янà й пабіегла ў калодзѐсь па вòду. Прынеслà янà вады̀, абліла акрàец і падаѐ. А Хрыстòс і кàжэ: насіць табіе й не перанасіць, — да й пашòў дàлей. От і началà

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

тая скупая жанчына насіць у хату воду. Нанасіла ужэ па самые вуокпа, а усе перестаць не мажэ, пакуль не прышоў гаспадар да не атабраў ат яіе ведро. Дак от як пакараў Хрыстос тую скупую жанчыну.

Даніло Кулієш.

Чудзін.

32. Як Хрыстос вучыў людзей.

Перш людзі былі вельмі дурные; нічого не уміелі рабіць. От Хрыстос хадзіў з Буоскаю Маткаю па землі да й навучаў іх, як на свіеце жыць, як абрабляць зэмлю, каб куожная рыэч ішла на патрэбу чалавіеку. Ось як тое было. Ідзе гэтак Хрыстос цераз поле да й бачыць, што чалавіек сукам калупае зэмлю. От Хрыстос прыуёў таго чалавіека ў сувараты, паказаў яму рагач да й зрабіў з яго соху. — Цепер, — кажэ, — залыгай пару валуоў, прывежы да рагача да й ары. — Пашоў Хрыстос далей, а чалавіек злавіў пару валуоў, звезаў ім хвасты да й зачапіў за рагач, а сам злыгаў валуоў за рогі да й ведзе па полі. А дзень быў ясны; сонейко грыэе, аж печэ. Напалі на валуоў овады да здракі, от тые як закруцяць хвастамі да чмыхануць, дак чалавіек туолькі скачэ бы скуочка, а саха да землі й не дакрапецца. Вырваліса валы да й пабіеглі сабіе ў кусты абціраць авадуоў, а чалавіек стаіць кала сахі да чуць не плачэ. Але ось жуонка прынесла яму абіед да й пытае, чаму ён нічого не ўзараў. А ён кажэ, што так і так, уздрачыліса валы да й пабіеглі ў валёс. — Гэй, дурны ты, — кажэ яна, — я сама пацягну гэстую соху. — Схапіла за рагач да й цягне. От чалавіек запруог яіе ў соху, сам папірае да й арэ. Але ось надходзіць туды зноў Хрыстос да й бачыць, што чалавіек арэ жанчынаю, от ён і пытае: — што ты робіш, чалавіечэ? на што ты мучыш жанчыну? — Мніе не важко, — адмаўляе яна, — бо куды вам мужчынам да нас жанок. — Гэто сказала, каб пахваліцца, што вельмі дужая. От Хрыстос і кажэ: з гэтых час будзеш ты рабіць, як чорны вуол і твая праца не

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

бу̀дзе прыкмі͡етна. Ты будзѐш хвата̀цца не за своѐ дзі͡ело, алѐ наро̀біш гэ, як сяго̀нячы наара̀ла. — От і цепѐр жанчы̀на працу̀е ад ра̀нку аж да по̀ўначы, алѐ яі͡е рабо̀ты ніхто̀ не ба̀чыць. За̀ўжды яна̀ берэ̀цца не за сваѐ дзі͡ело, а наро̀біць, бы ку͡от напла̀чэ. От паказа̀ў Хрысто̀с чалаві͡еку, як зрабіць му͡оцнае ярмо̀, каб валы̀ не злама̀лі яго̀, да як іх прызвыча̀іць да рабо̀ты. Падзя̀куваў той чалаві͡ек да й пача̀ў до̀брэ араць і абрабля̀ць по̀ле. Зарадзі̀ў у яго̀ хлі͡еб на по̀лі як ні ў ко̀го. Сабра̀ў ён хлі͡еб да й дава̀й яго мяць нага̀мі, каб вы̀церці зерня̀та. Ту͡олькі ось ідзѐ Хрысто̀с да й пыта̀е, на што ён то̀пчэ бо̀жы дар. — Малачу̀, — атка̀звае той. — Ці-ж гэ малаці̀ць? — І Хрысто̀с звеза̀ў дзві͡е па̀лкі, зрабі̀ў цы͡эп да й навучы̀ў чалаві͡ека, як малаці̀ць. Падзя̀куваў чалаві͡ек, а Хрысто̀с пашо̀ў да̀лей. Алѐ ось ішоў ён цѐраз лі͡ес і вѐльмі далѐко не было̀ ні̀якаі͡е вѐскі. Ві͡едамо, на палі͡есі ры͡эдко папада̀юцца вѐскі. Прагалада̀ў Хрысто̀с і велі͡еў, каб сухі̀ бу͡ор і ні̀зкае ўзмо̀шэ й уселя̀кая мейсцо̀вась у лі͡есе радзі̀ла я̀гады на патрэ̀бу чалаві͡еку. Зарадзі̀ла я̀гада, што хаць грабі̀. Назбіра̀ў Хрысто̀с я̀гад, алѐ не так сам пасілкава̀ўса, як даў Бу͡оскуй Ма̀тцы, каб яна̀ прагна̀ла сма̀гу. Пашлі̀ яны̀ да̀лей, алѐ ось прыхо̀дзяць у вѐску да й просяць хлі͡еба. Алѐ тут жылі̀ такіе скупы̀е лю̀дзі, такіе безбу͡ожные, што й бо̀га не бая̀ліса да й людзѐй не саро̀меліса. Не пазна̀лі яны̀, што гэто не про̀стые старцы͡э да й пачалі̀ ўпіка̀ць, што да̀рам цяга̀юцца па сві͡ету, а не хо̀чуць рабі̀ць дзі͡ела. — Ось, — ка̀жуць, — хлі͡еб на по̀лі пе[redacted]уса, а рабі̀ць ні͡екаму. От наняліса-б жаць, дак і і͡елі-б хліеб. — І нічо̀го не далі̀ ты̀е пага̀ные лю̀дзі. Пашо̀ў Хрысто̀с да̀лей. І̀дуць яны̀ цѐраз по̀ле, а тут тако̀е зрадзі̀ло збу͡ожэ, што каласы̀ начына̀юцца ат са̀маі͡е зямлі̀. Пача̀ў тут Хрысто̀с зрыва̀ць каласы̀. Хаці͡еў ён, каб спрэ̀су загубі̀ць збу͡ожэ тых пага̀ных людзѐй, алѐ Бу͡оская Ма̀тка заступі̀ласа за іх да й пачала̀ прасі̀ць Хрыста̀, каб ён змі̀луваўса. От Хрысто̀с і ка̀жэ: с тых час не бу̀дзе тако̀го зраджа̀ю, та̀гды пазна̀юць лю̀дзі, што бу͡ог на нѐбе. — От з таі͡е пары̀ збу͡ожэ кѐпсько ро̀дзіць і даѐ ту͡олькі каро̀ценькіі͡е каласкі̀ да й то ча̀сам саўсі̀м пусты̀е. По̀тым дагада̀ліса лю̀дзі, якіі͡е гэто былі̀ старцэ̀, дагада̀-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ліса да нічòго не парàдзіш. Саграшы̀лі бòгу, дак трэ церпі͡ецьˏ бо на тòе бу͡оская вòля. Ягò й вòля, яго й цу͡оц. Ту͡олькі у̃жэ с таі͡е пары̀ зау̃жды дàюць старцу͡ом па кавàлку хлі͡еба, нікòму не аткàжуць і нікòго не у̃пікну̀ць, а як пры̀дзе Спас да Зі͡елная, дак і несу̀ць у цэркву сьвеціць збу͡ожэ да маліцца бòгу, каб пасла̀у̃ лі͡епшы зраджàй.

Даніло Кулі͡еш.

Чудзін.

33. Валачàшчыса пàрабак ці служàчы хлі͡еб сабàчы.

Быу̃ сабі͡е адзін валачàшчыса пàрабак. Ён не мау̃ сваі͡е даму͡оу̃кі, а у̃се парабкавàу̃. Алѐ дзі͡е ён не застанѐцца, та у̃сю̀ды яму̀ не дòбрэ, не мажэ ён ужы̀цца да й валачэцца дàлей, шукàць лі͡епшаго прыту̀лку. Наня̀уса ён у дворы̀ служы̀ць пàну. Ду̀мае сабі͡е, што дзі͡е-ж лі͡епш служы̀ць, як не у̃ пàна. Пан багàты, у̃сягò у̃ ягò мну͡ого, — бу̀дзе й на ягò дòлю. Слу̀жыць ён пàну ві͡ерно, шчы̀ро працу̀е, а пан усѐ частỳе ягò ку͡ожын дзень: — гультàй, пся крэу̃! Нѐмаш тòбе лòзы! — Ві͡едамо-ж, прàу̃ду кàжуць лю̀дзі, што служы̀ пàну ві͡ерне, та ён табі͡е пі͡ердне, бо у̃ пàна ляска па пàру͡ог. Пан дурны̀, рабòты не знàе да ту͡олькі панукàе. Яму̀ не трэ дòбрэ рабіць, а як ён веліць. Кіну̀у̃ той пàрабак пàна, — агідло яму̀. Глядзі͡ець, што у̃се рòбіцца не на кары̀сь, а на пакàз, і пашòу̃ шукàць лі͡епшаі͡е гаспадàркі. Дòу̃го ён цягàуса без дзі͡ела да й зайшòу̃ у карчму̀ атды̀хаць да людзѐй распытàць, ці не трэ каму̀ пàрабка. А ты̀е кàжуць, што у̃ ку͡ожнага рабòты мну͡ого, алѐ якàя з валачàшчагоса пàрабка кары̀сьˏ ві͡едамо — чужы̀. І ніхтò не хòчэ ягò браць. — От ідзі хібà-ж к папу̀, — кàжуць нарэшце, — бо у̃ папà якòе дзі͡ело. Паблагатàу̃, паблагатàу̃ да й спажывàй, што люд дау̃. — Пашòу̃ той пàрабак да й наня̀уса к папу̀. Алѐ ві͡едамо пу͡оп, быу̃ ён вѐльмі скупы̀ да завідны. Бàчыць ён, што лю̀дзі завіхàюцца, старàюцца сабі͡е бу͡ольш зрабіць і што у̃ іх усягò мну͡ого, от і хòчэцца яму̀, каб

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

пàрабак згураваў людзèй і нарабіў бòльш, як свуой семевін. Стараўса, стараўса пàрабак, а папу ўсе мàло; от і застаўляе той ягò, каб уставàў дò сьвета, як запаè піевень да забрэшэ сабàка да йшоў у гумнò малацìць. — Лю̀дзі, — кàжэ, — ўсе памалацілі, а ў нас стаìць у тòрпе. Гультàй ты, а не пàрабак. — Гуорно пàрабку. Ён стараèецца ліепш, як сабіе, пнèцца су сіх сіл, а папу̀ не ўгòдзіш. Да яшчэ не так папу̀, як пападзì, бо апры̀ч сваіе парабкуоўськаіе рабòты, трэ зрабіць усе за нàймічку, бо віедамо, што ў папà заўжды дурнàя да гультаявàтая нàймічка, якòе-нèбудзь пакìдзішчэ, што нічòго не рòбіць. — Лю̀дзі памалацілі, — гавòрыць ён сам сабіе, — памалацілі, бо небылò чагò малацìць. Якàя там лава. Як грàдка, а ў папà на паўпаліетка. Налядаваў пòўнае гумнò, што й да каляды̀ не змалацìць. — Алè ўстаè пàрабак дòсьветкі, пне жы̀лы да малòціць. Нарэшце надаіело яму̀ чуць не дàрам рабіць папу̀ да яшчэ ўставàць так рàно й давàй ён прыслухòўвацца, які̀ гэто піевень паè так рàно й чаму̀ з ім не абзывàюцца другìе пеўнì. Пацікаваў ён, аж гэто паè сам пуоп; запаè ён піеўнем да раскатýрхае сабàку, пачнè ягò біць да цкавàць ім нібы̀то вòўка. Сабàка й забрэшэ. На другі дзень пàрабак укінуў сабàку ў пусты̀ калòдзесь да й спіць сабіе, пакýль сòнейко ўзышлò, а пèўня не слу̀хае. Піеў, піеў пуоп, аж яму̀ гòрло апу̀хло, — не ўстàе пàрабак; шукàў ён, шукàў сабàку, — німà. От пуоп плю̀нуў да й пашòў спаць. На заўтра давàй лàяць да сварыцца на пàрабка. А той кàжэ, што ніхтò ягò не пабудзіў, затым ён і заспàўса. Бàчыць пуоп, што з такім пàрабкам піва не звàрыш, і хòчэ ён, каб не плацìць, а каб пàрабак ці загіб, ці сам пакінуў слу̀жбу. А ў папà былò вèльмі велìзных да драпіежных пяць вапрукуоў. От і велìць ён пàрабку закалòць аднагò вапрукà на каўбàсы. Ду̀мае пуоп, што як пàрабак начнè калòць аднагò вапрукà, та другìе кінуцца бараніць ягò да й разарву̀ць пàрабка. — Што тут рабіць, — ду̀мае пàрабак, — ніельга калòць аднагò вапрукà. От ён папрасіў дзецюкòў да рàзам і закалòлі яны̀ ўсіх вапрукòў. Пасвары̀ўса пуоп, алè нічòго не парàдзіць, трэ рабіць каўбàсы да ўжывàць, бо сàло й мя̀со сапсуèцца. —

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

От е каўбасы, а німа хліеба, — кажэ пуоп да й пасылае парабка ў пусты млін, дзіе аблюбавалі сабіе прытулак чэрці да ўселякая нечысь, каб ён там намалоў мукі з мекіны й руознае бузы. Паўёз парабак тую лабазу к чартуом у млін малоць. Туолькі ён надъіехаў, як тут на сустрыэк выскачылі чэрці, памаглі яму знесьці мешкі, змалолі сваю самую ліепшую пшаніцу да й насыпалі ў мешкі таму парабку за тое, што ён першы прыіехаў к ім у млін малоць. Прывозіць парабак муку, а пуоп як убачыў, дак аж сплеснуў рукамі, бо ён дзіву даўса, што парабак не туолькі не загіб у туом млыне, але яшчэ й намалоў мукі. Спужаўса пуоп, заплаціў парабку ўсю ардынаръю нават уперад да яшчэ атдаў і тую муку, абы ён ішоў сабіе, куды зхочэ. Забраў парабак тое дабро да й пачаў сабіе гаспадараваць, — бо, — кажэ, — служачы хліеб сабачы.

Даніло Куліеш.

Чудзін.

34. Як браты дзеліліса.

Было ў бацька два сыны. Адзін вельмі ўпраўны да скупы, а другі такі ціхі, што й вады не замуціць. Памёр стары бацько, от і пачалі браты дзеліцца. Але-ж кажуць: хто дужшы, той і прутшы. Забраў сабіе той упраўны брат нємаль усе бацькаво дабро, а брату пакінуў туолькі голые сціены да даў адну карову. От упраўны брат стаў багачом, а ціхі хутко саўсім абедніеў, так што німа чаго і ў рот палажыць ні сабіе, ні жуонцы з друобнымі дзіеткамі. Німа чаго рабіць, парадзіўса з жуонкаю да й паўёў на продаж апуошнюю карову. Прышлосо яму весьці карову цераз ліес. Бачыць ён, што людзі злавілі якогось злодзея да й цягнуць яго віешаць. Той просіцца так і сяць, клінецца на праміллы буог, што ён невінен, што гэта на яго паклёп. Куды там, тые й слухаць не хочуць. Нагнулі берэзіну, прывезалі за верх вероўку да ўжэ й петлю зашмаргнулі. Шкода стало таму біеднаму злодзея, от і атдаў ён тым людзям сваю карову, абы яны не віешалі злодзея. Тые згадзіліса да й перарыэзалі вероўку.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Усхапіўса злòдзей да так з петлёю на шыі бы заяц сунуў у ліес. Вернуўса той біедны да гаспòды без грòшэй і без каровы да й раскàзвае жуонцы, як тòе былò. Гуорно мàцеры, што дзіеці плàчуць, іесці хòчуць, алè як пачýла янà, што гаспадàр выбавіў ат смèрці чалавіека, дак янà абнялà да пацалавàла перш гаспадарà, пòтым дзецèй да хаць галòдная, алè рàдасная леглà спаць. Спяць яны, дак ось жуонцы прыснìўса такì гòжы сон, што янà аж прахапілаеа да й забыла, што снìла, туолькі й паметàе, што вèльмі пàхло. Павелà янà нòсам, аж сапрàўды ў хàце штось дòбрэ пàхне. Засвеціла янà агонь, аж той разбуойнік ім дабрà прыўèз пòвен вуоз да й злажыў у сіенечках. Аттýль пах пашòў аж у хàту. От пачалì яны спажывàць тòе дабрò, накармìлі дзецèй да й далì ім яшчэ салòдзенькіх піернікаў. Віедамо, дзіеці, пабіеглі яны на двуор гулàць з дзецьмì багàтаго дзяцькі. Убàчылі багàтые ў дзецèй піернікі, пазавìдували біедным да й хòчэцца ім давіедацца, скуль узелòсо ў тагò біеднаго ўселякое дабрò, што ён дзецèй кòрміць піернікамі. Пачалì яны распытòўваць у дзецèй, алè тые малые, нічòго не знàюць. Што тут рабìць, як развіедаць, аткýль у біеднаго брàта ўзялòсо дабрò. От чэшча й кàжэ: от як сьцемніее, я пайдý к ім у сіенечкі да аттýль і падслýхаю, што яны бýдуць гаманìць, та мо што й разузнàю. — Як сказàла бàба, так зрабìла, забрàласа ў сіенячкі да там і прытаìласа. Туолькі, віедамо, старàя, пачалà янà кàшляць. Пачýў тòе разбуойнік да й падýмаў, што гэто тые лю̀дзі зноў прышлì ягò віешаць, выскачыў ён у сіенячкі да як рàз і аседлàў бàбу—да давàй яіе перыэсціць. А ў таіе й духì выперло, бо куолькі старуой трэба. Аглèдзяўса ён, узяў тýю бàбу да й завалòк к багàтаму пад дзьвèры. Пабòжкалі багàтые да й пахавàлі тýю бàбу. От злòдзей нуочу пашòў на мòгліцы, выкапаў тýю бàбу, прынёс к багàтаму пад вакнò, набрàскаў у абалòнку да й кàжэ зменìўшы гòлас: аддàй біедному брàту карòвы й валы, бо я на туом свіеці не мàю супакòю. — Спужàліса багачы, усюсеньку нуочку перакалаціліса бы асіна. На зàўтра яшчэ рàненько высунуўса багàты брат з хàты, зірнуў, аж чэшча лежыць пад вакнòм. Пабіег ён к папý да й кàжэ:

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

так і так, бацюшко, нуочу прышла з могліц чэшча да й казала, каб я аддаў брату каруоў і валуоў, а то яіе на той сьвіет не прымаюць, — да от і лежыць пад вакном. Нехай бацюшко, калі ляска, яшчэ раз яіе схавае. — Пачуў тое пуоп да й веліеў яму аддаць брату каруоў і валуоў, а чэшчу абецаў пахаваць. Аддаў багаты брат біеднаму каруоў і валуоў і пахаваў бабу. Але на другую нуоч зноў браскае баба ў абалонку да кажэ, што яшчэ не аддаў коней, свіней да авец і руознаго дабра. Назаўтра багаты аддаў брату ўсе, як мае быць, пахаваў зноў чэшчу да й прыбіў яіе асінавым калом, каб буольш не хадзіла. З таіе пары супакоілаоа баба. А біедны чалавіек стаў жыць да пажываць да дабра нажываць, а злодзей пашоў сабіе сваею дарогаю. Дак от як браты дзеліліса.

Даніло Куліеш.

Чудзін.

35. Хітры мужык.

Даўніей яшчэ за паньшчынаю жыў адзін мужык. Быў ён хіцер, але прыкідваўса дурням. Рабіць ён нічого не рабіў, бо быў гультай да дзіела, а туолькі каго ашукае, дак з таго й жывіўса. Абарве дзіе грошэй, так зараз да карчмы да й крычыць, — эй, Шлёмка, гарыэлкі да аселенец. — От ён раз дзіесь апарваў шмат асьмакуоў. Усіх не прапіў, а ходзіць па вёсцы, саўгаецца пьяны ат плота да плота да выхваляецца. — Маю шмат асьмакуоў да німа чаго купіць, бо ўсе галышы. — Віедамо, мужыкі біедные, ўсе хаджайство, што адна безхвостая каруоўка да паршывая сьвінка. Добрэ, ў каго дзьвіе-тры авечкі, або каза. Што тут прадасі? Але ось ведзе жыд старого каня прадаваць на шкуру. Сустракае таго жыда Сымуон — так дражнілі таго дуракаватаго мужыка. — Куды Шмуль ведзеш каня? — пытае Сымуон. — Куды? — Лупіць скуру. — Прадай каня мніе. — А хібо ў цебе ест грошы? — Гэ, паганы пархуцько, ў мене туолькі грошэй, што не то, каб што, але куплю пару коней і тваю пархатую мазгаўню. — А аткуль ты ўзяў грошы? — Аткуль узяў, та ўзяў,

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

а цебѐ не пытàў. — А куолькі ты дасі? — А куолькі ты хòчэш за каня̀? — Двàдцаць рублёў. — Хіба-ж з тваìмі патрахàмі. Гаварь̀і сэнс. — Ну, давàй петнàнцаць. — Што петнàнцаць за дыхлìну. От шэсь рублёў дам, калì хòчэш. — Ну, давàй дзèсяць да й спажывàй на здарòве. — Дòўго яны̀ цанавàліса, нарэшце Сымуон купіў каня̀ за сем рублёў. От прывёў ён каня̀ ў сваю̀ стàйню. А стàйня ягò ўжэ даўнò абернўласа, туолькі яшчэ тырчыць аднò шўло. Прывезàў Сымуон каня̀ да тагò шўла, падстàвіў пад хвуост цабèрык; а як куонь туды̀ нарабіў, дак Сымуон накідаў у цабèрык грòшэй. Ідўць жыды̀ да й бàчаць, што Сымуон іешто рòбіць пад хвастòм у каня̀. А віедамо, жыды̀ вèльмі цікàвые. Падхòдзяць яны̀ бліжыэй і пытàюць — што ты рòбіш, Сымуонка? — Што раблю̀, — кàжэ Сымуон, — хіба-ж вы слепы̀е, што не бàчыце, што раблю̀? — А сам тым чàсам вымàе з цабèрка куолькісь залатуовак. Убàчылі тòе жыды̀ дак аж затраслìса, бы іх трàсца калòціць. Паднелì тут жыды̀ такì гармìдар, што Сымуон аж спужàўса, ён дўмаў, што тут якòгось жы̀да чорт ухапіў. От пакрычàлі, пакрычàлі жыды̀, паг(g)ерг(g)етàлі сàмі прэміж сабòю да й кàжуць Сымòну. — Слўхай, Шымуонка. На сто табè такì куонь? Ты нікўды не іездзіс, а каня̀ еспэ трэба кармìць да дагледàць. Ну, от ліепш ужэ прадàй нам. — А што вы дасьцè? — Сто, ну, хòцэс двадцаць рублì. — От пархўцько чагò захапèў. Да мніе куонь за адзìн дзень вы̀рабіць двàдцаць рублёў, туолькі я ягò дòбрэ пакармлю̀. — Ну, а куолькі ты хòцэс? — прыстаю̀ць жыды̀ бы смалà. Сымуон запрасіў чуць не ты̀шчу. Спужàліса жыды̀, алè ўчапìліса, бы кліешчэі ўсе таргўюцца. Таргавàліса яны̀, таргавàліса, алè нарэшце мўсілі заплацìць Сымòну тры̀ста рублёў. Павелì жыды̀ каня̀, а Сымуон узяў грòшы да й пашòў хучыэй у кàрчму. Датўль Сымуон не вылàзіў з кàрчмы, пакўль усіх грòшэй не прапіў. Прайшлò мо сòдзьве недзіелі, ачўхаўса Сымуон і пацёгса ў мястэчко. А жыды̀ ты̀м чàсам кòрмяць каня̀ сіенам да аўсòм і ўсе калупàюць пад хвастòм, алè грòшэй пімà-ш.

От прышòў Сымуон у местэчко рàненько, яшчэ да ўсхòда сòнца. Местачкòвые лю̀дзі яшчэ спàлі. Віедамо, ў местэчку рàно

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

німа̀ чаго̀ рабі̀ць, дак пу͡озно сьпяць. От Сыму͡он прышо̀ў на ры̀нак, вы̀капаў там я̀мку, насы̀паў туды̀ жа̀ру, прысы̀паў звѐрху тро̀хі по̀пелам да землѐю, пастàвіў туды̀ го̀ршчык з вàрываю, сі͡еў калѐ яго̀ да й чакàе, по̀куль зберу̀цца жыды̀. Го̀ршчык кіпі̀ць, аж з яго̀ пàра клу̀бам вàліць. А Сыму͡он седзі̀ць сабі͡е калѐ го̀ршчыка да лю̀лячу пaку̀рвае. От ушчу̀халіса жыды̀, бегу̀ць на ры̀нак: хто крàмкі атмыкàе, хто людзѐй пераймàе, каб упѐрш што вы̀дурыць, хто на ры̀нку расклàдвае ру͡озные тавàры. Бàчаць тут жыды̀, што ў Сыму͡онà го̀ршчык без агню̀ кіпі̀ць і вàрыць стрàву. Ніко̀лі яны̀ тако̀го дзі̀ва не бàчылі. Збі̀ліса яны̀ ў ку̀чу, патраслі̀ пэйсамі, паг(g)ерг(g)етàлі да й кàжуць Сымо̀ну.— Цу̀ес, Сыму͡онко, на сто табі͡е го̀ршчык? — А ў чо̀м жэ я бу̀ду стрàву вары̀ць? — Купі̀ сабі͡е другі̀, а гэты прадàй нам, мы до̀брэ заплàцім. — Тут прыбі͡еглі ты̀е жыды̀, што купі̀лі ў Сыму͡она старо̀го каня̀. От давàй яны̀ крычàць на Сыму͡она, што ён абману̀ў іх, бо ку͡онь назàўтрэ здох і ніякіх гро̀шэй не даў.—Адберу͡ом,— крычàць жыды̀, — го̀ршчык за то̀е, што ты нас падману̀ў. — От жэ я вам лудàтые бі͡ельма кіпетко̀м вы̀смалю, зачапі͡еце ту͡олькі, дак я вам усі͡е пэйсы павырывàю, хварэць вàшуй мàтары. Вон, пранцавàтые парху̀цькі, каб вас халѐра ўзялà!—Бàчаць жыды̀, што гру͡озьбаю з Сымо̀нам нічо̀го не парàдзіш, давàй яны̀ прасі̀ць яго̀, каб прадàў ім сву͡ой го̀ршчык, су̀ляць за яго̀ пьяць рублѐў. Алѐ Сыму͡он упѐрса: от давàй яму̀ дзѐсяць рублѐў; хаць што хо̀чэш, тані͡ей не аддаѐ. Шко̀да жыду͡ом гро̀шэй, алѐ не магу̀ць Сымо̀на абдуры̀ць.—Ну, Сыму͡онко, трàсца тваѐй мàтары, ты й так нас абшукàў, беры̀ шэсьць рублі̀. Ну, што з табо̀ю рабі̀ць, беры̀ сі͡ем. — Да хавàй бо̀жэ, й аднаго̀ шэляга не скі̀ну; плаці͡еце дзѐсяць. Гэтакая начы͡эніна. Да янà сто рублѐў вàрта. Не трэба табі͡е ні дроў, ні пѐчы... вары̀ сабі͡е г(g)уг(g)ель хаць у су̀тачках.—Ну, беры̀ ву͡осім рублі̀. — Не трэба мні͡е вàшых гро̀шэй, я сваі͡е мàю асьмакі̀. — І сто з табо̀ю рабі̀ць, Сыму͡онко, вазьмі̀ ўжэ дзѐсяць рублі̀ да давàй нам го̀ршчык. — Да ўжэш лічэце асьмакі̀; што з вàмі робі̀ць? Прыстàлі, бы смалà да азàдку. — От заплаці̀лі жыды̀ Сымо̀ну дзѐсяць рублѐў і забрàлі гарàчы го̀ршчык.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

—Пачакайце трохі, — крычыць Сымуон, —я забыўса, што ў горшчыку варацца тараны. — Павыцягваў тут Сымуон з горшчыка тараны, завінуў іх у капусны ліст, палажыў за пазуху да й пашоў у карчму. Тут ён зарас патрэбуваў гарэлкі, выпіў і давай таранамі закусваць. Патуль седзіеў Сымуон у карчміе, пакуль не прапіў усіе грошы. Тым часам аглядзіеліса жыды, што Сымуон іх абшукаў і пашлі к пану жаліцца на Сымона. Пасылае пан парабкуоў па Сымона. Пашлі тые шукаць Сымона. Доўго яны шукалі, нарэшце знайшлі ў качміе пад лаваю. Лежыць Сымуон пъяны, бы пласт. От яны вылілі на яго мо вёдзер з дзесяць халоднаіе вады. Тагды туолькі Сымуон трохі ачухаўса. Тым часам парабкі падхапілі яго да й цягнуць к пану на расправу.—Дайце пахмеліцца,— кажэ Сымуон, — та я й сам пайду. — Тут прыбіеглі жыды, пасставілі Сымону кварту, далі аселёнец да лусту хліеба, а жыдуоўка прынесла кіслых агуркуоў. Частуюць жыды Сымона, каб туолькі ён ішоў да пана. Напіўса Сымуон, наіеўса, аж пояс расперазаў да й пашоў да пана. От прывелі Сымона й давай на яго жаліцца. Выслухаў пан жыдуоў, распытаў Сымона, але той пъяны, нічого не атказвае. Думаў тут, думаў пан і не віедае, што тут рабіць з Сымонам і аддаў яго жыдуом, каб яны самі рабілі, што зхочуць. Павалаклі тут жыды Сымона на рынак. Збіегласо сюды жыдуоў цьма-цьмушчая: немаль усіе з мястэчка, старые й малые. Крычаць, г(g)ерг(g)ечуць і паднелі такі гармідар, як на Гамана. Крычалі яны, крычалі й парашылі Сымона ўтапіць, ці павіесіць. Перш яны замоўклі, але потым зноў пачалі крычаць. Адны кажуць — атарвецца, другіе кажуць — усплыве. Зноў пачалі жыды крычаць, спорыць. Адны хочуць павіесіць, другіе — ўтапіць. Доўго яны крычалі, аж ахрыплі, нарэшце пытаюць самого Сымона, як ён хочэ: ці каб павіесілі, ці каб утапілі. — Э, хварэць вашуй матары, пархатые недавіеркі, — кажэ Сымуон,—рабіеце, як ліепш.—От паг(g)ерг(g)еталі жыды да й згадзіліса праміж сабою, што трэ Сымона лепіей утапіць. От пасадзілі яны яго ў міех, завезалі лычкам і занеслі к рацыэ. Але тут уздумалі, што не спыталі рабіна. Кіпулі яны міех з Сымо-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

нам на дарòзе калà ракì да й пабі͡еглі пытàць рàбіна. Пакỳль рàбін седзі͡еў над бỳбляю да мыслявàў, вы̀ехаў пан з местэчка к сусі͡еду ў гòсьці. І͡едзе пан калà ракì да й бàчыць, што лежы̀ць мі͡ех, а ў ём хтòсь варỳшыцца. Як пачỳў Сыму͡он, што хтось і͡едзе, што гэто мàбыць пан, бо хурмàн пàліць з бічà, от ён давàй крычàць, — ратỳйце дòбрые лю̀дзі! Не ўмі͡ею ні чытàць, ні пісàць, а за караля̀ везỳць. — Учỳў тòе пан і захаці͡еласо яму̀ зрабіцца каралём. Велі͡еў ён хурману̀ супынìць кòней, злі͡ез з качòбрыка, падышòў к Сымòну, развезàў мі͡ех да й кàжэ: «я ўмі͡ею чытàць і пісàць, з менè дòбры бỳдзе кару͡оль. Давàй я ўлі͡езу ў мі͡ех, а ты менè завежы̀». Улі͡ез гэто пан у мі͡ех. Сыму͡он му͡оцно ягò завезàў, а сам сі͡еў на качòбрык да й паі͡ехаў у маёнтак панавàць зàмяст пàна. Тым чàсам жыды̀ вернỳліса ат рàбіна да й укінулі пàна ў раку̀. Ту͡олькі забулбатàў пан і пашòў на дно, бы кàмень. А Сыму͡он з таі͡е пары̀ зажы̀ў пàнам. Бо кàжуць жэ лю̀дзі, што калì шанцỳе, та й у лàпцях танцỳе. Калì шчàсьце, та й з мі͡еха вылезе.

Даніло Кулі͡еш.

Чудзін.

36. Заву͡оцкіе кòні.

Былì ў аднагò чалаві͡ека вèльмі дòбрые кòні. Куды̀ ён ні паі͡едзе, та ўсю̀дых абстỳпяць жыды̀ да ўсе пытàюць, дзі͡е ён узя̀ў такіе кòні. Напры̀крыло яму̀ ку͡ождаму пàрху спаведàцца, от і пачàў ён шуткавàць да гавары̀ць на кпінкі. Чагò ту͡олькі ён не выдумòўваў, як не чмуціў да не смея̀ўса з дурны̀х жыду͡оў. От раз сабрàўса ён у мі͡есто на ры̀нак, запру͡ог сваі͡е кòні, а каб не і͡ехаць улèгцы, ўскінуў на ву͡оз з паўдзіся̀тка гарбузу͡оў. А той гу͡од глàдкіе да велізазные зрадзілі ў ягò гарбузы̀. Ту͡олькі ён супынìў на ры̀нку кòней, як ось атусю̀ль збі͡егліса жыдэ̀, акружы̀лі ву͡оз да й пытàюць:

— Ну, цỳес, цỳес, чыі͡е гэто ў цебè кòні?

— Чыі͡е? Вèдомо чыі͡е. Маі͡е.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

— Алѐ-с вѐльмі дòбрые кòні.

— Аджэ-ж дòбрые, бо завуоцкіе.

— Якіе завуоцкіе? Сто ты кàзэс?

— Што ты чўеш. Завуоцкіе, бо сам заўёў.

— Як заўёў?

— Да хварыэць вàшуй мàтары, не віедаеце, як кòней завòдзяць дòбрые людзі. Звіесно, сіеў, як кўрыца на ѝйца да й вы̀сядзеў жарабя̀т. От і кòні да яшчэ̀ якііе!

— Ну, а дзіе ты ўзяў ѝйца? — пытàюць жыды̀. Бàчыць той чалавіек, што жыдэ̀ й праўда дўмаюць, што кòней высіеджваюць на ѝйцах да й давàй яшчэ̀ буольш шуткавàць. От ён ім і аткàзвае:

— Хіба̀-ж вам вòчы павылàзілі, што небàчыце. А гэто-ж на вòзе лежàць. — Зірнўлі жыдэ̀ на вуоз да й хапіліса мàцаць тые гарбузы̀.

— Прэч, пагàные недавіеркі, бо яшчэ̀, папсуецѐ ѝйца, дак не вы̀дуць жарабя̀та! — Да й пачàў сербàць жыдуоў пўгаю, каб атагнàць іх ат вòза. Разагнàў ён збуольшаго жыдуоў да й хаціеў іщі па сваймў дзіелу, алѐ ось адзін жыд, мàбыць сам цòдык, бо вѐльмо з дòўгімі пэйсамі, прыстàў, бы смалà — прадàй да прадàй тые ѝйца.

— Чамў не прадàць? Купі. Я-ж на тòе й прыўёз, каб прадàць. А куолькі-ж ты дасі?

— А куолькі ты хòцэс?

— Куолькі? Давàй па двàдцать пъяць рублёў.

— Ну, сто так дòраго? Казі сэнс.

— Якòе дòраго? Ты зірні, якіе кòні. Бàчыш, завуоцкіе.

— Ну, німà цагò казàць. Кòні дòбрые, алѐ й грòсы дòбрые. Ну, а куолькі ты ўступіс?

— Нічòго не ўступлю. Гэто я прадаю, што самòму ніекалі седзіецьь, а трэ̀ збуожэ малаціць.

— Ну, ўступі трòхі, та я ўсіе заберў.

— Хіба-ж так. Ну, што з табòю рабіць, бері ўжэ ўсіе за сто рублёў.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Заплаціў жыд гро̀шы, забра̀ў тые гарбузы̀ да й пыта̀е, як гэто трэба на іх седзі͡ець.

— Ты завезі̀ іх у хмызнік, — ву̀чыць той жы̀да, — дзі͡е мну͡ого ялу͡оўцу, насечы̀ з яго̀ ві͡етак, зрабі̀ кубѐльцэ да й седзі̀, по̀куль вы̀седзіш. Ту͡олькі скінь плю̀ндры, бо нічо̀го не бу̀дзе, — даба̀віў той да й паі͡ехаў з рынка, каб у кра̀мках закупіць усѐ, што трэ ў гаспада̀рцы.

От змо̀віўса жыд з сваѐю Ха̀йкаю, каб яна̀ насіла яму̀ абі͡ед, а сам зрабіў, як яго̀ вучы̀ў той чалаві͡ек да й седзіць на тых гарбу͡зу͡ох. Седзі͡еў ён, седзі͡еў, ужэ̀ весь вы̀петраў да й ску͡очкі да мура̀шкі яго̀ заі͡елі, а нічо̀го німа̀. Пама̀цае ён тые гарбузы̀, павѐрне на другі̀ бу͡ок да й зноў седзіць. Прыхо̀дзіць Ха̀йка да й ка̀жэ: ну, ты іх тро̀хі пабаўта̀й. Маръя̀на каза̀ла, што трэ̀ба баўта̀ць, ту͡олькі не мну͡ого, бо бу̀дуць баўтуны̀. — Пакалаціў жыд гарбузы̀, сі͡еў да мыслю̀е сабі͡е, як ён бу̀дзе і͡ездзіць на заву͡оцкіх ко̀пях, як ён з іх зро̀біць до̀бры г(g)ішэфт. Падхо̀дзіць ша̀бас. Седзіць жыд бы прыко̀ваны да мармы̀чэ сабі͡е пад ну͡ос. — Ша̀бас му͡ой не дзіву̀й. Я седжу̀, бо ко̀ней хачу̀. — Праседзі͡еў ён мо недзі͡ель со̀ тры, алѐ ось і ба̀чыць, што з пад ку̀ста кала̀ са̀маго яго̀ вы̀скачылі два за̀йчыкі да й паскака̀лі. Ду̀мае жыд, што гэто вылупіліса жарабъя̀тка, павернуўса ён, каб бі͡егці за імі да й раздушы̀ў гнілые гарбузы̀. Схапіўса тут жыд да так без плю̀ндраў і пусціўса даганя̀ць тых зайцу͡оў. Бежы̀ць да крычы̀ць: — ко̀ся, ко̀ся, маі͡е ко̀нікі, дам абро̀ку! — Сустрака̀е ён людзѐй да й про̀сіць: — Ой галу̀бцікі, ой, ру͡одненькіе, лаві͡еце маі̀х жарабъя̀т, бо ўцеку̀ць. Гэто̀-ж заву͡оцкіе ко̀ні. — Ашалі͡еў жыд, — ка̀жуць лю̀дзі, — без парто̀к бі͡егае за за̀йцамі.

Даніло Кулі͡еш.

Чудзін.

37. У ба̀бы чо̀ртава галава̀.

Сатвары̀ў бу͡ог сьві͡ет да й пашо̀ў з Міко̀лаю да Петро̀м агляда̀ць, ці ўсе до̀брэ зро̀блено. Іду̀ць яны̀ да ра̀дзяцца, што трэба

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

знішчыць, што перарабіць, каб усѐ было̀ до̀брэ. Вайхо̀дзяць яны̀ ў адну̀ ўѐску да й чу̀юць які̀сь крык да праклён. — Схадзі̀, — ка̀жэ буо͡г Міко̀ле, — пабач, што там ро̀біцца да папра̀ў, калі̀ кѐпсько.—Падхо̀дзіць Міко̀ла да й ба̀чыць, аж над карытам седзі̀ць жанчы̀на, шару̀е песко̀м да хвашча̀нкаю сваю̀ мо̀рду да крычы̀ць, клінѐ сваю̀ до̀лю, што куо͡лькі яна̀ ні мые, а мо̀рда ўсе чырво̀ная. Ї пыта̀е яіе͡ Міко̀ла, чаго̀ яна̀ хо̀чэ. — Я гуо͡ркая да нешча̀сная,— з пла̀чам жа̀ліцца яна̀, — на што менѐ буо͡г на свіе͡т пусці̀ў, калі̀ не даў мніе͡ до̀лі, не даў мніе͡ хараства̀.

— Яко̀го-ж ты хо̀чэш хараства̀?

— Я й сама̀ не віе͡даю. Ой мая̀ біе͡дная галуо͡ўка! Ліе͡пш-бы менѐ ма̀тачка не радзі̀ла, ці малу̀ю задушы̀ла, як мніе͡ жыць, як усіе͡ жыву̀ць! — Паслу̀хаў Міко̀ла й зрабі̀ў так, што жанчы̀на меня̀ецца куо͡жную часі̀ну, як на со̀нейку палыску̀ецца й меня̀ецца гадзю̀ка. Схілі̀ласа жанчы̀на над кары̀там з вадо̀ю, зірну̀ла на себѐ да й ра̀да. От пачала̀ яна̀ чапля̀ць на себѐ ўселя̀кую ўселя̀чыну, каб стаць іна̀кшаю, як лю̀дзі. Пашлі̀ яны̀ да̀лей, а па нема̀лум ча̀се чу̀юць, што зноў крычы̀ць ба̀ба. На гэты раз буо͡г пасыла̀е Петра̀, каб ён паба̀чыў, што там ро̀біцца. Падхо̀дзіць ён, аж ба̀ба бъѐцца з чо̀ртам. Ба̀ба схапі̀ла вілы, а чорт о̀жаг. Лу̀піць ба̀ба чо̀рта ві̀ламі па чуо͡м папа̀ло. Чорт круці̀ўса, круці̀ўса да й ка̀жэ: — от велі̀кая ры͡эч, што ты бъѐшса, бо ў цебѐ ніе͡льга пацэ̀ліць о̀жагам. Пры гэтум ён пераско̀чыў за плуо͡т. — Меня̀йм асо, — ка̀жэ ба̀ба. От паменя̀ліса яны̀. Чорт даў ба̀бе о̀жаг, а яна̀ перакѝнула яму̀ цѐраз плуо͡т вілы. Ї пачалі̀ яны̀ зноў бі̀цца. Пырнѐ чорт ба̀бу ві̀ламі, дак яны̀ й захра̀снуць у пло̀це, а ба̀ба што пырнѐ, та зро̀біць у чо̀рта дзі̀рку. Зрашапі̀ла яна̀ чо̀рта так, што мо не застало̀со радзі̀маго міе͡сца. Алѐ чо̀рт не здаѐцца; кі̀нуў ён вілы, пераско̀чыў наза̀д цѐраз плуо͡т да й схапі̀ў ба̀бу за̀грудкі. Во̀дзяцца яны̀ бы пъя̀ные, патамі̀ліса або̀е, алѐ не здаю̀цца, куо͡жнае хо̀чэ паста̀віць на сваём. Паглядзіе͡ў на то̀е Петро̀ да й пашо̀ў к бо̀гу. От буо͡г пасыла̀е яго̀, каб развѐў ба̀бу з чо̀ртам. Прышо̀ў Петро̀, расцяга̀ў іх, расцяга̀ў, алѐ нічо̀го не пара̀дзіць, бо так яны̀ сплелі̀са, што й вадо̀ю не разлі̀ць. Прышо̀ў Петро̀

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

назад ні з чым. Алè буог зноў пасылàе, каб ён іх развëў. Абазліўса Петрò, што праз іх ягò буог турбўе на стàрасці, папрòбуваў іх разцягці, алè ніяк не мажэ. От сцяў ім гòловы да й давàй расцягàць. Алè бàба так сашчаміла рўкі, што й без галавы, а чòрта не пускàе. Рашчаміў ён у бàбы рўкі, раскідаў іх да й пашòў к бòгу. — А што, развëў? — пытàе буог. — Ніе, гòспадзі, я ім сцяў гòлавы. — Не дòбрэ зрабіў, — кàжэ буог, — ідзі, прыстàў ім гòлавы, та яны ажывўць. — Пашоў яшчэ раз Петрò да са злòсьці хучыэй прыстàвіў ім гòлавы, туолькі абмыліўса да гòлаў чòрта прылажыў бàбе. От з тых чàсаў і засталàса бàба з хітраю чòртаваю галавòю. Мо затым янà й гòлаў закрывàе, каб не відны былі рòгі. А чорт так і застàўса з галавòю бàбы, бо так ямў лаўчыэй звòдзіць дòбрых людзèй.

Даніло Куліеш.

Чудзін.

38. Пьяніца.

На дàрам лю̀дзі кàжуць — сатупі пьяпаму з дарòгі, та буог віеку прыбàвіць. Мо затым дòбрые лю̀дзі заўжды пьянаго абхòдзяць, не чапàюць, нехàй прасніцца. Бо пьяны гарыэй чòрта. Жыў тут кòлісь вèльмі велікі пьяніца. Што з ім не рабіў пан, мо не раз спушчàў ямў ўсю шкўру да абліваў пісухі гарыэлкаю. А ён хаць бы што. Ягò лўпяць на стàйні, а ён кàжэ: не бузўйце дàрам бòжаго дàру, не разлівàйце гарыэлкі, а ліепш дàйце мніе, та я выпью. — Пасыпце ямў на хвуост сòлі, — крычыць пан. — А ён кàжэ — дзякуй панòчку й за тòе. — Німà чагò рабіць, кінуць ягò палòсуваць, а ён, калі не напьèцца, дак ці што ўпечэ, ці пàньськім кòням хвасты паабрыэзвае, ці вòду з стàва выпусьціць, абò ўдзерэ яшчэ якўю нèбудзь штўку, што й сміех лю̀дзям сказàць. Злавàў, злавàў пан, а нарэшце й аткаснўўса ат ліхòго. От напіўса той пьяніца да й пачàў ігрàць з чарцямі. Выдумòўваў ён уселякіе штўкі да так хвàцько забаўляў іх, што яны жыўцòм забрàлі ягò к сабіе ў пèкло. Алè мàбыць і ў пèкле ніельга пра-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

жы̀ць без пра̀цы аднѐю гульнёю. Прачу̍хаўса тро̀хі пъя̀ніца да й крычы̀ць на ўсе пѐкло — дава̀йце гарыэлкі, а то ўсе пѐкло развярну̀! — Німа̀ чаго̀ рабі̀ць, далі̀ чэ̀рці яму̀ гарыэлкі мо два, ці тры разы̀, да й шко̀да ім ста̀ло да̀рам бузава̀ць гарыэлку, калі̀ яна̀ на землі̀ так до̀брэ зво̀дзіць людзѐй да ведзѐ іх у пѐкло. Туольк̀і параста̀лі чэ̀рці дава̀ць яму̀ гарыэлку, дак ён так разбушава̀ўса, што аж пѐкло трашчы̀ць. Разбіегліса чэ̀рці чорт віедае куды̀, а ён пача̀ў зрыва̀ць з катлуоў замкі̀ да выпушча̀ць з гара̀чаіе смалы̀ грыэшные ду̀шы. Атчыні̀ў ён адзін кацёл, аж там седзя̀ць усе жыды̀. Вы̀скачылі яны̀ да й про̀сяць, каб ён аслабані̀ў усі̀х жыдуоў. — А гарыэлкі дасцѐ, пага̀ная ва̀ша душа̀? — Ой, цаму̀ ніе, туолькі ты ўзэ зрабі̀ міласць, аслабані̀ на̀сых балабо̀стаў. — Віедамо, праны̀ры жыды̀, яны̀ й у пѐкле за̀рас даста̀лі пляшку гарыэлкі. Глыну̀ў ён тро̀хі дзѐля разо̀ну да й сарва̀ў віеко яшчэ̀ з аднаго̀ катла̀. Павылазілі аттуль жыдуоўкі да жыдуовачкі да й паднелі̀ такі̀ гармідар, што аж пѐкло правалі̀ласо. Пасыпаліса жыды̀ з пѐкла бы град да про̀сто ў наш край. От затым іх по̀ганi у нас так мнуого, што хаць гаць гаці̀. Вы̀піў пъя̀ніца апуошнюю гарыэлку й тро̀хі супако̀іўса. Пачалі̀ тут збіра̀цца чэ̀рці да як уба̀чылі, чаго̀ ён тут навычвара̀ў, дак дава̀й рахава̀цца, што тут рабі̀ць. — Гэто-ж ён — ка̀жуць, — усіе ду̀шы павыпуска̀е. — Намо̀віліса яны̀ да й вы̀кінулі пъя̀ніцу з пѐкла. Праспа̀ўса ён у раўчуку̀ пад пло̀там, прадзёр во̀чы, алѐ ба̀чыць — што̀сь незнаёмы край. Усцёгса ён, алѐ кала̀ сэ̀рца так печэ̀, што немуожне й вы̀трымаць, трэ пахмелі̀цца. От і пашо̀ў ён шука̀ць ка̀рчмы. Хадзі̀ў, хадзі̀ў, — нідзіе німа̀. — Дзіе-ж гэто я, — ду̀мае ён, — ні на землі̀, ні ў пѐкле, бо й там і там му̀сіць быць гарыэлка. Віедамо — без гарыэлкі на свіеці не пражы̀ць да й у пѐкло не папа̀сці. — Падхо̀дзіць ён к бра̀ме й начына̀е сту̀кацъ у дзьвѐры. — Хто там? — пыта̀юць аттуль. — Я. — А хто ты такі̀? — Звіесно хто. Пъя̀ніца. А ты хто? — Я святы̀ Петро̀. Ідзі̀ сабіе, го̀лубе, бо ў рай пъя̀ніц не прыма̀юць. — А, гэто той са̀мы Петро̀, што ат Хрыста̀ атруокса. Дак ба̀чыш яго, як угіба̀ў ат ра̀я ключы̀, дак ніко̀го й не пуска̀е. Пачака̀й-жэ, я й на цебѐ

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

справу знайду. — Німа чаго Петру казаць, заве ён Паула, каб той пагаманіў з пъяніцаю. — Хто там? — пытае Паўло. — Я.— Хто ты такі? — Пъяніца. А ты хто? — Я Паўло. — А, гэто той самы Паўло, што ганяўса да лавіў Хрыста. — Дак чаго табіе трэ? — Атчыні дзьвёры. — Тут німа міейсца пъяніцам. Ідзі сабіе далей. — Дак от які ты? Хрыста ганяеш, а мене не пушчаеш. Я як вып'ю чарачку, дак заўжды скажу: дзякуй табіе Госпадзі. — Німа чаго казаць, пашоў Паўло да й пазваў Івана Еваналіста. Прыходзіць той, а пъяніца грукае ў дзьвёры, аж рай дрыжыць. — Хто там? — пытае Еваналіст Іван. — Я. — Хто ты такі? — Пъяніца. — Чаго табіе трэ? — От пусці, калі стукаюць. — Тут пъяніц не пушчаюць. — А ты хто? — Я Еваналіст Іван. — От і бачно, якая ў цебе праўда. Ты сам напісаў, што калі будзеш стукаць, та атчыняць, а калі станеш шукаць, та знайдзеш. Я от ужэ мо паў гадзіны грукаюса, а ты ўсе не атчыняеш. Сягонячы ўвесь дзень шукаю гарыэлкі, а яіе німаш і капелькі. Дак от як ты нашаго брата ашукоўваеш. — Німа чаго рабіць, пусціў той пъяніцу ў рай да яшчэ й напаіў яго гарыэлкаю, каб туолькі маўчаў.

Даніло Куліеш.

Чудзін.

39. Хітрыэй сьвіету не будзеш.

Праўду кажуць старые людзі: хітры, не хітры, а хітрыэй сьвіету не будзеш. А як пачнеш вельмі хітраваць, та й перахітрыцца. Чула я ат аднаго старого чалавіека, што тут дзіесь недалечко жыла адна вельмі хітрая баба. Яна была такая хітрая, што мо хітрыэй самого чорта. У яіе была дачка адным адзініца. Але то кажыэце, была яна такая-ж хітрая, як і матка. Жыве сабіе хітрая баба, ліханька не знае. Людзі гаруюць, працуюць, зарабляюць кусок хліеба. А баба й так сабіе цягне, што ні запарве. Я, — кажэ, — мірськая і ўсе мірськое, дак мніе муожна й браць. — А як трэба што аддаваць, та яна крычыць, галасуе,

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

што буог не веліеў крыўдзіць біедную удаву з сіруоткаю. Не чапàлі яіе дòбрые лю̀дзі. Кàжуць: нехàй ёй ліхо й бедà. Ты яіе пàлцам крэнеш, дак і не атчыэпішса, бы ат ліхòіе скулы. Ужэ рыхтавàліса нàшы дзецюкі правучыць старую віедзьму, каб янà не хітрыла да людзèй не звадзіла, да туолькі баяліса бòга. От падраслà дачкà таіе бàбы да й стàла ўжэ нелапàя дзіеўка, алè як і мàтка нічòго не хòчэ рабіць, а туолькі седзіць да прыхарòшваецца. Ужэ трэба гатавàць ручнікі да лядавàць кубел, бо не загарàмі прыдуць і сваты, а дзіеўка не то, каб што, алè й лàткі сабіе не залàпіць. А, віедамо, ў гаспадàрцы трэ ўсе ўміець рабіць, бо кàжуць-жэ лю̀дзі: дай бòжэ ўсе ўміець, да не ўсе рабіць. От хітрая бàба пашлà на кірмàш, накупіла там руознаіе жанòчаіе рухамòсьці, пакàзвае тòе лю̀дзям да кàжэ, што гэто нарабіла яіе дачкà. Ī пашлà прачутка, што бàбіна дачкà такàя здàтная да рабòты, што ніхтò тагò не зрòбіць, што янà навычварàла. От пòсьле Калядіпачалі к ёй хадзіць сваты. Дак куды там, бàба й слухаць нехòчэ, а дзіеўка кòжнаму хлòпцу даè рэкуз; нèмаль зрэкузавàла ўсіх хлòпцаў ва ўсёй акрузе. Сòрам лю̀дзям, алè немà чагò рабіць. Перабірàла янà, перабірàла, алè за перабірàчку даè буог гарàчку. Так трàпіласо й з тòю дзіеўкаю: пахадзілі сваты да й кінулі. От прайшòў гуод, другі, а к ёй ніхтò й нòса не пакàжэ. Бàчыць бàба, што перахітрыла, што дачкà мажэ саўсім застàцца ў дзіеўках, от і началà янà круціць да падбівàць жанòк, каб тые падмаўлялі людзèй браць яіе дачку. Дачуліса аб туом дзеўкі да й началі абхòдзіць бàбіну дачку, бы ліхую, а хлòпцы давàй к ёй прыставàць нібыто кахàюць, алè прыстаю̀ць туолькі, каб накпіць. Рàда хітрая дзіеўка, што яіе хлòпцы кахàюць і к куожнаму янà хіліцца, нібыто й самà кахàе, а тым чàсам выбірàе сабіе хлòпца сàмаго багàтаго да ўдàлаго. Сьмею̀цца хлòпцы, а сватуоў не засылàюць. Нарэшце дагадàласа хітрая дзіеўка, што гэто кпінкі да й гòдзі карагòдзіцца з хлòпцамі, не хòчэ з імі й гаварыць, не то, каб што. От быў там адзін плюгàвы хлòпец. Ён яшчэ з малèнства та пàсьціў у папà сьвіне, та служыў у жыдуоў, та дзіесь цягàўса па сьвіету да так разбэсьціўса, што ягò дòбрые лю̀дзі

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

й к сабі͡е не прымàлі. Пачàў той хлòпец піць да крàсьці. Злавìлі ягò людзі, павучы̀лі трòхі да й пусьцìлі. От і пачàў ён вèльмі сму͡олно прыставàць к ту͡ой хітруй дзі͡еўцы, алè куды̀ там, тàя й слу̀хаць не хòчэ, дзі͡е янà пу͡ойдзе за такòго пъянчу̀жку-валацу̀гу. От той хлапèц і пачàў хітравàць. Пашлà раз тàя хітрая дзі͡еўка ў лі͡ес па я̀гады, а той хлапèц за èю нàзіркам. Падышлà янà к паля̀нцы да й рве сабі͡е малìны. На паля̀нцы расьцè прòсо, а каб ягò не пілì птушкі, дак гаспадàр зрабіў апу̀дало: паві͡есіў рвàны жыду͡оўські лапсардàк да дзірàвы капелю̀ш, бы рэшато да й падапъёр тòўстым дручкòм. Стаіць апу̀дало, целепàецца ат ві͡етру да пужàе не то што пту̀шак, алè й людзèй. Бàчыць хлòпец, што дзі͡еўка заахвòцілася рваць малìны, от ён скìнуў сваю̀ ву͡опратку, зняў з апу̀дала лапсардàк да капелю̀ш, адзі͡еўся разбу͡ойнікам, узя̀ў той дручòк да й кìнуўся з гушчэчы к ту͡ой дзі͡еўцы. Спужàласа янà да й кàжэ: рабì, што хòчэш, тòлькі не губì душы̀. Тым чàсам ужэ быў змру͡ок. Пастушкì гнàлі гòвядо да й пачалì галёкаць. Кìнуўся разбу͡ойнік наўпекачà ў гушчэчу, скìнуў там жыду͡оўські лахмàн да капелю̀ш, апрану̀ўся ў сваю̀ ву͡опратку да бегòм к ту͡ой дзі͡еўцы, нібы̀то ратавàць яі͡е ат разбу͡ойніка. Рàда дзі͡еўка, што засталàса жывòю, дзя̀куе таму̀ хлòпцу да й згаджàецца з ім пабрàцца. Пакруцìла трòхі бàба, алè нарэшце дагадàласа, што хітры͡эй сьві͡ету не бу̀дзеш да й аддалà дачку̀ за тагò пъяньчу̀жку-валацу̀гу.

Матруна Бохмачыха.

Чудзін.

40. Пѐршае яѐчко.

Хадзіў дзі͡ед на ахвòту, мі͡еў ён мну͡ого клапòту: сам утòміцца, аж слòва не прамòвіць, а зьверыны̀ не налòвіць. Бàба дзі͡еда лàе, што ён дàрам гуля̀е. Пашòў дзі͡ед у алёс да бàбе ку̀рку прынёс. Рàда бàба, скàчэ, а ку̀рка кудàхчэ. Сі͡ела ку̀рка на ві͡ечко да й знеслà яèчко. Бі͡егла мы̀шка пад скры̀нку, цяглà сабі͡е скары̀нку, хвастòм вільну̀ла, яèчко сапхну̀ла. Вінавàто ві͡ечко, што разбìласо яèчко. Заплàкала бàба, аж завы̀ла да з жàлю у̀сі͡е гаршкì

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

пабiла. Дзiед як абазьлiуса, дак i засiлiуса. Баба рукi паламала да пад плотам i сканала. Пашлi бабы па воду, пабачылi тую прыгоду, пачалi сакатаць да людзей ззываць. Збiеглiса людзi за ўсяiе ўескi, не пагасiлi цескi. Пакуль разважалi тое дзiело, дак село й згарыэло. Людзi пад нёбам начуюць да хаты будуюць, робляць як птушкi гнезьдзечко, каб курка знесла iм яечко. Курка знесла iм яечко другое, яно-ж не такое, бо першае дарагое, другое-ж лiхое.

Матруна Бохмачыха.

Чудзiн.

41. Агонь у серцу, а розум у галавiе.

Даўно тое было, бо я яшчэ была блазнiцаю, як нам гаварыла старэнькая баба ўселякiiе казкi да байкi, а яна, кажэ, чула тые байкi ат свайго небуожчыка дзiеда, як яшчэ была дзiеўкаю. Мнуого яна казала казак, да такiх харошых, што туолькi заслухацца. Але я пазабывала, бо, дзiеткi, доўго жыву, мо хутко будзе дзевятдзiсят гадкоў. Бачыце, як мене сагнуло ў сучок, а даўнiей была маладзiца, як кроў з малаком, а як гуляла дзiеўкаю, дак каса аб лыткi бiласа. От седзiмо мы бывало чуць не ўсю нуоч пры лучыне да прадуом у двуор талькi да такiе тоненькiе, каб сарачня пасам пралiезла праз персцёнак. Седзiмо мы, а баба суслiць зрыэбе да кажэ казкi, каб мы не заснулi. От, дай божэ памець, i ўспаменула адну казку. Дак слухайце, як тое было. Жыў сабiе адзiн чалавiек. Быў ён вельмi цiкавы й хацiеў усе знаць. Куды нi гляне, што нi ўбачыць, та ўсе пытае, што гэто такое, зачым яно да на вуошто? Казалi яму, казалi людзi, нарэшце ўбачылi, што й самi не знаюць да й кажуць яму: — дзiвачны ты чалавiек, куолькi не пытай, та дурням памрэш, бо ўсяго не пазнаеш. — Не слухае ён людзей, кiнуў гаспадарку да й пашоў у свiет. — Пайду, — кажэ, — к ясному сонейку, яно ўсюды свiецiць, усе бачыць, дак усе знае. Запытаю ў яго, чаму так робiцца на сьвiецi. — От iдзе ён да йдзе, бачыць — седзiць кала дарогi на

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ка̀мені чалаві͡ек да ўсе крычы̀ць, пыта̀е: даку̀ль я бу̀ду седзі͡ець? І про̀сіць ён, каб запыта̀ў у со̀нейка, калі̀ ён уста̀не. Пашо̀ў да̀лей да й ба̀чыць, што які̀сь чалаві͡ек падпіра̀е тын. Зірну̀ў ён, алѐ, неві͡едае, што гэто ён ро̀біць. Ідзѐ ён да̀лей, аж дзві͡е жанчы̀ны пераліва̀юць у рац͡ыэ во̀ду. Зацікавіўса ён, алѐ неві͡едае, што яны̀ гэто ро̀бяць да й пашо̀ў да̀лей. Мо ўжэ саўсі̀м блі̀зко падышо̀ў ён к со̀нейку, дзі͡е яно̀ з-за землі̀ ўсхо̀дзіць на нѐбо, да й ба̀чыць, што чалаві͡ек пераграба̀е сьмі͡еце. Пашо̀ў ён да̀лей да як зірну̀ў праз лі͡ес, дак аж во̀чы зажму̀рыў, такі̀ там бляск. Падышо̀ў ён бліж͡ыэй, аж гэто со̀нейка пала̀цы блішча̀ць у зо̀лаце, бы ваго̀нь гары̀ць. Насі̀лу вайшо̀ў ён туды̀, чуць не аслі͡еп ат бля̀ску да й сустрака̀е там со̀нейка ма̀тку. Та̀я й пыта̀е, чаго̀ ён прышо̀ў? — Прышо̀ў, — ён ка̀жэ, — да со̀нейка, ка̀б запыта̀ць, зачы̀м так ро̀біцца на сьві͡еці? — А та̀я й атка̀звае, што со̀нейко паднялосо на нѐбо аглядаць аттуль землю. — Пачакай, яно ху̀тко вѐрнецца. — От ён накла̀ў сабі͡е агѐньчыку, седзі̀ць, гр͡ыэецца да сма̀жыць са̀ло на ражэ̀ньчыку. Наі͡еўса са̀ла с хлі͡ебам. Захац͡іелаео яму̀ піць. Пашо̀ў ён к рац͡ыэ, каб напі̀цца. Ту͡олькі ён схіліўса к вадзі͡е, аж атту̀ль вы̀плыла вѐльмі го̀жая панѐнка да як зірну̀ла на яго̀, дак ён і стаў бы ўко̀паны. Стаі̀ць, пазіра̀е да й ачу̀ не мажэ̀ атарва̀ць ат яі͡е. Спадаба̀ўса ён ту͡ой панѐнцы, от яна̀ й ка̀жэ яму̀: не пі вады̀ з ракі̀, бо тагды̀ со̀нейко цебѐ зпа̀ліць. — Да й павела̀ яго̀ пад стары̀ дуб, дзі͡е была̀ крыні̀ца. Схіліўса ён да й пача̀ў піць ту̀ю чы̀стую да халѐдную во̀ду. Ку͡олькі ён ні пъе дак усѐ бу͡ольш хочэцца й немажэ̀ ні̀як напі̀цца. — Го̀дзі ты піць, — ка̀жэ та̀я панѐнка, — бо ўсе до̀брэ ўмі͡еру. От ты хо̀чэш усѐ знаць, зачы̀м яно̀ гэ, а не йнак, а не ві͡едаеш таго̀, што хуч͡ыэй вы̀піць усю во̀ду, чым усѐ знаць. От ты тро̀хі напі̀ўса, та й бу̀дзеш жыў, тро̀хі сьві͡ету пабачыў, та й бу̀дзеш знаць пра патрэ̀бу. — Зірну̀ў ён, аж со̀нейко апуска̀ецца з нѐба ў сваі͡е пала̀цы. Трэ йці̀ туды̀, алѐ не мажэ̀ ён атарва̀ць ачу̀ ат таі͡е панѐнкі. А яна̀ й ка̀жэ: от му͡ой ба̀цько верну̀ўса да гаспо̀ды. Лядзі̀, ніч͡ого не кажы̀ яму̀, што ты пазна̀ў і што менѐ ба̀чыў. — Тут яна̀ ўзнела̀са ўго̀ру да й забліша̀ла атту̀ль го̀жаю зу͡оркаю.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Пашо̀ў ён да со̀нейка ў пала̀цы. Уба̀чыло яно̀, што чалаві͡ек асьмі͡еліўса прыці̀ да яго̀, да як пачнѐ смалі̀ць яго̀ да пякці̀, дак аж мур круго̀м трашчы̀ць, а ён як напі̀ўса халодна͡іе вады̀, дак і ні па̀нкі. Абазлі̀ласо со̀нейко, дава̀й яшчэ̀ гары͡эй пекці̀, а ён ша̀пку насу̀нуў на во̀чы да й падхо̀дзіць блі̀жы͡эй. Ба̀чыць яно̀, што нічо̀го не пара̀дзіць з упа̀ртым чалаві͡екам, от і пыта̀е яго̀, што яму̀ трэ. Расказа̀ў ён со̀нейку, чаго̀ прышо̀ў, а то̀е й ка̀жэ: як бу̀дзеш усѐ знаць, та ху̀тко памрэ̀ш, — і блі̀снуло яму̀ со̀нейко ў го̀лаў. От і пачу̀ў ён, што мну͡ого зна̀е, алѐ галава̀ гары̀ць, а ў сѐрцы хо̀ладно бы лёд. Вы̀шаў ён ат со̀нейка да й сустрака̀е со̀нейка ма̀тку. От та̀я й ка̀жэ: памрэ̀ш ты, чалаві͡ечэ, калі̀ не согры͡эеш сѐрца, бо без сѐрца галава̀ згары̀ць. — Дагада̀ўса ён, як нагры͡эць сѐрцэ да й пашо̀ў шука̀ць ту̀ю панѐнку да зваць я͡іе з нѐба. Пачу̀ла яна̀, ху̀тко пакаці̀ласа з нѐба я̀снаго зу͡оркаю да й ста̀ла кала̀ яго̀ то̀ю го̀жаю панѐнкаю. От і загары͡эласо ў яго̀ ў сѐрцы да й пачу̀ў ён, што паку̀ль бу̀дзе там гары͡эць, пату̀ль ён бу̀дзе знаць, чаму̀ так усѐ ро̀біцца на сьві͡еці. От пабра̀ліса яны̀ да й пашлі̀ ў яго̀ край. От падхо̀дзяць яны̀ к таму̀ мі͡ейсцу, дзі͡е чалаві͡ек пераграба̀е сьмі͡еце. — Ой, чалаві͡ечэ, — ка̀жэ ён, — ты ў сьмі͡еці шука̀еш згу̀бленые гро̀шы да да̀рам тра̀ціш час. Ідзі̀ ты рабі̀ць дзі͡ело, та хучы͡эй заро̀біш бу͡ольш тых гро̀шэй. Пазна̀ў той чалаві͡ек сваю̀ амы̀лку да й пашо̀ў гарава̀ць да працава̀ць — дак і нажы̀ў гаспада̀рку й гро̀шы на патрэ̀бу. Іду̀ць яны̀ да̀лей, аж ты̀е жанкі̀ ўсе пераліва̀юць во̀ду. І растлума̀чыў ён ім, што ку͡олькі-б яны̀ не пераліва̀лі, та вада̀ вадо̀ю бу̀дзе, як ку͡олькі-б яны̀ не гавары̀лі, та нічо̀го не вы̀гаварацьь. Іду̀ць да̀лей, аж чалаві͡ек падпіра̀е тын. От ён і ка̀жэ яму̀: не падпіра̀й у жы̀цю гніло̀е, бо яно̀ ўсеру͡оўно ўпадзѐ. Нарэ̀шце падышлі̀ яны̀ к таму̀ чалаві͡еку, што ўсе седзі̀ць на ка̀мені, да пашлі̀ мі̀мо яго̀. Атышлі̀са тро̀хі, от ён і ка̀жэ здалѐка: Пату̀ль ты седзі̀ш, паку̀ль другі̀ тут ся̀дзе, бо ў жы̀цю ку͡ожын займа̀е сва̀е мі͡ейсцо. От прышлі̀ яны̀ ў яго̀ край, нашлі̀ ту̀ю ўѐску, дзі͡е ён жыў, алѐ там ужэ̀ без гаспадара̀ й ха̀тка яго̀ аберну̀ласа да я͡іе хло̀пцы расцяга̀лі на вагонь. Нема̀ чаго̀ рабі̀ць, трэ жыць, як набежы̀ць. І па-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

чаў ён будаваць сабіе харомы да заводзіць гаспадарку. Па немалум часе абрабіліса яны да й началі жыць да нажываць да дабра нажываць. І дзівіліса людзі, што яны жывуць і ніколі не тужаць. Пачалі яго пытаць, чаму яны так добрэ жывуць, а ён і кажэ: затым мы добрэ жывуом, што ў нас вагонь у серцу, а розум у галавіе.

Матруна Бохмачыха.

Чудзін.

42. Аткуль узяласа сьвіньня?

Перш не было сьвіней. От наслухайце, я вам раскажу, аткуль узяласа гэтая брудная скаціна, што іесь усе паганае да не чыстае. Было гэто даўно, яшчэ тагды, як жыды Хрыста мучылі. Сьмеяліса паганые жыды да руозно зьдзіекуваліса з Суса Хрыста, заўязвалі яму вочы й білі, а потым пыталі яго, каб ён згадаў, хто яго біў. Маўчыць Хрыстуос, а туолькі як зірне на таго, хто яго біў, дак у таго й атсохне рука. Спалохаліса жыды, пакінулі яго біць да й кажуць: от калі ты згадаеш, хто седзіць у скрыні, та мы цебе выпусьцім. — А тым часам жыды пасадзілі ў скрыню сваю матку да й чакаюць, што Хрыстуос скажэ. Знае Хрыстуос, што ў скрыні седзіць тоўстая да брудная бы сьвіньня жыдуоўка да й кажэ туой погані: — Была там жыдуоўка, а цепер — сьвіньня. — Зарагаталі жыды бы коні. — От-жэ такі не згадаў, — кажуць яны да й атчыняюць віеко скрыні. Туолькі яны прачынілі, як ось і высунула аттуль сваё рыло тоўстая сьвіньня. Жыды ачуом сваім не віерапь, а сьвіньня рох, рох! да от так і ліезе к ім. Спалохаліса жыды да ў рассыпную, бы рудые мышы як сунуць, дак туолькі пейсы мітусяцца. Рохкае сьвіньня да бежыць з імі. Застаўса туолько Хрыстуос да тыіе жыды, у каторых атсохлі рукі. І пачалі яны маліцца Хрысту да казаць: віеруем, Госпадзі! Памажы нам. — Сжаліўса Хрыстуос і сцаліў ім рукі. А сьвіньня так і засталаса. От чаму жыды не едзяць сьвініны, бо сьвіньня — іх матка. Выракліса жыды сваіе маткі да так яіе неўзьлюбілі, што калі ўбачаць сьвіньню ў хаці, як моляцца,

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

та кідаюць маліцца да просяць, каб людзі выгналі з хаты сьвіньню. Туолькі раз яны паміна̀юць сьвіньню, гэто тагды, як прысяга̀юць у ра̀біна. Тут яны стано̀вяцца на сьвінуую шкуру да й прысяга̀юць бо̀гу да й ка̀жуць: прысяга̀ю табіе Адана̀й, прысяга̀ю табіе Шадо̀й, што гэто пра̀ўда, як пра̀ўда то, што гэто мая̀ ма̀тка. — Як ні клянѐцца жыд, та заўжды брэшэ, туолькі тагды ён ска̀жэ пра̀ўду пад хараімам, як стаіць па сьвінуой шку̀ры.

Бохмат.

Чудзін.

43. Не любіць.

Стрыэліса кала̀ кало̀дзіся дзвіе маладзіцы да й загаварылі.

— Ага̀па, хто гэто табіе скрыва̀віў мо̀рду? Гаспада̀р, ці што?

— Ніе, мая̀ руодная, гаспада̀р у менѐ такі ціхі, як целя̀. От ужэ чацьво̀ртае ліецячко, як мы пабра̀ліса, а ён не то, каб што, алѐ на̀ват ніко̀лі прыкраго сло̀ва не прамо̀віў. Я й так, я й сяк знаро̀к зневажа̀ю яго̀, або кліну̀, а ён хаць бы што: маўчыць, бы вады ў рот набра̀ўшы.

— Ціхі ў цебѐ гаспада̀р. Ён ніко̀го й па̀лцам не зачапіў. Бачно̀, што вы жывецѐ ў зго̀дзе.

— Ніе, мая̀ руодная, не любіць менѐ гаспада̀р, от затым і не ла̀е і не бъе, як іньшые мужыкі. Ліха̀я мая̀ до̀ля з маім гаспадаро̀м. Які гэто мужык, калі ён жуонку не бъе. Не мажэ на̀ша сестра̀ жыць без таго̀, каб еіе мужык не ўшчува̀ў.

— Дак гэто-ж і до̀брэ, калі гаспада̀р не бъѐцца. От пажыла̀-б ты з маім раско̀лам. Зірні, што ён нарабіў. Ба̀чыш, — усѐ цѐло ў сінякуох. Ой, мая̀ руодная, на̀йдзе на яго̀ яка̀ясь хваро̀ба, дак ён табіе дыхну̀ць не дась: та бъе, та ўшчыпнѐ, та ла̀ецца, та зневажа̀е на чуом сьвіет стаіць, хаць бежы — тапіса.

— Бо ён цебѐ любіць, дак і чу̀біць, а муой ціхі, бы целя̀, менѐ не любіць, от затым і не чапа̀е. Ой, каб ты віедала, мая̀ руодная, куолькі я выплакала, куолькі я слёзак выліла. Чаго̀ туолькі я не рабіла, каб ён, як другіе гаспадары, хаць разо̀к

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

менè дòбрэ пабіў, абò хаць палàяў. Дак кудЫ там, — маўчЫць зўбы сцяўшы, а не то, штоб біць, дак нікòлі нàват пàлцам не зачапіў. Пачнў я лàяць да зневажàць, а ён муоўчкі насўне шàпку да й напрэцца с хàты. Пòтым прЫдзе й не гніеваецца, бàццэ я й не лàяла. Ён хòрашо загавòрыць да менè, а мніе яшчэ гарЫэй гуорно, от так калè сèрца й заўè. Ой, нешчàсная маЯ жЫтка. Лепèй бы менè мàтачка пахавàла, чым за такўю куцьцю зàмуж атдавàла.

— Ну, не плач, руодная, не ўбівàйса! Вы яшчэ маладЫе. Пажывецè, пасвàрЫцеса, а мо ён яшчэ й пабъè цебè да й не раз, туолькі ты рабі ямў ўсе на перакуор.

— Дзякуй табіе, маЯ руодная, маè сòнейко, дзякуй табіе за дòбрую рàду. Бўду рабіць так, як ты кàжэш, да сьлепіцаю ліезці ў вòчы, мо дась бòг і пабъè.

— А хто-ж гэто цебè цепèр пабіў?

— Наш пісар, хварЫэць ягò мàтары. Ён даўнò ўсе ка мніе чапляецца.

— За што-ж ён цебè біў?

— Да з дòбраго рàю.

— Мàбыць ты ямў спадабàласа.

— А ліхіе ягò віедаюць. Дак небàчыла я такòго смаркачà.

— Чамуж ты не жàлішса?

— Камўж мніе жàліцца на пісара?

— А зèмськаму?

— Хібà-ж зèмськаму. Дак калі-ж ягò тут убàчыш.

— А от туолькі што прыіехаў. Я самà бàчыла. Хадзіем у вòлась.

— Хадзіем, алè я баюса...

— Чаго-ж ты пужàешса? Хібà ты баішса, каб і зèмські не біўса?

— Ніе, баюса, што пан за пàна цягне.

— Хадзіем, а там пабàчым, хто за кагò цягне.

— Хадзіем.

Прыхòдзяць маладзіцы ў вòласць к зèмськаму жàліцца на пі-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

сара. А ў пісара ўжэ й хміель з галавы выскачыў, як убачыў, што прыіехаў земські, дарма, што быў пъяны, хаць выкруць.

— Вам што, маладзіцы? Падыдзіеце бліжыэй да кажыэце, што вам трэба.

— Паночак дарагенькі, мене пісар пабіў.

— За што-ж ён цебе біў?

— Ні за што, паночак. Просто з добраго раю.

— Хіба-ж ён быў пъяны, што біў маладзіцу. Маладзіц трэ не біць, а любіць.

— Што ён пъяны, паночку, дак на тое ён пісар, але за што-ж ён бъецца?

— Ось я яго пазаву, нехай пакажэ, як ён цебе біў. Маладзіцы, маладзіцы, куды-ж вы? Пачакайце. — А тые як сунуць у збуорню да вон з воласці.

— Дзержы іх, дзержы! — крычыць смеючыса земські. А тые шамелях цераз паркан да ў каноплі, толькі кумпякі замітусіліса.

Д. Кулага.

Чудзін.

44. Упарты хахол.

Жыў адзін чалавіек. Ён быў хахол і як усіе хахлы быў такі упарты, што з ім ніхто не муог зрабіць ніякаго ладу. Вазіў ён на продаж гаршкі. Зіма й ліето накладзе гаршкуоў і руознаіе паліва повен велізазны вуоз, запражэ пару сівых валуоў да й плішчыць ат вескі да ўескі. Ліето — яшчэ туды-сюды — з рана да пад вечар валы ціхенько плішчаць вуоз да туолькі абмахваюцца хвастамі, але як прыгрыэе сонейко да нападуць на валуоў авады, здруок да ўселякі гнюс, от тые як закруцяць галавамі, падымуць хвасты да сунуць у кусты, або ў балото, дак гаршкі туолькі трашчаць, а вуоз скрыпіць, бы ў совеснаго чалавіека. — О цэ бэ, о цэ бэ! — крычыць упарты хахол да пыркае валуоў аснóм, а тые й без таго пруць, аж вуоз разкідаецца. — Чаго цебе нечыстая сіла несе ў такую спеку? — пытаюць яго людзі, — нехай бы ты пачакаў, пакуль спадзе гнюс. — А ён хаць бы што, маўчыць да

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

пакурвае сабіе люльку. — Гэто-ж яны табіе усіе гаршкі ператаукуць да й яром зломяць. — Нехай таукуць, — атказвае упарты хахол да й пыркае валуоу асном. Алè от прыдзè зімà, навàліць сніегу на мокрую зèмлю, размiесяць на дарозе гразь да гліну, што й нуог не выцягці, а упарты хахол везè гаршкі на колах; зробіцца колесо бы тачыло, валы насілу цягнуць, а ён такі прэцца, хаць у такую нèгаць добры гаспадар і сабаку не выганіць з хаты. Прыпхауса ён раз у вèску. Сышліса бабы, абступілі вуоз, бы вараньè падло, выбіраюць да таргуюць гаршкі. Тая трымае запазухаю яйца, тая насыпала у прыпуол круп, ці якого збуожа, тая прынесла палуойку йлну, або пучок шчаціны, дак куды там, — зацяуса упарты хахол да й хаць-бы што, — плацiеце яму грошы. А дзiе узяць грошы, калі іх немашака мо у ва усèй вèсцы. Сакаталі, сакаталі бабы, а ён маучыць да курыць сабіе люльку. Не прадау ён ні годнаго гаршка, а тут ужэ сонейко нізко, вiедамо, зімою яно не успiее падняцца над лiесам, як ужэ пара зноу спускацца на супачынак. От хацiеу ён тут паначаваць, самому пасілкавацца да супачыць да й валуоу пакарміць. Алè бабы абазліліса, да й ніхто не прымае нанач. Валы галодные, аж сніег хапаюць да ліжуць на вуліцы пуовалач. Нема чаго рабіць, упарты хахол пе траціць гумару, — пхнèцца далей. Адъiехау ён мо з версту, ці буольш лiетвікам да й варочае на зімнік. Тут сустракаюцца людзі да й кажуць: не iедзь, чалавiечэ, зімнікам, бо управіш у балото вуоз, та яшчэ жыуèло загубіш. — Не слухае упарты хахол, iедзе далей. От прапхауса ён ганууоу з двоі, як пад возам затрашчау лёд, колесо праваліласо. Пачау ён пароць асном валуоу, а тые як рвануць, вуоз абернууса, гаршкі пасыпаліса бы гарох, а валы праламалі лёд да й увязлі у гразі па самые рогі. Хацiеу хахол выпрагці валуоу, да й сам усунууса у палонку па самые вушы. Пачау тут ён крычаць да зваць людзèй на ратунак. Пачулі тые людзі, вернуліса да насілу выратавалі таго упартаго хахла да валуоу, а вуоз і гаршкі так і загінулі. Дак от якіе хахлы упартые.

Чудзін. Савіцкі.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

45. Разумны й дурэнь.

Былі у бацька два сыны, адзін разумны, а другі дурны. Пакуль бацько уздужау, дак ён сам правіу гаспадаркаю, а сыны туольки рабілі дзіело; а як бацько пастарэу да ужэ неуздужау прыганяць сынуоу да работы, та разумны сын пачау агінацца, пачау увільваць ат работы да усе цяжкае дзіело узвальваць на дурня. А той, віедамо, як дурны, запруогса, бы чорны вуол у соху да й не бачыць прасьвіетлаіе гадзіны. Разумны та у людзі, та у карчму, та у волась, ці куды, а дурэнь, як устане з самаго рана, дак да пуозваіе ночы таучэцца у гаспадарцы да так робіць, што аж жылы у яго трашчаць. Камендуе разумны брат дурням, дарам, што старэнькі бацько пазірае на тое падсліепаватымі вачамі да туолькі галавою круціць, нічого не парадзіць, бо ж кажуць людзі, што трэ тагды вучыць дзецей, як яны кала лавы ходзяць, бо як вырастуць, та яны цебе навучаць да памучаць. Седзіць старэнькі бацько у запечку да туолькі уздыхае. Рад ён і таму, што хаць невіестка не гоніць яго з хаты, а то куды там яшчэ разумнаго сына ушчуваць. І пачау разумны сын цягнуць сабіе з гаспадаркі дабро да заводзіць атарыцу. Ён цягне, а жуонка памагае. Яшчэ за жывуопе бацька нажыліса яны, сабралі грошы, справілі сабіе вуопратку, але не дзеліліса, бо шкода было аставацца без дурного рабуоцька, што хадзіу цёмны да чорны, бы комін, а дзіело рабіу за усіх. Але ось памёр стары бацько, й пачалі браты дзеліць спадкі. Разумны брат, як вельмі упрауны, забрау сабіе усе, што ліепшае, а дурню заставіу старэнькую хатку да кучу сміецця. Узяу сабіе разумны парабка, выбудавау новую хату да й жыве бы пан, а дурэнь не віедае за што й узяцца. Дау яму брат адну каруоуку, дак ён і тую не віедае, як даглядзяць: стаіць карова у загарадцы, раве галодная да бъецца, аж плуот раскідае. Пачуу разумны, як раве карова да й кажэ: — нехай бы ты выгнау яіе на пашу. — Заняу дурэнь карову, выгнау яіе на яравы паліетак, — тая й пасецца у збуожы, а ён

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

сіеў сабіе на межы кала̀ даро̀гі, зрабіў з саломіны дудачку да й граѐ так го̀жэ, што аж жаваранкі заціхлі ў нѐбе да й слухаюць. Алѐ ось пабачылі людзі, што дурэнь нарабіў шко̀ды да й давай яго̀ лупцава̀ць да вучыць ро̀зуму. Дак што ты з дурням зро̀біш,— яны яго̀ лупяць, а ён смеѐцца да ка̀жэ: ото-ж дзякуй вам, браткі, што вы тро̀хі пабілі во̀шы да пачасалі мніе плѐчы. — Плюнулі тые людзі, выгналі з збуожа каро̀ву да й пашлі куожын за сваім дзіелам. Прыгнаў ён дамуоў каро̀ву да й пашо̀ў к брату пыта̀цца, што яму рабіць. От разумны й даѐ яму злыгач прывеза̀ць каро̀ву, каб яна̀ не ламала пло̀ту да не ліезла ў вагаруод. А дурэнь думаў, што брат даў яму злыгач, везці каро̀ву на про̀даж. От ён залыгаў і паўёў. Ведзѐ ён да ведзѐ праз ліес, аж чуе — рыпае дзѐраво, навалі̀ўшыса на другое й здало̀со яму, што яно̀ ка̀жэ: прадай каро̀ву. От ён прывезаў к таму дзѐраву каро̀ву да й пытае: а калі-ж запла̀ціш гро̀шы? — Рып, рып! — Прыхо̀дзь заўгрэ. — Пашо̀ў дурэнь да гаспо̀ды да й хва̀ліца брату, што прадаў каро̀ву. — А дзіе-ж гро̀шы? — пытае той. — Вѐлено прыці за̀ўтрэ, — ка̀жэ дурэнь. На за̀ўтра яшчэ чуць сьвіет пашо̀ў дурэнь у ліес па гро̀шы. Прыхо̀дзіць туды, аж ат каро̀вы асталіса туолькі руожкі да нуожкі, а за нуоч яіе ваўкі ўсю растрыбушылі да туолькі шкуру вылушчылі. — Дава̀й гро̀шы! — крычыць дурэнь на ўвесь ліес, а дзѐраво маўчыць бы пень, бо на той час сьціх віецер. Запла̀каў дурэнь ат жалю, так яму шко̀да, што да̀рам аддаў каро̀ву, да й пашо̀ў жаліцца брату. А той й ка̀жэ: прыведзі таго̀ сюды, каму ты аддаў каро̀ву. — Пабіег дурэнь зноў у ліес, аж бачыць, што кала̀ таго̀ дзѐрава стаіць жыд да абрыэзвае шкуру. — Аддай за каро̀ву гро̀шы! — крычыць на жыда дурэнь. — Якіе, гро̀сі, якіе гро̀сі? — атказвае той, — гэтош па̀дло. — Схапіў гэто дурэнь жыда за̀грудкі, грымануў яго̀ на зѐмлю да завезаў по̀вадам за шыю так муоцно, што аж у таго̀ во̀чы з ылба̀ выперло. Пацёг дурэнь жыда ў вёску к разумнаму брату. Бачыць жыд, што ат дурня не выкруціўшса, йдзе, туолькі бо̀кі пачухвае. Убачыў то̀е разумны брат да й навалі̀ўса на жыда, каб заплаціў гро̀шы за каро̀ву. Круціўса, круціўса жыд, алѐ мусіў адда̀ць гро̀шы,

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

бо ягò кабы́лка там асталàса да й шкỳру ён ужэ палажы́ў к сабі͡е на вуо͡з. От дỳрэнь узя́ў грòшы, разгрòб кỳчу смі͡етніку да й пасі͡еяў іх, каб буо͡лш вы́расло. Хòдзіць дỳрэнь да куо͡жны дзень палівàе смі͡етвік, а грòшы не растỳць. Пачалì з ягò смеяцца лю́дзі, пачалì вòчы выбірàць. Гуо͡рно ямỳ стàло, што што-б ён ні зрабіў, дак усè кèпсько, за ўсе яго лю́дзі лàюць, бэсцяць да завỳць дỳрням. Мòташно на сэрцы, хаць ты рỳкі налажы́. От узя́ў ён злы́гач да й пашòў у лі͡ес, каб там засілìцца. Ідзè ён цèраз пòле, а там дзі͡еці пасỳць авèчкі да паю́ць пі͡есні. Падышòў ён бліжы͡э́й, каб паслỳхаць, як яны́ паю́ць да грàюць, а ты́е, як убàчылі ягò, дак і пачалì крычàць: — Онь ідзè дỳрэнь, нехàй ён нам пайграе.— Абступілі ягò дзі͡еці да й пачалì тỳзаць атусю́ль, каб ён пайграў. Дастàў дỳрэнь з-за пàзухі дỳдачку да й пачàў іграць. Заслỳхаліса дзі͡еці, прыцìхлі бы кві͡еткі, а вуо͡чкі ў іх сві͡еціяцца, бàццэ зуо͡ркі. І забы́ў ён, куды́ йшоў да давàй ігрàць з дзèцьмі да рабіць ім цàцкі. Пачапляліса на ягò дзі͡еці да на перабуо͡й крычàць: — дзя́цько, дзя́цько, павазì менè! — Яны́ забы́лі, што гэто дỳрэнь, а ён забы́ў усè на сві͡еце, ўсю сваю пля́гу. От ужэ сòнейко захòдзіць, а дỳрэнь усè грае з дзèцьмі. Туо͡лькі, як сьцемні͡ело, прыцèгса ён даму͡оў. Туо͡лькі ён улі͡ез у хàту да пачàў шукàць, каб што-нèбудзь зъі͡есці, бо вèльмі агалòдаў, аж прыхòдзіць к ямỳ старэнькі дзедòк да й кàжэ: от за тòе, што ты забаўля́ў маìх дзі͡етак, я прынёс табі͡е і͡есці. — Да й пачàў ён выклàдваць з тòрбы ўселя́кую ўся́чыну. Наі͡еўса дỳрэнь да й забы́ў падзя́куваць, а той дзедòк і кàжэ: — пашукàй ты на смі͡етніку, там твуо͡й бàцько схавàў табі͡е грòшы, — а сам і знік. Пашòў дỳрэнь на смі͡етнік да як карпанỳў, дак і вы́вернуў гаршчòк грòшэй. І пачàў ён з таі͡е пары́ дòбрэ жыць. І то сказàць, аткỳль у ягò й рòзум узя́ўса? Алè, ві͡едамо, багàты, дак і разỳмні͡ей ад усіх. Туо͡лькі дзі͡етак ён не забывàў і заўжды зь ìмі граў.

Іван Куцько.

Чудзін.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

46. Медзьвіедзь.

Даўнò тòе былò. Алѐ мàбыць і тагды̀ лю̀дзі гаравàлі, працавàлі, каб зарабіць крыху̀ хліеба да ўзгадавàць дзіетак. Віедамо, маркуотно куожын дзень ат сàмых пеўнёў да аж да змрòку цягнỳць ярòм бы вуол, што табіе аж вòчы выпірàе. Зірнѐш на бòжы сьвіет, дак дакòла так гòжэ: птỳшачкі вѐсело паю̀ць да рàдасно шчабѐчуць на зелёных віетках. Не трэ ім клапаціцца, каб у дòбрую пòру паарàць, ці пасіеяць; не трэ ім пасьпешàць, каб за пагòду пажàць да звезці з пòля збуожэ; нічòго не трэ, бо буог ім дàе гатòвы корм. А зірнѐш, якàя ў іх уопратка, што куолькі ты ні гарỳй, такòіе ты й праз сон не ўбàчыш. Зірнѐш на буольшых птàхаў, як яны̀ сміело ўздымàюцца ўгòру пад сàмае нѐбо, к я̀снаму сòнейку да як яны̀ крỳжацца да купàюцца ў павіетры, дак так зрòбіцца зайздрòсно, так кàла сэрца заўѐ, што от здàецца, пакінуў-бы сваю̀ слімазàрную гаспадàрку да чòрную хàтку, паднясуса-б угòру да й палеціеў-бы над ліесам зелёным, над жòўтымі гуоркамі, над цёмнымі ўёскамі туды̀ далѐко к я̀снаму сòнейку, к друобненькім зуорачкам, палеціеў-бы к бòгу на скàрг(g)у, каб там гуоркімі слёзкамі вы̀плакаць сваю̀ ліхỳю дòлю, вы̀плакаць тòе гòрэ, што гнецѐ да тòчыць табіе сэрцэ на землі цы̀элую жы̀тку. Алѐ буог кры̀лаў не даў, а веліеў усю̀ жы̀тку лàзіць у гразі чòрным да цёмным і немà табіе нікòлі супачы̀нку, немà рàдасці. От як паліезе ў гòлаў дỳмка, што мо шчаслівейшы ат цебѐ той кàмень, катòраго таўкỳць да перакідàюць на дарòзі, дак кінеш дзіело, кінеш дỳмкі да й напъѐшса так, як мо й у нѐбе не трàпяць. Вы̀пъеш аднỳ-другỳю кватэру й пабежы̀ць якàясь сіла па жы̀лах, загудзѐ ў галавіе, бы вагòнь у пѐчы й здаѐцца табіе, што от, каб упёрса ў што нѐбузь, та-б і зѐмлю пераверніўў, такая ў табіе чỳецца муоц. Вы̀пъеш яшчэ, дак нòгі сàмі так і хòдзяц, так і тỳпаюць, бàццэ ў тагò пàньськаго жарабцà, рỳкі махàюць, бы кры̀ла ў ветракỳ й здаѐцца, што гэто не рỳкі, а кры̀ла, што імі не дзіело рабіць, а туолькі летàць да кружы̀цца. І ціесно стàне

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

табі͡е ў чòрнуй хàццы, вы̀леціш на шырòкі бòжы сьві͡ет да так табі͡е зрòбіцца вèсело на сэ̀рцы, што ту͡олькі паèш да паèш. Ì хò-чэцца табі͡е, каб усі͡е лю̀дзі з табòю пі͡елі да скакàлі, бы на ве-сі͡ельлі. Дак от што рòбіць гэ̀стая жывàя вадà. Ì не дзіво, чаму̀ наш брат, гарапàшнік рòбіць, рòбіць як чòрны ву͡ол, клапацìцца, клапацìцца, а як ужэ̀ ні͡ельга бу͡ольш вы̀трымаць, дак і лыкнè жывòі͡е вады̀ да й забу̀дзе сваю̀ гу͡оркую жы̀тку. От, кàжуць, быў у нас такì адзìн чалаві͡ек, што ён не мі͡еў налòгу да гары͡элкі й не любìў яі͡е піць ку͡ожын дзень, а ту͡олькі прымàў тагды̀, як душà з ці͡ела вылàзіла да прагла̀са рàдасці да лі͡епшаго жы̀цьця. Ужэ̀ ку͡олькі раз ён чуць не засіліўса, хаці͡еў прадàць чòрту ду̀шу, каб ту͡олькі ён даў гары͡элкі, алè мàбыць дрэ̀нная былà ў ягò душà, калì за яі͡е й сам чорт не зхаці͡еў даць квàрту сваі͡е гàры. Немà гары͡элкі й немà за што купіць, дак ён валя̀ецца бы ка-лòда да сьпіць, каб хаця̀ прысніўса рàдасны сон, бо жы̀тка гары͡эй ат пèкла. Гэ спаў ён мо паўжы̀ткі, аж бòкі атлèжаў. Ì кàжуць яму̀ лю̀дзі: чагò ты валя̀ешса, абібу͡ок, гэ̀то-ж ат людзèй смі͡ех і ат бòга гры͡эх. — За што-ж мні͡е гры͡эх, — аткàзвае ён, — не-хàй таму̀ гры͡эх і смі͡ех, хто не даè мні͡е гары͡элкі, а без гэ̀стаі͡е жыву̀чкі я ні на што не гу͡ож. — Да гэ̀то-ж ты апусьціўса, бы мòкрая ку̀рыца. — Мàбыць так бу͡ог даў, — мы̀ркнуў ён да й су̀нуўса зноў у берлу͡ог. — Дзецюкì, — кàжэ адзìн чалаві͡ек, — давàйце, ку̀пімо яму̀ гары͡элкі, та мо ён сваìмі шту̀камі й у нас крыху̀ атгòніць пля̀гу, а то от так калà сэ̀рца і ўе, аж мòташно.— Дòбрэ, — кàжуць ты̀е. От яны̀ злажы̀ліса, прынеслì дзьві͡е пля̀шкі гары͡элкі, далì таму̀ чалаві͡еку такì дòбрэ вы̀піць, а сàмі ту͡олькі ду̀шу падражнілі. Вы̀піў той мо з пля̀шку да й пачàў вычварàць ру͡озные шту̀кі. Алè ось іду̀ць якìясь старцы͡э. Пабàчыў той пья̀ніца, апрану̀ўса ў кажу̀х, вы̀вернуўшы ягò ўверх шэ̀рсцью, да й пабі͡ег пужàць тых убòгіх. Алè то былì не прòстые старцы͡э, а сам бу͡ог з анёламі. Зірнуў бу͡ог на тагò чалаві͡ека да й абер-нуў ягò ў медзьвèдзя. Пашлì старцы͡э дàлей, а ён папрòбуваў распрану̀цца, дак куды̀ там — кажу̀х і прыру͡ос. Су̀нуўса ён к лю̀дзям, алè ты̀е спалòхаліса да й пахавàліса, хто куды̀ трàпіў.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

От і пацёгса ён у ліес да там і да тых час жывè. Уліетку цягàецца да пужàе людзèй, а ўзімку сьпіць да сьсè сваю лàпу. От затым у медзьвèдзя чалавіечые нòгі і ён вèльмі лю̀біць гарыэлку да салòдзенькі медòк.

Кажан.

Чудзін.

47. Аўсяная двòрня.

Сышлàса ўся двуорня й жàліцца, што пан кòрміць іх туолькі адным аўсòм.

— Данìло, браткò! Ты ўсім нам галавà. Дай ты нам рàду, што тут рабìць з пàпам? Замòрыць ён нас гэстым аўсòм.

— Эй, Сьцепàне, не табіе гэто казàць: ты бывàў у сьвіеце, мнуого бàчыў, мнуого чуў. А я нічòго не знàю. Якую я тут дам рàду!

— Прàўду кàжэ Данìло. Калì ты, Сьцепàне, не парàдзіш, та ўсіе мы паздыхàем ат гэстаго аўсà.

— Што я парàджу, калì пан кàжэ — бàчіш, якіе дужые кòні ат àуса. От такàя дужая мая двуорня, бо янà аўсяная.

— Ой, мы гуоркіе! Што тут рабìць, што пачàць? Гэсты аўёс уже нам кішкі пераіеў.

— Да што кішкі... Онь у менè кірдзюк на языку̀.

— Дòбрэ табіе казàць, калì ў цебè кішкі бы халява. Я бàчыў, як ты іеў ершы ў кума на радзінах. От, маіе браткì, кідае ў гòрло адзін за другім сухіе ершы, бы ў пруорву. Мо ат тагò ў цебè й кірдзюк на языцэ.

— Талкуй, ат тагò. Ершы я кідаю ўпèрад галавòю... Ніе, гэто, ат аўсà. Ат гэстаго аўсà мы скòро саўсім абèрнемса ў кòней.

— Ой, ратуй, Сьцепàнко, калì ў бòга віерыш. Не хачу я быць кабылаю.

— Ну, чаго заскулìла? Хібà-ж спалòхаласа, што кабыла туолько адзін раз у гаду гуляе?

— А табіе абы зубы вышчарàць.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

— Вышчарыш і ты, як абѐрнешса ў кабылу.

— Ну, Сьцепàне, чагò к маладзіцы прычапіўса?

Бàчыш, што й ёй ат аўсà жыцьця немà. От лепіей пакруці галавòю да парàдзь, што тут рабіць.

— Што я парàджу? От хібà нам хурмàн Нічыпар парàдзіць, што рабіць з пагàным пàнам. Нічыпар мàе дачынѐне да кòней...

— Хібà-ж мы ўжэ кòні?

— Да чагò ты прыплёў тут кòні?

— Онь нàшы кòні нікòлі аўсà й не бàчаць.

— Аўёс, аўёс!.. Людзі зàўжды з аўсà гатòвяць блінцы, рòбляць талакнò.

— Онь салдàтка Рыпіна з аўсà вàрыць крўпнік і не нахвàліцца, як смàчно.

— Я ку, што Нічыпар іездзіць з панàмі на кòнях, дак ён лепшыэй знàе кòней, лепшыэй знàе, што паны гавòраць і што дўмаюць...

— Да неплецì ты лàпці, не чмуцì. Мы сàмі з вусàмі.

— Я не плетў, а прàўду кажў. Не мая прàўда, Нічыпар?

— Ужэ-ш прàўда. Я чўю, што паны гавòраць, знàю, што яны дўмаюць: я бàчу іх навылет.

— Ой, Нічыпарко, сакòлік, памажы ты пам у бедзіе.

— А што вы мніе дасьцѐ? Калì пастàвіце г(g)àрнец гарыэлкі, дак не ўбàчыце аўсà, як сваіх вушэй.

— Не тўолькі г(g)àрнец, а нàват два, тўолькі памажы нам, Нічыпарко, атвернì гэстую плягу.

— Ну, так хадзѐм-тко на дзедзінец, да рабѐце тòе, што я скажў.

— Камѐндуй, камѐндуй, Нічыпарко, бўдамо рабіць, што ты завелìш.

— Дак от пакўль я схаджў па гарàпнік, вы ззавіеце сюды ўсю двўорню да й чакàйце менѐ. Як я прыдў да пачнў смалìць гарàпнікам, дак вы біегайце да ржэце, бы кòні. К пàну назезжàласо мнўого гасьцѐй, я ўсе расталкўю пàну пры гасьцях. Пàну бўдзе сòрам ат гасьцѐй.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

— Рабі, Нічыпарко, як дòбрэ. Ты лепі͡ей нас знàеш.

— Нічыпар, Нічыпар! Чэго там тэ галгàны пазбірàлысе на дзедзінец? Распэньдзь іх бічэм.

— Да я ўжэ разганяў, панòчку, ту͡олькі ены ешчэ гары͡эй ржуць, от бàццэ кòні.

— А ты задàй ім пад фэ.

— Гэй, каб вас так і сяк! Чагò пазбірàліса.

— І-га-га-га! І-га-га-га!

— Алè цо то ест? Г(g)òсьці бардзо зацікаўèны сон.

— Што? Бàчыце, што людзі ў кòней абернўліса.

— З чэг(g)о-ш то?

— З чагò? Ві͡едамо — з аўсà.

— З якег(g)о овса?

— А пан жэ велі͡еў усю дву͡орню карміць усè аўсòм. От кармілі, кармілі да й выкармілі на адзін бу͡ок.

— Цо-ж тэрас рòбіць?

— Што? Ві͡едамо, што рабіць. Трэ й дварòвых карміць уселякаю стрàваю, а не аўсòм, як кòней. От нехàй пан спытàе ў пàньськіх гасьцèй, што яны скàжуць, прàўду я ку, ці ні͡е.

— С тых час каж іх кàрміць вшысткім, цо ест і цо готўèн до мэг(g)о стòла.

С. Корчык.

Чудзін.

48. Здàтны палешўк.

Жыў сабі͡е адзін вèльмі здàтны палешўк. Мну͡ого ён хадзіў па сьві͡ету, мо на сі͡ем міль у акрўзе, мну͡ого ўселякаго дзіва бàчыў. Дзівіліса людзі, як ягò галавà знòсіць, як янò там мі͡есьціцца. Разўмны быў ён і да ўсягò здàтны. Бàло, калі ўжэ ніхтò не зрòбіць, та бегўць к ямў. Ён пакрўціць галавòю да калі нічòго не зрòбіць, дак ужэ ніхтò не парàдзіць. А, ві͡едамо, ў гаспадàрцы зàўжды мàе быць прыгòда, дак нічòго й не парàдзіш, калі немàшака здàтнаго чалаві͡ека, хаць седзі да й плач, ці бежы к тамў палешукў, чапкўй да прасі, каб паму͡ог. Алè немà чагò казàць,

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ён быў добры чалавіек, бало папросіш, дак ніколі не атказжэ, паможэ ў бедзіе. От раз адзін чалавіек пашоў араць на грэчку. Гэто было якась после Сёмухі. І напалі на валуоў авады да здракі. Круціўса ён, круціўса, нічого не мажэ парадзіць, валы круцяць та на занозу, та на кульбаку. — Ну, — думае, — беда! Яшчэ задратую валуоў, — а тут трэ даараць, хаць ты лунь. Задаў ён валуом дыхту да й арэ, алè ось адзін вуол як закруціць на кульбаку, дак тая трыэсь і зламаласа. Што тут рабіць! Была ў яго сакіерка, а ў суваратах як раз стаяў, каржакаваты дуб, да, бачыце, авады да здракі так рыэжуць вала, што ён круцідца бы ўюн у рэшаце, — нельга ўзяць міеркі. Стаіць той чалавіек, рукі сашчапіўшы, чуць не плачэ, не віедае, што рабіць. Аж ось на шчасце буог паслаў таго здатнаго палешука. — Чаго ты, — ка, — сябрэ, бедуеш? Гэто-ж муожне зрабіць кульбаку. — Да зрабіць муожне, — атказвае той, — алè як паміерадь. — Гэ! Які ты дзіўны, — кажэ палешук, — от пабачыш, як я хутко паміераю. — От завезаў ён валу на карак злыгач, закінуў яго другі канец на тоўстае рало дуба, схапіліса яны абудва абіеручкі за тую вероўку да й цягнуць вала на дуб, каб там паміераць крывую галіну на кульбаку. Чуць не задушылі вала, алè такі зрабілі кульбаку. — От-жэ дзякуй табіе, сябрэ, што навучыў менè да памуог, як ратавацца ў бедзіе, а то-б я й глузду не прылажыў. — Другі раз здатны палешук вельмі цікаво паказаў сваёй бабе, як мыць дзераўляные місы да каўшы, бо, віедамо, што ат туку на іх гразі на палац. Баба скрабè нажом да шарує хвашчанкаю, алè нічого ніельга зрабіць, бо сало ўедаецца ў дзераво наскруось. — Гэ, дурнаяя баба, — кажэ ён, — ты ўсіе кінці папрыдзірала, — ось я табіе хіба пакажу, як чысціць уселякую пасудзіну. Я бачыў, як жыды на Пейсах кашыэраць рандэлкі. — От узяў ён усіе сваіе дзераўляные місы, каўшы да таўчыэйкі да й паўкідаў у піеч на жар да яшчэ й піеч засланіў засланкаю. — Ось яны там агнём выгараць да не то, што будуць чыстые, бы шклянка, алè нават кашыэрные, хаць ты жыдуом давай на сьвята. — Па немалум часе атчыніла баба піеч, аж там туолькі вугалькі асталіса.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Схапіла яна кавенѝо да давай перы̂эсціць таго здатнаго палешукà да прыгавòрваць: от жэ табі̂е, хвары̂эць тваёй мàтары, як у бàбськае дзі̂ело мешàцца! Ты-б дагледàў свайго гумнà, што там павуці̂ене да гразь, што ні̂ельга й улі̂езці, а не пазірàць на маі̂е місы. — Насілу палешу̀к вы̀бег з хàты да пачàў пачу̀хваць патьі̀ліцу да спіну. Ачу̀хаўса трòхі ён да й пацёгса ў гумнò. Зірну̀ў ён, аж прàўду казàла бàба, што там гразь да павуці̂ене так навісло пад страхòю, што яі̂е аж саўсім не зу̂орко. — От жэ, — ду̀мае, — я вы̀смалю гэстую пòшкудзь да зраблю̀ гумнò бы ля̀льку. — Вы̀красаў ён агню̀, зрабіў з салòмы зу̀бленку да давàй памалèньку апàльваць, пад страхòю пàвуць. Страхà была сухая̀, як пòрах. Ту̂олькі ён запаліў пàвуць, а пòламъе як шыбанè, як пабежы̀ць, як зòймецца адразу̀ у̀ся страхà да пацеру̀ха, дак ён насілу вы̀бег з гумнà да давàй крычàць, звàць людзèй на рату̀нак. Пакуль збі̂егліса лю̀дзі, страхà й праваліласа, а гумнò гары̀ць, бы сьві̂ечка. Бàчаць лю̀дзі, што у̀жэ ні̂ельга нічòго парàдзіць, от яны̀ й кàжуць: ты чалаві̂ек здàтны, ху̀тко пабуду̀еш нòвае, яшчэ лі̂епшае гумнò, а гэтае нехàй ідзè на хвàлу бòжую. Згары̂эло гумнò да звàпьня. Пашòў той здàтны палешу̀к у лі̂ес пушчàць дзèраво на гумнò. Назсі̂екаў ён дзераўля̀к да й давàй іх вазіць у вёску: прывя̀жэ дзераўля̀ку валу̀ за хву̂ост, да й гòніць тагò пу̀гаю. Ву̂ол як рванèцца, дак і адарвè хву̂ост. Паадрывàў ён сваім валу̂ом хвасты̀, а нігòднаго дзераўля̀кі не прыуёз у вёску. Убàчыла тòе бàба да як пачалà ягò дубàсіць, пачалà ягò пі̂ерыць мі̂ешалкаю, дак ён кінуў гаспадàрку да й уцёк у лі̂ес. Бежы̀ць да й чу̀е, што дзя̀цел крычы̀ць: цэх, цэх! Ї здаèцца яму̀, што гэто яму̀ грòзіць бàба. Ён дàлей прэ с усіх лапàтак, а тут скрыпіць дзèраво: рып, рып. А яму̀ здаèцца, што гэто бàба кàжэ: дам, дам! Забіўса ён у балòто да так і седзіць там да тых час.

Семён Корчык.

Чудзін.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

49. Аткуль узялiса грыбы.

Гэто было яшчэ тагды, як сам буог хадзiў па землi, бо даўнiей людзi яшчэ не грашылi, як цепер, i буог любiў iх, навучаў i пака̀зваў, як жыць на сьвiеце, каб усiм было добрэ. От раз iшоў буог з сваiмi святымi людзьмi па вескам; iшлi яны, як простые жабракi. З богам былi Петро, Iлья, Барыс i Мiкола. Добрые людзi прымалi iх, частавалi, чым буог пасла̀ў i яшчэ давалi на дарогу. Вiедамо, часам вескi вельмi далеко адна ат другоiе, а на дарозе нiчого нема. А Петро, заўжды любiў наладаваць свуой трыбух. От раз яны доўго цягнулiса праз лiес, а кругом i дымам не пахне. Прагаладаўса Петро, аж яму пад дыхавiцу закалоло. Пазiрае ён па абапал дарогi, цi нема дзiе якiх небузь ягад, але нема, бо справа была калe Мiколы Вiешняго. Туолькi ось схаменуўса ён, як убачыў, што Барыс прэ за плечамi торбу кускуоў хлiеба. Барыс iшоў ззаду, вiедамо з клункам важко йцi. От Петро супынiўса, нiбыто дзеля таго, каб завязаць аборы па нагах. Барыс пашоў уперад. Тагды Петро хуценько дагнаў яго да й падкраўшыса на пальчыках украў з торбы кусок хлiеба. Барыс i не пачуў, так той здуолно залiез у торбу. Iдзе сабiе Петро да беззубым ротам жуе сухi хлiеб. Набраў ён повен рот, а тым часам буог знаў тое да й запытаў Петра, цi неўтамiўса ён, цi не трэ яму атдыхаць. Немажэ Петро адмаўляць богу, бо ў роце хлiеб мешае. От ён нiбы кашляе да пацiхеньку выплеўвае хлiеб, каб буог не закмiеў. Але буог i кажэ: «не выплеўвай на зэмлю,— гэто-ж божы дар. Нехай з яго вырастуць грыбы на патрэбу людзям». От з таiе пары й пашлi ў лiесе расцi грыбы, каторымi й цепер карыстаюць людзi.

Круглiк.

Чудзiн.

50. Дурэнь.

Даўно тое было, мо яшчэ нашых прапрадзедаў не было на сьвiецi. Жыў сабiе адзiн багаты чалавiек; ён знаўса з лiхiмi;

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

затым у яго было мнуого уселякаго дабра, а грошэй як трыэсак. Віедамо, ат сваіе працы багат не будзеш, бо як ні працуй, як ні гаруй, а тут табіе чорт дзірку знайдзе: не пасьпіееш азірнуцца, як туды-сюды усе й разойдзецца. А той багаты чалавіек туолькі пахаджау сабіе да даглядау парабкуоу да наймічак, а гаспадарка расла бы грыбы. Людзі працуюць дзень і нуоч, ніколі не бачаць прасьвіетлаіе часіны, а тут прыпадкі адзін па другуом да нашчатку зьнішчаць ім гаспадарку. Та зьвіер нападзе да зарыэжэ самае ліепшае гауядо, та яно само змітрэнжыцца, та усходзіцца навальніца да градам у адзін момант загубіць усе збуожжэ, та з добраго раю прычыэпіцца хвароба да пачне цебе гнесьці да ламаць так, што аж жытка не міла. Зірнеш і дзівісса, чаму гэто багатаго чорт не берэ, чаму гэто у яго гауядо цыэло, чаму гэто град дойдзе да яго рыэза да й закруціць назад, ці зьверне убуок. Але зьвіесно, чаму так, бо багатаму чэрці дзецей калышуць, чэрці памагаюць яму на гэтум сьвіеці, дак за тое на туом сьвіеці возьмуць сабіе яго душу на расплату. Так і той багач ні якаго ліха не знау, жыу сабіе у дастатку да раскошы, пакуль такі падышоу тэрмін і трэба было аддаць чарцям душу. Не хаціелась яму пакідаць багатство, доуго ён круціу та так, та сяк, але-ж кажуць, круці, не круці, а трэ умерці. Наскочылі на яго чэрці зненацку, як ён таго саусім не чакау, да раптам і задушылі. Не пасьпіеу ён нават сказаць, дзіе у яго схованы грошы. Па сьмерці багатаго засталіса тры сыны, два разумные, а трэйці дурэнь. Пахавалі яны бацька да й кажуць: — У бацька было мнуого грошэй, але ён не сказау нам, дзіе яны захованы. Пеуне ён цепер нам скажэ, як мы справім памінкі. — От справілі яны памінкі да й сгаварыліса тры ночы па чарзіе начаваць на моглицах кала магілы бацька й слухаць, што ён скажэ. Падышоу вечар. Прышлосо йці на моглицы буольшаму брату. Пабаяуса ён іці на моглицы да й просіць дурня, каб ён за яго там паначавау. Згадзіуса дурэнь. Віедамо, дурному усе руоуно, дзіе ні начаваць. От лёг ён кала сьвіежаіе магілы да й захруоп. Туолькі ось праз сон чуе, што яго хтось будзіць. Прахапіуса ён да й пытае: хто тут? —

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Я, твуой бацько, — адмаўляе з магілы. Нуоч была цёмная. Невазнаў мерцьвец, каторы гэто сын да й пытае: — Ты буольшы?— Эгэ-ж, — аткàзвае дурэнь. — Пакапай пад сьвіронкам, там я закапаў табіе мнуого грошэй. — Сказаў тое да й замоўк. На заўтрэ яшчэ досьвета прыходзіць дурэнь у вёску, аж тут кала самаіе аколіцы сустракае яго чорт да й кажэ: тые грошы заклятые, не дам табіе, калі ты не абецаеш, што будзеш спажываць туолькі ў сваёй вёсцы. — Дурэнь на ўсе згаджаецца й выдае чорту роспіску, але падпісвае на ёй імя буольшаго брата. Уліез дурэнь у хату, от братэ й пытаюць, што яму казаў бацько. А дурэнь аткàзвае, што бацько яго абляяў, а аб грашуох нічого не сказаў. На другі дзень трэ йці селедуоршаму брату. Баяўса ён іці на могліцы да й пасылае й ён дурня. Пашоў дурэнь і на другую нуоч. У самую глупась зноў пытае бацько, ці гэто селедуоршы сын, а дурэнь аткàзвае, што але-ж селедуоршы. — Табіе я закапаў пад ігрушаю такі персьцёнак, што як будзеш яго насіць на руцэ, — кажэ мерцьвец, — та цебе пакахае першая красуотка на сьвіецці, хаць бы то была царэўна. — Сказаў тое й замоўк. Туолькі хаціеў дурэнь іці да гасподы, як зноў прычапіўса да яго чорт. — Заклятый — кажэ — той персьцёнак, я табіе яго не дам. — Мусіў дурэнь і гэстаму чорту даць роспіску, што апрыч сваіе ўескі нікуды не панесе таго персьцёнка й сам не пуойдзе. Зноў дурэнь падпісаўса, нібыто селедуоршы брат. Зноў пытаюць яго братэ, што казаў бацько. На гэты раз дурэнь кажэ, што бацько агрыэў яго папліскаю. На трэйцюю нуоч пашоў дурэнь на могліцы сам за себе. На гэты раз мерцьвец пытае, ці гэто меньшы сын. — Але-ж, — аткàзвае дурэнь. — Табіе я заставіў старую торбачку, — кажэ бацько, — ты ў ёй заўжды знайдзеш яду, каб пасілкавацца. — Замаўчаў мерцьвец, а дурэнь пашоў да гасподы. Падслухоўваў чорт, што яму скажэ мерцьвец, але не сустракаў буольш дурня, бо чорту такая торбачка не трэба. Прышоў дурэнь да гасподы, а братые пытаюць, што яму казаў бацько. — Бацько казаў, — адмаўляе той, — што мніе дае ось гэстую старую торбачку. — Пасьмеяліса братэ з дурня да й кажуць у вадзін

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

голас. — Беры, беры, як пуойдзеш жабраваць, та прыгадзіцца. —

Узяў сабіе дурэнь тую торбачку, выкапаў грошы да персцёнак і пашоў у сьвіет, бо віедамо, з велікімі грашыма да з зачарованым персцёнкам нема чаго жыць у цёмпуй вёсцы. Браты не спынялі яго, бо, віедамо, якая ў гаспадарцы з дурного карысць, — туолькі трэ дарма хліебам карміць да апранаць. Пашоў сабіе дурэнь у міесто да й зажыў там панам. Віедамо, цяжко прывыкнуць гараваць да працаваць, а панаваць куожын мажэ. Хутко пашла прачутка па ўсёй акрузе, што зьявіўса такі багач, што мо такого й на сьвіеці другого нема. Пачалі тут князі, грапы да руозные паны сватаць яму сваіх дачок да небог. Куожнаму хочацца міець багатаго зяця. А тут ён як ускладзе на палац той персцёнак, дак усіе панэнткі аж прагуцца. Але, куды там, ён не хочэ на іх іназіраць. І чым буольш к яму прыстаюць панэнткі, тым буольш яму хочацца ўзяць самую харашыэйшую красавіцу на сьвіеці. Дачуліса браты, што ў міесьці жыве такі велікі багач, што нікому не атказвае, а без ліку дае грошы, от і пашлі яны туды, каб і ім пажывіцца ат дурного папа. Туолькі яны вышлі з вёскі, як аткуль ні ўзяўса чорт да й схапіў іх жыўцом да й павалуок у пекло. Яны бажыцца, яны хрысьціцца, што жуодных роспісак не давалі. Чорт не слухае, валачэ. Прыцёг ён іх к старшому. Давай яны жаліцца яму на чорта. Разглёдзяў той роспіскі да й аслабаніў іх, а чорту веліеў за тое служыць ім тры гады. Нема чаго рабіць, падгіндзіў чорт хвуост і паўёў іх да гасподы. — Мабыць мужык хітрыэй чорта, — кажэ ён, — калі й мене перахітрыў. — Служыць чорт, працуе, аж на ём шкура лопаецца. Давуолны браты, панукаюць чортам, а самі нічого не робляць, бо ён і без іх адзін управіцца. Абгультаіліса браты за тры гады так, што нават самі себе не могуць ахаяць, — напруцца да й валяюцца ў берлагу бы сьвіньне. Тым часам дурэнь ат дабра не віедае, куды дзіецца. Спрыкрала яму такая жытка ў міесьці гарыэй, як у вёсцы, бо не чуе ў сабіе таго слодычу, які чуў там. Тут панэнтак хаць гаць гаці, самі яму чапляюцца па карак, але

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ў ягò з душы̀ вѐрне, а там бàло на ўѐсцы, як ушчыпнѐ ён якỳю нѐбуць дзеўчы̀ну, дак ат слòдычу аж у вачỳ зрòбіцца цѐмно. Пакінуў ён міесто, паіехаў у вѐску, — дак і там немà ямỳ жуоднаго слòдычу. Хòдзіць дỳрэнь без дзіела, сланяецца, бы ў вòду апỳшчаны, сам не віедае, што з сабòю рабіць, хаць беры̀ да й засілі̀са. Нарэшце дачỳуса ён, што е такàя знахуорка, катòрая мажэ ў бедзіе парàдзіць. Пашòў ён да таіе знахуоркі. — Бàбко, лебъѐдко, ты дòбрэ знàеш, дòбрэ памагàеш лю̀дзям, — прòсіць ён знахуорку, — памажы̀ й мніе. — А чагò ты хòчэш? — Нічòго, бàбко, я не хачỳ, бо ўсе мàю. — Дак чагò-ж ты, муой сакòле, прышòў? Да менѐ прыхòдзяць лю̀дзі ў бедзіе, абò хвòрые, дак я ім і памагàю. Ты здаруоў і ўсе мàеш, ніякаіе беды̀ ў цебѐ немàшака. А зрабіць табіе ліхо я неўміею, бо нікòму не раблю̀ ліха. Менѐ мàтачка як канàла навучы̀ла туолькі лечы̀ць людзѐй да памагàць ім у бедзіе. А ў цебѐ якàя бедà? — У менѐ, бàбко, тòе ліхо, што беды̀ немà. — Э, муой гòлубе, бедà не за гарàмі, а за плечàмі. — Ратỳй, бàбко, а то я засілю̀са. — Што ты гавòрыш. Перахрысьці̀са. Гэто мàбыць ліхі̀ падкаснỳуса. Ось пачакàй, я дам зіельля, та мòжэ й памòжэ. — Навары̀ла знахуорка якòгось зіельля да й далà дỳрню піць. Вы̀піў ён раз-другі̀ да й зноў прыхòдзіць да бàбы. — Ну, што, гòлубе, ці памаглò? — Памаглò, бàбко, ой, як памаглò! Былò ліхо да й пагуоршало. То нічòго не хаціеласо, а цепѐр я жыць не бỳду, калі̀ не дастàну сабіе сàмаіе ліепшаіе красàвіцы на сьвіеці. — Ой, муой сакòле я̀сны, не турбỳйса, бо гэто вѐльмі ця̀жко зрабіць. Сàмая ліепшая на сьвіеці красуотка жывѐ за гарàмі, за марàмі ў тры-дзеся̀тум цàрстве, да там яіе пілнỳе зьміей. Ты ягò не адаліееш. — Нічòго, бàбко, пайдỳ шукàць, хаць загіну. — От бàба наўчы̀ла ягò, як найці̀ тỳю сàмую гòжую дзеўчы̀ну. — Як бỳдзеш іці̀, — вỳчыць янà, — та нікòлі не рабі̀ тагò, што лю̀дзі лі̀чаць ліхім, та ўсе табіе бỳдуць памагàць. — Падзя̀куваў дỳрэнь і пашòў шукàць таіе гòжаіе дзеўчы̀ны. Ідзѐ ён да йдзе, аж бàчыць, калà дарòгі стаі̀ць карчòмка. Зайшòў ён туды̀ адды̀хаць да пасілкавàцца. Віедамо, ў карчмѐ заỳжды людзѐй шмат. Сіеў сабіе ён у кутòчку да й прыслухòўваецца, што лю̀дзі

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

гавòраць. Ту͡ольκі ось чỳе ён, што ỳсі͡е ỳ вадзіп гòлас жàляцца да бедỳюць, алè піяк ён не разпалòпае, чагò. Пачàў ён распытòўваць, от ямỳ й кàжуць, што зьявіўса пагàны гад, схапіў ён у царà дачкỳ, а янà былà сàмая харашбы͡эйшая на сьві͡еці, а цепèр лѐтае ўсюды да хапàе ў людзѐй гòжых дзі͡евак. Схòпіць, завалачэ к сабі͡е да там і заставіць, велìць услугòўваць царэўне, ці ці͡ешыць, каб янà не журбавàласа без айцà да без мàткі. Пахватàў ужэ збу͡ольш сàмых гòжых дзі͡евак. Дачýуса аб ту͡ом дỳрэнь да й пашòў к царỳ. Прышòў пад цàрськіі͡е палàцы, алè ніяк не мажэ даступіцца да царà, бо паны̀ не пушчàюць. Ві͡едамо, калà царà заўжды стаіць вàрта. От дỳрэнь насỳнуў сабі͡е на пàлац персьцёнак да й пахаджàе калà вàрты. Вышла тут дачкà сàмаго старшòго пагуляць да й убàчыла дỳрня. Як убàчыла, дак ён так спадабàўса ёй, што янà й вытрымаць не мажэ, каб ягò не бàчыць. От янà падышлà да вàрты да й правелà дỳрня ў палàцы к царỳ. Пачàў тут цар пытàць дỳрня, чагò ён прышòў, а той адмаўляе, што берэцца вызваліць ад гàда царэўну, калі царь дась лю̀дзям слабòду, каб паны з іх не зьдзі͡екуваліса. Згаджàецца цар даць лю̀дзям не ту͡олькі слабòду, алè й зèмлю, каб ту͡олькі ён аслабаніў ягò дачкỳ. Алè дỳрэнь упірàецца да й кàжэ, што пакỳль лю̀дзі не мàюць слабòды, датỳль ён не мажэ аслабаніць царэўны. Немà чагò рабіць, выдаў цар маніхвэст, што даè лю̀дзям слабòду й зèмлю. Падзякуваў дỳрэнь царỳ, пакланіўса аж да землі, ўзяў маніхвэст за пàзуху да й пашòў. Алè, ві͡едамо, не спадабàласо пану͡ом, што цар даў лю̀дзям слабòду, от яны й схавàлі цàрські маніхвэст да яшчэ гарбы͡эй пачалі ціснуць хрысьцян. Ідзè дỳрэнь да й бàчыць, аж ведỳць мужыкà да стàйні лупцавàць. Заступіўса дỳрэнь за мужыкà, падышòў к лю̀дзям да й паказàў цàрські маніхвэст. Загаманіў нару͡од, кінуўса на пàньськіх слуг да й атабрàў тагò мужыкà. Падзякуваў той дỳрню да й пашòў з ім рàзам. Убàчылі тòе дзецюкì, дак і яны абрàліса памагàць дỳрню. От гэ набралòсо ў дỳрня малайцòў шмат. Ідỳць яны, пакàзваюць маніхвэст да падбухтэрваюць людзѐй, а ты͡е ўсе прыстаюць да дỳрня. Набралòсо ў ягò малайцòў мòо цісяч дзèсяць ці бу͡ольш. От падхòдзяць

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

яны туды, дзіе зьміей запъёр царськую дачку. Напалі тут малайцы да давай ламаць да паліць гада палацы, алё бўольш усіх завіхаецца сам дурэнь. Перабілі яны ўсе вуойсько зьміея да ўже падбіраюцца да ягò самòго. От ён і заліез у такую зямлянку, каб ніхтò не трапіў. Аслабаніў дурэнь царэўну да ўсіх дзіевак, алè немажэ супакòіцца, бо не віедае, куды схаваўса пагàны гад. От давай ён трасьці да шукаць зьміея па ўсіх кутўох. Пераграсьлі яны ўсе, аблазілі ўсюды, а зьміея нема, от бы ў зèмлю праваліўса. От сабраў дурэнь усіх дзіевак да й давай балявàць да гасьцевàць. Была тут адна дзіеўка з чужòго царства. Гэто была дачка вельмі велікаіе віедзьмы. Яна абваражыла зьміея да й рабіла ў ягò, што сама хаціела. Усіе яіе слухалі, апрыч аднаіе царэўны. От тая дзіеўка вельмі незлюбіла царэўны да хаціела яіе загубіць, тўолькі не магла, бо зьміей аберагаў царэўну, як самую гòжую на ўсём сьвіеці. Тая дзіеўка знала, дзіе зьміей, алè маўчала. Яна хаціела, як усіе будуць пъяные, загубіць дурня з ягò малайцами да разам і царэўну. От пьюць да весèляцца малайцы, а дзіеўкі скачуць да паюць піесьні. Пачала скакаць і тая дзіеўка да так спадабàласа яна дурню, што ён і ачу немажэ з яіе зьвесьці. Зірнè ён та на царэўну, та на яіе, алè яму здаèцца, што не царэўна, а тая дзіеўка самая гòжая на сьвіеці. Бо віедамо, як спадабаецца, та здаèцца, што такòіе другòіе немашака й на сьвіеці. А тут царэўна так закахàласа, так ёй спадабаўса дурэнь, меньш яна рада слабòдзе, меньш рада пабачыць айца да матку, чым пазіраць на дурня. От убачыла царэўна, што дурэнь усè пазірае на тую ліхую дзіеўку, да так засмуцілася, што й вытрымаць не мажэ. Зірнуў на яіе дурэнь да й дагадаўса, што гэто яна ат любòшчаў так змяніласа. Гòдзі ён піць, гòдзі забаўляцца, давай у дарòгу зьбірацца. Тым часам тая пагàная дзіеўка сказала зьміею, што пара з малайцами расправіцца, а сама падбіегла к дурню да й кажэ: — Хучьэй уцекаймо, бо зьміей блізко. — Дурэнь надзіеў на палац персьцёнак да й пытае: — А дзіе той пагàны гад? — Улюбіласа тая пагàная дзіеўка так, што не мажэ таіцца да й кажэ: — А онь там у пòграбе. Кінуўса

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

дурэнь хучыэй да пограба да й накл̀аў у дзьверах агню. Разгарыэўса агонь, от і веліеў ён буольш класьці віецьце да мокрую салому, а сьверху памахваць, каб дым ішоў у пограб. Круціўса, круціўса там пагàны гад да й затохса ат дыму. Біегае тая дзіеўка кала агню да туолькі рукі ломіць. Дагадàўса дурэнь, якая гэто прыяцелька, забраў хучыэй царэўну, папрашчаўса з малайцамі да й паіехаў к цару. Рады цар з царыцаю, што вернуласа царэўна й абецàюць яіе аддаць замуж за дурня. Тым часам абазлілаcа тая паганая дзіеўка да й кінуласа за дурням сьліедам. Бежыць яна да па дарозі падмаўляе пануоў, каб яны не здавàліса да ўмаўлялі цара, што дурэнь загубіць усе царство, як мужыкі будуць міець вуолнась. А пануом туолькі тое й трэ. Пашлі яны к цару да давай яго дурыць. Дурылі, дурылі, пакуль той і здаўса. Віедамо, як утапае, та сакіерку обецае, а як вылезе, та й тапарышчэ адбірае, бо за добрае злым заплата. От так і той цар хутко зьменіў сваё слово, атвернуўса ат дурня, а мужыкуоў зноў аддаў пануом. І стало людзям яшчэ гарыэй, як было. Схапілі паны дурня да й выдалі таму чорту, катораго ён абшукаў. Бо віедамо, дурэнь ніколі не зробіць добрэ.

Круглік.

Чудзін.

51. Валасны суд.

Да ўсяго быў Янко вельмі здатны. Бало на што ні зірне, та й зробіць сам да яшчэ штучніей, як у людзей. За тое яго паважалі не то, што наш брат мужык, але нават і дваровые. Ужэ што вам казаць, які быў гарды паньські хурман Міна, да й той, як што небуць нарвецца, дак бежыць да Янка да бы сабака віляе хвастом. — Яначко, руодненькі, выратуй з беды, парапаруй набедрыкі, бо як убачыць пан, та зъіесь. — Але што я кжаў хурман, калі раз сам пан пасл̀аў па Янка, каб яму прыладзіў стрэлбу, ці што. Той туолькі дзьмухнуў у рулю, дак стрэлба й стала, як мае быць. І веліеў пан даць Янку шклянку гарбаты. Схапіў Янко шклянку да й хаціеў бы гарыэлку выпіць обмегам

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

за паньскае здаруоуе. От ён абернуў шклянку ў сваю халяву да як пырхне, дак чуць пана не сыпъёк тою гарбатаю. — Нехай, яна, паночку, спрахне гэстая гарбата! Усіе печанцы гарадь. Ліепш, нехай пан дась мніе мужыцкаго трунку, бо куды мніе, лапцюжніку паньская гарбата. — Засмеяўса пан і веліеў даць Янку добрую чарку гарыэлкі. От з тых часаў і пачаў пан пасылаць Янка туды-сюды на работу, та ў двуор, та ў хвальварак, та на бровар. Віедамо, ў велікуй гаспадарцы заўжды зробіцца якая нєбудзь прыгода. Саўсім занехаяў Янко сваю гаспадарку, — нємаль куожын дзень седзіць у дварьі; калі на рабоце, а калі й так. А з гаспадаркаю ўпраўляецца Янкава маладая жуонка. Яна абробіцца ў хаце да даглєдзіць гаўяда й яшчэ нема куды часу дзеваць. От яна выскачыць на вуліцу да й вышчарае зубы з дзецюкамі, або сакочэ з маладзіцамі. А тым часам Янка ўсе часціей і часціей пачалі зваць у двуор та тое, та сее рапараваць ці перарабляць. І так усл авіўса ён, што бало пан кажэ: Яначко, што зхочэ, ўсе зробіць. От дачуласа аб туом пані да й пазвала яго к сабіе, каб ён зрабіў ёй якуюсь рапарацю. Зрабіў Янко, што трэба, злажыў сваё нажэндзе да й хаціеў іці да гасподы, але пані мабыць вєльмі спадабаласа яго работа, от яна веліела яму яшчэ застацца. Доўго Янко там рапараваў, аж увесь спаціеў. Вышаў ён ат пані нємаль змрокам да й прыходзіць да гасподы. От жуонка й пытае яго, дзіе ён так доўго забаўляўса. — Віедамо дзіе, ў дварьі, — атказвае ён да й маўчыць. Чуе жуонка, што ат яго штось тронціць, бы ат пані, хочэцца ёй давіедацца, што там такое ён рабіў, да невіедае, з якого боку падыці. От і пачала яна лашчыцца, а ён і ў той буок не пазірае. От яна й кажэ: Ой, Яначко, я-ж і забыласа, што каняка ў хлевіе галодная зубамі звоніць. Нехай-бы ты звадзіў яіе на начліег. — Я штось занепаў, — кажэ ён. — Ну, дак хіба-ж я сама паведу. — Ну, чаго табіе турбавацца? Каняка за нуоч не здохне, а раненько я прыпну яіе па прыгумєчы. — Уперласа маладзіца й хаць-бы што, — паведу да й паведу! — От апранула яна кажушок, за-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

круцìла хýстку да й павѐла каня̀ку на лужòк. Туо̑лько янà вы̀ехала за ўѐску, аж сустракàе дзецюкà. Той рàдзіць везцì кòней на пàньськую канюшы̀ну, што расцѐ калà вескòваго аўса. От папýталі яны̀ кòней, а самі цìхенько леглì на межы̀ да й грыэюцца аднò калà другòго. Качàюцца яны̀ да цıе̑шацца на межы̀, а тым чàсам кòні паскакàлі з канюшы̀ны да ў Янкаў аўѐс. Аўѐс быў туо̑лькі ў пучкуо̑х. Не так кòні зъıе̑лі, як напсавàлі. Тым чàсам прыбегàюць з дварà па Янку, каб ён ішòў напраміл̀ы буо̑г туды̀, бо там у калòдзесь ускòчыў пàньські вы̀жал і ніхтò не вıе̑дае, як ягò аттýль дастàць. Насìлу ўскатýрхалі Янка, так ён напрацавàўса ў пàні, што спаў бы зарыэ̑заны. Пралупіў ён вòчы, ўзяў пàпліску да й пашòў. Туо̑лькі падышòў к сваймý рыэ̑зу, аж бàчыць — у ягò аўсıе̑ пасýцца кòні. Ён туды̀ да й насýнуўса на жуо̑нку з тым дзяцюкòм. От ён цìхенько падышòў бліжыэ̑й да як закмıе̑ў, што яны̀ рòбяць, дак давàй іх перыэ̑сціць пàпліскаю. Былò яшчэ̀ цѐмно. Не пазнàў дзецю̀к Янка, ўсхапìўса да й схапìў ягò зàгрудкі. Па немàлум чàсе дзецю̀к падгібàў Янка пад себѐ да й давàй ягò месìць калıе̑нкамі. Усхапìласа й жуо̑нка да давàй памагàць дзецюкý. Схапìла гэто янà за бòраду да й цягне, каб перавернýць дагары̀ да тут і пазнàла, што гэто гаспадàр. Нарабìла янà кры̀ку, збıе̑гліса людзі да й атбаранìлі Янка. Насìлу жуо̑нка прывелà ягò да гаспòды, так ягò пабìў той дзецю̀к. Прайшлò мо́ недзıе̑ль з пятòк, пакýль ён вы̀чухаўса. От сабрàў ён свıе̑так да й пажàліўса на тагò дзецюкà ў валасны̀ суд, што стравìў ягò аўѐс. От прышлì на суд. Вы̀слухалі сýдзьі ягò скàрг(g)у, дапрасìлі тагò дзецю̀ка й сьвıе̑так да паняты̀х, сказàлі памірьı̀цца да й вы̀шлі ў другую̀ стàнцаю на рàду. Адзìн кàжэ, што Янкò вінавàт, на штò пускàў жуо̑нку на начлıе̑г. Другì кàжэ, што яıе̑ дзецю̀к падмòвіў пусцìць кòней у канюшы̀ну. Трэ̀йці кàжэ, што Янко пѐршы пачàў іх біць. Пѐршы кàжэ: ён біў, бо яны̀ грыэ̑ліса пад адны̀м кажушкòм, дак ён іх і абагрыэ̑ў пàпліскаю. — Другì кàжэ, што іх двòе, а ён адзìн. Трэ̀йцы кàжэ, што ягò муо̑цно пабìлі. Пѐршы кàжэ, што ён не жàліцца на пабòі, а жà-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ліцца, што дзецю̀к стравіў аўёс, а што аўёс патаптàла й ягò каня̀ка. Другì кàжэ, што дзецю̀к вінавàт, бо не то, што грыэўса з маладзіцаю да яшчэ й кòней напàсьціў у аўсіе. Трэйці кàжэ, што й сам рàбін не разберэ гэстаго дзіела, хібà трэба пазвàць старшынỳ й пісара. От пазвàлі яны старшынỳ й пісара, дòўго яшчэ рàдзіліса, нарэшце стары̀ судзья̀ й пытàе: ты як, Нічы̀пар? — Туды. — А ты Гаўры̀ло? — Туды. — Ну, дак і я рàзам туды. А вы, пàне старшынò, як?—Калì вы туды, дак і я туды.— Мы ўсіе туды, а як вы, пàне пісар?—Там вас давòлі й без менè,— атказвае той.

Болбат.

Чудзін.

52. Хармазòнскіе грòшы.

Гэто было̀ калà Зажэвіч, ці што. Яшчэ майго ся̀бра туды̀ ганя̀лі з хурмàнкамі к пàну ў двуор па трỳбы на брòвар. Дак ён мніе сам раскàзваў, што чуў там ат аднагò старòго чалавіека, катòры сам тòе бàчыў. Жыў, кàжэ, ў нас у Пагібѐльцы, ці мо ў Убібàцьках, — от дòбрэ не паметàю, не хачỳ хлусìць, — жыў, кàжэ, адзін вѐльмі біедны чалавіек. Працавàў ён як чòрны вуол, ні ў бỳдзень, ні ў сьвя̀то не міеў ён супачы̀нку, алѐ от так ямỳ не шанцавàло, так нішчылаcа ягò гаспадàрка, што нічòго не парàдзіць. Перш прапàлі ўсіе свіньне, пòтым кабы̀ла качàючыса перэвернỳласа ў я̀му да, скажы̀ ты, пакỳль ён аглѐдзяўса, дак янà й нòгі вы̀пруціла. Нарэшце пастушкì пàсцілі ў ліесі гаўя̀до да трàпілі на медзьвѐдзіцу. Мỳсіць быкì зачапілі медзьведзеня̀так, ці што да й пачалì раўці, туолькі ось вы̀скачыла медзьвѐдзіца, схапіла друк да й пассàджвала гаўя̀ду клубы̀. Пастушкì, віедамо блазнòта, кìнуліса ўцекàць да й паўзлàзілі на дзѐраво. Разбіегласо гаўя̀до па ліесі, а пàру валуоў і тры карòвы тагò чалавіека засталìса хто без клỳба, хто з перабітаю спінаю. Памỳчыласо тòе гаўя̀до да ўсе й прапàло. Асталàса ў тагò чалавіека туолькі аднà целìца да й тỳю ваўкì зары̀эзалі. Сàмі віедаеце, якàя гаспадàрка без гаўя̀да. Памỳчыўса, пабіўса трòхі той чалавіек, алѐ

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

нічѐго не парàдзіць, бо ў сòху жу͡онку не запражэш. От і кàжэ ён сваёй маладзіцы: чўеш, маѝ галўбко, мàбыць за грахì нас бу͡ог пакараў. Ягò святàя вòля. А мы кіньмо гэстую слімазàрную гаспадàрку да хадзèм у сьві͡ет, та мо дзі͡е натрàпім сваю дòлю. — А дзецèй у іх не было̀, бо яшчэ недàўно ту͡олькі пабрàліса. Кінулі янѝ хàту, наклàлі тòрбы да й пашлì. Прыдуць у вёску, стàнуць к лю̀дзям на рабòту, та тые накòрмяць да яшчэ̀ дадўць на дарòгу. От дзі͡есь на палі͡есі за Старòбінам зайшлì янѝ к аднамỳ вѐльмі багàтаму гаспадару̀ нàнач да й засталìса ў ягò на рабòту. А было̀ гэто ўжэ пад канèц лі͡ета, як лю̀дзі кàжуць, што калì прайшòў багàч, пакідàй рагàч да берѝ севèньку да й сі͡ей памалѐньку. От той чалаві͡ек пасі͡еяў багачу̀ жыто, а ягò жу͡онка капàла бўльбу. Яшчэ̀ сòнейко высòко, а ён ужэ̀ забаранавàў жы̀то, пусціў кòней на пàшу, а сам пашòў жу͡онцы падкòпваць картòплю. У гэты час багàтаго гаспадарà не было̀ дòма, бо ён быў вѐльмі велікі ведзьмàр, дак ягò заўжды лю̀дзі прасілі к сабі͡е, каб ён атрабìў, якòе трапля̀ецца ліхо. Ві͡едамо, ў гаспадàрцы трапля̀ецца не тòе, та другòе ліхо, ці якì прыпàдак. Бо кàжуць: хто мàе стàтак, та мўсіць мі͡ець і прыпàдак. Захвары͡ыэе хто, бегўць к ведзьмару̀, каб ён пашаптàў ці даў якòго зелья̀. Прападзè ў лі͡есі гòвядо, завўць ведзьмарà, каб ён засі͡ек ат зві͡ера. Зрòбіць вòраг у збу͡ожы кўклу, зноў ідўць к ведзьмару̀, частўюць да плàцяць яму̀, каб атрабіў да вы̀рваў тўю кўклу. А калì немà й ніякаго прыпàдку, дак і так гòдзяць ведзьмару̀, бо ві͡едамо, калì хòчэш на сві͡еце жыць, та й бу͡ога хвалì да й чòрта не гневì. От пачàў той бі͡едны чалаві͡ек падкòпваць картòплю да й капанўў калà самаі͡е межы̀. Чўе, штось зазвіні͡ело. Пракапàў ён там бу͡ольш да й дастàў аттўль гаршчòк грòшэй. Пачалì янѝ рàдзіцца, што тут рабіць, ці забрàць гэтые грòшы сабі͡е, ці аддàць гаспадару̀. Жу͡онка кàжэ, што гэто нàшы грòшы, бо мы іх знайшлì, а чалаві͡ек кàжэ, што мы капàем гаспадару̀ й вы̀капалі грòшы на ягò землì, дак гэтые грòшы трэ аддàць яму̀. Дòўго янѝ спрачàліса да й неўбàчылі, як ззàду падышòў той ведзьмàр да й кàжэ: гэто грòшы маі͡е, бо я іх заклѝў. Забрàў ён тые грòшы рàзам

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

з гаршкòм у хàту, палічы̀ў іх да й схавàў, а тым лю̀дзям даў ту͡ольки па адну͡ом рублю̀. Падзя̀кувалі яны̀ ведзьмарỳ, перанача-вàлі да й пашлі дàлей. Дòўго йшлі яны̀, от і захаці͡еласо ім і͡есці. А ведзьмàр быў скупы̀ чалаві͡ек і нічòго не даў ім на дарòгу. Алè бàчаць яны̀ пры дарòзе — карчòмка. Зайшлі яны̀ туды̀, ўзелі ў жы̀да хлі͡еба, аселèнца да агурку͡оў, пасілкавàліса да й даю̀ць той рубèль, што ведзьмàр вы̀дзеліў. Даў жыд ім рэшты. От яны̀ й пашлі дàлей. Адышлі яны̀ мо версту͡оў пъяць, мацнỳў той чалаві͡ек у кішэні, аж там лежы̀ць той сàмы рубèль. Ён дỳмаў, што гэто жу͡онка палажы̀ла ямỳ ў кішэню сву͡ой рубèль і пашлі яны̀ дàлей. Захòдзяць нàнач у другỳю кàрчму. Пасілкавàліса яны̀ трòхі нàнач, пашлі ў баку͡оўку да й паклàліса спаць. Тым чàсам хапіўса той ландàр, катòраму яны̀ далі хармазòнскі рубèль, аж немà грòшэй. Ён туды̀, ён сюды̀, ён пытàць сваю̀ балабòсту, ці не брàла янà, — немà тагò рубля̀, от бы скру͡ось зèмлю праваліўса. Дагадàўса пòгань, што гэто мàбыць хармазòнскіе грòшы да й узелà ягò хцівась, як-бы вы̀дурыць той рубèль сабі͡е. Запру͡ог гэто ён кабы̀лку, сі͡еў да й пусціўса даганя̀ць тых людзèй. Гòніць ён каня̀ку ўчвал, аж з таі͡е пі͡ена вàліць да пытàе ўсіх стры͡эчных, ці не йшлі тут ты̀е лю̀дзі. От ужэ пачалò світàць, як ён дабі͡ег да таі͡е карчмы̀, паг(g)ерг(g)етàў з жыдàмі да й чакàе, пакỳль устàнуць ты̀е бі͡едные лю̀дзі. Ужэ сòнейко падня̀лòсо высòко, як яны̀ прачỳхаліса. Устàлі яны̀, памы̀ліса да памаліліса бòгу, а пòтым сі͡елі сні͡едаць. Ўèцца калà іх той жыд, бàцэ мỳха калà мёду, та распытòўвае, аткỳль і куды̀ яны̀ йдуць, та што яны̀ рòбляць да й завè к сабі͡е, нібы̀то на рабòту. От пасні͡едалі яны̀ да й даю̀ць тамỳ ландарỳ рубèль за начлі͡ег і за сні͡еданьне. Не вытрымаў той жыд, схапіў рубèль да й кàжэ: прадàй ягò мні͡е, я табі͡е заплачỳ пъяць рублі. Здзівіўса той чалаві͡ек, наштò жы̀ду гэсты рубèль, а жу͡онка й шэпчэ: прадавàй, у менè èсьцека сву͡ой. І янà развязàла хỳстачку да й дастàла аттỳль сваі͡е грòшы. Дагадàўса тагды̀ чалаві͡ек, што ягò рубèль хармазòнскі да й кàжэ жы̀ду, што тані͡ей, як сто рублёў ён ягò не атдàсь. Круціўса, круціўса жыд, нарэшце заплаціў грòшы да й паі͡ехаў даму͡оў. —

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Рэхт, — думае ён, — фаран масонскі г(g)елт, — і як мае сілы тузае лейчынамі да бъе кабылку, гоніць барджжыэй, каб паказаць грошыкі сваёй балабосце. — Ё, ё! каб цебе воук зарыэзау, сто ты круціс хвастом, — крычыць жыд, а той рубель сашчаміу і трымае у жмені. От прышлосо яму іехаць па грэбельцы да цераз бруод. Пагнау ён кабылку, а тая як тузане, дак жыд чуць з драбінак не выскачыу да й упусціу рубель у бруод. А бруод, віедамо, глыбокі да такі гразкі, што й нуог не выцягці. Скінуу жыд боты да плюндры, падняу свуой лапсардак да й паліез у воду шукаць грошы. Месіу ён, месіу там гразь, аж ужэ цыцалі зрабіліса чорные ат руды, а грошэй нема. Лазіць ён па гразі да рве на сабіе пейсы да бораду. Але ось ідуць па кладках кала броду людзі, смеюцца з жыда да й пытаюць, што ён робіць у гразі. — Ой, маіе ві кахаленькіе, — адмауляе ён, — я згубіу тут гросікі, не простые гросікі, а хармазонскіе. — Які-ж ты дурны, — кажуць тые. — Калі гэто хармазонскіе грошы, та яны пашлі к таму, ат каго ты іх дастау, дак табіе й нема чаго шмараваць тут абразанец. — Чуе жыд, што людзі кажуць сэнс, нема чаго рабіць, узліез на драбінкі да й паіехау дамуоу, вымазаушыса бы чорт. Тым часам тые людзі купілі сабіе добраго каня да колы, сіелі сабіе бы паны на вуоз да й іездзяць ат вескі да уескі. Ці доуго, ці мало яны іездзілі, а грошы у іх усе растуць і растуць, нарэшце прыіехалі яны у тую веску, дзіе жыу той ведзьмар да й заіехалі к яму нанач. Пазнау іх ведзьмар да й пытае: скуль яны так разбагаціелі, а той чалавіек і расказау яму усе, як было. — Ты, — ка, — дау нам тагды хармазонскіе грошы. — А мніе тые грошы не пашлі у карысь. С тых часау звелосо у мене гауядо, захварыэла жуонка да й сам я хаджу бы ціень. Вазьміеце сабіе тые заклятые грошы, бо яны належаць вам. — Аддау ён гаршчочак з тымі грашыма, от яны й паіехалі к сабіе дамуоу да й пачалі добрэ жыць, туолькі тые грошы ужэ буольш к ім не варочаліса. Дак от якая была справа.

Болбат.

Чудзін.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

53. Багàты й бiедны.

Жылì ў аднуой вѐсцы пòмеж два мужыкì, адзін вѐльмі багàты, а другì такì бiедны, што немà за што й рук зацяць. Багàты жывѐ, як пан, усягò ў ягò мнуого, а грашуом і ліку немà. А ў бiеднаго ўсе ягò багàцье, гэто тòе лàпікло, што на ём да ў кішэні тры грòшы валяюцца, каб іх муожна былò патрасьцì, як пачуе пѐршы раз зсўзюлю. Куожын гуод, як зеўзюля закукуе, трàсе бiедны сваiе грòшыкі, алѐ яны не прыбаўляюцца. Надаiело яму насіць тые сьлімазàрные грòшы, алѐ не вiедае, каму іх аддàць, а кінуць на зѐмлю без дай рàцы, баіцца граху. От раз пашòў багàты ў цэркву. А тут ось калà крыжà седзіць слепы й прòсіць міластыньку. Не пазірàе багàты да йдзе міма, задрàўшы ўверх гòлаў. Ззàду, апусьціўшы гòлаву да дòлу йшòў бiедны. Убàчыў ён сьлепòго да й даў яму грòшык. І пачàў той малìцца да дзякуваць. Пачуў багàты й сòрам яму стàло, што бiедны ягò згураваў. Паліез ён у калітў, алѐ там немà друобных грòшэй.— Пазыч мніе друобных! — кàжэ ён бiеднаму. Той пазычыў яму апуошніiе двà грòшыкі. — Я табiе заўтрэ аддàм — бурккуў багàты да й пашòў у цэркву на сàмы перуод да й стаў там на пѐршум мiейсцы. Стаіць ён да хрысьціцца, бàццэ абганяе мухі. А бiедны, вiедамо, ў сваём дзіравуом лàпіклу, сарòмеецца людзей у цэркві, дак стаіць у кутòчку бабінца да шчыро мòліцца бòгу. На другì дзень пашòў бiедны к багàтаму па сваiе грòшы, а той кàжэ: немà друобных. Прыдзі заўтрэ. Пачасаў бiедны патыліцу да й пашòў да гаспòды. Ідзѐ ён калà старòiе дупленàтаiе ліпы, аж якурàт закукавàла пѐршы раз зеўзюля. Што тут рабіць, грòшэй немà. Схапіў ён ліпу да давàй яiе калаціць. Калòціць ён да й чуе, — штось там усерэдзіне забрашчàло. — Мàбыць парахня ўпàла, — думае ён. На другì дзень зноў пашòў ён к багàтаму па грòшы. Раскрычàўса той: — чагò ты лàзіш! Якiiе гэто грòшы! Ты ўжэ напрыкраў мніе, гарыэй гуоркаiе рэцькі. Кажу табiе, што немà друобных. Давàй рэшты з десяцì рублёў, ці пры-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

хо̀дзь цѐраз ты̀дзень. — Куды̀ там бі͡едпаму даць гэтулькі рэшты. У ягѐ мо зро̀ду не было̀ ту͡олькі гро̀шэй. От цѐраз ты̀дзень зно̀ў ідзѐ ён к бага̀таму. Ужэ не так яму̀ трэ ты͡іе гро̀шыкі, як хо̀чэцца напры̀крыць бага̀таму да ўпікну̀ць яму̀, што не аддаѐ до̀ўгу. Зірну̀ў бага̀ты, што бі͡едны падхо̀дзіць к ха̀це да й лёг на ла̀ву, нібы̀то памѐр, а ягѐ жу͡онка гры͡эе ў пѐчы чагу̀н вады̀ да гало̀сіць. Улі͡ез бі͡едны ў ха̀ту. — Чаго̀ ты прышо̀ў? — пыта̀е ягѐ жу͡онка багача̀. — Па сва͡іе гро̀шы, — ка̀жэ бі͡едны. — Ой, го̀лубе, прапа̀лі тва͡іе гро̀шы. Ба̀чыш, гаспада̀р памѐр. — Бу͡оская во̀ля, — ка̀жэ бі͡едны, — ўсі͡е пад бо̀гам хо̀дзім. Дак от я хаць ягѐ памы̀ю. — Схапі̀ў гэто ён з пѐчы чагу̀н гара̀ча͡іе вады̀, налі̀ў у но̀чвы да дава̀й кіпетко̀м мыць бага̀таго. Нема̀ чаго̀ рабі̀ць, маўчы̀ць той, зу̀бы сашчапі̀ўшы, хаць бі͡едны яму̀ кіпетко̀м чуць шку̀ру не зняў. От сышлі̀са лю̀дзі, палажы̀лі бага̀таго ў труну̀ да й вы̀неслі ў цэ̀ркаў. — Ну, — ка̀жэ бі͡едны, — скруці̀ў ты ма͡іе гро̀шы, дак я з таго̀ не прападу̀, алѐ ось яшчэ̀ паста̀ўлю таб͡іе сьві͡ечку да пачыта̀ю псалты̀р. — І заста̀ўса бі͡едны ў цэ̀ркві чыта̀ць псалты̀р. Нахапі̀ласа ну͡оч; пашлі̀ лю̀дзі да гаспо̀ды, ту͡олькі адзі̀н бі͡едны папраўля̀е сьві͡ечкі да чыта̀е. Ту͡олькі ось прышлі̀ ў цэ̀ркву зладзі͡еі да й пазіра̀юць, ці нема̀ чаго̀ ўкра̀сьці. Алѐ цэ̀рква бі͡едная, нічо̀го нема̀. От стая̀ць яны̀ да слу̀хаюць, як бі͡едны чыта̀е. Тым ча̀сам усхадзі̀ласа така̀я бу̀ра, што цэ̀рква аж трашчы̀ць. Стая̀лі, стая̀лі зладзі͡еі да й пачалі̀ спрача̀цца, хто з іх сьмелі͡ейшы. Адзі̀н ка̀жэ, што ён нікѐго й нічо̀го не баі̀цца. А другі̀ ка̀жэ, што непра̀ўда, мерцьвеца̀ й ён баі̀цца. — Я баю̀са мерцьвеца̀? — ка̀жэ той зло̀дзей, — нічу̀тачкі не баю̀са. От хо̀чэш, я сакі͡ераю адра̀зу атсеку̀ го̀лаў гэ̀стаму мерцьвецу̀. — Спало̀хаўса бі͡едны, не мажэ̀ чыта̀ць, так яму̀ го̀рло сьці̀сло, а бага̀ты як учу̀ў то̀е, дак го̀дзі прыкі̀двацца мерцьвецо̀м да як ўско̀чыць з труны̀ да пу̀сьціцца наўцекача̀, дак зладзі͡еі так спужа̀ліса, што немо̀гуць і дзверэ̀й знайці̀. Кі̀нулі яны̀ й сакі͡еры, кі̀нулі сва͡іе клу̀нкі да й суну̀лі вон з цэ̀ркві. Узвалі̀ў на себѐ бі͡едны зладзі͡ейськ͡іе клу̀нкі, ўзя̀ў сакі͡еру да й пашо̀ў да гаспо̀ды. Ідзѐ ён кала̀ та͡іе дуплена̀та͡іе лі̀пы, аж ба̀чыць, — я͡іе злама̀ла бу̀ра. І ўспамяну̀ў ён, што

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ў туо̑й ліпе штось брашчàло. От секанўў ён раз-другì гнілы пень, дак аттўль грòшы й пасыпаліса бы боб. Забрàў ён тые грòшы да й пачàў з тае̑ пары̀ дòбрэ жыць. А багàты так спалòхаўса зладзіе̑яў, што хварыэ̑ў мо цы̑элы гуо̑д. Насілу ягò бàбы атхадзілі. А пакўль ён хварыэ̑ў, гаспадàрка занепàла, й стаў ён саўсім біе̑дны, алè ніхтò тамў не давàў віе̑ры й не памагàў ямў.

Болбат.

Чудзін.

54. Слепы̀, глухì й безнòгі.

У вѐсцы былì слепы̀, глухì й безнòгі. Нахапіласа там вайнà. Варагì падышлì к вѐсцы. Зачўлі лю̀дзі, што нѐпрыяцель блізко, схапілі сваè дабрò да й пахавàліса: хто ў ліе̑с уцёк, а хто забіўса ў балòто ці на берагì ў лòзу, туо̑лькі засталіса ў вѐсцы слепы̀, глухì да безнòгі. Слепы̀ чўе, што стàтак стукацìць на вўліцы, калёсы грукацяць на масткуо̑х, лю̀дзі крычàць да кудыìсь бегўць, алè нічòго не бàчыць і невіе̑дае, куды̀ йці. Так і застàўса ён на ўѐсцы. Глухì седзіць сабіе̑ на загумѐчы ў халадкў пад ліпаю да плецè лàпці. Ён бàчыць, што ў пòлі паднàўса пыл да й дўмае, што гэто мàбыць крўціць віхар. І нечўў ён, што лю̀дзі пакінулі ўѐску. Безнòгі чўе, што нѐпрыяцель блізко, бàчыць што лю̀дзі ўцекàюць, хто куды̀, алè, віе̑дамо, без нуо̑г, седзіць бы пень да абганя̀еццa ат мух. Тым чàсам нахапіўса вòраг, пература̑ос усю̀ ўѐску, забрàў хліе̑б, забрàў усе, што былò, а ўѐску падпалі̀ў с усіх канцуо̑ў. Гары̀ць вѐска бы сухòе сіе̑но й немà камў ратавàць. Куды̀ ні сўнецца слепы̀, та ўсе наткнѐцца на вагòнь. Пачàў ён крычàць, звацъ людзѐй на ратўнак, алè ніхтò не памагàе, бо лю̀дзі кінулі ўѐску, а нѐпрыяцель, зрабіўшы сваè ліхòе дзіе̑ло, не мàе ўвàгі на слепòго, а хучы̑эй ідзè дàлей. Глухì муо̑г-бы памагцì слепòму, да не чўе, што той прòсіць ратўнку. Безнòгі чўе й бàчыць, што рòбіцца да не мажэ̀ хадзіць. От так і гінуць яны̀ куо̑жын сам па сабіе̑ й немà ім жуо̑днаго ратўнку. Ужэ̀ атусю̀ль печэ̀ агòнь слепòго й безнòгаго бы ў пѐчы, а ніхтò іх не чўе.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Алѐ ось пачàў безнòгі паўзьцì з агнѝ на загумѐчэ. Падпòўз ён к глухòму да й давàй ягò шчыпàць. Хапіўса глухì, зірнỳў на пòжар, алѐ не віеедае, што рабіць, не віеедае, чагò хòчэ безнòгі, й што ён мàе сказàць. Лỳпае вачыма глухì бы савà, а на пòжары ніемым гòласам прòсіць слепы — ратỳйце, хто ў бòга віеруе! Гарỳ! — Пачàў тут безнòгі пакàзваць глухòму на мìгі, што гìне чалавіек. Зразуміеў той мìгі, ўсхапіў безнòгаго сабіе на плѐчы да й папѐр у пòжар. Несѐ безнòгаго, а той ім кірỳе. Пашлì яны на гòлас памìж агнѝ да й вывелі аттỳль слепòго. От атышлìса яны ат пòжару, сіелі пад крыжòм да й не віедаюць, што рабіць, седзяць да плàчуць. Змòкла ўѐска, бы яіе хто языкòм злізàў, тỳолькі кỳрацца ўшỳлы да дагарàюць галавѐшкі. Немà ні ядỳ, ні начліегу; кругòм ні дамỳоўкі, ні людзѐй. Ї пачалì яны рàдзіцца, як тут дàлей жыць на свіеці. Ї надỳмаліса яны не пакідàць адзìн другòго да сàмаіе сьмѐрці, а рабіць усѐ, бы адзìн чалавіек. От пашòў глухì да й прыўѐз перадòк. Пераблỳталі яны віецем аглòблі, пасадзìлі на перадòк безнòгаго да й павезлì. Слепы й глухì везỳць перадòк, а безнòгі седзіць да кірỳе. Ї іедуць яны, як мàе быць: дзіе ѝма, там пакàжэ глухì, дзіе выюць галòдныя ваўкі, там перасцеражэ слепы, а дзіе трэ ўбàчыць стрыэчнаго да запытàць у ягò дарòгі, там памòжэ безнòгі. Прыцяглìса яны так у якỳюсь вѐску. Астàўса безнòгі на сваѐм вòзе, а слепы й глỳхі пашлì шукàць едỳ да вадỳ. Чỳе слепы, што бурчыць вадà, штỳрх ён глухòго, а той і ўбачыў крынìцу пад дзѐравам да й набрàў вадỳ. Бàчыць глухì, што калà аднаіе хàты штось летàе мнòго варỳон да сарỳок. Падышлì яны тудỳ, аж у кліеццы пòўно сыраў. Забрàлі яны сыры да й хаціелі вернỳцца назад, аж ось слепы чỳе, што ў хлеўчукỳ пішчàць да скрыгìчуць парасѝта. Штурханỳў ён глухòго, а той і ўбàчыў мо паўтỳзіна парасѝт. Так знайшлì яны хліеба, яѐц і другòіе жыўнасці да й засталìса там жыць, пòкі не вѐрнуцца лѝодзі. Нàнач заліезуць на гумніе ў салòму, каб не знайшòў ліхì чалавіек, ці не напàў драпіежны звіер, а ў дзень вылезуць на сòнейко да й грыэюцца. Віедамо, слепы не бàчыць, дак за тòе так дòбрэ чỳе, што к ім не падкрà-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

дзецца анѝ звіе͡р, анѝ злòдзей. Глухѝ не чу̀е, алѐ ён бàчыць, бы арòл і віе͡трыць нòсам, бы сабàка. От закміе͡цяць яны̀ якỳю нѐбудзь мітрэнг(g)у, схòпяць безнòгаго да й схавàюцца ў пòграб. Раз ѝкась і там знайшлì іх якìесь абдзірàнцы да й хаціе͡лі пабìць, алѐ безнòгі як пачàў з ìмі жỳпіць, пачàў ім давòдзіць, што з тагò не бỳдзе ім жу͡одная͡е карысці, дак і тые не зачапілі каліе͡к. Так пражылі яны̀ да тых чàсаў, пакỳль скòнчыласа вайнà, й лю̀дзі вернỳліса назàд у сваі͡е даму͡оўкі. Знайшлì іх лю̀дзі да й дзівìліса, як гэто яны̀ маглì, бỳдучы каліе͡камі, пераж ы̀ць такì ліхì час. — Нам усѐ былò ніштò, — аткàзваюць каліе͡кі, — бо мы былì ў згòдзе, бы адзìн чалавіе͡к.

Болбат.

Чудзін.

55. Калі-б старшынòю.

Былò тòе ў Пілìпаўку пѐрад сàмымі калядàмі. Як вòдзіцца, пу͡оп іе͡здзіў па малìтве. От зайшòў ён у вадну̀ хàту, паблагатàў трòхі да й сіе͡ў на лàву калà сталà, каб крыху пагры͡эцца, бо на дварỳ быў велìкі траскỳн і пу͡оп такì дòбрэ прамёрз. У хàці апры̀ч жанчы̀ны да падшпàркаў-дзецѐй нікого не былò. Бàчыць жанчы̀на, што пу͡оп разсіе͡ўса калà сталà, немà чаго рабìць, пачалà шукаць пачòсткі. Тым чàсам пу͡оп седзìць да круцìць галавòю: пазірàе ён, ці немà ў хàці чагò нѐбудзь здàтнаго, каб узя̀ць сабі͡е. Алѐ немà нічòго, бо трàпілаcа хàта вѐльмі біе͡дная. Цікавàў, цікавàў пу͡оп, аж яму цёмно ў вачу̀ стàло, — немà нічòго да й ту͡олькі. Алѐ ось нарэ̀шце закміе͡ў дау̀гагры̀вы штòсь за бàлькаю. — Што там тырчы̀ць? — шытàе ён у жанчы̀ны.

— Нічòго, бàцюшко, а мòо хлапчукà якіе шмàты.

Саскòчыў пу͡оп з лавы да бегòм туды, вы̀хваціў з-за бàлькі жмак чòрнаго папіе͡ру, што ягò прусàкі ўчарнілі, да й давàй разглядàць. Кусòчкі папіе͡ру былі спісаны ў мітуські і так замàзаны, што пу͡оп насілу трòхі разабрàў тòе пісàньне.

— Хто гэто у вас так пішэ? — пытàе ён у жанчы̀ны.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Гэто мабыць хлапчу̀к, што хо̀дзіць ў шко̀лу, — атка̀звае та̀я.

Тым ча̀сам ба̀чаць мужчы̀ны, што пуоп штось замару̀дзіўса ў ха̀ці, от пачалі̀ й яны̀ туды̀ зьбіра̀цца. Перш уліез у ха̀ту ста̀раста, за ста̀растаю пасу̀нулі бра̀ччвікі, нарэ̀шце папха̀ўса й гаспада̀р. А пуоп тым ча̀сам усѐ пазіра̀е на тые папіеры да ўсе мыркае сабіе пад нуос: ці ба̀чыш яго... эгэ... ото-ж... Нарэ̀шце закміеў ён гаспадара̀ да й ка̀жэ: до̀брэ, до̀брэ пішэ твуой хлапчу̀к. Учы̀, учы̀ яго̀ да̀лей, адуку̀й, та ён папо̀м бу̀дзе. Пачу̀лі то̀е гаспада̀р і гаспады̀ня да бы змо̀віўшыса ў вадзін го̀лас і атка̀зваюць: эй, ба̀цюшко, пуоп..... От калі̀-б старшыно̀ю! Прыкусіў пуоп язы̀к да й сунуў з ха̀ты, бы яго̀ саба̀камі чва̀ляць. А мужчы̀ны крыча̀ць наў̆здагуон: пра̀ўда, пра̀ўда, ба̀цюшко, што пуоп! От каб старшыно̀ю!

Болбат.

Чудзін.

56. Шчаслі̀вы пасту̀х.

Быў адзі̀н вѐльмі разу̀мны пан. Маў ён велі̀кі маёнтак, харо̀шую па̀ню да сьвіет уселя̀кага дабра̀. Алѐ як ні до̀брэ яму̀ жыло̀со, дак усе хаціеласо яшчэ̀ ліепшаіе жыткі. Кі̀нуў ён маёнтак і пашо̀ў у сьвіет, пыта̀ць людзѐй, ці не пака̀жуць яму̀ шчасьлі̀ваго чалавіека. До̀ўго хадзіў ён, мо абышо̀ў тры ца̀рства, алѐ нідзіе не мажэ̀ тра̀піць тако̀го чалавіека, цаб ён быў усім давуолан і нічо̀го буольш не хаціеў. Сустрака̀ў ён бага̀тых людзѐй, алѐ яны̀ хаціелі яшчэ̀ буольш разбагаціець да так клапаціліса, што былі̀ гарыэй нешча̀сныіе, чым апуошніе беднякі̀. Той бага̀т, да хво̀ры; той здаруоў і бага̀т, алѐ пешча̀сны за̀тым, што на яго̀ ніхто̀ не зваро̀чвае ўва̀гі. Той сла̀вен, да лю̀дзі яго̀ не каха̀юць; таго̀ каха̀юць, да не бая̀цца. Дак от так, куды̀ ён ні пры̀дзе, на каго̀ ні зірнѐ, куожын ма̀е сваю̀ пля̀гу, што яго̀ грызѐ. От ішо̀ў ён раз праз ліес да й натра̀піў там старо̀го пастуха̀. Хо̀дзіць гаўя̀до да шчы̀пле траву̀, а пасту̀х седзі̀ць сабіе на пеньку̀ да гра̀е на ду̀даццы да так го̀жэ, што аж ліес разлега̀ецца. Падышо̀ў

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

к яму̀ той пан да й пыта̀е, ці давуо̂лан ён сваѐю жы̀ткаю. — А то-ж яко̀го ражна̀ мніе̂ трэ? Алѐ-ж давуо̂лан, — атка̀звае шчаслі̀вы пасту̀х. — Вазьмі̀ менѐ к сабіе̂, — про̀сіцца пан. — Застава̀йса, калі̀ хо̀чэш. Мніе̂ ўсе руо̂ўно, ці ты бу̀дзеш, ці ніе̂. — Здзіві̀ўса пан і паду̀маў, што пѐршаго страка̀е тако̀го чалавіе̂ка, като̀раму ўсе руо̂ўно. От заста̀ўса пан у таго̀ шчаслі̀ваго пастуха̀ падпа̀сычам. Пасу̀ць яны̀ го̀вядо да размаўля̀юць праміж сабо̀ю. Пан распыто̀ўвае, а пасту̀х вучыць яго̀ вуму̀-ро̀зуму. Расказа̀ў тут пан пастуху̀, чаго̀ ён пашо̀ў у сьвіе̂т, як ён до̀ўго хадзі̀ў і што трапля̀ў. Вы̀слухаў стары̀ да й ка̀жэ: — неўміе̂юць лю̀дзі жыць на сьвіе̂ці, от заты̀м яны̀ й нешча̀сные. Што лю̀дзі лі̀чаць шча̀сьцем? Здаруо̂ўе, бага̀цье, сла̀ву, по̀часьці, або̀ ўлась? Ці-ж гэто шча̀сьце? Зірні̀, я ўвесь дзень гуля̀ю ў буо̂жум ра̀ю, хто-ж мажэ̀ быць здаравіе̂й ат менѐ? На мніе̂ ўсе маѐ бага̀цье й нічо̀го буо̂льш мніе̂ не трэ й ніхто̀ ў менѐ гэтаго не атберэ̀. Я са̀мы бага̀ты чалавіе̂к на сьвіе̂ці. Ба̀чыш, яка̀я ма̀е быць мніе̂ сла̀ва ат майго̀ гаўя̀да, бо ні адно̀ яно̀ са мно̀ю не зраўня̀ецца. А хто ма̀е таку̀ю сла̀ву? Паглядзі̀, як менѐ шапу̀е муо̂й лыско й яку̀ю ўла̀дзу я тут ма̀ю над гаўя̀дам? А ці-ж не ўсе руо̂ўно, хто цебѐ слу̀хае, ці го̀вядо, ці лю̀дзі? Пры гэтум лёг сабіе̂ шчаслі̀вы пасту̀х на му̀раву да й зайгра̀ў на сваёй ду̀дацці. До̀ўго йгра̀ў ён, а пан усѐ слу̀хаў да ўсе ду̀маў. Зірну̀ў ён на пастуха̀ й уба̀чыў у яго̀ ў вачу̀ тако̀е шча̀сьце, таку̀ю ра̀дась, чаго̀ ён не ба̀чыў ні ў ка̀го. Ї пазна̀ў ён, што туо̂лькі той шчасьлі̀вы чалавіе̂к, хто давуо̂лан тым, што ён е й што ма̀е. Падзя̀куваў ён шчасьлі̀ваму пастуху̀ за наву̀ку да й верну̀ўса дамуо̂ў. От з таіе̂ пары̀ мо й да тых час ён шчасьлі̀во жывѐ на сьвіе̂ці да ра̀дуецца, пазіра̀ючы на бо̀жы сьвіе̂т.

Стары дзіе̂д Савіцкі.

Бохаво.

57. Ціка̀вая жуо̂нка.

Не ўсе руо̂ўно, дзіе̂-б то̀е ні было̀, туо̂лькі ось была̀ ў аднаго̀ чалавіе̂ка вѐльмі ціка̀вая жуо̂нка. Усѐ то ёй раскажы̀, ўсе ёй па-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

кажы̀, от такая цікàвая, такàя цікàвая, бы ўсіе жанкі. А, віе-дамо, ўсе казàць, та варагуоў нажывàць; алè нічòго не парà-дзіш, трэ ўсе расказàць жуонцы, бо калі янà чагò не віедае, та аж шкура на ёй лопаецца, хòдзіць бы непрытуомная, ці хварыэе, што не наберэсса ні варажбітуоў, ні дахтуруоў. А віедамо, скажы̀ жуонцы, та янà куміе, кумà сусіедцы, сусіедка дзя̀нне, а там усіе як у бубен бъюць. От раз штось зрабіласо тамỳ чалавіеку. Быў, бàцэ, саусім здаруоў, а назàўтрэ й дух вон. Памёр чалавіек з дòбраго рàю да й туолькі. Плàчэ жòнка, аж разлівàецца ат слёз, не віедае, што рабіць. Збіегліса бàбы, сышліса лю̀дзі, па-гаманілі, да нічòго не парàдзіш, трэ пакуойніка хавàць. От па-мыли ягò, адзіелі ў чыстае плàцце, палажылі на лàву да й пачалі рабіць дамавіну. Лежыць той чалавіек дзень, два, тры бы жывы̀. Перш баяліса лю̀дзі ягò хавàць, дỳмалі, што ён туолькі абмёр, алè як тут дзержàць мерцьвецà ў хàці? На чацьвòрты дзень па-звàлі папà, каб ён пахавàў. Пачàў пуоп сьпевàць, пачалі бàбы плàкаць. Ну, зрабілі ўсе, як трэ да й налажылі на дамавіну віеко. Туолькі ось рàптам той мерцьвèц прахапіўса, скінуў віеко да й сіеў у дамавіне. — Ото-ж я муоцно спаў, — кàжэ ён. А лю̀дзі спужàліса да ўсіе ў рассыпнỳю. Сам пуоп з хàты вы̀скачыў да давàй крычàць, бàцэ ягò рыэжуць. Алè ось памалèньку аглè-дзеліса лю̀дзі да й вернỳліса ў хàту. Устàў чалавіек да давàй шу-кàць яды. Віедамо, на памінкі ўжэ ўсе былò прыгатòўлено, от ён выкінуў дамавіну вон, пазвàў папà да дòбрых людзèй і сіелі яны за стуол балявàць. Выпілі па аднуой-другуой чàрцы га-рыэлкі, закусілі салòдкімі патàпцамі да канунòм, разгаварыліса да й пачалі распытòўваць тагò чалавіека, што ён бàчыў на туом сьвіеці. Віедамо, куожнаму цікàво знаць, што рòбіцца там, аткỳль ніхтò не варòчаецца. Раскàзвае той чалавіек усè, што там бàчыў, туолькі кàжэ, што аднагò не мажэ сказàць, бо ямỳ веліелі не ка-зàць, калі-ж ён не паслỳхае да скàжэ, та тагды̀-ж памрэ. Па-слỳхалі тагò лю̀дзі да й кінулі дапытòўвацца, віедаюць, што ні-кòму не хòчэцца памірàць.

От разышліса лю̀дзі да й узяліса куожын за сваè дзіело. Алè

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

от прыстàла к тамỳ чалавіеку жуонка бы смалà, скажы да скажы ўсе, што там бàчыў і чуў на туом сьвіеці. Адмаўляецца чалавіек, кàжэ, што памрэ, як скàжэ. Куды там, цікàвая жуонка й слỳхаць не хòчэ, сьлепіцаю ліезе ў вòчы да кàжэ, што ён яіе не любіць, што кахàе другỳю, якỳю нèбудзь патаскỳшку, калì не хòчэ ёй сказàць нàват аднагò слаўцà. — Ты мнуого не гавары, — кàжэ янà, — а туолькі намекнì, я самà дагадàюса. — Круціўса, круціўса той чалавіек, алè ніяк не мажэ атмаўчàцца, бо, віедамо, як бàба прыстàне, та ўжэ ты ніяк ат яіе не аткаснèсса, ні крыжòм, ні кадзілам, гарыэй, як ат чòрта. Што тут рабіць? Не сказàць бàбе, та не бỳдзе жыткі, бо янà пачнè піліць да іесьці, бы йржà жаліезо. Сказàць, та трэ папрашчàцца з жыткаю, а тут так на сьвіеці гòжэ, так рàдасно сьвіеціць сòнейко, што хòчэцца хаць крыхỳ яшчэ пажыць, пакрасавàцца. І давàй ён прасіць жуонку, каб янà не прыставàла, каб далà ямỳ яшчэ хаць трòхі пажыць на сьвіеці. Замòўкла янà мо на дзень, ці два, хòдзіць бы цёмная хмàра, а там зноў пачалà прыставàць да так, што хаць жывы ліезь у зèмлю. Не выцерпіеў ён на рэшце да й кàжэ: — ну, давàй мніе на сьмèрць чыстае плàцце, та ўжэ скажỳ. Прынеслà янà плàцце, ўзлажыў ён ягò да й лёг на лàву памірàць. А жуонка стаіць над ім крỳкам, вòчы блішчàць, бы спуонкі, стаіць і аж дрыжыць, такàя яіе берэ цікàвасьць. Туолькі ён хаціеў раскрыць рот і сказàць ёй, што ягò наўчылі на туом сьвіеці разуміець мòву жыўѐла, як тут якрàс піевень і кàжэ: — «Я сіемь жуон мàю, да ўсіх сунімàю, а ты ёй патварàеш да памірàеш». — Пачуў ён тòе, ўсхапіуса з лàвы да як пачàў яіе цягàць зà касы да пачàў лупіць па чуом папàло, дак гòдзі янà з тых чàсаў ліезці гаспадарỳ ў вòчы. Заклялàса янà да забажыласа, што да сьмèрці не бỳдзе тагò пытàць. Алè не віедамо, ці выцерпела янà, ці ніе.[1]

Стары дзіед Савіцкі.

Бохаво.

[1] Адменьнік у В. Н. Дабровольского. Смоленскій Этногр. Сборнік, ч. I, Спб., 1891, стр. 354—355.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

58. Пъя̀тніца.

Гэто цепѐр ста̀лі лю̀дзі хітрые̑ да вѐльмі разу̀мные̑. Усѐ яны̀ зна̀юць, на ву̑ошто янò й зачы̀м гэ, а не йнак. А дау̀ні̑ей лю̀дзі былì прòстые̑, працава̀лі да гарава̀лі, дак бу̑ог ім усѐ дава̀у̑. Ра̀дасно яны̀ сустрака̀лі сòнейко, як янò падыма̀ецца з-за землì да аглядàе, ці у̑се на сваё̀м мі̑ейсцы, ці накòрмлено да расòю напòяно, ці сагры̑это да намы̀то. Ра̀дасно бра̀ліса за дзі̑ело, шчы̀ро працава̀лі, як бу̑ог велі̑еу̑ на у̑сіх дòлю да сабі̑е на кары̀сь. Ра̀дасно-ж і праваджа̀лі я̀снае сòнейко на супаку̑ой да й са̀мі, пасілкава̀у̑шыса, чым бу̑ог пасла̀у̑, лажы̀ліса аддыха̀ць. — Дзя̀куваць бòгу, нарабі̀у̑са за дзенё̀чак, насы̀ціу̑са, а цепѐр і аддыха̀ю. Нічòго мні̑е бу̑ольш не трэ. — Гэ каза̀лі дау̀ні̑ей лю̀дзі, дак і дòбрэ жылòсо ім на сьві̑еці. А як пашлì вѐльмі разу̀мные̑ да пачалì вымышля̀ць, пачалì й бòга вучы̀ць, дак наста̀ла така̀я жы̀тка, што хаць ты жыу̑цòм лі̑езь у зѐмлю, абò засілі̀са да прада̀й чòрту ду̀шу. Ку̑олькі ты ні працу̀й, ку̑олькі не стара̀йса, як ні збіра̀й дабрò, а на ягò чорт мі̑ех шые. Заихнѐш адну̀ дзі̀рку, а тут табі̑е дзѐсяць, — усіх не ната̀ліш, бо-ж ка̀жуць, што адзі̀н рабу̑оч, да не бага̀т. От была̀ адна̀ маладзі̀ца. Яна̀ не слу̀хала стары̀х людзѐй, бо, ві̑едамо, маладàя, дак вѐльмі разу̀мная. Яна̀ й свя̀та не сьвяткава̀ла, й пъя̀тніцы не шанава̀ла. Жанкì быва̀ло, яшчэ̀ сòнейко не схава̀ецца за лі̑есам, а у̑жэ злòжаць сваі̑е ручàйкі да верацё̀ны, вы̀несуць у камòру абò на гòру кудзѐлі да пра̀сніцы да й сустрака̀юць недзі̑ельку, абò другòе сьвя̀то. А яна̀ прадзѐ мо да пòу̑начы пѐрад сьвя̀там і з пòу̑начы па сьвя̀ту, а у̑ пъя̀тніцу у̑се рòбіць, бы у̑ бу̀дзень. Быу̑ раз у чацьвѐр святы̀ Мікòла. Усхапі̀ласа яна̀ на зау̀трэ у̑ пъя̀тніцу з пѐршымі пеу̑ня̀мі, сі̑ела на пра̀сніцу, схапіла верацё̀но да дава̀й пасука̀ць, дава̀й круціць, так што тòе аж гудзѐ. Алѐ ось чу̀е яна̀, што хтось бра̀знуу̑ у вакнò. Зірну̀ла яна̀ туды̀, аж пад вакнòм стаі̀ць старэ̀нькая ба̀ба да така̀я старэ̀нькая, што чуць-чуць на нага̀х трыма̀ецца. І пыта̀е яна̀ ту̀ю маладзі̀цу, чаму̀ яна̀ так ра̀но прадзѐ да яшчэ̀

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ў святую пъятніцу. Змешàласа маладзіца, не вїедае, што казàць.— Гэто-ж сьвято, — кàжэ старэнькая бàба. — Эй, бàбко, грыэх ленавàцца, а рабіць не грыэх, — кàжэ маладзіца. — А хтòж табїе гэто сказàў? — Ніхтò. Я самà вїедаю. — Дак наш табїе ось гэстыїе верацёны, а на іх напрадзі ты мнїе сягòнячы да вèчара. Я зайдў. — Сўнула бàба праз вакнò мо з кòпу верацён, а самà й знікла, от бы ў зèмлю праваліласа. Спужàласа маладзіца, не вїедае, што рабіць. Зірнўла на тыїе верацёны да й дўмае, што трэ цыэлы тыдзень, каб іх напрàсьці. Не паслўхаць-жэ бàбу стрàшно, бо бачнò, што гэсто не прòстая бàба, а ці святàя, ці ліхàя. А, вїедамо, людзі кàжуць, што бòга хвалі да й чòрта не гневі, бо як прыдзèцца, та атрыгнèцца. Седзіць маладзіца, чуць не плàчэ. Алè ось і ўхòдзіць у хàту сівенькі-прасівенькі дзедòк. Зірнўла на ягò маладзіца да й пачалà ўспамінàць, дзїе-б гэто янà бàчыла ягò. Яїе не здзівіло тòе, што дзедòк не брàскаў ні ў вакнò, ні ў дзвèры, а яны былі на засўоўцы да й завàлены калòм. — Дзень дòбры! — кàжэ дзедòк. — Здарòвенек быў! — Памагàй бўог! — Дзякуў за дòбрае слòво. Садзіса да супачынь. — Дзякуй! — Не садзіцца дзедòк да ўсе пазірàе на тыїе верацёны, а пòтым і пытàе, — на вўошто табїе, дзїеткі, так багàцько верацён? — Гэто не маїе, дзїеду. — І расказàла тут маладзіца, як пèрад ім падхòдзіла к вакнў якàясь бàбка й што янà застàвіла гэстыїе верацёны да велїела ў вадзін дзень усїе напрàсьці. — Што мнїе рабіць, дзїеду з гэстаю бàбаю? — пытàе нарэшце маладзіца. — А ты паслўхай менè. Наві з клубкà на гэстыїе верацёны па крысїе прàжы да скажы, што напрàла. — Сказàў тòе сівенькі дзедòк да й знік. Тўолькі тагды ўспòмніла маладзіца, што ўчòрэ бàчыла ягò ў цэркві, як пèрад ягò вòбразам стàвіла сьвїечку. — Дзякуй-жэ табїе, сьвяты Мікòла Чудатвўорац, што наўчыў менè, як выбавіцца з беды, — памаліласа маладзіца да й абецàла яшчэ паставіць Мікòле сьвїечку. От наматàла янà з клубкà гатòваїе прàжы на ўсїе верацёны да й чакàе таїе бàбы. Тўолькі сьцемнїело, як ось і брàскае янà ў вакнò. Атчыніла маладзіца вакнò, а бàба й пытàе: — А што, напрàла маїе вера-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

цёны? — Напрàла, — кàжэ маладзіца да й падаè тыіе ручàйкі. — Ну, шчàсьце твàе, што ты дагадàласа, як зрабіць, а тоб я скруціла цебè, як верòўку. — За што-ж менè карàць? — пытàе маладзіца. — За тòе, што ты сьвятòіе пъятніцы не паважàеш да яшчэ дòсьветкі прадзèш. — Зьнікла тàя бàба, зьнікли й ручàйкі, а маладзіца стаіць калà акнà й не віедае, ці гэто былò сапрàўды, ці ў васьніе. Дачакàла янà сьвятòіе недзіелькі, выпаліла рàненько ў пèчы да згатòвіла абіед, а пòтым хучыэй пабіегла ў цэркву да й паставіла Мікòле тòўстую сьвіечку. Выхòдзіць янà з цэркві, абернýласа, перахрысьціласа да й зірнýла яшчэ разòк на св. Мікалàя. А ён як убàчыў яіе, дак ківаè галавòю да трасè сіваю барадòю. — Ну, — дýмае, — ўблагатварыла сьвятòго Мікалàя, дак і пъятніцы не баюса. — Расказàла янà аб туом жанкàм, от з тых часаў людзі ў пъятніцу не прадýць і не ўюць, каб не прагнеўіць сьвятòіе пъятніцы.[1]

Стары дзіед Савіцкі.

Бохаво.

59. Недапàд.

Што-ж мніе вам расказàць? От здаèцца, я ўжэ ўсе расказàў, што знàю. А мо што й забыў. Віедамо, жыву на сьвіеці мо ўжэ вòсьмы дзісятак. Дак от хібàш раскажý вам гэтакае-ж здарэне з адным кýхарам, як ён немуог прыдýмаць аднаіе патрàвы. Туолькі гэто не кàзка, алè саўсім прàўда. А як устарыэе, та мо бýдзе й кàзка. Бо тòе, што я кòлісь бàчыў і чуў, дак вам здаèцца бàйкаю, аднò-ж янò былò прàўдаю. Бо даўніей былі не такіе людзі, як цепèр, да й сьвіет быў іньшы. Бывàляшніе паны не нàшым руоўня: такіе пýшныіе да груозныіе, што ты й не падступіса, бàццэ наравістая кабыла. Каб іх чàсам не палічылі людзьмі, дак яны не гаварылі, як буог даў, як гавòраць усіе людзі, а гугнявілі, шапелявілі, балбатàлі ці заікàліса да цягнýлі

[1] Адменьнік. П. В. Шейнъ. Бѣлорусскія народныя пѣсни. СПб., 1874, стр. 425.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ку͡ожнае сло̀во ці выпушча̀лі праз зу̀бы да лічы̀лі, што яно̀ даражы͡эй зо̀лата. Ка̀жуць жэ, што па̀ньскае сло̀во гры͡эе. Яно̀ як нагры͡эе, та й го̀лы ў мару͡оз пабежы̀ш на ўцекача̀. А пры̀дзе ба̀ло па̀ну ў го̀лаў яко̀е-нѐбудзь лі̀хо, дак дава̀й яму̀, хаць радзі̀, дастава̀й і тагды̀, хаць-бы на надву͡оръі з нѐба сы̀паласо камі͡еньне. Эгэ-ж, упа̀ртыі͡е да пу̀шныі͡е былі̀ даўні͡ей паны̀. Дак от яшчэ̀ пры па̀ньшчыві͡е жыў такі̀ пан, што не знахо̀дзіў сабі͡е ру͡оўні й хаці͡еў, каб у яго̀ ўсе было̀ не па-лю̀цку. Апавесьціў ён па ўсёй акру̀зе, што дась мну͡ого гро̀шэй тако̀му ку̀хару, като̀ры цы͡элы гу͡од ку͡ожын дзѐнь бу̀дзе гато̀віць яму̀ но̀вую стра̀ву. Алѐ, хто во̀зьмецца, да не дацягне да тэ̀рміну, ці не прыду̀мае но̀ваі͡е стра̀вы, таму̀ пан нічо̀го не запла̀ціць, а ту͡олькі дась сто бізуну͡оў. Ніхто̀ не бэрэцца, не хо̀чэ й гро̀шэй, абы̀ не закаштава̀ць бізуну͡оў. А ў таго̀ па̀на быў такі̀ хурма̀н, што ба̀ло як смалянѐ, дак аж па̀ра пу͡ойдзе. Алѐ жыў там адзін пъяньчу̀шка. Ён хаць піў, як у халя̀ву ліў, алѐ да ўсяго̀ быў вѐльмі здатны да такі̀ штука̀р, так ён вычвара̀ў, што ніхто̀ таго̀ не зро̀біць. Ба̀ло нема̀ за што вы̀піць, бо ўжэ апу͡ошняе лайно̀ прапіў, а напаві͡ер жыды̀ не даюць, дак ён і пачнѐ рабі̀ць уселя̀кіі͡е шту̀кі, пачнѐ тако̀е вычвара̀ць, што сьмі͡ех і до̀брым лю̀дзям каза̀ць, дак надзі̀вяцца лю̀дзі да й даду̀ць яму̀ кватэру або̀ дзьві͡е, а натра̀піць на яко̀го дурно̀го па̀на, дак той сыпанѐ й жмѐню гро̀шэй. От дачу̀ўса той пъяньчу̀шка да й пашо̀ў найма̀цца к таму̀ па̀ну за ку̀хара. Наня̀ўса ён да й пача̀ў ку͡ожын дзень прыдумо̀ўваць усе но̀вую да но̀вую стра̀ву. Прыду̀мае да згато̀віць яку̀ю-нѐбудзь но̀вую патра̀ўку да й закарбу̀е сабі͡е на кіѐчку. Ї чаго̀ ту͡олькі ён не гато̀віў, які̀м ту͡олькі бру̀дам не кармі̀ў пану͡оў. Алѐ, ві͡едамо, паны̀ не саба̀кі — ўсе зьедзя̀ць да яшчэ̀ аблі̀жуцца. Рабі̀ў ён каўба̀сы з давальдрэку, вужо̀вую яѐчню, верашча̀ку з мышы̀ных хвасту͡оў, каша̀чых вантру͡об да жа̀бячых клю̀шаняк; пъёк печэ̀ню з пацуку͡оў да чарапа̀х, гато̀віў галярэту з жабуры͡эня, або̀ з шаршнѐваі͡е чарвы̀, рабі̀ў чарвяко̀вае ма̀сло да вашы̀ную за̀таўку. Ку͡ожын дзень усе но̀вае да но̀вае гато̀віць ён па̀ну, а той і͡есь да ту͡олькі хва̀ліць. Як ужэ вѐльмі хі̀трае прыду̀мае ку̀хар,

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

дак пан атусю̀ль назьбіра̀е гасьцѐй, часту̀е ён іх да хва̀ліца, што такі̀х патра̀вак нідзі͡е нема̀, апры̀ч у ягò. От так выдумо̀ўваў, выдумо̀ўваў той пъяньчу̀шка да ўсе карбава̀ў кій, нарэшце ўжэ нічо̀го не мажэ̀ прыду̀маць. От узя̀ў ён кій да й пача̀ў лічы̀ць зару̀бкі, налічы̀ў трысто, ко̀пу й пъяць. — Ну, — ду̀мае, — от і гу͡од. — Хаці͡еў ён ужэ йці к па̀ну па пѐньсью да яшчэ̀ запыта̀ў людзѐй, ці ўжэ гу͡од, ці ні͡е. А ты̀і͡е ка̀жуць, што на ягò нешча̀сьцье вы̀даўса прыбышо̀вы гу͡од. Абла̀яў пъяньчу̀шка Касья̀на, што той яму̀ зрабі̀ў здра̀ду, алѐ нема̀ чагò рабі̀ць, трэ цягці̀ да канца̀. Алѐ ку͡олькі ён ні ду̀маў, як ні круці̀ў галаво̀ю, от хаць ты што, — нічо̀го не прыду̀мае. А тут к па̀ну атусю̀ль назъезджа̀ласо пану͡оў, па̀няў да панѐнак бы гно̀ю, хаць ты гаць гаці̀. Паха̀джаюць яны̀ да чака̀юць, што такѐ сма̀чнае прыду̀мае штука̀р-ку̀хар. Бі͡егаў, бі͡егаў пъяньчу̀шка з палумі̀скам у руцы͡э, нічо̀го не прыду̀мае да й пабі͡ег ён яшчэ̀ раз у по̀граб, ці нема̀ там чагò такòго, каб зь ягò згато̀віць нòвую патра̀ўку, ці яку̀ю нѐбуць стра̀ву. А тут ужэ̀ й со̀нейко пачало̀ падыма̀цца ў го̀ру, пара̀ гато̀віць сьні͡едане. Вы̀бег ён на дзедзі̀нец. От ужэ пасту̀х сабра̀ўса выганя̀ць на па̀шу гаўя̀до. Падняло̀со то̀е, пацяга̀ецца да угно̀йвае дву͡ор. Зірну̀ў пъяньчу̀шка, штось прыду̀маў да й падста̀віў каро̀ве палумі̀сак. — Не ўпа̀ло далу͡оў, — сказа̀ў ён сам сабі͡е, — дак гэто бу̀дзе недапа̀д. Навару̀ да насма̀жу сяго̀днячы пану͡ом так сма̀чно, што яны̀ па̀лцы пааблі̀зваюць. — Пабі͡ег ён барджджы͡эй гато̀віць недапа̀д — ту̀ю апу͡ошнюю стра̀ву. От згато̀віў ён. Пача̀ў лѐкай да пакаѐўкі захаджа̀цца кала̀ стала̀. Пыта̀е лѐкай, яка̀я ў ягò чарго̀вая патра̀ва. — Недапа̀д, — адмаўля̀е ку̀хар, — гэто такі̀ смак, што мо ты яшчэ̀ ніко̀лі такòго не каштава̀ў. Скажы̀ пану͡ом, каб яны̀, як бу̀дуць і͡есьці, трыма̀лі му͡оцно языкі̀, а то праглыну̀ць. — Прышла̀ пара̀, пачалі̀ паны̀ абі͡едаць, алѐ не ядзя̀ць да ўсе чака̀юць, паку̀ль прынесу̀ць ту̀ю сма̀чную чарго̀вую патра̀ву. Нарэшце лѐкай прынѐс недапа̀д. Накі̀нуліса на ягò паны̀, бы саба̀кі на ко̀сьці, або̀ сьві̀ньне на мякі̀ну. Ло̀паюць яны̀ да мнуць, аж за вуша̀мі трашчы̀ць. — Ну, — ка̀жуць, — яшчэ̀ такòго сма̀чнаго ніко̀лі не было̀. — Чмы̀хае пан

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ат гònару да ту͡олькі нòсам вòдзiць, бы крутагалу͡оў. — А пазвàць сюды̀ кỳхара! — кàжэ ён. Усỳнуўса пъяньчỳшка да й стаў пры парòзе бы̀ слуп, чакòе, што скàжэ пан. — З чагò ты згатòвiў гэты недапàд? — пытàе пан, — скажы̀, та дам гасьцiнца тры дукàты. — Нему͡ожне, панòчку, — кàжэ кỳхар, — бо сапсуѐцца. Нему͡ожне казàць, пакỳль пан не разьлiчыць менѐ, бо ўжэ мнi͡е кòньчыўса тэ̀рмiн. — От пан заплацiў пъяньчỳшцы як абецàў мну͡ого грòшэй да яшчэ̀ даў гасьцiнца тры дукàты. Насы̀палi тут ямỳ яшчэ̀ пàньськii͡е гòсьцi грòшэй пòўну шàпку, от ту͡олькi тагды̀ сказàў ён пàну да тут i ўсiм гасьцям, з чагò згатòвiў недапàд, а сам i сунỳў наўцекачà да прòсто ў кàрчму. Пачỳлi паны̀, — да пачнѐ iх нỳдзiць да вярнỳць з душы̀, дак насiлу вы̀чухалiса. А што былò з пàнямi да панѐнкамi, дак аж бры̀дко казàць. От якòе былò здарэ̀не.

Стары дзi͡ед Савiцкi.

Бохаво.

60. Сьвятòе падры̀гваньне.

Пашлì пàшы лю̀дзi ў зарабу͡откi дзi͡есь вѐльмi далѐко да й папàлi там раскòлаў. Вi͡едамо, ў будзѐнныi͡е днi жылì сабi͡е ў лi͡есi, пушчàлi дзѐраво, да рабiлi клёпку, а ў нядзi͡ельку пашлì ў вёску, паглядзi͡ець, як там жывỳць лю̀дзi. Прышлì яны̀ рàненько да й паглядваюць сюды̀-туды̀. Вёска, як вёска. Шырòкая вỳлiца, пабàпал хàты, а на канцы̀ стаiць вялiзазная хàта з кры̀жам на дàху. Пачалì туды̀ зьбiрàцца тàмашныi͡е лю̀дзi да й кàжуць, што гэто цэ̀рква. Прышòў якiсь сiвы дзi͡ед, атчынiў цэ̀ркву, вы̀нес аттỳль залi͡езную штàбу, павi͡есiў яi͡е на гву͡озд да й давàй па ёй лупiць малаткòм. Зьвiнiць штàба, аж глỳшыць, а лю̀дзi здымàюць шàпкi да хры̀сьцяцца. Дагадàлiса нàшы дзяцюкì, што гэто ў iх такì зву͡он. Улi͡езлi яны̀ ў цэ̀ркву. У цэ̀рквi ўсе як трэ: канастàс, пратэ̀сы, абразы̀. Прышòў поп да й кàжэ: дзi͡елайце тòе, што я бỳду дзi͡елаць. От пачàў ён хрысьцiцца да атбiвàць паклòны. Хры̀сьцяцца й лю̀дзi да грỳкаюць iлбàмi аб паму͡ост. За-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

пі͡еў пу͡оп. Падхвацілі тòе й лю̀дзі да й пают̀ь, бàццэ ў лі͡есі пастухì галёкаюць. Нарэ̀шце ўзяў пу͡оп чарапòк з жàрам, насы̀паў туды̀ лàдуну да й пачàў кадзіць. Кадзіў ён, кадзіў, аж ану̀чы на нагàх закуры̀ліса. Вàліць дым ат папà, бàццэ з кòміна. Пазірàюць лю̀дзі да гру̀каюць ілбàмі аб паму͡ост. Тым чàсам пу͡оп кінуў з рук чарапòк да давàй ту̀пацъ, тушы̀ць агòнь. Убàчылі тòе лю̀дзі да як пачалì усі͡е ту̀пацъ, дак аж цэ̀рква трасѐцца. Алѐ ось перабірàў, перабірàў нагàмі пу͡оп, нарэ̀шце не вы̀трымаў, мàбыць яму̀ такì дòбрэ прыпеклò, от ён пакаціўса дòлу да давàй дры̀гаць нагàмі. Зірну̀лі лю̀дзі да ўсі͡е рàптам грым на паму͡ост да давàй дры̀гаць нагàмі. Паскідàў пу͡оп з пу͡ог лàпці да ану̀чы, забрàў іх у ахàпку да тым і кòнчыў слу̀жбу. Пачалì лю̀дзі расхòдзіцца з цэ̀ркві, от наш чалаві͡ек і пытàе тàмашпаго старòго, што гэ̀то ў іх за сьвя̀то й што гэ̀то яны̀ рабілі ў цэ̀ркві. А той і кàжэ: сòдня сьвятòго Дрыгунà, от мы й рабілі сьвятòе падры̀гваньне. Падзівіліса нàшы лю̀дзі да й ду̀маюць: што край, та абычàй, што сялò, та нòраў, а што галавà, та рòзум.

Стары дзі͡ед Савіцкі.

Бохаво.

61. Вòко на пàлцы.

Быў адзін мужы̀к да такì здарòвы як дуб. Ні я̀кае ліхо к яму̀ не прыставàло, ні я̀кая хварòба не маглà падступіцца. — Якàя-такàя хварòба, — кàжэ ён, — я жу͡одна͡іе не знàю. От нехàй пры̀дзе, дак яшчэ̀ пабàчым, хто кагò злòміць. — Выхваля̀уса ён, выхваля̀уса, а нарэ̀шце й к яму̀ ліхо падкаціласо. Быў здару͡оў, а тут рàптам пачàў качàцца жыватòм. От так з дòбраго рàю схапіло рàптам, што ён аж равѐ ні͡емым гòласам. Перш ду̀малі, што гэ̀то пры̀стры͡эк, што на другì дзень самò пру͡ойдзе. Алѐ равѐ ён дзень, равѐ другì, а палёгкі немà. Ужэ̀ пачарні͡еў ён бы зямля̀. Пазьбірàліса бàбы, пачалì яны̀ шаптàць, кінулі на чэ̀раво гаршчòк, паілі ягò ўселя̀кімі зелья̀мі, — от нічòго не памагàе. Памірàе чалаві͡ек да й ту͡олькі. Бàчыць жу͡онка, што гэ̀то не пе-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

рэліўкі да й пачала яна прасіць муоцнаго ведзьмара, каб ён атрабіў, бо гэто мабыць было ўдзіеяно. Прышоў ведзьмар, аглёдзяў ён ўсю хату, вылазіў пад лавамі, пад палом, зірнуў у надпіечак да й кажэ, што ўдзіеяно. Пачала тут жанчына яго прасіць да благаць, каб ён злітуваўса да атрабіў.—Не буойцеса, атраблю,— кажэ ведзьмар. От узяў ён з семі калодзісяў вады, наліў яіе ў пляшку, насыпаў туды попелу, напхаў вуглёў да й яшчэ якоесь плягі да й пачаў шаптаць. Шаптаў, шаптаў ён пеўне з гадзіну да й даў туюю воду хвораму піць. Напіўса той, алё яшчэ гарыэй пачаў раўці. Пашоў ведзьмар да гасподы, а хвораму так падпёрло пад грудзі, што й дыхаць ніельга. Раве ён так, што аж па вуліцы чуваць. Дзівяцца людзі, што гэто сталасо з тым здаравенным чалавіекам. Паміраe такі здараўяка й ніхто нічого не мажэ парадзіць. Туолькі ось на яго шчасьце якурат іедзе дохтур. Параўняўса ён з тою хатаю, дзіе быў хворы, пачуў, што там хтось раве да й пытае, што гэто такое. Расказалі людзі дохтару ўсе, як было. От ён схапіўса з воза, ўліез у хату да й пачаў лечыць таго чалавіека. Нарэшце даў яму якогось зелья да й паіехаў у двуор к хворуй паненцы. Дак от кажыэце, на заўтрэ бы рукамі зняў. Здаруоў чалавіек, бы нічого й не было. Пранікі людзі баюць, што дохтурэ не памагаюць. Той дохтур добрэ памуог да яшчэ як! От дачуўса той чалавіек, што дохтур яшчэ госьціць у пана да й пашоў яму падзякуваць. От узяў ён за пазуху дзісятак яёц да й прышоў у двуор. Тым часам дохтур разам з панамі вышаў у сад і сіелі яны там у ценьку пад ліпаю піць гарбату. Седзяць сабіе паны да паненкі, пъюць, закусваюць марцыпанамі да гамоняць з дохтурам. Зняў той чалавіек шапку, падышоў бліжыэй да целюх дохтару ў ногі. — Чаго табіе, чалавіечэ? — пытае дохтур. — Дзякуй табіе, паночку, што мене адраваў. — Тут дохтур пазнаў таго чалавіека да й кажэ: а, гэто ты так учорэ крычаў. Ну, добрэ. Цепер сьцеражыса, та будзеш здаруоў. — Я здаруоў, паночку, дзякуваць богу да й табіе. Ось я прынёс табіе гасьцінца. — І пачаў ён даставаць з-за пазухі яйца. — Не трэ, не трэ, — замахаў дохтур рукамі, — ліепш

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

аддай сваім дзіецям. — Тым часам зацікавілася пані да й пачала пытаць дохтура, што такое было з тым чалавіекам. От дохтур пачаў расказваць пані, што ў таго чалавіека было ў серэдзіне, з чаго ён так крычаў, што ён пачуў аж на вуліцы. Зачуў той чалавіек, што дохтур расказвае пані, што было ў ём усерэдзіне да й просіць яго, каб ён паказаў сваіе рукі. Зьдзівіўся дохтур да й кажэ: на паглядзі, калі такі цікавы. — Рукі, як рукі, — кажэ мужык, — от каб табіе да яшчэ воко на палцы, дак яшчэ не такім быў-бы ты дохтурам. — Чаму? — пытаюць усіе. — А зьвіесно, калі пан дохтур цепер віедае, што робіцца ў чалавіека ўсерэдзіне, дак тагды ўлажыў-бы палац з вокам у сраку да й пабачыў-бы ўсе, што там дзіеецца. — Туолькі гэто мужык прамовіў, як усхапіўся пан да й хаціеў яго біць, але не было часу, бо як пачала пані да панэнкі блеваць да рыгаць, дак адзін дохтур не муог іх ратаваць, а пазваў і пана.

Стары дзіед Савіцкі.

Бохаво.

62. Хто меняе, ў таго хамут гуляе.

Жыў тут недалеко кала Сёмежава, а мо й за Сёмежавам адзін багаты чалавіек. Ён не то, каб быў вельмі багаты, а так сабіе добры, замуожны гаспадар. Гараваў, працаваў, а жыў сьціснло, дак і міеў сабіе не лапую гаспадарку да й асьмакуоў на патрэбу. А, віедамо, ў нашум стане, калі е хліеб, ведзецца гаўядо да пра ліхую беду лежыць дзіе нёбудзь у шчыліне які зломаны груош, дак ужэ й лічаць багатым чалавіекам. А якое там ліхо багацье! Праўда, ў таго чалавіека веліса добрые коні. От ужэ перад сьмерцью выгадаваў ён такого каня, што просто як лялька, глядзі й не наглёдзісса. Паіехаў ён на туом кані да Капыля на кірмаш, дак адбою не было ат людзей, агарнулі яны каня су сіх бакуоў да й стаяць, дзівяцца, бо зроду не бачылі такого каня. Дак не туолькі людзі, а то кажы, што й паны да жыды паразяўлялі пыскі да й дзівяцца, як гэто мужык іезьдзіць на гэстакуом

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

кані, як ён не растрасè ягò драбінак. Пачалì тут паны̀ да жыды̀ смуолно прыставàць к таму̀ чалавіеку — прадàй да прадàй свайгò канѝ, беры̀ якіie хòчэш грòшы. — Хібà-ж я пайду̀ да гаспòды піешкі, — аткàзвае той чалавіек, — гэто-ж лю̀дзі засьмею̀ць, а бàба й вòчы̀ вы̀берэ. — Насѝлу ён атчапіу̀са ат іх да хучыэй купіу̀ сòлі, таранўоў да бàбе абарàнкаў, ці яшчэ̀ што, падабрàў вуожкі, зьвёў з гары̀, сіеў на вуоз да як палеціеў, дак бы маланка. Алè не дòўго красавàўса. Гэто было̀ на Рòха, а пèрад Багàтнікам ён цягàў з балòта атàву да вèльмі спаціеў, а тут пад грудкòм была̀ крыніца, а ў ёй вадà чы̀стая, бы сьлезà, алè халуодная, бàццэ лёд. От ён як напіу̀са таіе вады̀, дак і запепàў. Жуонка туды̀-сюды̀, давàй шукàць людзèй. Што яны̀ ні рабѝлі, якìх зельёў не давàлі, нічòго не памагло̀. На пъяты дзень ён і аддàў бòгу дўшу. Засталàса жуонка да сын, ужэ не лапы̀ хлòпец гэтак гадуоў двàццаць, а мо й буольш. Алè, віедамо, малады̀, дак яшчэ̀ дурны̀. Які̀ з ягò гаспадàр. За бàцькаваю галавòю, дак і ён быў разўмны, а як бàцько памёр, дак ён не віедае, што й рабіць. А мàтка, віедамо, жанчы̀на, калà пèчы ўміее захаджàцца, а не прàвіць гаспадàркаю. От затым па сьмèрці старòго ѝкась рàзам пашла̀ гаспадàрка на ўпàдак: та воўк зарыэзаў сàмую ліепшую карòву, та сіено зазімавàло на балòці, дак не было̀ чым карміць гаўя̀до, так што янò яшчэ̀ да Калѝд вы̀петрало бы шчыэпкі да павычыэсвало ўсю шэ̀рсьць, та збуожжэ зту̀хло ў засіеку, дак ніхтò ягò не хаціеў купавàць. А малады̀ гаспадàр усè дўмаў, што ён вèльмі багàты, дак і не рўпіу̀са даглядàць гаспадàрку да зараблѝць грòшы. Туолькі вяснòю, як прышлòсо плаціць падàткі, аглèдзяўса ён, што грòшэй немà да й прадàць ніечаго. Астàўса адзін той вèльмі гòжы куонь, да й той ужэ̀ не такі̀ глàдкі, як быў за жы̀цьце бàцька. Немà чагò рабіць, трэ прадавàць канѝ. Алè як у гаспадàрцы жыць без канѝкі. От і надўмаўса хлопèц паменѝць канѝ да ўзяць сабіе велікі прыдàтак, та бўдзе й куонь і грòшы. Парàдзіўса ён з сусіедам, а той і кàжэ: ніе, гòлубе, не менѝй, бо хто менѝе, та ў тагò хамўт гуля̀е. Ліепш прадàй канѝ, вазьмі̀ дòбрые грòшы, а на груош кўпіш сабіе канѝку, якàя спадабàецца. — Не паслўхаў

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

малады̀ гаспадàр, пaўёў каня̀ на кірмàш і вы̀меняў сабе̑ вялізазнаго каня̀ да й узя̀ў яшчэ сто рублёў прыдàтку. Рад хлòпец. Пакàзвае лю̀дзям каня̀. Зірну̀лі ты̀е ў зу̀бы, аж таму̀ каню̀ ўжэ над тры̀ццаць гаду̑оў. Наступілі яму̀ на нòгу, дак ён чуць не ўпаў. — Абшукàлі цебè канавòды, хвары̑эць іх мàтары, — кàжуць лю̀дзі, — гэтò-ж саўсім дыхлìна, хаць ты вы̀кінь за плот. — Цèраз ты̀дзень паўёў хлòпец меня̀ць тагò каня̀ да й вы̀меняў сабе̑ маладòго. Рад ён, хаць і даў піддзіся̀т рублѐў прыдàтку. Зноў пакàзвае нòваго каня̀ лю̀дзям. Абышлì ты̑е кругòм, пагляддзе̑елі ў зу̀бы, памàцалі акàрак, наступілі на нòгу, нарэшце давàй махàць пèрад ачу̀, — хаць бы што, ку̑онь стаіць і не ўхмыля̀ецца. — Дак гэтож ён сьлепы̀, — кàжуць лю̀дзі ў вадзін гòлас. Пусьцілі ягò на дзедзінцы да ры̑эзнулі пу̀гаю, дак ён прòсто й су̀нуўса ў сьце̑ну. Немà чагò рабіць, знòў паўёў хлòпец меня̀ць і тагò каня̀. Так датуль ён меня̀ў, пòкі вы̀меняў таку̀ю каня̀ку, што не пры̑ехаў на ёй і да гаспòды, бо янà ўпàла пасеру̑од дарòгі да й нòгі вы̀пруціла. Зня̀ў ён хаму̀т, палажы̀ў ягò на драбінкі да так самату̀гам і прывалу̑ок іх дому̑оў. Ї застàўса ён без каня̀кі. А хаму̀т мо й да тых час дàрам гуля̀е.

Стары дзе̑ед Савіцкі.

Бохаво.

63. Князь Радзівìл Кахàнко.

Жыў даўне̑ей у Нясьвіжу адзін князь Радзівіл. У яго былò мну̑ого маёнткаў па ўсёй Случы̀зне. Усе̑ паны̀ яму̀ служы̀лі, бо ён быў над панàмі пан. А зь людзямì ён хòрашо абхòдзіўса. Бывалò з кім не загавòрыць, та за ку̑ожным слòвам кàжэ: кахàнку, кахàнку. От за тòе й прадражнілі ягò Кахàнко. Дòбры быў князь Кахàнко, ту̑олькі ён вèльмі любіў шуткавàць да вычварàць ру̑озные̑ шту̀кі. Ось раз абъявілі ўсю̀ды, што князь Кахàнко зьбірàе к сабе̑ атусю̀ль усіх краўцу̑оў. Сабраліса краўцы̑э да й пашлì на тэрмін да Нясьвіжа. Назьбірàласо іх там такàя сіла, што загрузілі ўсе ме̑есто. Седзя̀ць яны̀ на землì калà палàцу, седзя̀ць

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

дзень, седзяць два, чакаюць, покуль выдзе князь Каханко да дась ім гасьцінец. Тульки ось на трэйці дзень чуюць яны, аж равуць медзьведзі. Пачалі яны азірацца та ў той, та ў другі бук, аж бачаць, іедзе князь Каханко шасьцерыком на медзьведзях, аж пыл курыць, падкаціў просто к палацам. От і кажуць яму слугі, што яго ўжэ трэці дзень чакаюць краўцэ. — А, та добрэ, каханку, о, та я зарас, — кажэ ён да й наказаўса праз вакно. Падышлі краўцэ пад вакно, стаяць без шапак да чакаюць, што скажэ князь. — Вы краўцы? — пытае князь, — а, та добрэ. Краўцы вельмі патрэбны людзям. Дак от што я вам параджу. Вы як будзеце шыць, та заўязвайце вузел. Гаспадар будзе вам дзякуваць і дабром вас памінаць.—Пры гэтых словах ён павернуўса да й пашоў сабіе. Пацяглісa краўцыэ назад, бы мыла зьіеўшы. А князь Каханко зноў кудысь паіехаў. А іезьдзіў ён заўжды не палюцку: аб ліету на санях, а ў зімку на колах. От якась былі жыдуоўськііе сьвята. Назьбіраласо жыдуоў, жыдуовак да жыдзенят поўна грэбля, так што нема дзіе й павернуцца. А віедаеце, якая там доўгая грэбля цераз возеро. Гуляюць жыдыэ, бімкаюць сабіе пад нуос. Але ось аткуль ні вазьміса, й коціць Каханко шасьцерыком на медзьведзях да просто па грэблі. Спалохаліса жыды, кінуліса ў бук да й нырнулі ў воду. Насілу іх аттуль павыцягвалі, а мо каторы й заліўса. Не любіў князь Каханко гэстаіе погані. Ось як то адзін раз ён гасьціў у сусіеда. Пашлі яны на паляване. Пачаў тут круціцца адзін жыдок, каб падкаціцца к князю да зрабіць які нёбудь гішэфт. Закміеціў тое Каханко да як пыльнуў нібыто не нарокам, дак той жыдок і пакаціўса. — А, шкода, шкода, — кажэ ён, — я нарабіў шкоды, а пэўне, гэто быў пажондны жыдэк, хаць куожды самы пажондны жыдэк, шыбеніцы варт, але я нарабіў шкоды, дак я прышлю пану за тое буольш жыдуоў. — Паіехаў ён, а на другі дзень веліеў налядаваць цыэлы вуоз жыдуоў пад рубель да й завезці таму пану. Пішчаць жыды пад рублем, чуць жывы, а хурман гоніць коней да прэ пархуцькаў у двуор к таму пану. Не любіў Каханко жыдуоў за тое, што яны вельмі ласы на грошы, што за

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

гро̀шы па̀рхі гато̀вы прада̀ць ба̀цька й ма̀тку. От раз абъявіў ён жыду͡ом, што бу̀дзе плаці̀ць па тры рублі͡е таму̀, хто залі͡езе на дзэ̀раво да закуку̀е бы зеўзю̀ля. Пазàрыліса жыды̀ на гро̀шы, пазала̀зілі ў саду̀ на лі̀пы да дава̀й кукава̀ць. Вы̀шаў тут князь Каха̀нко ў сад з дубальту͡оўкаю да дава̀й смалі̀ць жыду͡оў на лі̀пах драба̀мі со̀лі. Забі̀ць не забъѐ, а ту͡олькі со̀лі насы̀пле за шку̀ру. Крыча̀ць жыды̀ ні͡емым го̀ласам, а ён сма̀ліць да сма̀ліць. Пазва̀льваліса парха̀тыі͡е далу͡оў да ту͡олькі чу̀хаюць аза̀дкі. Заплаціў ён ім па тры рублі͡е да й ка̀жэ: — гэто вам наву̀ка, не за сваѐ дзі͡ело не бра̀цца. Зеўзюля дарма̀ куку̀е да лю̀дзям гро̀шы гату̀е. — Гэто ён намекну̀ў на то̀е, што лю̀дзі ка̀жуць, — як пачу̀еш пѐршы раз зеўзюлю, та трэ пакалаці̀ць гро̀шы, каб яны̀ у̀весь гу͡од вадзі̀ліса ў кішэ̀ні.

Дак от які̀ то быў князь Каха̀нко гу̀чны да шту̀чны. Дачу̀ласа аб ём цары̀ца Кацеры̀на. Яна̀ абъезджа̀ла сва̀е ца̀рство да й захаці͡ела паба̀чыць яго̀. Пасла̀ла яна̀ к яму̀ сваі̀х янара̀лаў сказа̀ць, што заі͡едзе к яму̀ да ту͡олькі чака̀е, паку̀ль папра̀вяць даро̀гі, бо яны̀ вѐльмі трасу̀ць. А гэто было̀ па лі͡ету. От князь Каха̀нко велі͡еў вы̀сыпаць даро̀гу цу̀крам да й пасла̀ў па цары̀цу сву͡ой шасьцеры̀к медзьвѐдзей, като̀рыі͡е былі̀ запрэ̀жаны ў са̀ні. Пабая̀ласа цары̀ца Кацеры̀на і͡ехаць на медзьвѐдзях. От тагды̀ князь Каха̀нко пры͡іехаў к ёй на сустры͡эк верхо̀м на ло̀сю. Як паба̀чыла то̀е цары̀ца Кацеры̀на дак і сі͡ела на са̀ні да й паі͡ехала на медзьвѐдзях па цу̀кру, бы па сьні͡егу аж да са̀мых пала̀цаў. Ба̀чыць ён, што цары̀цы спадаба̀ліса ты̀і͡е медзьвѐдзі, от ён і падарава̀ў іх ёй. За то̀е яна̀ дарава̀ла яму̀ залату̀ю табакі͡ерку з дъя̀мантам. Сьві͡еціць ён у ну͡очы, бываго̀нь гары̀ць. Но̀сіць князь Каха̀нко ту̀ю табакі͡ерку за̀ўжды пры сабі͡е ў кішэ̀ні, а як вы̀ме яі͡е по̀ўначы, дак яна̀ й сьві͡еціць за̀мест ліхта̀рні. Пазьбіра̀ліса паны̀ мо атусю̀ль да дзіву̀юцца на ту̀ю табакі͡ерку, бо тако̀і͡е й зро̀ду не ба̀чылі. Дачу̀уса аб ту͡ом кару͡оль да й велі͡еў, каб князь Каха̀нко прыу̀ёз яму̀ ту̀ю табакі͡ерку на пака̀з. Велі͡еў князь Каха̀нко запрагці̀ ў са̀ні ву͡осім медзьвѐдзей, сі͡еў да й паі͡ехаў да караля̀. Прыезджа̀е ён да Арша̀вы, ці што да й садзі̀ць про̀сто

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

да каралѝ ў палàцы. Як убàчылі там медзьвèдзей дурныіе ляхì да як спалòхаюцца да пабегўць, дак карўоль адзін і астàўса. Паказàў князь Кахàнко ямў табакіерку, а той і з рук не выпушчàе, так янà ямў спадабàласа. І пачàў карўоль прасіць, каб ён уступіў ямў тўю табакіерку. — Беры, — кàжэ, — што хòчэш, тўолькі аддàй. — Дòбрэ, — кàжэ, — вàшае каралèўськае вялічаство, аддàм я гэстую табакіерку, тўолькі вы мніе дàйце тўолькі землì, кўолькі я абъіеду за тыдзень. — Карўоль згадзіўса на тòе. От князь Кахàнко сіеў на сваіх медзьвèдзей да й памчàўса. Абъіехаў ён за тыдзень нèмаль усè каралèўство да й заўладàў усèю там землёю зь людзямі да сусімі маёнткамі. От чамў ў князя Радзівіла так мнўого землì.

Стары дзіед Савіцкі.

Бохаво.

64. Дзеўчына.

Гэто тўолькі цепèр так нарòду намнўожыласо, што як тўолькі іх землѝ паднімàе. А даўніей людзèй былò мàло, а землì кўолькі хòчэш. Зèмлю мàло абраблялі, а бўольш жывіліса людзі калà ліесу. Лясы былì такііе, што й канцà ім не былò. Людзі селіліса дзіеніегдзе калà рыэк да на ўзгўорачках, разчышчàлі калà хàтак трòхі земèльку да карпàлі яіе як нèбудзь. А кругòм шуміеў бòжы гай да стаяў з віеку такì густы да цёмны, што й нòса не вабъèш. Людзі хадзілі ў ліес шукàць сьлèпата да забірàць салòдзенькі медòк. Ідзè чалавіек у ліес да ўсе залысвае дзераўлякі, ці заўязвае кўклы, каб зрабіць прыкміету, кудòю вернўцца назàд, бо без прыкміеты ў такўой нèтры адрàзу заблўдзіш і прападзèш у ліесіні за панюх табàкі. Адны тўолькі разбўойнікі не баяліса цёмнаго ліесу, алè й тые бўольш рабілі сабіе куранì ці буданы дзіе нèбудзь не далèко ат вёскі. Яшчэ я быў падшпàркам гэтак гадòў мòжэ дзèсяці. От раз мы пàсьцілі гаўядо. Грыбўоў былò вèльмі шмàт, дак гаўядо й разбіегласо па ліесе. Біегалі мы, біегалі да й загубілі целіцу. Пабіеглі гэто мы, шукàючы целіцу цèраз ба-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

луоцэ на астравок·да як пралiезьлi праз густы iельнiк, дак i бачым, аж там стаiць маленькая хатка, а буольш нiчого. Улiезьлi мы ў хатку, аж там нiкого нема, туолькi бачно, што там хтось жыў. Спалохалiса мы да наўцекача. Расказалi мы буольшым, от тые аглёдзялi да й кажуць, што там жылi разбуойнiкi, але мабыць iх палавiлi, цi дзiе загiблi ўжэ даўно, бо страва ў гаршкуох зацьвiла, а кала парога зарасло зiельем. Тагды яшчэ быў у жыцю муой дзiед. От i прычапiлiса мы к яму, каб ён расказаў нам пра разбуойнiкаў. Муой дзiед вельмi добрэ расказваў казкi, туолькi не любiў, калi яго не слухаюць. Бало пачпе ён расказваць, а як туолькi хто загаворыць, або ўстане закурыць люльку, дак i кiне расказваць. Дак от якi быў муой дзiед. Эгэ-ж. Дак от прычапiлiса мы к дзiеду, каб ён расказаў нам пра разбуойнiкаў. Перш не хацiеў дзiед расказваць нам — падшпаркам, думаў, што мы, вiедамо, дзiецi, не будам слухаць, але як мы забажылiса да заклялiса, што будам слухаць, дак ён згадзiўса, закурыў люльку да й пачаў расказваць. Гаварыў ён павуолно; скажэ два-тры слова, сплюне да й зноў скажэ куолькi слуоў, пакуль закашляе. Дзiед кашляе, а мы седзiмо й неварухнуомса, а ўсе слухаем, — так ён цiкаво расказваў. Я так неўмiею да й забыўса, бо тое было вельмi даўно. Бачыце, я ўжэ зрабiўса сiвы, а тагды от гэ, бы й вы лазiў на дзераўлякi да сборваў кубельца. Птушачкi пiшчаць, бьюцца пад ногi, а мы, паганые хлопцы ловiм да мучым бiедных птушанятак. Дак от слухайце да не мешайце, та я мо й успамяну да й раскажу вам адно здарэне, якое было тут недалеко. Дзiед нават казаў, дзiе тое было, але я забыўса. От з галавы выскачыло да й туолькi. Але ўсе руоўно. Тун недалеко пасеруод пушчы была маленькая ўёска, гэтак мо дымуоў пъяць, цi шыэсь. Жылi сабiе там людзi, на лiес глядзячы, нiхто iх не чапаў, нiхто iм нiякаiе беды не рабiў, бо мо кругом на сарачню, або копу верстуоў не было нi ўёскi, нi жуоднаiе селiбы. Жылi там людзi вуолно, як птушкi. Туолькi ось раз пабiеглi хлапчукi ў гушчэчу да й падглёдзялi, што там хаваюцца разбуойнiкi. Сказалi яны аб туом бацькуом. Тые давай сачыць i дазналiса, што

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

гэто там жыву̀ць ліхі͡е лю̀дзі. Падглѐдзялі яны̀, што ты̀е ліхі͡е лю̀дзі нічо̀го не ро̀бяць, не гаду̀юць і гаўя̀да, а ўсе ма̀юць, бо ці кра̀дуць у людзѐй, ці гра̀бяць у дваро̀х да на даро̀гах. От і ду̀маюць сабі͡е ты̀е лю̀дзі, трэ даць га̀сла пану͡ом да пача̀лству. Тым ча̀сам разбу͡ойнікі закмі͡еціл, што лю̀дзі з вѐскі вы̀сачылі іх, алѐ сьмі͡ело жыву̀ць там на мі͡ейсцы, бо ду̀маюць, што лю̀дзі не зро̀бляць ім шко̀ды, бо нема̀ за што рабі̀ць лі̀ха, калі̀ яны̀ ніко̀лі ў вѐсцы не рабі̀лі нічо̀го кѐпськаго. Алѐ зрабі̀лі памы̀лку, бо лю̀дзі за̀ўжды ро̀бляць лі̀хо друго̀му ні за што, а так сабі͡е. Жыву̀ць разбу͡ойнікі ці̀хо й нечака̀юць лі̀ха. А тут паны̀ да нача̀лство сагна̀лі людзѐй са ўсеі͡е акру̀гі, прыгна̀лі маскалё̀ў да казаку͡оў. Акружы̀лі ты̀е ўвесь о̀ступ да дава̀й калаці̀ць. Ба̀чаць разбу͡ойнікі, што хо̀чуць іх палаві̀ць, от яны̀ й схава̀ліса ў земля̀нку да там і седзя̀ць ці̀хенько, ба̀ццэ іх і нема̀. Бѐгаюць маскалі͡е да казакі̀ па ўсяму̀ лі͡есу, по̀руцца ў кусту͡ох, а ў лу͡ом да каладзьё̀, дзі͡е была̀ земля̀нка, й не паглядзі͡елі. Перапаро̀лі яны̀ нѐмаль увесь лі͡ес — нема̀ разбу͡ойнікаў, ба̀ццэ яны̀ ў зѐмлю правалі̀ліса, ці схава̀ліса ў во̀ду. А яны̀ вы̀лезлі сабі͡е з земля̀нкі да пазіра̀юць праз лу͡ом, пазіра̀юць да мата̀юць на вус, што маскалё̀ў да казако̀ў во̀дзяць па лі͡есу ты̀е лю̀дзі, што жыву̀ць у маленьку͡ой вё̀сцы. — Пагадзі͡еце-ж, хвары͡эць ва̀шуй ма̀тары, — ду̀маюць разбу͡ойнікі, — мы-ж вам адрыгну͡омса, неха̀й ту͡олькі пу͡ойдуць атсю̀ль маскалі͡е да казакі̀. — Так і было̀. Пахадзі̀лі, пахадзі̀лі маскалі͡е да казакі̀ дармо̀ па лі͡есі, пала̀зілі па гушчэ̀чы да й пашлі̀ сабі͡е да̀лей, куды̀ ім трэ. Абслу̀халіса разбу͡ойнікі, вы̀лезлі з земля̀нкі да й кі̀нуліса на ўё̀ску. Яшчэ̀ мо маскалі͡е да казакі̀ атышлі̀са версту͡оў пъяць або̀ шы̀эсь, як разбу͡ойнікі спалі̀лі ту̀ю ўё̀ску, а людзѐй усі̀х перабі̀лі, апры̀ч мало̀і͡е дзі͡евачкі, што тагды̀ ў лі͡есі па̀сьціла гаўя̀до. Варо̀чаюцца разбу͡ойнікі к сабі͡е ў лі͡ес да й сустрака̀юць ту̀ю дзі͡евачку. А яна̀ была̀ хаць і мала̀я, алѐ така̀я го̀жая, што от глядзі͡еў-бы за̀ўжды да й не нагледзі̀сса. Іду̀ць разбу͡ойнікі к ёй, а яна̀ седзі̀ць сабі͡е на пеньку̀, плецѐ вено̀к з кві͡етак да паѐ пі͡есьні. Яна̀ паѐ, а гаўя̀до ву̀шы развi͡есіло, слу̀хае, стаі̀ць, бы ўко̀панае. На̀ват пту̀шкі пазлета̀ліса, седзя̀ць

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

кругòм на дзèраве да слỳхаюць, як паè дзеўчына. Паслỳхалі разбуойнікі да й не магỳць варухнỳцца, бàццэ янà закалдавàла іх cваёю піесьняю. Замоўкла дзеўчына да й пачалà гнаць гаўядо дамуоў. Пагнàла янà гаўядо, а разбуойнікі йдуць за èю, бо немагỳць от яіе атарвàць (ачуоў) ачỳ. Прыгнàла янà гаўядо на тòе міейсцо, дзіе былà ўèска, да туолькі сьплеснỳла рукàмі. Немà ўèскі, туолькі яшчэ дагарàюць галавèшкі. Падышлà янà тудь, дзіе былà хàтка, аж там валяюцца забітыіе бàцько з мàткаю. Пачалà янà плàкаць да ўбівàцца. Плàчэ янà да прычытàе. — Ой, мàтачка-ж маЯ зеўзюлечка, на кагò-ж ты менè пакінула? Ці-ж цебè зьвіер задрàў, ці цебè ліхì чалавіек забіў? Ой, бацюхно руодненькі, сакòле муой ясны, чамỳ-ж ты маўчыш, нічòго не адмаўляеш, менè сіратỳ не прыгалỳбіш? На кагò-ж ты менè пакінуў без ладỳ, без спòсабу? Ой, мàтачка руодненькая, хто-ж мніе галуоўку памые, хто-ж мніе кудзèркі разчэшэ, хто-ж мніе куоску заплецè?.. Так плàкала да прычытàла тàя дзіевачка, а разбуойнікі стаялі да слỳхалі. Ї мо пèршы раз закалòло ім у сèрцы; мо пèршы раз пакàяліса яны, што пабілі тых людзèй. Выплакаласа дзеўчына да бàццэ акаменіела, седзіць калà халòднаіе мàткі да пазірàе, бы непрытуомная. От разбуойнікі пахавàлі тых людзèй, забрàлі дзеўчыну, занялì гаўядо да й пагнàлі ў ліес. Доўго прадзірàліса яны праз гушчэчу, нарэшце атаўбавàліса на прагàліне, дзе ў іх былà другàя хàтка. Тут яны паслàлі пасьціель да й палажылі тỳю дзіевачку спаць, а сàмі сіелі ціхенько калà хàткі да так муоўчкі й праседзіелі цалюсьсенькую нуоч. Пракапіласа дзіевачка, азірнỳласа да як успаменỳла пра мàтку да бàцька, дак і знуоў давàй плàкаць да прычытàць. Алè як янà ні плàкала, як ні ўбівàласа, мỳсіла прывыкàць к жыццы ў разбуойнікаў. А разбуойнікі з тых чàсаў саўсім пераменіліса. Гòдзі яны крàсьці да разбівàць. Давàй яны лавіць зьверынỳ да рыбу, давàй пасьцì да даглядàць тòе гаўядо. Нарэшце пачалі яны рабіць будуоўлю да як уміелі карпàць зèмлю, каб зарабіць сабіе хліеб. Расьцè тàя дзеўчына да ўсе харашыэе й стàла янà такàя гòжая, што мо такòіе немà на ўсём сьвіеці. Слỳхаюць яіе

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ўсіе разбуойнікі, робляць усе, што яна скажэ, робяць затым, што немогуць не рабіць, немогуць неслухаць яіе. От здаецца, каб яна сказала ліезьці ў вагонь, та-б і ў вагні было-б ім не горачо, а так добрэ, як у (раю) небе. Туолькі не доўго міелі разбуойнікі такое шчасьцье, каб пазіраць на туую дзеўчыну. Раз пашла яна ў ліес да й не вернуласа. Як ні шукалі разбуойнікі, не маглі яіе знайці. Бацэ зайшло ім сонейко й сталі яны хадзіць не ў дзень, а ў нуочы, так ім маркуотно было без дзеўчыны. А яна тым часам вышла к рацыэ. Там людзі лавілі рыбу да як убачылі такую гожую дзеўчыну, дак забылі ўсе на сьвіеці, туолькі пазіраюць на яіе. І здаецца ім, што варто мучыцца ўвесь віек, каб туолькі хаць раз зірнуць у тыіе вуочкі, што бы сонейко паляць серцэ, паляць, шчыпаюць, але такі даюць слодыч, якого буольш нема на сьвіеці. Пазірае дзеўчына, а людзям здаецца, што на сьвіеці ўсе так гожэ, так радасно сьвіеціць сонейко, так добрэ жыць, што ліепшаго нічого й не трэ. От пакінулі рыбакі сваё нажэндзе, пасадзілі дзеўчыну ў човен да й павезлі яіе ў веску. Зірнулі людзі на дзеўчыну да й дзякуюць богу, што прыўеў іх хаць раз у жыцю пазнаць слодыч шчасьця, пазнаць, што на сьвіеці ўсего мііеей небескі погляд гожаіе дзеўчыны. Дачўуса царэвіч, што там такая гожая дзеўчына, прыіехаў туды, ўзяў яіе к бацьку да маццы, каб там зрабіць лад. Але дзеўчына дарогаю занепала да й памерла. Налажылі тагды жалобу на ўсе царство. Прайшло мнуого часу, а такоіе дзеўчыны буольш нема, бо мабыць небескі погляд дзеўчыны буог судзіў бачыць туолькі адзін раз у жыцю.

Стары дзіед Савіцкі.

Бохаво.

65. Ведзьмар.

Жыла адна маскоўка да вельмі распусная баба. Чаго туолькі яна не вычварала. Не доўго яна пажыла з сваім гаспадаром, як яго забрылі да й здалі ў маскалі. Здалі яго й загналі так далеко, што можэ буольш, як дваццаць гадоў не было аб ём ні якаіе чуткі.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Ужэ ду̀мала маско̀ўка, што ягò й на свіеце немàшака, што мо ягò й кòсці пагнілì. Тым чàсам прыдбàла янà сабіедачку̀. Іў малèнстве былà янà гòжая дзіевачка, а як падраслà, дак стàла такòю харòшаю, што туолькі ў кàсцы сказàць. Хаць і казàлі лю̀дзі, што я̀блычко ат я̀блынькі далèко не кòціцца, што дачкà бу̀дзе такàя-ж распу̀сніца, як і мàтка, алè за тòю дзеўчы̀наю ўвівàліса нèмаль усіе хлòпцы з цыэлаіе акру̀гі, такàя янà былà гòжая да ўдàлая. Алè янà нікòго к сабіе не подпускàла. Дзівілìса лю̀дзі да й пачалì гаварыць, што гэто мàбыць якìсь вырадак, а не дзіеўка. Туолькі ось зъявіўса там на ўèсцы якìсь вèльмі ўдàлы й гòжы хлòпец і наня̀уса ў жыда ландарà пàрабкам. Ніхтò не віедаў, хто ён такì й аткуль ён прышòў. Туолькі пашлà памуоўка, што ён нікòлі не хрысціцца й не хòдзіць у пэркаў. Алè другіе казàлі, што жыдуоўськаму пàрабку й ніекалі хадзìць у цэркаў, калì тàмака й папуоў пàрабак нікòлі не бывàе. Пагаманìлі да й замòўклі. Туолькі ось і зпазнàласа дачкà маскòўкі з тым жыдуоўськім пàрабкам. Алè віедамо, немà як ім пабрàцца, бо ні ў ягò, ні ў яіе нічагу̀сенько немàшака; ён слу̀жыць у жыдуоў пàрабкам, а ў яіе мàтцы туолькі аднà, як куол старэнькая хàтка, што отот асу̀нецца. Ніельга ім брàцца, алè віедамо маладòсь, яны так лю̀бяцца, што й жыць не мòгуць ні аднагò дня, як не пабàчаць аднò другòго. Туолькі ось дачуўса аб туом малады пан, а ён ужэ даўнò, дабірàуса да таіе дзеўчыны. Былà памоўка, што перш той пан вèльмі ўчашчàў да маскòўкі, як яіе дачкà былà яшчэ малèнькая. Бàбы сакатàлі нàват, што мо й дзіевачка ягò. Ніхтò тагò дòбрэ не знàў, алè-ж кàжуць, што на бàбськіе языкì прывязі немàш. Пачàў тут пан смуолно прыставàць да таіе дзеўчыны та груозьбаю, та прòсьбаю; алè тàя кàжэ: ці цебè атручу̀, ці самà засілю̀са, а з табòю жыць не бу̀ду. — Што ні рабіў пан, нічòго не парàдзіць з упàртаю дзіеўкаю й ду̀мае ён, што гэто яіе падбухтэрвае кахàнак — той удàлы парабчу̀к, што слу̀жыць у жыда. От і давàй пан дабірàцца да тагò хлапчукà. Тут якрàз падышлì ў жыдуоў асèньніе свя̀та. Сабралòсо ў тую карчму̀, дзіе служыў удàлы хлòпец, вèльмі мнуого жыдуоў са ўсеіе акру̀гі рабіць кучкі.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Віедамо, жыды баяцца, каб іх чорт не ўхапіў і заўжды наймаюць сабіе хрышчонаго чалавіека на сьвята, каб ён абараняў іх ат чарцей. Сабраліса жыды да й мыслюють, што цепер ім нема чаго баяцца чарцей, бо ў іх е хрышчоны чалавіек. А яны не віедалі таго, што той парабак не то, што не хрышчоны, але й сам з ліхімі знаецца. Дак от настала страшная нуоч, ці як кажуць хапун. Дрыжаць жыды, бы барануоў хвуост, баяцца, каб каго чорт неўхапіў. — Цуес, дзецюцок, — просяць жыды таго парабчука, — ты ўзэ нікуды ад нас не адхозь і іез сабіе г(g)уг(g)ель і руозные прыпраўкі да беры лагодкі, туолькі пільнуй нас. — Не зважайце, калі не суджано, та чорт не ўхопіць, — кажэ парабак да іесь сабіе ўселякіе прысмакі. Туолькі ось прыбегае к яму маскоўка да й кажэ: — ой, мой голубе, ці нема ў цебе крыху гарыэлкі? Жыдуом свято, — не прадаюць. Дай хаця капельку. — Да што табіе так захаціеласо гарыэлкі? Хібо на маладое ці што. — Пашуткаваў парабчук. — Ой, злыдзень, як табіе не грыэх смеяцца з біеднаіе ўдавы. — Яна, бачыце, ўжэ даўно лічыла себе ўдавою, бо аб гаспадару не было ніякаіе чуткі. — Тут кроў вочы залівае, а ён яшчэ смеецца. — А што-ж мніе плакаць, што гарная маскоўка зажадала гарыэлкі? — Зноў пашуткаваў парабчук да й ушчыпнуў маскоўку за кумпъяк. — Аткасніса, паршывец, бо я табіе й біельма павымаю, — закрычала жанчына, нібыто абазліўшыса на парабчука. — Дак дасі гарыэлкі? — пытае яна зноў. — Скажы, каго хочэш частаваць, та дам. — Саўсім не ля пачосткі, а трэ гарыэлка ў зелье. — Хіба хочэш любіснік варыць да хлопцаў паіць, каб цебе кахалі. — Маўчы, хварыэць тваей матары! бо бачу, што ты й без любісніку ўмурзаўса па самые вушы. — А хаць і так, да не ў цебе. — Ой, глядзі, ліхо табіе будзе з тваім каханем, бо точаць на цебе зубы. — Хто? — Віедамо, хто. — Пан і ландар. — Чаго-ж ландар? — Пакаеўка шапнула мніе сягоднячы, што пан прызваў к сабіе ландара да й веліеў яму найці спосаб, каб цебе ці атдаць у маскалі, ці згнаіць у вастрозе. — Пачакай, яж ім, хварыэць да стагнаць іх матары, яж ім пакажу, як мене чапаць, — захадзіўса тут той парабчук. —

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Дак прыхòдзь, — шапнỳла маскòўка, — да ту͡олькі, каб ніхтò не бàчыў, бо пан нас з гаўнòм зъі͡есь. — І яна кінуласа бі͡егці да гаспòды. — А гарыэлка, — крычы̀ць хлапчỳк. — Вы̀пі сам за яі͡е здарòвейко. — І маскòўкі ту͡олько хỳстка мігнỳласа за абу͡озняю. Дагадàуса парабчỳк, хто гэто янà, ухмылìўса сабі͡е пад ну͡ос да й пашòў прыслугòўваць жыду͡ом, ту͡олькі ось сустракàе яго ландàр да й кàжэ: ой, дòбры ты, гàрны хлòпец, ту͡олькі кèпско рòбіш, што йдзеш прòціў вады! — Якòі͡е вады̀? Я-ж нанасìў вады̀ на цы͡элы ты̀дзень. — Ну, не аб ту͡ом я гаварỳ. Я гаварỳ, што калì чалаві͡ек ідзè з ві͡етрам, та ямỳ лёгко йці, а калì прòціў ві͡етру, та ві͡ецер ягò валя̀е. — Што ты плецèш? Кажы̀ прòсто. — Ты знàеш, што ганчàр не ландàр, што хлапèц маладзèц, а панìч свіны̀ лыч, да ўсе-ж панìч панічòм, яму ўсе непачу͡ом, а хлòпец як ні пнìса, а з панічòм не бары̀са. Ты дòбры хлòпец. Наплю̀й ты на гэтую дзі͡еўку да й разатры̀. — Чаго ты прыстàў? Якỳю дзі͡еўку? — Ну, — сказàў жыд і падня̀ў уверх плèчы, аж пèйсы затрасліса, — калì так, калì ты менè паслỳхаес, та й табі͡е бỳдзе дòбрэ, і ёй бỳдзе дòбрэ. — Плю̀нуў парабчỳк і пашòў па сваймỳ дзі͡елу. — Ну, пачакàйце, хвары͡эць вàшуй мàтары, — мырчы̀ць ён сабі͡е пад ну͡ос, — дàмса я вам у знак, як жыду͡ом, так пану͡ом. — От у стрàшную ну͡оч вы̀мазаўса ён сàжаю бы чорт, набрàў у рот галòвак сі͡ернікаў і так разжавàў іх, што з рòта бы пòламъе шыбàе, патушы̀ў жыду͡оўськіе смаркàчыкі да й цягàе жыду͡оў аднагò за другìм, а ты̀е спужàліса, маўчàць, ні пìснуць, бо яны̀ дỳмалі, што гэто чорт. Схапìў ён перш ландарà, зацёг ягò к азерòду да й запъёр серэдзінаю памìж жардòк. Пішчы̀ць жыд, а вы̀лезці не мажэ̀. Схапìў яшчэ̀ двух-трох жыду͡оў і пазацягàў іх, кагò ў сàжалку, каго ў стаў калà млынà, а кагò запъёр на балòце ў вы̀жар. Разпаўзлìса апу͡ошніе жыды̀, бы рàкі ў траві͡е, хто куды̀ му͡ог да й пахавàліса. А ён пабі͡ег тым чàсам у дву͡ор да й усмалìў пàньськіі͡е пакòі, а сам прыбі͡ег у карчмỳ да збірàе жыду͡оў. Вы̀цягне жы̀да з пад лàвы, сперажэ̀ ягò пàлкаю да й кàжэ: адзін жыд. Пакỳль ён лічы̀ў жыду͡оў, дак ат пакòяў занялàса ахвіцы̀на, ат ахвіцы̀ны пекàрня, ат пекàрні ка-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

нюшня, вазу͡оўня, абòра, свìран да гумнò разам з адры̀наю. Пакуль збі͡егліса лю̀дзі, дак і тушы̀ць нема̀ чагò: зчы̀сціло дву͡ор, бы языкòм злізàло. Сам пан ці бо панìч насìлу вы̀скачыў з агню̀ без партòк. Дагадàўса ён, чыя̀ гэто рабòта, алè немàшака сві͡етак. Алè прàўду кàжуць лю̀дзі, што пан і тагды̀ праў, як сві͡етак чорт маў. Дак і той пан велі͡еў схапìць тагò нàрабка, каб пасадзìць у вастру͡ог. От сабрàў ключву͡ойт сваìх пахòлкаў, да яшчэ̀ й пан паслàў сваю дву͡орню на памòгу, каб схапìць жыдòўськаго пàрабка. Акружы̀лі гэто яны̀ кàрчму су сìх баку͡оў да й пачалì калацìць да шукàць пàрабка. А ён тым чàсам адзі͡еўса ў жыду͡оўськую ву͡опратку, прычапìў бòраду й пèйсы, вы̀мазаўса сàжаю да й вы̀шаў з кàрчмы, так што ягò ніхтò й не пазнàў. Ускòчыў гэто ён на ключву͡ойтаваго каня̀ да й ду̀хам прыскакàў да лàзні, дзі͡е атаўбавàўса пан. Зірну̀ў ён, аш у двары̀ нікòго немàшака, атчынìў ён лàзню да давàй пі͡ерыць, да давàй перы͡эсціць пана ключву͡ойтавым канчукòм. Лу̀піць пàна да прыгавòрвае: от гэто-ж табі͡е к дзі͡еўкам прыставàць да лю̀дзям жыць не давàць. Перш пан крычàў, а потым і замаўчàў. Збіў ён пана на гу͡оркае я̀блыко, садрàў з ягò персцёнак з печàткаю да й кìнуў чуць жывòго.Ператраслì ўсю кàрчму, а пàрабка й слі͡ед прасты̀ў. Шукàй ві͡етра ў пòлі, а чалаві͡ека ў лі͡есі. Тым чàсам парабчу̀к прадàў таго каня̀ да на ты̀е грòшы спрàвіў сабі͡е ву͡опратку, назбірàў ру͡озных зельёў да й хòдзіць сабі͡е па сьві͡ету да лі͡ечыць людзèй. Дзі͡е зі͡елье не памагàе, там ён пашэ̀пчэ, пахукае, та й памòжэ, а не памòжэ, та й так бу̀дзе гòжэ. Куды̀ ні пры̀дзе та зàўжды знàйдзе мну͡ого хвòрых. От прышòў ён і ў ту̀ю вèску, дзі͡е жыў той пан. Ніхтò не пазнàў ягò, й хвòрые на перабу͡ой запрашàлі к сабі͡е. Пачу̀ў аб том пан, што на ўèсцы такì слаўны знахар і папрасìў ягò к сабі͡е, бо яшчэ̀ да тых чàсу͡оў не ачу̀хаўса ат таі͡е пачòсткі, яку̀ю яму̀ даў жыду͡оўські пàрабак. Прышòў той знàхар к пàну, аглèдзяў ягò, дастàў з тòрбачкі якòесь зі͡елье, разтòўк ягò з сàлам да й дòбрэ вы̀шмараваў ім пàна з галавы̀ да ну͡ог. Заплацìў яму̀ пан дòбрые грòшы. От знаху͡ор узя̀ў грòшы да велі͡еў пàну тры дні не змывàць тагò зèлья, а сам і пашòў дàлей да й знік,

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

бы ў вòду кàнуў. На другì дзень пан зару͡оў рòвам, бо з ягò
злі͡езла ўся шкỳра й ці͡ело пакры̀ласо струпàмі, як у шалỳдзька.
Што ён ні рабіў, к якìм дахтару͡ом не і͡ездзіў, ніхтò не памагàе.
Так і згніў той малады̀ пан, бы разлі͡езлы грыб. Тым чàсам
дачкà маскòўкі жджэ-пажджэ̀ свайгò кахàнка, не мажэ̀ ягò да-
ждàцца, а тут чỳе, што пад сèрцэм штось трапèчэцца. Доўго
маўчала янà, а нарэ̀шце прызнàласа мàтцы Тàя наўчы̀ла, як зра-
біць, каб лю̀дзі не даві͡едаліса. От нібы хвары͡эе тàя дзі͡еўка да
й нікỳды ачу͡оў не кàжэ. Ту͡олькі ось і радзіўса ў яі͡е хлапчỳк
з дòўгім хвастòм і з капытàмі на нагàх. Дагадàліса тагды̀ мàтка
й дачкà, што той гàрны хлòпец быў не хто другі, як òбарацень;
затым ад ягò й радзìласо такòе плюгàўство. І задỳмала маскòўка
стрàціць тòе дзіця̀. Алè дачкà пашкадавàла ягò забівàць. Ві͡едамо,
ку͡ожнуй мàцы шкòда свайгò дзіця̀ці. От атнеслà янà тòе дзіця̀
ў глухì лі͡ес і там палажы̀ла ягò, а самà хуцèнько пашлà да га-
спòды да й сустракàе свайгò кахàнка. Спужàласа янà й усе ка-
хàне разлеці͡еласо як дым. Перахрысцìласа янà да давàй бу͡ог
нòгі. Чỳе янà, аж той яі͡е кахàнак зарагатàў, бы жарабèц, да
па лі͡есу й разсы̀паўса. Прышлà янà даму͡оў ні жывàя, ні змàр-
лая, алè як памі͡ешаная. Тым чàсам аб тỳю пòру вернỳўса з ма-
скалёў гаспадàр яі͡е мàткі. Убàчыў ён такòю гòжаю тую дзеў-
чыну й шкòда ямỳ стàло яі͡е. От і давàй ён распытòўваць у сваі͡е
жòнкі, з чàго-б гэто так зрабìласо з тою дзеўчы̀наю. Немà чагò
рабìць, мỳсіла жу͡онка расказàць ямỳ ўсе, як былò. — От, —
кàжэ, — янà занеслà ў лі͡ес на стрàту тòе дзіця̀, дак цепèр з жàлю
й стàла непрыту͡омнаю. — Пачỳўшы тòе, маскàль хуцèнько па-
шòў у лі͡ес, знайшòў тòе дзіця̀ да й прынёс ягò дамòў. Убàчыла
мàтка сваè дзіця̀тко й хỳтко вы̀здараві͡ела. Расцè дзіця̀ як грыб,
і вы̀рас хỳтко гòжы хлòпец. Гуля̀е ён з дзецьмì, ту͡олькі нікòлі
гòлы нікòму не пакàзваецца, а нòгі хавàе ў лàпці. Узру͡ос той
хлòпец і не былò ямỳ ру͡оўні. Такì ён быў зду͡олны да спры̀тны
да ўсягò. Бàло, за што не вòзьмецца, та ўсе зрòбіць, усемỳ дась
рàду. Ту͡олькі памìж людзèй седзìць сабі͡е да слỳхае, а сам маў-
чы̀ць, а калì ўжэ прамòвіць слòво, дак янò такòе му͡оцнае да шчы̀-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

рае, што аж пах ідзè. От пачàў ён збірàцца ў велікую дарòгу, хадзіць па сьвіету да ròзуму набірàцца. Узяў ён кіёчак да пустую тòрбачку й пашòў сабіе вандравàць па сьвіету. Куды ні прыдзе, ўсіе разглèдзіць, разцікуе да й дàлей. Дзіе ўбàчыць, што людзі не віедаюць, як ім жыць, от ён і раскàжэ ім, як жывуць у другіх міейсцах. Бàчыць шатàн, што той чалавіек навучàе людзèй, як на свіеце жыць, што ён перасцерагàе, каб людзі сцерагліса ліхòго, дак і давàй ён спакушàць ягò. Дòўго хадзіў шатàн рàзам з тым чалавіекам, алè нічòго не муог зрабіць. Перш скінуўса ён вèльмі гòжаю дзіеўкаю да й пачàў ягò залучàць к сабіе. Алè той чалавіек і ў той буок не глядзіць. — Што мніе, — кàжэ, — дзіеўка? У жанчыны вòлас дòўгі, да вум карòткі. — Паказàў яму шатàн мнуого грòшэй, каб ён пазàрыўса на іх. Паглядзіеў той на грòшы да й кàжэ: мàбыць грòшы чорт выдумаў, бо з-за іх уся бедà на сьвіеце. Бачнò, што ліхі сабрàў усè ліхòе да й зле-піў грòшы. А хто віедае, што я ў пустуом міейсцы чуць не памёр без яды, хаць і міеў грòшы ў кішэні. Тагды шатàн скінуўса вèльмі дòбрым чалавіекам да й пачàў намаўляць ягò на ўсе дòбрае да й кàжэ: от ты сàмы разумніейшы чалавіек, а шляешса без дзіела. Чаму-б табіе не вучыць людзèй, каб яны ўсіе роўно былі шчаслівые. Зрабі гэ і ты будзеш сàмым слàўным чалавіекам на ўсём свіеце. — Спадабàласо гэто таму чалавіеку, от ён і пытàе шатанà: што ля тагò трэба, каб усіе людзі былі руоўные да ўсіе руоўно былі шчаслівымі. — А я цебè наўчу да й сам буду табіе памагàць, туолькі ты дай мніе ròспіску, што будзеш менè слухаць і тут і там. — Згòда, — кàжэ той чалавіек. От шатàн дастàў папіерак і напісàў карталюшку да й дае падпісàць. А той кàжэ, што не ўміее. — Ну, гэто не біедà. Прарыэж руку да сваёю кròўю й зрабі знак, які хòчэш. Той чалавіек так і зрабіў, пракалòў нажòм шкуру на сваёй руцыэ да кròўю намàзаў сваю міетку. Тагды шатàн даў яму сваю муоц і зрабіў ягò велікім ведзьмарòм, якіх яшчэ не было на сьвіеце. От і пашòў ведзьмàр усе перараблять так, як ён сам думаў, што так найліепш, а шатàн яму памагàе й духам усè ròбіць, што ведзьмàр хòчэ. От і

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

пашлì яны̀ раўня̀ць людзѐй: аднагò падры͡эжуць, астàтак прылòжаць другòму. Зраўня̀лі яны̀ ўсіх людзѐй пад аднỳ мі͡ерку, ту͡олькі зірнỳць, аж сàмі не падхòдзяць пад тỳю мі͡ерку. От шатàн і кàжэ: трэ й нам з усìмі зраўня̀цца. А ведзьмàр адмаўля̀е: а хто-ж бỳдзе людзѐй вучы̀ць да раўня̀ць, як мы бỳдзем такìе, як і яны̀. Ì асталìса яны̀ такìмі, як і былì да й пашлì пытàць людзѐй, шчаслìвые яны̀, ці ні͡е. От ідуць яны̀ да разгля̀дваюць, як жывỳць лю̀дзі да й бàчаць, што куды̀ яны̀ ні пры̀дуць, лю̀дзі тòе ту͡олькі й рòбляць, што падры͡эзваюць адны̀х да надтàчваюць другіх. Ì пытàюць яны̀ ў людзѐй, ці яны̀ шчаслìвы, ці ні͡е. А лю̀дзі й кàжуць: той шчаслìвы, хто лìчыць себѐ шчаслìвым, а мы не мòжэм себѐ лічы̀ць, бо за нас лìчыце нас вы, а не мы сàмі. Дагадàўса тагды̀ ведзьмàр, што хаці͡еў шчàсця ту͡олькі сабі͡е, а ўсіх людзѐй зрабìў нешчàснымі, пазнàў ён тòе да й гòдзі слỳхаць шатанà, алѐ той паказàў рòспіску, схапìў ягò крỳкам пад рабрò да й пацёг у пѐкло. Да тых час, а мо й наві͡екі ві͡ечные бỳдзе той ведзьмàр седзі͡ець у смалі͡е. А лю̀дзі як жылì, так і зноў пачалì жыць.

Стары дзі͡ед Савіцкі.

Бохаво.

66. Як гòжэ.

Гэто былò тагды̀, як пагàные жыдэ̀ схапілі Сỳса Хрыстà да й пачалì ягò мỳчыць да зьдзі͡екувацца. Ві͡едамо, пòгань. Дзі͡е яны̀ вòзьмуць верх, дак ужэ̀ там такòе выдумля̀юць, каб зрабìць як гары͡эй. Мỳчылі яны̀, мỳчылі, алѐ нарэ̀шце не ві͡едаюць, якỳю зрабìць Хрыстỳ сьмерць. Дòўго яны̀ г(g)ерг(g)етàлі, дòўго рàдзіліса, алѐ нічòго не прыдỳмалі. От і павелì яны̀ Хрыстà да сàмаго стàршаго рàбіна. А ён быў ужэ̀ сàмы навỳчны да сàмы разỳмны, бо ўсе на біблì седзі͡еў. Чытàў ён, чытàў, дỳмаў-дỳмаў да й кàжэ, што трэ запытàць хібà самòго Хрыстà. Куды̀ там, не згаджàюцца пагàные жыды̀ пытàць Хрыстà, а вядỳць ягò к другòму рàбіну да й пытàюць тагò, якỳю даць сьмерць Хрыстỳ. Па-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

чаў і той рабін чытаць да думаць. Мысьлеваў ён, мысьлеваў, чытаў-чытаў да й кажэ: калі ўтапіць, та ён выплыве, бо хадзіў па вадзіе й нуог не абмачыў; калі павіесіць, та ён абарвецца. — Пакруціў ён галавою, патруос барадою да й маўляў, што нічого не парадзіць, пакуль не спытае самого Хрыста. Нема чаго рабіць, трэ папытаць. От сабраліса ўсіе паганые жыдэ да й пытаюць Хрыста, якую яму даць сьмерць. Выслухаў Хрыстуос да й кажэ паганым жыдуом: рабіеце, як гожэ. А яны не віедаюць, што гожэ, а што не гожэ, але куолькі яны больш ні пыталі Хрыста, ён ім нічого не атказаў. От тут жыдэ схапілі Хрыста да й укрыжавалі, а рукі й ногі прыбілі гваздамі.

Сакалуоўські.

Бохаво.

67. Марцыпаны.

Добрае было ліето: поначы йшоў цёплы дождвык, а ў дзень лаг(g)уодно прыгравало сонейко, й такое было павіетрэ, што паведзі языком — здаецца бы мёд. Зрадзіло ўсе, як ніколі: цыбуля ў вагароде бы лаза, ў жыце с канём схаваешса, а пшаніца дак аж спелаecа, хаць ты борану прыстаў. Такі даў буох зражай, што нема куды й дзеваць. Пазбіралі людзі збуольшаго с поля, наледавалі пуоўны гумна, намалацілі хліеба на дзесяць гадуоў, насыпалі пуоўны засіекі да ешчэ ў ваўсіе кадушкі да кадаўбы. — Ну, — кажуць — даў буох дабра, туолькі каб было каму спажываць. — Віедамо, калі людзям добрэ, та яны баяцца, дрыжаць, каб не было якое беды. Нашаму брату, гарапашніку заўжды е якое небудзь ліхо. Праўду-ж кажуць, што чорт ліхо збудзе, адно згіне, дзесяць будзе. От як трохі добрэ, та ўжэ й чакай бы вуол доўбні гарыэйшаго ліха. Ніхто так, як бабы. Яны ўжэ голасам галосяць, баяцца таіе беды, якоіе яшчэ й не бачно. Бо самы страшны той страх, якого мы яшчэ не бачылі. Дак от галасілі-галасілі бабы, дрыжалі-дрыжалі людзі ат страху, а беды ніякаіе нема-ш; от і давай яны спажываць дабро да вазіць у местэчко

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

на про̀даж. Ку͡ожын дзень, як дась бу͡ог ра̀нак, дак ключо̀м цяг-нуцца по̀ўныя ху̀ры хлі͡еба ў местэ̀чко. Туды̀ і͡едуць ціхо, ту͡олькі вазы̀ скрыпяць, а як варо̀чаюцца пазад, дак тагды̀ ўсю̀ды чува̀ць весѐлы го̀ман да пі͡есьні. Бачно̀, што лю̀дзі варо̀чаюцца с кірмашу̀. Адны̀ тро̀хі вы̀пілі, та набра̀ліса разо̀ну, другі̀е чу̀юць у мага-лі͡ейцы. А што̀ ні гавары̀, гро̀шы мно̀го даю̀ць разо̀ну. Як нема̀ асьмаку͡оў, та от так кала̀ сѐрца й завіва̀е, а як чу̀еш у кішэ̀ні, та й на сѐрцу весялі͡ей. Гро̀шы не музы̀ка, а як яны̀ зайгра̀юць, та й скака̀ць хо̀чэцца. Заты̀м то с кармашу̀ варо̀чаюцца лю̀дзі весё̀лые: паю̀ць пі͡есьні да смею̀цца, раго̀чуць бы падшпа̀ркі. От гэ было̀ вѐсело на сѐрцу Паўлюку̀, як ён прада̀ў у местэ̀чку цы͡элы ву͡оз пшаніцы да набра̀ў гро̀шэй по̀ўну кішэню. Дай, ду̀мае Паў-лю̀к, куплю̀ то̀е сма̀чнае, што паны̀ едзя̀ць, да й сам зъі͡ем. От захо̀дзіць ён у кра̀мку, алѐ ба̀чыць, што там не жыду͡оўка тар-гу̀е, а які̀сь пан ці мо пані̀ч. А ў кра̀мцы такі̀ пах, што ню̀хаў бы дзень й ну͡оч. Пакруці̀ў Паўлю̀к но̀сам, ду̀мае, што не туды̀ па-па̀ў, і хаці͡еў су̀нуцца з кра̀мкі, алѐ ось пан цыта̀е, што трэ. — Мні͡е трэ купіць марцыпа̀наў — ка̀жэ Паўлю̀к. — До̀брэ, — ка̀жэ аптака̀р, — пачака̀й тро̀хі. — Ба̀чыце, Паўлю̀к, зайшо̀ў у апцэ̀ку. От заплаці̀ў Паўлю̀к аптэкару тры рублі̀, а той пада̀ў яму̀ штось, завіну̀ўшы ў папі͡ер. Паўлю̀к ду̀маў, што за тры рублі͡е аптака̀р дась яму̀ марцыпа̀наў цы͡элае бярэ̀мя, адно̀-ж той даў ту͡олькі, што й у жмѐні схава̀ецца. Пакруці̀ў-пакруці̀ў Паўлю̀к марцы-па̀ны пѐрад ачу̀, паглядзѐў на сваю̀ велі̀зазную ка̀йстру, ў като̀-рую ду̀маў схава̀ць марцыпа̀ны, паню̀хаў сву͡ой тава̀р — чу̀е, што до̀брэ па̀хне, да й пасу̀нуўса к во̀зу. От напаі̀ў ён кабы̀лу, па-дабра̀ў раскі̀даны муру͡ог, усхапі̀ўса на драбі̀нкі да й патарахці͡еў да гаспо̀ды. От вы̀ехаў ён за местэ̀чко да ўсе цэё̀бае, паганя̀е кабы̀лу: вѐльмі хо̀чецца худчы͡эй прыі͡ехаць да гаспо̀ды да па-про̀буваць марцыпа̀ны. От тарахці̀ць ён да ўсе сплё̀ўвае, бо слі̀на от так і чэчэ̀, — вѐльмі хо̀чэцца папро̀буваць марцыпа̀ны. От да-ста̀ў ён з кішэ̀ні марцыпа̀ны, паню̀хаў, сплю̀нуў слі̀ну да й зно̀ў палажы̀ў сма̀чны гасці̀нец у кішэ̀ню. Яшчэ̀ гары͡эй пача̀ў цэѐ-баць кабы̀лу да гі̀каць на ўсе го̀рло. Та̀я ту͡олькі хвасто̀м кру̀ціць

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

да пасцыквае, а шпаркасці ніякаіе немаш. От церпіеў-церпіеў Паўлюк да й у другае дастаў марцыпаны. Перш ён панюхаў іх, а потым давай памаленьку лізаць. Лізаў-лізаў, аж пачала піена з роту падаць, бы с кабылы, як яна доўго й хутко прабежыць. Запіеніўса Паўлюк марцыпанамі да й не бачыць, што сусіедзі ззаду нагналі. От параўняліса яны, а адзін сусіед да й пытае:

— Паўлюк, што ты есі?

— Марцыпаны — атмаўляе той і апцірае рукавом піену.

— Якіе табіе марцыпаны, — гэто-ж мыло.

— Было-б і табіе міло, каб даў тры рублє, — атказвае Паўлюк да жумрыць мыло, аж за вушамі трашчыць, бо не то міло, што міло, а то міло, што дораго.

Калеснік.

Перэвалака.

68. Дабро й ліхо.

Праўду кажуць людзі, што ніколі не згадаеш, дзіе ліхо, дзіе дабро спаткаеш. От так і ходзіш усю жытку бы ў пацёмках, ходзіш і не віедаеш, што цебе сустрыэне. Адзін кажэ, што дабро зьяе бы сонцэ, што мы любім яго сьвіет, але жмурым вочы, бо яго ніельга вытрымаць. Другі кажэ, што дабру людзі вочы выкалалі, дак яно цепер і не ходзіць па сьвіету, а седзіць сабіе на нёбе да ціешыцца, што яму добрэ. Дак за тое ліхо бы ціень ходзіць за чалавіекам да цікуе, каб яго ўкусіць. А што праўда, што крыўда — багі яго віедаюць, бо часам лепшыэй праўда спаліць, чым ліхо пахваліць. От раскажу вам, якое колісь было здарэньне. Жыў сабіе адзін біедны чалавіек. Быў ён такі ціхі, што й вады не замуціць. Працаваў за двох, а гараваў за трох. Мо ліхо ніколі яго не пакідало, а ён ціхенько робіць сваё дзіело да ўсе церпіць. Мо за тое й прадражнілі яго Ціхонам. Жыве сабіе Ціхуон у сваёй старэнькуй хатацы да маўчыць, зубы сцяўшы, хаць часамі нема за што рук зацяць. Дзівяцца людзі, як гэто Ціхуон такі біедны, такі нешчасливы, а маўчыць бы трава, ні

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ла̀ецца, ні праклі̀на̀е сваі͡е дѐлі, ні заві̀дуе лю̀дзям. Ты̀е пыта̀юць: як ты жывѐш, Ціху͡он? Гэ̀тож у цебѐ нічо̀го нема̀! — От жыву̀, як бу͡ог даў, — атка̀жэ ён да й маўчы̀ць. Алѐ лю̀дзі любі̀лі Ціхо̀на, бо ві͡едалі, што ён до̀бры чалаві͡ек, ту͡олькі лічы̀лі, што яму̀ не даў бу͡ог до̀браі͡е до̀лі. А ві͡едамо, калі̀ е до̀бры чалаві͡ек, та чорт ні на крок не атсту̀піцца ат ягò, дзень і ну͡оч ціку̀е, каб як ягò спакусі̀ць. От бі͡егаў, бі͡егаў чорт за Ціхо̀нам мо ку͡олькі гаду͡оў, ужэ̀ збі͡егаўса бы хо̀рт, а нічо̀го не мо̀жэ пара̀дзіць, — маўчы̀ць Ціху͡он да жывѐ, як бу͡ог велі̀ць. От чорт і ду̀мае, чым-бы спакусі̀ць Ціхо̀на. — Ось я забяру̀ ў ягò апу͡ошняе, — ду̀мае чорт, — от тагды̀ ён бу̀дзе наракà̀ць на бо̀га. — Была̀ ў Ціхо̀на адна̀ кару͡оўка да й та̀я безхво̀стая. От чорт загна̀ў яі͡е ў бало̀то, дак яна̀ там і залі̀ла̀са. Паба̀чыў то̀е Ціху͡он, перахрысці̀ўса да й ка̀жэ: бо̀жая во̀ля. Атско̀чыў чорт ат Ціхо̀на мо на цы͡элые го̀ны да й неві͡едае, што рабі̀ць. Палеці͡еў ён у пѐкло, а там чэ̀рці з ягò смею̀цца да кепку̀юць, што Ціхо̀на не мажэ̀ спакусі̀ць. Уцёк чорт з пѐкла да й агіна̀ецца ў раю̀, хо̀чэ там разню̀хаць, чаму̀ быва̀юць праўдзі̀вые лю̀дзі. Ту͡олькі ось уба̀чыў ягò бу͡ог да й пыта̀е, ці зна̀е ён праўдзі̀ваго Ціхо̀на. Схлусі̀ў чорт і ка̀жэ, што не зна̀е, бо яму̀ вѐльмі со̀рам было̀ прызна̀цца. І про̀сіць ён бо̀га, каб пазво̀ліў яму̀ зрабі̀ць над Ціхо̀нам пра̀хтыку, які̀ ён праўдзі̀вы чалаві͡ек. Бу͡ог пазво̀ліў. Палеці͡еў чорт на зѐмлю да й падъю̀дзіў жыду͡оў, каб яны̀ абакра̀лі цэ̀ркву. Залі͡езлі жыды̀ ну͡оччу ў цэ̀ркву да й забра̀лі там гро̀шы, алѐ пабая̀ліса несці̀ к сабі͡е, каб ча̀сам не знайшлі̀, а захава̀лі іх у дупленя̀тую вербу̀, што схілі̀ласа над пло̀там Ціхо̀на. Ту͡олькі адзі̀н зло̀дзей узя̀ў сабі͡е срэ̀бны крыж да й замурава̀ў яго ў ко̀мін у ка̀рчме. Агледзі͡еліса лю̀дзі, пачалі̀ шука̀ць зладзі͡еяў, — нема̀, бы ў во̀ду ка̀нулі. Тым ча̀сам чорт падня̀ў такі̀ ві̀хар, што аж ха̀ты пазваро̀чвало да паламàло дзераўля̀кі. Злама̀ло й ту̀ю вербу̀. Пашо̀ў Ціху͡он сі͡екці ту̀ю вербу̀ на дро̀ва да зірнѐ, аж там у дуплі̀ гро̀шы. Палічы̀ў ён ты̀е гро̀шы да й пашо̀ў пыта̀ць у папа̀, ці не яны̀ ўкра̀дзены ў цэ̀ркві. Зірну̀ў пу͡оп да й пазна̀ў ты̀е гро̀шы да й ка̀жэ Ціхо̀ну: дава̀й падзі͡елімасо, та я ніко̀му не скажу̀, што ты ўкраў. — Я не

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

краў, — кàжэ Ціхӯон, — а грòшы гэто бòжые, трэ аддàць у цэркву. — Абазліўса пӯоп да й сказàў лю̀дзям, што гэто Ціхӯон абакрàў цэркву, алѐ сòвесь замӯчыла, дак прынѐс назàд грòшы. Схапілі Ціхòна, звезàлі яму̀ ру̀кі, забілі ў калӯодкі нòгі да й пасадзілі ў вастрӯог. — Ну, — ду̀мае чорт, — яшчэ̀ гарӹэй я нарабіў. Цепѐр Ціхӯон саўсім святы̀. А я-ж ду̀маў, што ён вòзьме грòшы сабі̑е да разбагаці̑ее, дак тагды̀ не вàжко ягò спакусіць. — Тым чàсам тàя бу̀ра раскідала стару̀ю кàрчму да й абернула кòмін. А ў жыдӯоў была̀ вескòвая дзі̑еўка за нàймічку. Убàчыла янà ў кòміне крыж да ду̀мала што гэто цуд, пабі̑егла янà скарӹэй у цэркву да й сказàла лю̀дзям. От велі̑еў пӯоп забрàць пратэ̀сы да абразы̀, й пашлі̀ яны̀ ў ту̀ю карчму̀. Зірну̀ць яны̀, аж гэто той крыж, што зладзі̑еі ўкрàлі ў цэркві. От тагды̀ схапілі тых жыдӯоў да й пасадзілі ў вастрӯог, а Ціхòна аслабанілі. Тӯолькі, ві̑едамо, жыды̀, падмàзалі яны̀ каго̀ трэба да й аслабаніліса з астрòгу. Сердзіты яны на Ціхòна, што ён знайшòў ты̀е грòшы; от узелі̀ яны̀ да й падпалі̀лі Ціхòнавую хàтку. А Ціхòна не было̀ дòма, бо ён пачу̀ў, што які̀сь чалаві̑ек за ракòю ґукàе, прòсіцца на праміілы бòг, каб ягò перавезлі̀ цѐраз рӹэку. Ві̑едамо, кӯожын глядзіць свайгò дзі̑ела, — ніхтò й не варухну̀ўса, каб перавезці̀ тагò чалані̑ека. Шкòда ягò стàло Ціхòну, от ён сі̑еў на чòвен да й папхàўса. Ракà была̀ шырòкая, паку̀ль ён перапхàўса на другі̀ бӯок да пасадзіў тагò чалаві̑ека, зірнѐ на ўѐску, аж ягò хàтка гары̀ць бы сві̑ечка. — Вòля бòжая, — ду̀мае ён да ціхенько грабѐ веслòм, каб не затапіць дзірàвы чòвен. Паку̀ль яны̀ перабхàліса, дак ат Ціхòнаваі̑е хàткі тӯолькі вуглі̀ да галавѐшачкі засталіса. А лю̀дзі стая̀ць калà пòжару да кàжуць: што яі̑е тушы̀ць, калі̀ янà у̀жэ так згнілà, што засталàса аднà парахня̀. От падышòў Ціхӯон з тым чалаві̑екам к пòжару да й кàжэ: ну, браткò, немà чым цебѐ частавàць, немà дзі̑е й сапачы̀ць табі̑е з дарòгі, хібà ось цебѐ вòзьмуць к сабі̑е дòбрые лю̀дзі. Прымі̑еце, браткі̀, падарӯожнаго чалаві̑ека, — кàжэ ён лю̀дзям. Павелі̀ яны̀ тагò чалаві̑ека к сабі̑е на начлі̑ег, а Ціхӯон так адзін і застàўса без вечэ̀ры калà вӯогнішча. Атышліса лю̀дзі ат пòжару, а той

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

чалавіеек і кàжэ пра Ціхòна: от браткì, бòжы чалавіеек. Хатà ў яго гарыць, а ён ціхенько менè перавòзіць цèраз рыэку, каб не замачыць. Мо немàшака такòго дòбраго чалавіеека на свіеце.— Алè-ж, — згаджàюцца лю̀дзі, — дòбры, праўдзìвы чалавіеек Ціхуон, туолькі ліхую яму̀ даў буог дòлю. А ты-ж скуль, чалавіеечэ?— З далèка, маіе лèбедзікі, — кàжэ ён. Пачалì тут лю̀дзі прызірàцца да й пазнàлі, што гэто той канакрàд, што мо ў ваўсёй акру̀зе крàдзе кòні. Куолькі раз ягò лавìлі да саджàлі ўваструог, а ён хаць-бы што? Заплàціць там каму̀ трэ да й зноў цягàе кòні. Пазнàлі ягò лю̀дзі да й звезàлі, бо ён яшчэ недàўно ўкрàў тут пàру кòней. За ім гнàліса да немаглì злавìць, бо ён ускòчыў на канѐ, падлажыў яму̀ пад хвуост вераўчыну з вузлàмі да як пачàў шмаргàць, дак куонь так хуткo пабіег, што ніхтò не дагнàў.— Э, ён вèльмі хвàліць Ціхòна, — кàжуць лю̀дзі, — мàбыць яны̀ ў хаўру̀се крàдуць кòні. Да бачнò, прàўду казàў пуоп, што Ціхуон абакрàў цэркву. Бàчыце-ж жыдуоў пусцìлі, нашлì, што яны̀ не вінавàты. — От і пачалì Ціхòна зноў цягàць, цягàць за тòе, што ягò пахвалìў злòдзей. Дòбрэ яшчэ, што знашòўса адзìн чалавіеек, што ён з Ціхòнам усю̀ тую нуочку, як абакрàлі цэркву, рàзам лавìў рыбу. От ён стаў свіедкаю да й памуог Ціхòну асла-банìцца. Верну̀ўса Ціхуон на сваè папелìшчэ да й стаў перагра-бàць пòпел, каб тут на старуом міейсцы збудавàць сабіе нòвую хàтку. Пераграбàў ён пòпел да й знайшòў там мнуого грòшэй. Хаціеў ён аддàць іх на цэркаў, алè буог яму велііеў самòму спажывàць. І стàў з тых чàсаў Ціхуон дòбрэ жыць да бòга хвалìць. Дак, бàчыце, нікòлі не згадàеш, што дабрò, а што лìхо, бо часàмі ліепш вòраг спàліць, чым злòдзей хвàліць. Цягàўса, цягàўса за Ціхòнам чорт, нарэшце плю̀нуў да й палеціеў у пèкло, бо так задурыўса, што й сам не разберэ, што лìхо, а што дабрò.

Калеснік.

Перэвалака.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

69. Платуон казак.

У двананцатуом гаду падняуса на біелаго руськаго цара прапцуз Напальён. Нагнаў ён сюды вуойська бы цёмная хмара да й пачаў паліць вёскі, гарады да забіваць людзей. Пахаваліса людзі, хто пасьпіеў у ліес, ці за балото, загналі туды ўвесь свуой статак, а дабро закапалі ў землю. Знішчылі прапцузы ўвесь край, змарнавалі ўсе дабро, так што й самі пачалі падыхаць з голаду. Пераіелі паганые сабак да катуоў, палавілі мышэй да пацукуоў, пастралялі ўсіх варуон да й паіелі ўселякую погань. Сам цар Напальён ходзіць сабіе на балоце да ловіць жабы або чарапахі, каб пасілкавацца, бо голад не свуой брат, куожнаго як засмокчэ, дак гатуоў сам сабіе руку адгрызці. Соваюцца галуодные прапцузы бы сонные мухі да збіраюць чарвякуоў, жукуоў да ўселякіх слізнякуоў, каб хаць гэстаю пошкудзью набіць сабіе лантух. От і пачалі людзі памаленьку вылазіць з ліесу да дабіваць тых гадаў. Зберуцца яны дзіе-нёбудь грыэцца ў хату, а тут бы з землі выныриe Платуон казак да й запаліць атусюль тую хату. Пекуцца прапцузы бы картопля ў прыску, пекуцца, а вылезці з хаты не могуць, бо дзьверы калом падперты. Гуляе Платуон казак та тут, та там і ніяк яго не могуць злавіць прапцузы. Абецаў Напальён велікі гасцінец таму, хто зловіць Платона казака, ці хаць скажэ, дзіе ён. Але ніхто не мажэ таго сказаць, бо Платуон казак летае бы арол, плывае бы шчупак, біегае бы хорт. От пераадзіеўса ён за купца да й прыіехаў к Напальёну, нібыто прадаваць хліеб. Прымае яго Напальён да й пытае: — ой ты слаўны купец-маладзец, ты ўсюды па сьвіету бываеш, усе бачыш, усе знаеш, мо Платона дзіе стракаеш? — Ну, нема таіць чаго, — добрэ знаю я яго. — Цар тут разам схаменуўса, на Платуона азірнуўса. Дак казак той не дурак, паказаў яму канчак. Замахнуўшыса з плеча, рыэзнуў трэйко з гарача, аж зваліласа карона; сам ускочыў у стрымёна да й крычыць: — лаві Платона. — От такі то быў казак, што прапцузам даўса ў знак. Ён па полю

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

разъезжджàе, страх на вàрмъю наганяе, пàліць яняpàлаў хàты да берэ ат іх гармàты; забегàе на дарòзі, тòпіць вуойсько у Берòзі. От адзін стаў Напальён, хаць прыўеў да нас мільён. От і іедзе той казàк на пòлю, сміело даў канячы вòлю. Жыто пòруч каласіцца, крыж за гуоркаю ласніцца. Сòнцо грыэе, аж печэ, туолькі пуот с ылба цечэ. От ён шàпачку здымàе, бòга шчыро праслаўляе, што памуог пранцуза раць з крàя руоднаго прагнàць. Туолькі ў жыце зашуміело, рàптам сэрцэ бы згарыэло. Туолькі ён перахрысціўса да й на карак да каня схіліўса. Казакуоў падбіегло двòе. — Мàбыць міесто тут ліхòе. — Перш пранцуза тут забілі, а Рамàнава местэчко на жалòбу запалілі. Бы свіечà дамы палàюць, — то Платòна памінàюць. Слёзанькі з вачэй цекуць, піесню-ж казакі паюць, як велікі той казàк згінуў дàрам небарàк.

Калеснік.

Перэвалака.

70. Цыгàн.

Валачыўса па свіету цыгàн. Сам ён не віедаў, дзіе ён радзіўса, дзіе ён хрысціўса. Валачыўса ён да ўсе распытòўваў у людзèй, ці былà ў ягò мàтка, ці ніе, а пра бàцька й не пытàўса, бо ўперуод дазнàўса, што ў ваўсіх цыгануоў немàшака бацькуоў. І пачàў той цыгàн усіх жанчын назывàць мàткамі, а куожнаго мушчыну бàцькам. Куды ні прыдзе цыгàн, та й прòсіць: дай мніе, матулька, кусòчак сàла, каб табіе жытка ліепшая стàла, дай яèчак да лычко каўбàс, та й будзе з нас. Сустрыэне гаспадарà, дак і кàжэ: дабрыдзень, бàтю, вам! Ці рàды вы нам? Чагò, бàтю, зажурыўся, што так рàно ажаніўся? Не журыся, не турбуй, друобных дзіетачак гадуй. Дзіеткі падрастуць, — стракачà дадуць, а ты, бàтю, не гаруй да гадуй, гадуй. Чàсам тàя «матулька» зàмест сàла да каўбàс дась цыгану на квас, а тут гаспадàр падаспіее да «сынòчка» абагрыэс — цыэпам ці якòю капюбòю. Дак ат «лàскі» не прапàсці. Ён нарòвіць, штоб укрàсці. Так валòчыцца цыгàн бес клапòту, бàццэ пан. Раз ягò пачаста-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

вàлі, — чуць касцèй не паламàлі. З клèці кìнулі за плу͡от. Дак цыгàн жывỳч бы ку͡от: трòхі дòле атлежàўса да й у лі͡ес папхаўса. Там сустрі͡эў дзеўчыну маладỳю да прыгòжую такỳю, што не бàчыў сьві͡ет мо праз сотню лі͡ет. Блìснуў тут цыгàн вачàмі, бàццэ зъі͡еў бы з патрахàмі. Ту͡олькі дзі͡еўка тàя — ві͡едзьма хìтрая старàя, цыганà к сабі͡е наймàе, — мі͡ех чырву͡онцаў абецàе, як ён дзень рабòту парòбіць да пòту. Дак не так ён зòлата жадàе, як на дзі͡еўку пазірàе. Ï служыць гату͡оў без плàты, бо ягò не выганіш і з хàты, дзі͡е дзеўчына маладàя ву͡очкамі бліскàе. От згадзіліса на плàту да й пашòў цыгàн у хàту. Дзі͡еўка ў стỳпу вòду налівàе да ягò пытàе, ці таўкцì вадỳ умі͡ее, ці да вèчара паспі͡ее стỳпу высушыць да дна, бо хаць кàпелька аднà вадỳ зрòбіць мнòго тут бедỳ. Той цыгàн калì наняўса, дак ён бàццэ запрадàўса, стаў абі͡еручкі таўкцì, бàццэ крỳпы ля куцì. Ту͡олькі, ві͡едамо, вадà, — брыські скàчуць, аж бедà. Кìнуў на дзеўчыну вòкам, — мàбыць закахàўса не нарòкам. Дзі͡е дзеўчына, сам не знàе да дакòла пазірàе, аж на дòле кàла стỳпы грòшэй кỳпы. От цыгàн у мі͡ех зграбàе да хуцèнько упекàе. Сòнцо пàліць, сòнцо грі͡эе, ві͡етрык жàрам ві͡ее. К вèсцы цягнецца цыгàн. — Буду, — дỳмае, — я пан. Што схачỳ, — куплю за грòшы, — бу͡ольш не бỳдуць грызці вòшы. — Сòнцо пàліць, сòнцо гры͡эе, ві͡етрык жàрам ві͡ее. Смàга тòміць, смàга пàліць, аж ягò да дòлу вàліць. — Бàтю, дай вадзіцы да халòднаі͡е з крынìцы. — Прòсіць той цыгàн. — Не велìкі пан, — кàжуць рàзам мужыкì, — вонь цягнìса да ракì. Кòней крàсці, дак умі͡ееш, та й напìцца там пасьні͡ееш. — Батю, дай вадзіцы, заплачỳ. — Хармазòнськіх грòшэй не хачỳ. — От нажыў цыгàн бедỳ, што з грашыма без вадỳ да без ядỳ! Хòдзіць з мі͡ехам за плечàмі, ту͡олькі лỳпае вачàмі. Цяжко грòшы валачыць, як на іх і хлі͡еба не купìць, лèпі͡ей і не жыць. Скìнуў мі͡ех цыгàн на пень, сі͡еў і плàчэ цы͡элы дзень. Ту͡олькі вось чарцюк падхòдзіць і такỳю ры͡эч завòдзіць — мнòго ты па сві͡ету шляўса, а вумà, бра, не набрàўса. Мàеш зòлата мешòк, бàццэ жòўценькі песок, да неўмі͡ееш, як спажыць, дак хадзì ка мні͡е служыць, навучỳ на сві͡еце жыць. Ту͡олькі ты зрабі ра-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

бòту, пакасì дзенёк да пòту. — Тут цыгàн з землì схапìўса, кìнуў грòшы да й пусцìўса бі͡егці па шырòкум пòлі да шукàць сваі͡е ён дòлі, каб нікòму не служы̀ць да без дзі͡ела ві͡ек пражы̀ць.

Тычына.

Пешчанка.

71. Цыгàн музы̀ка.

Быў адзìн цыгàн да якìсь шалапавàты, не ўмі͡еў ён крàсці, бо баяўса прапàсці, не ўмі͡еў кòней лечы̀ць, а хаці͡еў так сабі͡е жыць. Нічòго ён не дбаў, ту͡олькі на скры̀пачцы йграў. Былà ў ягò скры̀пачка маленькая да дарагенькая. Аткỳль ён яі͡е дастàў, дак і сам не знаў. Тàя скры̀пка так іграе, так вырàзно вымаўляе, што здаёцца душà з ці͡елам растаёцца. Ігрàў цыгàн у пану͡оў, ігрàў у жыду͡оў, іграў на весèльлі да на ігры̀шчах, дзі͡е людзі прасìлі, дзі͡е грòшы плацìлі. Што цыгàн захòчэ, скры̀пка плàчэ, ці рагòчэ. От здаёцна, скуль і гòлас той берэцца. Грàе цыгàн, грàе да нарэшце заспевàе. — Хвàцько, — кàжуць, — ён ігрàе, бо такỳю скры̀пку мàе, — што гавòрыць і спевàе. — Дак ніхтò не знаў пра то, як цыгàн часàмі граў над стàвам за вербàмі, як ён дỳшу атвадзìў, што без мìлаі͡е нудзìў. От седзìць цыгàн на змрòку. Стаў шырòкі збоку. Вèрбы ві͡етачкі спусцìлі. Зу͡оркі гòжэ засьвецìлі. Заіграў ён цìхо, цìхо, аж спалòхаласо лìхо. Жàбы крỳмкаць перастàлі. Лìсцікі з вербы̀ упàлі. Не лістòчкі, а дукàты. Чỳе гòлас: — будзь багàты. Ку͡олькі хòчэш забірàй, ту͡олькі скры̀пку мні͡е прадàй. — І выхòдзіць з стàва гìдкая праява, — чòрцік невелìчкі, жвàвы, ну͡ос гарбàты, лоб карàвы; над вушàмі мàбыць ру͡ожкі, з капытàмі ну͡ожкі; між нагàмі хву͡ост сагнỳўса. Той музы̀ка схаменỳўса. — Скры̀пку, — кàжэ, — я прадàм, ту͡олькі перш пайграю сам. — Згòда. — Чорт на знак вільнỳў хвастòм да й сагнỳўса пад кустòм. От музы̀ка смы̀кам цягне, аж далìна зьвягне, пàлцамі перабірàе, аж на сэрцы грàе. Лі͡ес прыцìх, прыцìхлі кві͡еткі, засмуцìліса палі͡еткі. Нèбо плàчэ, слёзы льюцца; камары̀ бу͡ольш не таўкỳцца. Стаў тут чорт хвастòм

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

круціць да ў кулàк трубіць. От цыгàн суняўса да й з ігрòю папрашчàўса. Скрыпку ён патруос бы грўшу да з грудзèй і выняў дўшу. Чорт грашмì ягò абсыпаў, скрыпку ўзяў да чуць зарыпаў. Рад, што й так іграе. От цыгàн у міех збірàе грòшы, міех кладзè на плèчы, каб схавàцца ат пусьцèчы. Прàшкі! Ат ліхòіе сілы не схавàешса, муой мілы. Чорт тры дні смыкòм цягàе, скрыпка свішчэ, да не грàе. — Ніе, хаць скрыпка дòбрэ грàе, да душы янà не мàе, сэрца не шчыпàе,—дагадàўса чòрцік жвàвы.— Я купіў не ля забàвы. — Чорт схапіў яіе пад пàху да й даў мàху, хўтко пòле й ліес прайшòў, пòкі цыганà найшòў. — Бàчыш, скрыпка без душы. На-ж іграй і мніе служы. — От з тых час цыгàн іграе, туолькі чòрта пацешàе, бо ў ігры немà душы, хаць на бòга ты брашы.

Тычына.

Пешчанка.

72. Буог віедае, што рòбіць.

Жылì сабіе двòе маладых. Яны туолькі яшчэ недàўно пабрàліса, як гаспадàр пашòў у ліес пушчàць дзèраво да зненàцку паслізнўўса калà пня да й папàў пад калòду. Дзèраво так прыціслo ягò, што й дух вон. Засталàса маладзіца ўдавòю да яшчэ й тòўстая. Што тут рабіць, як тут аднуой жыць, як упраўляцца з гаспадàркаю? Былà янà вèльмі гòжая да ўдàлая жанчына, алè віедамо, тòўстая, — ніхтò не паквàпіцца хўтко ўзяць зàмуж. От упраўляецца янà аднà з гаспадàркаю да чакàе пары. Па немàлум чàсе падышлà парà, й радзіўса ў яіе гòжы хлапчўк. Сышліса бàбы, даюць ёй ратўнак да бàбяць дзіця. А віедамо, як чалавіек рòдзіцца, буог пасылàе ямў àняла. От буог прызвàў аднагò àняла да й пасылàе, каб ён пашòў да таіе маладзіцы да й узяў у яіе дўшу, а сам застàўса з дзіцем. Прылеціеў àнял к туой жанчыне, зірнўў на малèнькае дзіцятко й шкòда ямў стàло рабіць ягò так рàно сіратòю. — Не дòбрэ рòбіць буог, — падўмаў ён, — як бўдзе жыць гэстае дзіця без айцà й без мàткі. — Ї не паслўхаў ён

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

бо̀га, хаці͡еласо яму̀ зрабіць лі͡епш. І заста̀віў ён ту̀ю жанчы̀ну ў жы̀цю. Прагні͡еваўса бу͡ог на таго̀ а̀няла, атабра̀ў у яго̀ кры̀ла да й велі͡еў служы̀ць лю̀дзям, а к таму̀ дзіця̀ці прыста̀віў друго̀го а̀няла. От той пѐршы а̀нял аста̀ўса ў ту͡ой вѐсцы й наня̀ўса к папу̀ па̀рабкам. Вы̀здаравела та̀я маладзіца да ста̀ла яшчэ̀ хараш͡ыэй як была̀. Пачалі̀ к ёй сва̀тацца харо̀шые да бага̀тые жаніхі̀ лі͡епш як к дзі͡еўцы, да̀рам, што ўдава̀. Кру̀ціць яна̀ хвасто̀м да ту͡олькі падма̀ньвае та аднаго̀, та друго̀го. І набрало̀со ў яі͡е такі̀м пара̀дкам жаніху͡оў мо цы͡элы ту̀зін. Абрабля̀юць яны̀ ёй по̀ле, дагляда̀юць гаспада̀рку да адзі̀н пѐрад другі̀м услуго̀ўваюць да но̀сяць ёй ру͡озные падару̀нкі. А яна̀ ціхенько зню̀халаса з сусі͡едам да адбіва̀е яго̀ ат маладо̀і͡е жу͡онкі да ат дру͡обных дзі͡етак. Жывѐ маладая ўдава̀, бы сыр у ма̀сле кача̀ецца да пі͡есьціць свайго̀ хлапчука̀. А той падру͡ос і̀ ніко̀го не слу̀хае. І пачалі̀ ты̀е жаніхі̀ адзі̀н пѐрад другі̀м насі̀ць таму̀ хлапчуку̀ ру͡озные падару̀нкі, каб хаць тым спадаба̀цца ту͡ой удаві͡е. Пі͡есьціць ма̀тка да пі͡есьцяць яі͡е жаніхі̀, от яны̀ так распі͡есьцілі таго̀ хлапчука̀, што ён стаў ні к чо̀рту не варт. Як ту͡олькі ён тро̀хі падру͡ос, так дава̀й ла̀зіць у чужы̀е сады̀ да агаро̀ды. Ма̀тка, за̀мест таго̀, каб ушчува̀ць, дак яшчэ̀ гар͡ыэй пі͡есьціць свайго̀ сынка̀ да гла̀дзіць яго̀ па галу͡оўцы. І вы̀рас з яго̀ такі̀ ўрві̀с да зло̀дзей, што ту͡олькі ў сьві͡еце пашука̀ць. Залі͡ез ён раз к папу̀ ў і̀сьцёпку да й пакра̀ў там каўба̀сы да палендві̀цы. Накла̀ў ён дабра̀ по̀ўную ка̀йстру да чуць плі̀шчыць на загумѐчэ, дзі͡е яго̀ чака̀лі таварышы̀, такі̀е-ж зладзейчукі̀ як і ён. Тым ча̀сам той а̀нял у гумні͡е малаціў да й закмі͡еў зло̀дзея. Вы̀скачыў гэто ён з гумна̀ з цы͡эпам да й замахну̀ўса, каб папужа̀ць. Кі̀нуў зладзейчу̀к ту͡орбу, вы̀хапіў канча̀ты ну͡ож да й кі̀нуўса на папо̀ваго па̀рабка, алѐ як пырпуў ён нажэ̀м, так і заста̀ўса на мі͡есьце бы ўко̀паны. Падышо̀ў тут пу͡оп да дава̀й яго̀ страмі̀ць да ла̀яць. От атпусьці̀ў а̀нял зло̀дзея й дарава̀ў яму̀ то̀е на пѐршы раз, ту͡олькі заказа̀ў, каб бу͡ольш ён нічо̀го не краў. Абазлі̀ўса зладзейчу̀к да й падпалі̀ў ну͡очу папу͡оўські̀і͡е харо̀мы, а сам і пабі͡ег у по̀ле. Збі͡егліса лю̀дзі на по̀жар да насі̀лу патушы̀лі, чуць уся̀ ўѐска не згар͡ыэла. От даў

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

буог сьвіет, і пашоў папуоўські пàрабак сачыць, хто гэто падпаліў харòмы. Бàчыць ён на расіе сліед. Пашòў ён па таму сьліеду да й вЫсачы тагò зладзейчукà, алè нікòму не сказàў. Туолькі тагдЫ дагадàўса àнял, што саграшЫў бòгу, як пашкадавàў тагò дзіцяці да ягò мàткі. Дагадàўса, што буог знàў, што рабіў, калі веліеў узяць дўшу ў таіе жанчЫны, каб янà самà не грашЫла да й сЫна не піестувала да не бэсьціла. От пачàў ён хадзіць у цэркаў, пачàў кàяцца да прасіць бòга, каб дараваў яму грахі. ПрЫдзе той àнял ў цэркаў да й мòліцца, пакўль пачнўць піець харувімы, а пòтым хўценько вылàзіць з цэркві. Дзівяцца людзі, чаму гэто папуоў пàрабак нікòлі не дастаіць да канцà. Сказàлі янЫ аб туом папу. Пазвàў пуоп пàрабка к сабіе да й пытàе ягò, чаму ён стаіць у цэркві туолькі да харуімськаіе піесьні, а пòтым хўценько выхòдзіць з цэркві. А пàрабак адмаўляе, што так буог веліеў. Немà чагò яму казàць, бо ён сам заўжды гавòрыць людзям, што тòе, ці сёе буог веліеў. Алè зацікàвіўса такі пуоп, што-б гэто за ён такі быў гэсты пàрабак і чаму ён не такі, як усіе людзі. От веліеў ён стàрасьце наглядàць за тым пàрабкам, што ён рòбіць, як вЫдзе з цэркві. От якрàз быў там хвэст. Сышлòсо й зъіехаласо мнуого людзèй да цэркві, сьцеглісa тудЫ са ўсяіе акрўгі старцЫ й убòгіiе. Напхàласо людзèй пòўна цэрква да й неміесьцяцца, стаяць на цьвінтàру. Яшчэ з сàмаго рàна ўліез у цэркву й папуоў пàрабак, памаліўса бòгу, а як засьпевàлі харуімы, от ён рàптам праціснуўса праз людзèй да й вЫшаў на цьвінтàр. Пашòў з ім і стàраста. Зірнўў пàрабак уверх на крыж, нахапàў камèння да давàй шыбàць угòру на цэркву да на крыж. Падзівіўса стàраста, алè маўчЫць, чакàе, што бўдзе дàлей. Падхòдзіць пàрабак к старцуом, а там іх цЫэлая чарадà; пасіелі ў два радЫ да на руозные галасЫ прòсяць да паюць Лàзара. Алè гарЫэй усіх ва ўсе гòрло крычЫць адзін старЫ дзіед: — падàйце міластыньку, дòбрыіе людзі, біедному старòму. Вам буог заплàціць на туом сьвіеці прасьвіетлым рàям. — Зірнўў на ягò папуоў пàрабак, схапіў ламàчыну да давàй перЫэсьціць тагò стàрца. Кінуліса тудЫ людзі да й засланілі сабòю старòго, а пà-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

рабку ка̀жуць, што нему͡ожне чапа̀ць бо̀жага чалаві͡ека. Атышо̀ўса тро̀хі па̀рабак да й сустрака̀е якого̀сь маладо̀го, здаравѐннага хло̀пца да й даѐ яму̀ ўсі͡е сваі͡е гро̀шы. Ля̀дзіць ста̀раста да ту͡олькі дзіву̀ецца, чаму̀ ён так ро̀біць, чаму̀ дае таму̀, хто мажэ̀ сабі͡е зарабі̀ць гро̀шы, а бъе старо̀го жабрака̀. Тым ча̀сам па̀рабак вы̀шаў за плу͡от у по̀ле, зірну̀ў увѐрх на со̀нейко да ста̀ў такі̀ весёлы да ра̀дасны, ба̀ццэ й не ві͡едама што. Верну̀ўса ста̀раста к папу̀ да й расказа̀ў усѐ, што рабі̀ў той па̀рабак. — Ма̀быць ён, ба̀цюшко, які̀сь шалапава̀ты, ці не ў сваём вумі͡е, — ка̀жэ ста̀раста. — Ні͡е, гэто не то̀е, — сказа̀ў пу͡оп і велі͡еў пазва̀ць к сабі͡е па̀рабка. Той прышо̀ў. — Скажы̀ мні͡е, — запыта̀ў пу͡оп па̀рабка, — на што ты шыба̀ў камі͡енем у крыж на цэ̀ркві? — А як жэ, ба̀цюшко, не шыба̀ць, калі̀ там кала̀ крыжа̀ ўѐцца цы͡элая чарада̀ чарцѐй, ба̀ццэ мо̀шкі мак таўку̀ць. Я як сьві̀снуў камі͡енем, дак мо з ту̀зін палажы̀ў на мі͡ейсцы, а рэ̀шта разлеці͡еласа чорт ві͡едае куды̀. — А за што ты бі̀ў таго̀ старо̀го жабрака̀, што прасі̀ў у людзѐй мі̀ласьцінкі? — Ба̀цюшко, як-жэ яго̀ не біць, калі̀ ён у сваём лайні͡е зашы̀ў цы͡элую ку̀чу гро̀шэй, а яшчэ̀ про̀сіць бу͡ольш? Наву͡ошто яму̀ гэстые гро̀шы, калі̀ ён сам не спажыва̀е й лю̀дзям не даѐ, бы той саба̀ка на сі͡ене, што сам не і͡есь й кару͡оў не падпуска̀е. — Пачака̀й, я разві͡едаю, ці гэто пра̀ўда — сказа̀ў пу͡оп і пазва̀ў таго̀ ста̀рца. — У цебѐ зашы̀ты ў лайні͡е гро̀шы? — пыта̀е пу͡оп ста̀рца. Той мнѐцца да мъя̀мліць: — зашы̀ты, ба̀цюшко. — Пакажы̀. — Зашы̀ты, ба̀цюшко. — Распары̀. — Нема̀шака нажа̀. — Пу͡оп схапі̀ў з яго̀ лайно̀ да й дава̀й разрыва̀ць рука̀мі ла̀ткі да разгрыза̀ць зуба̀мі. Разгры̀з, а сры͡эбло атту̀ль так і пасы̀паласо. Накрыча̀ў тут пу͡оп на ста̀рца да й прагна̀ў яго̀, а гро̀шы пазбіра̀ў да й суну̀ў у кішэню. — А чаму̀ж ты таму̀ маладо̀му да здаро̀ваму хло̀пцу даў гро̀шы? — пыта̀е ён да̀лей па̀рабка. — Я яму̀ заты̀м даў, што ён ужэ даўно̀ без рабо̀ты валёчыцца па сьві͡ету й нема̀е чаго̀ і͡есьці. — Ну, а чаму̀ ты ніко̀лі не дастаі̀ш у цэ̀ркві да канца̀ слу̀жбы? — Я ўжэ гавары̀ў ба̀цюшку, што так бу͡ог велі͡еў. — Ты каза̀ў, алѐ-ж я ўсе такі̀ не магу̀ ўразумі͡ець, хто ты такі̀

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

й чаму̀ ты не слу̀хаеш таго̀, што нам буог веліць? — Памаўча̀ў тро̀хі той па̀рабак, паглядзіеў у вакно̀, да як уба̀чыў, што на дварьі зляціеліса анѐлы да пачалі піець харуімськііе піесьні: дак і дагада̀ўса, што буог прасьціў яму̀. По̀тым і ка̀жэ: — я бо̀жы а̀нял. Менѐ буог пасла̀ў узя̀ць ду̀шу ў таіе ўдавы, што распіесьціла свайго̀ сына, узя̀ць тагды, як ён туолькі радзіўса. Я пашкада̀ваў дзіця̀ці, хаціеў зрабіць ліепш ат бо̀га, а тым ча̀сам зрабіў амылку. Каб яго̀ ма̀тка памѐрла, як ён быў малѐнькі, та й яна̀ не грашыла-б бо̀гу, да й ён не распіесьціўса-б, а быў-бы, як усіе лю̀дзі. Буог віедае, што ро̀біць. Я не паслу̀хаў бо̀га і нёс ка̀ру, а цепѐр буог мніе дарава̀ў грахі. — Пры гэстых слава̀х папуоўські па̀рабак стаў анёлам і замахну̀ў крыламі да й палеціеў к сваёй бра̀цьці. Пачу̀лі пуоп з ста̀растаю, што ў нѐбе паю̀ць да хва̀ляць бо̀га святые анёлы, арханёлы да харуімы, алѐ не ба̀чаць іх. От яны й ка̀жуць: велікі буог, велікая яго̀ мілась. Ён зна̀е, што ро̀біць.[1]

Рыэдкі.

В. Рожан.

73. Каміене.

Мо̀жэ ба̀чылі часа̀мі, па дубруоўцы паўз даро̀гу чэраду каміеня. Ба̀чылі, да, бада̀й, не чу̀лі, зку̀ль яны ўзяліса. Дак паслу̀хайце старо̀го. Ён вам ска̀жэ не на кпінкі. Ён вам ска̀жэ то̀е дзіво, што даўніей было̀ на сьвіеці. Там расту̀ць дубы ажно̀ пад нѐбо. Адны вырасьлі, згнілі ўсеро̀дку, ці перу̀н разбіў ім бо̀кі, што зваліліса да до̀лу. За̀мяст тых расту̀ць другіе. Таўшчыня̀ бы піеч, вышыня̀ — злета̀е ша̀пка. А ў землі лежа̀ць кало̀ды і зпад бѐрага круто̀го па рацыэ на дніе глыбо̀ко, пачарніеўшы бы вуго̀лье, не гнію̀ць з тых ча̀саў да̀ўніх. От дубъё ў землі, пні дубъя̀ навѐрсе, а між іх лежыць ад віеку чарада̀ каміеня, бы валуоў на па̀шы. Хто да скуль прыціс таку̀ю цѐнжар і па бѐразе

[1] Адменьнік у В. Н. Добровольскаго. Смоленскій Этнографическій Сборникъ, ч. I, СПб. 1891, стр. 323—325.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

раскінуў, бы картоплю ў вагародзе? Як вада цечэ ў рыэцци праз лесы, балота, так прайшлі дзенькі да ночы, зімы й ліеты, так праходзяць віек за віекам і ніколі не вертаюць. Як зьменяецца расліна, так зьменяюцца й людзі: родзяцца, жывуць, клапоцяць, потым паміраюць. Замяст іх раджаюцца другіе. Пакрасуюцца на сьвіеці, прагаруюць жыцьце да й праходзяць па каліейцы, бацдэ чэргу атбываюць. Так усе зьменяецца ад віеку. Туолькі ціхенько ў дубруоўцы чарада каміеньня сьпіць па між дубамі да чакае цуду, ці таго, як буог пазволіць стаць і ёй на чэргу, атбываць каліейку, бацдэ ўсе па сьвіеці. Дак якое-ж то каміене і за што яно ат віеку не меняецца як людзі? То не простае каміене і лежыць тут на пакуту, што зрабіло перад богам грыэх велікі. Як цепер, мо спраку віеку тут жылі якіясь людзі. Сіеклі ліес, рабілі поле да лавілі ў рыэцци рыбу, а правуорныіе мужчыны звіера білі ў ліесі. Як цепер мо гаравалі, працавалі, даставалі, як уміелі друобным дзіеткам жыўнасьць. Раз прышоў туды дзедок старэнькі, занепаў ён у дарозі да й пачаў прасіцца начач. Не пускаюць тые людзі. Дзіед пакінуў веску, сіеў у ліесі пад дубочкам да й чакае сьмерці. Туолькі ось адна дзеўчына ціхенько прыносіць дзіеду хліеба сьвіежаго паў булкі да вады гаршчочак. Дзіед падзякуваў дзеўчыне, хліебам ён пасілкаваўса да й запіў вадою. — Прашчавай, галубко! — дзіед сказаў дзеўчыне, — тут жывуць ліхіе людзі. Буог іх хутко пакарае, бо яны забылі бога да й жывуць гарыэй гаўяда. Дзіе твуой бацько? — Я не знаю бацька, — дзіеўка адмаўляе. — Старшы брат твуой бацько, а сестра — брацїха. Сьвет велікі, ён без края. Усюды сьвіеціць сонцо, а пад ім е людзі. Там цебе сустрыэне шчасьце, бацэ пчуолку квіешка. Уцекай хучыэй ты з вескі, каб не стрыэло ліхо. Уцекай, не азірайса. — Плачэ біедная дзеўчына, а дзедок, бы дым расплыўса. Што рабіць, сама не знае, стала кала дуба, рукі біелыіе ламае. Як ёй кінуць руодны вугал?! Там сестра да матка на вечэру мо чакаюць. Брат вернуўса з ліесу, налавіўшы зьвіера. Як пакінуць хатку, дзіе яна аткрыла вочы! Добрэ йці ў чужые людзі, як у пары мілы, што ведзе за ручку, бы дзіцятко матка.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Дòбрэ шчàсьце за гарàмі, як ягò сустрыэнеш, цяжко-ж у дарòзі дзіеўцы без падмòгі. Плàчэ біедная дзеўчына, жàласно галòсіць, аж па ліесі віецер гòлас яіе нòсіць. Азірнўласа на ўёску, не паслўхала старòго, аж немà там хàтак, дзіе яны стаялі, туолькі рад каміеня, бы валы на пàшы. Крыкнула дзеўчына да й закукавàла. Што за дзіво! — зàмяст рўчак — крыла. От з тых чàсаў мо праз віекі рад лежыць каміеня, а зеўзюленька над імі жàласно кукўе да раднì шукàе. Не паслўхала старòго, азірнўласа на ўёску дзіеўка, дак зеўзюлей стàла да й праз цыэло жыцце не стракàе шчàсьця, бо не ўе сабіе гнезьдзèчка — мілаіе да муоўкі, туолькі плàчэ да кукўе на высòкум дўбе. А каміеня чўюць, што зеўзюля плàчэ да сказàць не мòгуць, бо акаменіелі.

Рыэдкі.

В. Рожан.

74. Вòўчае куотло.

Ліес — бòжы гай. Буог даў ягò людзям на патрэбу. Даўніей ніхтò табіе не бараніў, хадзì па ўсёй пўшчы да й карыстàй усім, што табіе любо. І людзі карыстàлі: лавілі ўселякаго звіера, брàлі ў дупленàтых дзераўлякаx ат сьлèпата мёд і вуоск, наглядàлі да сіеклі сабіе здàтнае дзèраво, пàсьцілі гаўядо да выраблялі сеножàці, ці выпàльвалі да расчышчàлі ліес на пòле. Куожын абрабляў зèмлю, дзіе хаціеў. Бо людзі бòжые й земля бòжая. Зèмлю буог аддàў людзям, каб яны працавàлі да зараблялі сабіе жыўнасць. А, віедамо, дзіе буольш жыўнасці, як не ў ліесі. Тут табіе грыбы й ягады, веснòю птўшкі нанесўць яец, хаць ты ў куош грабі, а ўселякаіе жыўёлы так багàцько, што хаць у хліеў заганяй; не трэ ні пасьці, ні карміць, а туолькі лавì, ці страляй. Дòбрэ тагды жылòсо людзям, пòкі не прышлì варагì да не забрàлі зèмлю сабіе. Яны, не то што зèмлю да ліес, алè й балòто да ўселякую нèтру захапілі, паміеpaлі да панасыпàлі капцы. Куды ні сўнса, та межà; ўсе, кàжуць, чужòе. А дзіе-ж нàшэ? Хіба-ж мы не бòжыіе людзі, што нам буог не даў земèлькі?

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Пра̀шкі, бу͡ог даў зѐмлю й лі͡ес па ўсіх до̀лю. Алѐ, што ты зро̀біш. Усю̀ды пастаўля̀лі стражніку͡оў; яны̀ табі͡е й ды̀хаць не даю̀ць. Ось быў адзі̀н стра̀жнік. Дась бу͡ог сьвя̀то. Ві͡едамо, ў сьвя̀то, сьвято̀е й дзі͡ело. Пу͡ойдуць на̀шы ба̀бы ў лі͡ес па грыбы̀, ці рваць я̀гады, дак ось атку̀ль ні во̀зьмецца той стра̀жнік да не то, што атберэ̀ грыбы̀, ці я̀гады, алѐ й ху̀сткі пазьдзіра̀е да яшчэ̀ назьдзі͡екуецца. Ужэ̀ не раз зьбіра̀ліса на̀шы дзецюкі̀ атсадзі̀ць яму̀ печанцы̀, да ніякім пра̀вам не мо̀гуць яго̀ злавіць, бо ён, зло̀дзей, вѐльмі хі̀тры. Перш ён жыў адзі̀н. Лю̀дзі ду̀малі, што заты̀м ён такі̀ пага̀ны, што адзі̀н, алѐ ашука̀ліса, бо ён як ажані̀ўса, дак стаў яшчэ̀ гары͡эй. Алѐ то кажы̀, й жу͡онку сабі͡е падабра̀ў, таку̀ю-ж ліху̀ю, як і сам. Напладзі̀лі яны̀ дзецѐй. Усі͡е хло̀пцы, бы разбу͡ойнікі, ту͡олькі адна̀ дзеўчы̀на да й та̀я са̀мая мѐньшая. Ху̀тко яны̀ вы̀раслі, на лі͡ес глядзячы, да так пашлі̀ вычвара̀ць, што нему͡ожна й лю̀дзям сказа̀ць, про̀сто, во̀ўчае ку͡отло, да й го̀дзі. А гры͡эх каза̀ць, зда̀тные былі̀ хло̀пцы, алѐ зда̀тные на ўсе ліхо̀е. Яшчэ̀ ба̀цько здару͡оў як дуб, адзі̀н мажэ̀ ўпра̀віцца, а чаго̀ ім усі̀м стражніка̀ваць? І пашо̀ў адзі̀н сын стра̀жніка ў сьві͡ет шука̀ць сабі͡е шча̀сьця. Зайшо̀ў ён дзі͡есь у велікае мі͡есто да й наня̀ўса служы̀ць у бага̀таго купца̀. Паслужы̀ў ён там мо ку͡олько гаду͡оў і нажы̀ў гро̀шэй, мо бу͡ольш, як у купца̀, да й пача̀ў сам таргава̀ць. Натаргава̀ў ён мну͡ого гро̀шэй да й пача̀ў скупа̀ць у пану͡оў лі͡ес. Ку̀піць пу̀шчу, спля̀жыць дзѐраво, заго̀ніць яго̀ да Кралѐўца, прада̀сь там, заро̀біць мну͡ого гро̀шэй да й зноў купу̀е другу̀ю пу̀шчу. От купі̀ў ён і ту̀ю пу̀шчу, дзі͡е ба̀цько стражніка̀ваў. Пры͡ехаў ён туды̀ да й атубава̀ўса ў бацьку͡оў, нібы̀ то купѐц, алѐ не сказа̀ў ім, хто ён такі̀. Яму̀ хаці͡еласо паба̀чыць, як жыву̀ць бацькі̀ да браты̀ да як паміна̀юць аб ён. От жывѐ ён у бацьку͡оў, ба̀ццэ чужані̀ца да прыгля̀дваецца й прыслухо̀ўваецца. Пражы̀ў ён так мо недзі͡елю або̀ дзьві͡е. Не пазна̀лі яны̀, што гэто сын, бо ду̀малі, што той ужэ̀ даўно̀ загі̀б, ці згні̀ў у вастро̀зе; яны̀ до̀брэ ві͡едалі, які̀ ён быў раску͡ол да зло̀дзей. Ту͡олькі пазна̀ла яго̀ адна̀ вяско̀вая дзі͡еўка. Ён ко̀ліс вѐльмі кала̀ яі͡е ўвіва̀ўса. Ма̀быць му͡оцно яі͡е каха̀ў і на̀ват ха-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ціеў ажаніцца, алѐ бацькі не пазволілі брацца з мужычкаю. Янà потым служыла у двары пакаеўкаю да там і бачыла ў пàна таго купца. Ці пазнàў ён яіе, ці ніе, а мо й пазнàў, да нехаціеў прызнавàцца, бо, віедамо, разбагаціеў, дак куды там яму мужычка, хаць янà й пакаеўка. Ён ужэ на панѐнак пазірàе. Там-жэ ў двары служыла й дачкà стрàжніка. От тàя дзіеўка й шапнула ёй, што ў яіе бàцька жывѐ не хто другі, а яіе буольшы брат. Тым чàсам стрàжнік намовіўса з жуонкаю да з сынàмі забіць багàтаго купцà да забрàць яго грошы. От выдаўса такі ліхі дзень, што, як кàжуць людзі, нàват сабàку не выганіш з хàты, такàя там кудаса. Цалюсьсенькі дзень круціць да мецѐ кудаса, што й сьвіету божаго невідàць, а к ночы захадзілаеа яшчэ гарыэй, бàццэ велікі грыэшнік засіліўса. От яшчэ змрокам у стрàжніка павечэралі да й палеглі спаць. Равѐ бура ў коміне да сьвішчэ за вуглàмі. Штось не сьпіць малады купѐц да ўсе варочаецца на лàве. Потым ён задрамàў. Туолькі стрàжнік закміеў, што купѐц сьпіць, узяў сакіеру да й секануў яго абіеручку, алѐ ў поцемку не папàў, а туолькі ўдырыў тапарышчэм. Прахапіўса купѐц, забыў з прасоня дзіе ён да думаў, што на яго напàлі разбуойнікі, выхапіў ён з-пад галавы немѐцкі пісталіет да давàй паліць. Тым чàсам мàтка кінуласа на яго з нажэм да й усадзіла ў горло. Страляе ён куды папàло, а тут на яго накінуліса бацькі й браты да й рыэжуць у пацѐмках адзін другого. Тым чàсам як пачула ат пакаеўкі стрàжніка дачкà, што дома яіе брат, а не чужы купѐц, дак насілу дачакàла вѐчара, не паглядзіела й на ліхое надвуоръе да хучыэй пабіегла к бацькуом, бàццэ прачувàла тое ліхо. Прыбегàе янà пад хàту, зірнѐ ў вакно, аж цѐмно. Пачалà янà стукаць у дзьвѐры — ніхто не атчыняе. Абмàцала гэто янà ў страсіе ключ да й атсунула зàсаўку. Убіегла ў хàту да й спаткнуласа ў пацѐмку на мàтку, бо тàя лежàла калà сàмаго парога. Звàла, звàла дзеўчына, алѐ ніхто не абзывàецца. Спалохаласа янà да давàй дзьмухаць агонь. Уздула янà лучыну да як зірнѐ, аж уся хàта й плывàе ў крыві. Памàцала янà, аж бàцько, мàтка й усіе браты яшчэ цѐплые, алѐ лежàць покатам доле, туолькі ку-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

пѐц не зваліўса з ла̀вы да так і лежы̀ць, аткінуўшы го̀лаў, а ў го̀рле тырчы̀ць канча̀ты ну͡ож, като̀рым ма̀тка крышы̀ла буракі̀. Кінуласа яна̀ з ха̀ты на ўѐску звац ь людзѐй. Сышлі̀са лю̀дзі, паглядзі͡елі да й ка̀жуць: ото̀-ж во̀ўчае ку͡отло, така̀я яму̀ й сьмерць.

Ры͡эдкі.

В. Рожан.

75. Канакра̀д.

У ні͡еякум ца̀рстві͡е, ў ні͡еякум гасуда̀рстві͡е, а мо ў ту͡ом, дзі͡е мы жыву͡ом, бы ў такі̀ пага̀ны канакра̀д, што от ні̀які̀м пра̀вам не ўпілну̀еш, хаць ты зуба̀мі дзержы̀. Крадзѐ ён ко̀ней гары͡эй цыгана̀, крадзѐ от про̀сто з рук, а ні̀як не зло̀віш. А по̀тым выхваля̀еца да яшчэ̀ пачнѐ кпіць да сьмеяцца. — Ото̀, — ка̀а, — глусцы̀, ты ў іх з-пад но̀са беры̀, а яны̀ хаць-бы што. — Нема̀ чаго̀ рабі̀ць, трэ церпі͡ець, бо ліхо̀го не пераможэш. От церпі͡елі, церпі͡елі лю̀дзі, нарэ̀шце дагада̀ліса лі͡епш ліху гадзіць, абы̀ было̀ ці̀хо ліхо. От змо̀віліса лю̀дзі да й пачалі̀ ку͡ожын гу͡од плаці̀ць таму̀ канакра̀ду арэнду, каб ён ту͡олькі не краў ко̀ней. Бо, ві͡едамо, без каня̀кі, яка̀я табі͡е ліхо гаспада̀рка, пусто̀го хлева̀ за̀тычка. І то кажы̀, як пачалі̀ плаці̀ць ту̀ю арэнду, дак ні ў ко̀го ко̀ні не прапада̀юць, а як часа̀мі й прападу̀ць, дак зноў зна̀йдуцца. Лі̀хо яго̀ ві͡едае, што ён рабі̀ў. Лю̀дзі каза̀лі, што ён ма̀быць з ліхі̀мі зна̀ўса. Ту͡олькі от раз тра̀пілас о тако̀е здарэ̀ньне, што ў нас мо лю̀дзі ніко̀лі не забу̀дуць. Гэто было̀ я̀кась у лі͡етку. Быў які̀сь сьвято̀к, алѐ які̀, от запа̀мятаваў ві͡ечным пра̀вам. Ну, алѐ ўсе ру͡оўно. Сьвято̀к, дак сьвято̀к. Была̀ вѐльмі вялі̀кая су̀ша, а тут яшчэ̀ ўсхапі̀ўса такі̀ ві͡еце р, што аж буды̀нкі вѐрне. Пазрыва̀ў ён да папсава̀ў стры͡эхі. От адзі̀н чалаві͡ек пашо̀ў у лі͡ес драць луб, каб пала̀дзіць стры͡эху на сьвіро̀нку, да й замару̀дзіў там да са̀маго змро̀ку. От ту͡олькі вы̀шаў ён з лі͡есу на даро̀гу, да й сустрака̀е ся̀бра.

— Дабры̀вечар, ся̀брэ!

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

— Дабрывечар!

— Аткуль буог несе?

— Да з гасподы, а от ты скуль пхаешса?

— З ліесу, сябрэ. Хаціеў знайці трохі лубкуоў, да нема. Сусіедзі павыдзіралі, на яго ўссе ліхо. А ты куды праці ночы?

— Да от трэ схадзіць у мястэчко, купіць у жыдуоў солі. Халадком ліепш.

— Што-ж ты пхнешса піешкі? Блізкі сьвіет цягціса. Хіба шкадуеш кабылы?

— Эгэ-ж, сябрэ, от на старасьці давелосо піешкі хадзіць.

— Дзіе-ш твая кабыла? Хіба прадаў?

— Дзіе там прадаў... укралі, браткo, от з пад самаго носа.

— Да што ты кажэш? Дзіе ўкралі?

— Выпусьціў туолькі на пругміень папасьціса да замарудзіў у хаці от як люльку закурыць, потым зірнуў на пругміень, аж кабылы й нема. Я туды-сюды, нема, от бы ў зємлю праваліласа.

— Хіба-ж ты не плаціў страхуоукі?

— Усіе гады плаціў таму гаду па пъяць злотых, а селята зыскаўса дамуоў Семко да й не веліеў плаціць.—Гэто—кажэ,— грабіеж, беззаконьне!.. Не плаці, бацько, дармо паганаму канакраду.

— Эй, сябрэ, нашоў каго слухаць. Кепсько, калі яйца курэй вучаць. Мо там па пісьменнаму й гэ, але ты чуў, што людзі кажуць: бога хвалі, да й чорта не дражні. Выбачай, — твуой сын разумны хлопец, пісьменны, але ў нашум мужыцкуом дзіеле яшчэ нічого не знае, бо, віедамо, блазан.

— Так, браткo, так. Ён хаць прачытае, што на карчме напісано, а от, што я буду рабіць без каняки?

— Папытай шчасьцьця, пагамані з гэстым гадам.

— Гаманіў.

— І што-ж ён кажэ?

— А тое кажэ, што трэа, — каа, — было плаціць страхуоуку, а цепер і за пъяцьдзесят рублеў мо ніельга знайці кабылу.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

— Наплюй яму ў вочы, сябрэ. Гэто туолькі зьдзіекуецца гад. Чаго там шукаць, калі ён знаецца са ўсёю гэстаю хеўраю, калі не сам украў. Але пеўне ён. Задавіць мало гада! Трэ перш жыўцом шкуру злупіць, каб дзісятаму заказаў, як красьці коні. Ото кажы, й хуртовіны на яго нема...

— Да не дачакане яго, — прыдзе й на яго голаў пагібель... Знаеш, сябрэ, як убачыў я, што нема канякі, дак такая мене апанавала жалась, так завіло кала серца, што хаць жывы ліезь у дамавіну, ці запрадай чорту душу. І што мніе рабіць, што мніе пачаць, мая біедная галуоўка! Грашоў, бачыш, нема заплаціць гаду. Дзіе тут узяць гэстакую пруорву асьмакуоў, а тут і падаткі не за гарамі...

— От што, сябрэ, ты слухай мене. Купі сьвіечку, пастаў яіе ў цэркві перад Юрьям, памаліса перш богу, а потым зламі тую сьвіечку да й паверні агнём уніз, дак гэсты гад ці прыбежыць перапрашаць да верне кабылу, ці выпруціцца бы ражон.

— Грыэх гэтае рабіць, сябрэ, але нехай буог выбачае, бо нам без канякі немуожне жыць.

— Гэ, сябрэ, кажэш грыэх! Грыэх у міех, а спасеньне ў торбу. Хто скажэ — грыэх, лупі ў морду. Ці-ж за такого гада грыэх?

— Ой, баюса я, браткò, баюса граху, баюса, каб на туом сьвіеці не смажылі чэрці ў гарачуй смаліе. Але гэто мабыць чорт от так і падъюджвае, от так і шэпчэ ў вушы — задаві гэстаго гада, та буог віеку прыбавіць. От я, браткò, перахрышчуса, дак нечысь і аткаснецца.

— Дак што-ж ты яму даруеш?

— Бачыш, ён хаць канакрад, але ўсе-ж чалавіек, усе-ж божае стварэне. Туолькі не вытрымаю я, такі пастаўлю сьвіечку, як ты кажэш, да й то баюса, каб не было грыэх.

— Зірні, сябрэ, што гэто там, бацца пожар, ці што?

— Але-ж здаецца пожар. Чуеш, крычаць людзі.

— Бежыэм, браткò, мо сапраўды якое ліхо.

— Бежыэм ратаваць.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Бегуць мужыкі, засапліса, чуць духі пераводзяць. От падбіеглі яны трохі, выскачылі за гаёк да зірнуць, аж праўда — пожар: от так дым і валіць, поламъе шыбае аж пад нёбо.

— Лядзі, лядзі, сябрэ, гэто-ж гарыць канакрад. От такі нарваўса. Пакараў буог за люцкіе слёзы.

— Ой божухно, бацюхно! Отò-ж нешчасьце! А ў яго-ж куча дзецей.

— Ну, нашоў каго шкадаваць! Які воўк, такіе й ваўчанята.

— Грыэх табіе будзе, сябрэ! Дзіеці — божые янгелятка. Чаго яны будуць пакутавапь за бацькоў?

Падбегаюць мужыкі бліжэй да й бачаць, адно-ж там зьбіегліса людзі, але стаяць кала агню насупіўшыса, а пожару не тушаць.

— Чаго вы стаіце, хварыэць вашуй матары, — крычыць той мужык, у якого ўкралі кабылу, — чаму не тушыце пожару? Бачыце, які віецер усхадзіўса?

— Ну, чаго, сябрэ, лаешса? Нехай гад гіне.

— А ў хаці нікого нема? — пытае ўсе той мужык.

— Чаму нема? Сам ён ось вадзіўса загрудкі з якімсь жыдам, мабыць такім канакрадам як і сам, вадзіўса да распраўляўса нажом. Але ў таго нуож яшчэ даўжэйшы. От і выпруціліса яны тут абудва. А дзіеці мабыць у хаці.

Зірнуў той мужык, да й бачыць, што канакрад і зубы вышчарыў да й валяецца бы падло, пераскочыў ён церав яго, не ўсьпіелі людзі й ахнуць, як ён сунуў у самы агонь.

— Прапаў чалавіек ні за панюх табакі, — кажуць людзі, тым часам мужык выскачыў з агню, акрыўшыса колдраю да й вынес з хаты малое дзіця канакрада. Пакуль людзі стаялі да ціешыліса, што загіб канакрад, дак усхадзіўса такі віхар, што занялаеа ўся вёска да й змокла. От бы языком зьлізало. Асталаса туолькі будуоўля таго чалавіека, што баяўса граху. Дак гэто мабыць так буог даў.

Рыэдкі.

В. Рожан.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

76. Любдшчы.

У ніеякум царстве, ў ніеякум гасударстве, за даўніейшы час, як яшчэ не было нас, жыў сабіе адзін каруоль да віедзьма-каралiха, на яіе ліха. Не было ў іх дзецей. І пачаў каруоль турбавацца, што нема каму пакінуць свайго царства. Пачаў ён турбавацца да пачаў думаць, каб прагнаць ці страціць тую каралiху, а ўзяць сабіе другую жуонку, дак мо ат таіе будзе сын. Пранюхала аб туом каралiха да й надумаласа абшукаць таго караля, туолькі-б ёй застацца каралiхаю. От і кажэ яна каралю, што нарэшце стала тоўстаю. Абрадуваўса каруоль, беражэ ён жуонку, бы воко да чакае, пакуль прыйдзе той час, што яна обрадзіцца. Тым часам сама намовіласа з бабамі, каб яны даставлі ёй чужого маленькаго хлопчыка. Не доўго бабам трэ было клапаціцца, віедамо, гэтаго дабра мнуого, абы было каму гадаваць, а раджаць не штука. Да й куожная матка не вораг свайго дзіцятка, рада, каб сынок быў каралём. От наглядзялі бабы тоўстых жанок да дзіевак і чакаюць, пакуль яны обрадзіняцца. Туолькі от ліхо, — якая ні абрадзіцца, дак усе прыводзіць дзіеўку. Спалохаліса бабы, невіедаюць, што рабіць, бо ўжэ падходзіць пара, а хлопчыка нема. Туолькі ось ідуць яны раз кала сажалкі да й бачаць, што на вадзіе штось плывае. Узелі яны ламачыну да й давай яго падганяць к берагу. Туолькі як таўкнуць, дак тое яшчэ далей атходзіць ат берага. Хацiелі яны ўжэ плюнуць да йці па свайму дзiелу, аж чуюць, што там запішчало дзіця. Схаменуліса бабы да ўжэ хацiелі ліезці ў воду. Папробавалі яны, аж глыбоко. Хацiелі яны пазваць людзей, да пабаяліса, каб аб туом не дайшла чутка да караля. Туолькі ось ідзе якаясь вельмі біедная дзіеўка. А гэто была матка таго дзіцяці. Яна ціхенько седзiела ў кустох да пазірала, што будзе з яіе міленькім сыночкам, катораго сама не магла гадаваць, каб людзі не сьмеяліса да не зьдзіекуваліса. От падходзіць яна к бабам да й кажэ, што дастане з вады начоўкі. Пакуль бабы радзіліса, што ім зрабіць, тая дзеў-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

чы̀на шабулды̀х у во̀ду ва ўсём як стая̀ла, чуць не ўтапі̀ласа, алѐ такѝ даста̀ла начо̀ўкі на бѐраг. Раскі̀далі ба̀бы пелё̀нкі, аж там лежы̀ць малѐнькі хлапчучо̀к да такѝ го̀жы, такѝ зг(g)ра̀бны, што й у ка̀зцы не сказа̀ць. Забра̀лі ба̀бы таго̀ хлапчука̀ да й панесьлі̀ яго̀ ці̀хенько ў пала̀цы да каралі̀хі. Паба̀чыла та̀я дзі͡еўка, што яі͡е дзіця̀ панесьлі̀ ў пала̀цы, абра̀давалаcа, пастая̀ла яшчэ̀, паглядзі͡ела, перахрысьці̀ласа да й пашла̀ да гаспо̀ды з ра̀дасьцью, бы на сьві͡ет нарадзі̀ласа. От і абъявіла каралі̀ха, што ў яі͡е радзі̀ўса сын. Рад кару͡оль. Велі͡еў зрабіць пір на ўвесь мір. Расьцѐ сабі͡е той хлапчу̀к за каралѐвіча, алѐ ўсе ця̀гне к про̀стым лю̀дзям. Ї вѐльмі яму̀ спадаба̀ласо хадзі̀ць да аднаі͡е бі͡еднаі͡е жанчы̀ны, като̀рая яго̀ любі̀ла да ласка̀ла бу͡ольш як ма̀тка ві͡едзьма-каралі̀ха. Ён не знаў, што то не про̀стая жанчы̀на, а яго̀ ру͡одная ма̀тка. А яна̀ до̀брэ ві͡едала да пла̀кала ат ра̀дасьці, пі͡еcтуючы яго̀. Вы̀рас каралѐвіч і стаў харашы̀эйшы ат усі̀х людзѐй. Пачалі̀ бацькі̀ сва̀таць яму̀ го̀жую царэ̀ўну, алѐ ён не хо̀чэ й слу̀хаць, бо яму̀ вѐльмі спадаба̀ласа адна̀ вѐльмі го̀жая дзі͡еўка, ту͡олькі яна̀ была̀ дачка̀ купца̀. Ві͡едамо, хаць купѐц і бага̀ты, алѐ ўсеж про̀сты чалаві͡ек. Дзі͡е гэто ві̀дано, каб каралѐвіч да браў за себѐ про̀стую дзі͡еўку. Як ні прыстава̀лі кару͡оль з каралі̀хаю, каб царэ̀віч жані̀ўса з царэ̀ўнаю, ён сказа̀ў, што ру̀кі на себѐ нало̀жыць, а іх не паслу̀хае. Абазлі̀ласа ві͡едзьма-каралі̀ха, на яі͡е лі̀ха, да й пачала̀ разнюхо̀ўваць, чаму̀ гэто каралѐвіч не слу̀хае ні яі͡е, ні караля̀. Знайшлі̀са ліхі̀е лю̀дзі да й сказа̀лі, што каралѐвіч лю̀біць другу̀ю про̀стую дзі͡еўку, ту͡олькі не маглі̀ дазна̀цца яку̀ю. Узъі͡еласа ві͡едзьма-каралі̀ха да й заклела̀ каралѐвіча так, што ў яго̀ від зрабі̀ўса, бы сьвіны̀ лыч. Уба̀чыў то̀е кару͡оль, абазлі̀ўса на сы̀на да й пасадзі̀ў яго̀ на во̀страў пасеру͡од мо̀ра. Тым ча̀сам каралѐвіч яшчэ̀ пѐрад гэтым узя̀ў у каралі̀хі люсьцѐрко, а ў караля̀ па̀лку. Гэто не про̀стые былі̀ рэ̀чы. Гля̀нуў ён у люсьцѐрко ў той час, як ду̀маў аб сваё̀й дзеўчы̀не, дак і ўба̀чыў яі͡е, як жыву̀ю. Сту̀кнуў ён па̀лкаю аб зѐмлю, дак пѐрад ім бы вы̀раз з землі̀ до̀бры маладзѐц да й пыта̀е, што яму̀ трэ̀ба. Велі͡еў яму̀ каралѐвіч зрабі̀ць сабі͡е ха̀тку да даць і͡есьці.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Ду̀хам зьявìласа хàтка хаць малѐнькая, алѐ гòжая, бàццэ з землì вы̀рас сту͡ол, а на ём уселя̀кіі͡е патрàвы да напìткі, бы ў каралѐўських палàцах. Хòдзіць сабі͡е каралѐвіч калà мòра, зьбірàе кві͡еткі да так жàласно пàе, што аж птỳшкі зацìхлі да слу̀хаюць ягò пі͡есьню. Зну̀дзіцца каралѐвіч, вы̀ме сваѐ люсьцѐрко, пазірàе, што рòбіць ягò дзеўчы̀на да ту͡олькі лòміць ру̀кі. Успамену̀ў ён аб ту͡ой дòбруй жанчы̀не, што ягò пі͡естувала, гля̀нуў у люсьцѐрко да й бàчыць, што тàя плàчэ, аж залівàецца. І захоці͡еласо яму̀ пазнàць, чагò янà плàчэ, хто яі͡е зкры̀ўдзіў. От пазвàў ён малайцà да й кàжэ яму̀ — прывезì сюды̀ ка мні͡е ту̀ю й ту̀ю жанчы̀ну. — Не вѐлено, — кàжэ той. — Сюды̀ мòжэ прыі͡ехаць ту͡олькі той, хто сам хòчэ. — Засмуцìўса каралѐвіч да й пашòў садзìць да даглядàць кві͡еткі, каб не так былò ну̀дно да ця̀жко на сѐрцы. Тым чàсам бàцько таі͡е дзі͡еўкі, што любìў каралѐвіч, зьбірàецца і͡ехаць у чужы̀я зѐмлі па заму͡орскія тавàры. От і пытàе ён сваìх дачòк, якòго гасьцìнца ім прывезьцì. Бу͡ольшая прòсіць, каб бàцько прыўѐз ёй сàмую гòжую адзѐжу. Селеду͡оршая прòсіць прывезьцì ёй такìя гу̀сьлі, каб яны̀ сàмі грàлі; а мѐньшая, катòрую любìў каралѐвіч, прòсіць прывезьцì ёй заму͡орськую кві͡етку рòжы. Янà загадàла, што калì рòжа не заўя̀не, та каралѐвіч яшчэ̀ жыў і ду̀мае пра яі͡е. Сі͡еў купѐц на карàб да й паплы̀ў у заму͡орськія зѐмлі. Ці дòўго, ці малò ён там быў, ту͡олькі накупìў шмат ру͡озных дарагìх заму͡орськіх тавàраў, накупìў гасьцìнцаў сваìм дачу̀хнам да й паплы̀ў назàд. Ту͡олькі ось узхадзìласа шу̀ра-бу̀ра, разламàла ягò карàб да й затапìла са ўсім дабрòм. Учапìўса купѐц за яку̀юсь дòшку да й паплы̀ў. Дòўго ягò насìло па мòру, доўго пеклò на сòнейку, паку̀ль нарэ̀шце вы̀кінуло на бѐраг. Насìлу падня̀ўса ён на нòгі, алѐ немажэ̀ хадзìць, сі͡еў на кàмень да й седзìць, бы акамені͡еўшы. Дòўго ён так седзі͡еў, нарэшце апòмніўса й вѐльмі яму̀ захаці͡еласо і͡есьці. Падня̀ўса ён да й пашòў паўз бѐраг шукàць людзѐй. Абышòў ён кругòм да й дагадàўса, што ягò вы̀кінуло на астравòк, дзі͡е нікòго немà. А гэто быў той астравòк, куды̀ саслàлі каралѐвіча. Пашòў купѐц шукàць, ці немà грыбу͡оў, абò я̀гад, каб хаць трòхі

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

пасілкавàцца. І цяжко яму стàло, як уздумаў, што прапàлі ўсіе тавàры, алè буольш усягò шкòда, што прапàлі тые гасьцінцы, што ён въёз сваім дачухнам. Тут ён убачыў квіеткі ружы яшчэ харашыэйшыя ат тых замуорськіх. Забыў ён і гòлад да й думае,— отò-ж нарву квіетак рòжы сваёй любімуй дачушцы, а буольшым ужэ як сабіе хòчэ, мо дастàну й ў сваём краю, як даберуса да гаспòды. — Туолькі ён хаціеў сарвàць квіетку рòжы, як ось і нахапіўса якісь страшэнны чалавіек з сьвінным лычòм зàмяст віду. Спалòхаўса купèц, дрыжыць бы асіна. — Не лякàйса, — кàжэ той, — туолькі скажы, хто ты такі, аткуль узяўса й нашто табіе мая рòжа? — Расказàў купèц усè як былò, расказàў шчырую прàўду да й прыбàвіў, што рòжу хаціеў сарвàць сваёй любімуй дачухне, каб яіе хаць чым нèбудзь парàдуваць, а то янà чагòсь усе плàчэ да хòдзіць вèльмі смутная. — Дагадàўса каралèвіч, што дзеўчына па ём плàчэ да й пазвàў купцà ў сваю хàтку. Ён адрàзу пазнàў купцà, а той ягò не мог пазнàць бо нікòлі не бàчыў таім страшэнным да плюгàвым. От пакарміў каралèвіч купцà да й кàжэ: — я дам табіе квіетак, куолькі хòчэш, атпрàўлю цебè да гаспòды, туолькі ты павінен прыслàць сюды сваю мèньшую дачку. А калі янà не зхòчэ прыіехаць сюды ка мніе ў гòсьці ахвуотно, та вы ўсіе да й я прападуом. — Немà чагò рабіць, згадзіўса купèц на тòе. От каралèвіч прызвàў малайцà да й веліеў яму дастàць руозных тавàраў, якіх туолькі купèц зхòчэ, дастàць на гасьцінец дзèўкам сàмую гòжую адзèжу, такія гусьлі, што сàмі грàюць, і адвезьці купцà да гаспòды, а квіетак рòжы назрывàў цыэлае берэме, сплёў з іх венòк да й кàжэ: — а от гэстыя квіеткі аддàй сваёй мèньшуй дачухне ат менè. — Забрàў купèц усè дабрò да й паплыў да гаспòды. Рàды дòма, што ён вернуўса, алè як ён усе расказàў, дак жуонка й буольшыя дзеўкі пачалі галасіць і ўгавàрваць мèньшую дзіеўку, каб янà не іехала. А тàя як зірнула, што рòжа так гòжэ цьвіцè, бàццэ туолькі што з агаруодчыка, дак рàда, сьмеёцца да ў далòні ляскае. Янà думае сабіе, што гэто мàбыць ужэ такàя яіе судзьбà, такàя дòля, што трэ перш пагаравàць, панудзіць, каб пòтым, як убàчыць ка-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ралѐвіча, глядзі͡ецъ яму̀ ў во̀чы да ра̀дувацца. Зна̀е яна̀, што ёй так су̀джано, што каралѐвіч жыў й што яна̀ ўба̀чыць яго̀, от затым яна̀ сьмі͡ело хо̀чэ і͡ехаць у го̀сьці к таму̀ страшэнному чалаві͡еку. — А мо ён і не така̀я пачвѐра — ду̀мае яна̀ сабі͡е, — трэ паглядзі͡ецъ. А мо гэто так су̀джано. От надышо̀ў тэрмін. Як ні ўмаўля̀лі яі͡е бацькі̀ да сѐстры, ніко̀го не слу̀хае,—ото̀ж паі͡еду,— ка̀жэ яна̀ — да й ту͡олькі. Не хачу̀ я, каб праз менѐ да нам усім было̀ кѐпсько, каб мы ўсі͡е загінулі. А мо гэ лі͡епш, мо гэ су̀джано, мо ўжэ так мні͡е на раду̀ назна̀чано. А што су̀джано, таго̀ ні або̀йдзеш, ні адъі͡едзеш. — Ніч̀ого не пара̀дзяць бацькі̀, му̀сілі яны̀ згадзіцца, як ні ця̀жко было̀ ім атпраўляць сваѐ каха̀нае дзіця̀ неві͡едамо куды̀ да яшчэ̀ да тако̀е пачвѐры, што й на чалаві͡ека не нахо̀дзіць. От вы̀ладавалі бацькі̀ сваю̀ мѐньшую дачку̀ ў даро̀гу, папла̀калі, бы право̀дзілі на мо̀гліцы. Сі͡ела яна̀ на кара̀б, като̀ры ўжэ даўно̀ чака̀ў яі͡е, да й паплыла̀ на той во̀страў. Тым ча̀сам ру͡одная ма̀тка каралѐвіча даві͡едаласа, чаму̀ гэто яі͡е каха̀ны сыно̀к бу͡ольш не прыхо̀дзіць к ёй, даві͡едаласа, што гру͡озны кару͡оль да ві͡едзьма-караліха, на яі͡е ўсе ліха дзі͡есь схава̀лі ненагля̀днаго сыно̀чка, ці мо̀жэ й саўсім стра̀цілі. Ві͡едамо, ма̀тчыно сэрцэ за̀ўжды баліць па сваймў дзіця̀ці. Пла̀кала яна̀, пла̀кала, гарава̀ла-гарава̀ла, алѐ бу͡ольш не магла̀ вы̀трымаць да й пашла̀ ў сьві͡ет шука̀ць каралѐвіча. За ѐю я̀кась увеза̀уса саба̀чка, като̀ры так ла̀шчыўса да любіў каралѐвіча, як ён прыхо̀дзіў да ма̀ткі. Пра̀ўду ка̀жуць, што саба̀ка зна̀е, хто сву͡ой, хто друг, а хто во̀раг. До̀браго чалаві͡ека саба̀кі не чапа̀юць, а ліхо̀го гато̀вы загры̀зьці. Дак от гэ й той саба̀чка, як пры̀дзе каралѐвіч, дак ска̀чэ на яго̀, ліжэ яму̀ ру̀кі, лі͡езе цалава̀ць, вішчы̀ць, да кру̀ціць хвасто̀м з ра̀дасьці. За то̀е не ту͡олькі цыга̀н, або̀ жыд не магу̀ць прайці̀ ці праі͡ехаць аж па ву̀ліцы, алѐ й на̀ват ліхі̀ сусі͡ед без кія не сьмі͡елі падыці̀ бліско к двару̀. Чуць хто пака̀жэцца, як ось атку̀ль ні во̀зьмецца той саба̀чка, ко̀цілца бы ку̀ля, брэшэ, аж ахры̀пне да сьлепі̀цаю лі͡езе, паку̀ль та̀я жанчы̀на не абаро̀ніць сама̀ да не ска̀жэ: «пашо̀ў вон!» От ідзѐ яна̀, а саба̀чка бежы̀ць у пѐрадзе да пака̀звае ёй даро̀гу. Уто̀-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

міцца, ляжэ аддыхаць, а сабачка не сьпіць, віетрыць носам да настаўляе вўшы та ў вадзін, та ў другі буок,—прыслухоўваецца, ці не крадзецца які нєбудзь ворат. От так хадзіла яна, хадзіла з сваім сабачкаю па сьвіету, распытоўвала добрых людзей, ці не бачылі, ці не чулі яны аб яіе дарагенькум сынку. Ужэ нуожкі прытупіліса, а усіе ў вадзін голас кажуць, што бачыць не бачылі й віедаць не віедаюць, дзіе яіе сын. Абхадзіла яна усе каралеўство — нідзіе нема. Нарэшце парадзіла ей адна старэнькая баба, каб яна папробувала пайці ў чужыя землі, ў чужыя царства, к чужым людзям. — Мо ен, — кажэ, — там. — Падзякувала тая жанчына добруй бабе да й хаціела йці ў чужыя землі, туолькі давіедаласа, што яны дзіесь за глыбокімі да шырокімі марамі, што туды ніельга йці, а трэ плысьці на караблех. Падышла яна к мору, хаціела сіесьці на караб, дак яіе туды не пускаюць. — Куды ты, — кажуць, — баба ліезеш? Тут іезьдзяць туолькі князі, грапы да жыды. — Заплакала яна да й пашла да другого карабля. Давай там прасіць, давай благаць, кланяецца ў ногі да ловіць цалаваць рукі. Нарэшце знайшліса добрыя людзі, згаджаюцца яіе пусьціць на караб, але сабачку не прымаюць. — Куды, — кажуць, — гэстая пошкудзь, яшчэ караб загадзіць. — Шкода ей раставацца з сабачкам, з такім віерным слугою, заплакала яна да й пашла далей. Сабачка, бацца знаў, што пра яго гаварылі тыіе людзі, кідаецца з радасьці к ей на шыю да ліжэ языком. От ідзе яна да йдзе з сваім сабачкам да й падходзіць к таму караблю, на каторум мусіла плысьці дачка купца. Падышла яна да й просіцца, каб прынялі яіе на караб. — Хадзі, хадзі, бабко, — кажуць тыіе, — нам велено браць усіх, хто туолькі сам хочэ. — Пашла яна на караб, а сабачка бы маланка туолькі замітусіўса сьпераду. Караб веліізазны бы харомы. Заліезла яна ў самы вугал да й седзіць ціхенько, а ў нагах лег сабачка да туолькі вушкі наставіў. Па немалум часе сіела на караб і купецкая дачка, але яна не бачыла таіе жанчыны. Прайшла мо гадзіна ці буольш, як караб плыў па мору да й суняўса кала берагу. Падходзіць к жанчыне якісь чалавіек да й кажэ:—

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

выхòдзь, бàбка, ўжэ прыі͡ехалі. Забрàла янà свуо͡й клўначак, вы̀йшла на бèраг да й пашлà, куды̀ вòчы глядзя̀ць, ці куды̀ ведзè сабàчка. От злі͡езла й купèцкая дачкà да й пашлà к хàтцы каралèвіча. Убàчыў яі͡е каралèвіч да так абрàдуваўса, што аж не мажэ вы̀гаварыць ні слòва. Жывè там купèцкая дачкà ў раскòшы: піць, і͡есьці ўсегò мнуо͡го, чагò туо͡лькі душà хòчэ. Ўселя̀каі͡е дарагòі͡е сàмаі͡е гòжаі͡е адзèжы туо͡лькі, што хòпіць на ўсе жы̀цьце. Нічòго янà не рòбіць, туо͡лькі гуля̀е сабі͡е паміж кві͡етак да плецè венкì. Сплецè з рòжы венòк, узлòжыць ягò на гòлаў, зірнè ў люсцèрко да й зальèцца гуо͡рькімі слёзкамі. — На што мні͡е, — кàжэ, — маè харàствò, калì ні͡екаму ягò паказàць, калì тут апры̀ч гэстаі͡е пачвèры з сьвіны̀м лычòм нікагўсьсенько мемà. — Што ні рабіў каралèвіч, якіх гасьцінцаў ёй не давàў, нічòго не памагàе, ніяк не мажэ яі͡е навернўць да себè. Ві͡едамо, пачвèра з сьвіны̀м лычòм, а не чалаві͡ек. На ягò туо͡лькі зірнўць, дак з душы̀ вèрне, а не то, каб што. Засмуціўса каралèвіч, ні пъе, ні і͡есь, кінуў даглядàць і сваі͡е кві͡еткі да ўвесь дзень хòдзіць па лі͡есі ці па беражкў мòра да ні то плàчэ, ні то паè пі͡есьні, алè такіі͡е жàласныі͡е пі͡есьні, што хто ні ўчўе, дак сèрцэ бы хто кібдзюрàмі скрабè, а слёзкі так і цекўць з вачуо͡ў бы ў бабрà. Пашлà раз купèцкая дачкà гуля̀ць на бèраг мòра, зачўла, што хтось паè да й заслўхаласа; слўхае, плàчэ, а самà й не варухнèцца да так і прастая̀ла, пòкі сòнейко зайшлò за вòду й зрабіласо саўсім цёмно. Ужэ даўнò ат пі͡есьні па лі͡есу заціх апуо͡шні пòшчак, а янà стаіць, бы закамені͡ела. Тым чàсам каралèвіч вернўўса да гаспòды, зірнўў туды̀-сюды̀, аж немà ягò кахàнаі͡е дзеўчы̀ны. От ён і пабі͡ег яі͡е шукàць. Бі͡егаў ён бі͡егаў, нарэшце трàпіў яі͡е на бèразе мòра да й паўёў да хàты. Цёмно, дарòгі немà. Што ні стўпіць дзеўчы̀на, та й пàдае. Бàчыць каралèвіч, што янà саўсім пабъèцца, схапіў яі͡е на берэме да й панёс. Несè лёгенько бы перцò да так лаг(g)уо͡дно размаўля̀е, што дзеўчы̀на нàват забы̀ла пра ягò сьвіны̀ лыч. І здаèцца ёй, што гэто гавòрыць хтось другì, той замуо͡рські каралèвіч, аб катòрум янà дўмала кòлісь у дòўгіі͡е нуо͡чкі, як лежàла на мя̀гкіх перы̀нах руо͡д-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

наіе̑ матачкі, што гэто ён, яіе̑ кахаиы каралевіч цудам нашоў яіе̑ да й несе на сваіх сілных руках да шэпчэ ёй салодкіе̑ слаўца да прыціскае да сваіх багатырскіх грудзей. І так добрэ ёй, так радасно бъецца серцэ, што от здаецца, ўсю-б жытку пралежала-б на руках свайго міленькаго да ўсеб слухала яго мілую мову, яго дарагі галасок. Унес ён яіе̑ ў хату да й просіць вечэраць. Але яна падзякувала да так, не засьвеціўшы агню й легла на пасьціе̑ль, каб не атагнаць тых салодкіх думак, каб лежаць і ўсе думаць і думаць да чуць голас свайго міленькаго каралевіча. Не спала яна ўсю нуо̑чку, а ўсе гарыэ̑ла бы ў вагні. Але от даў бог дзень, думкі разлеціе̑ліса бы дым. Успомніла яна, што каралевіча нема, дак бы голкамі закалоло ў серцэ, а слёзкі так і паліліса. Не хочэ яна ні іе̑сьці, ні піць да так уткнуўшыса галавою ў падушку й праплакала ўвесь дзень. А як надышоў вечар, яна зноў пашла на бераг мора. Зноў пачула, што хтось пае, туо̑лькі гэто так гожэ, так радасно, што й ёй лёгко стало на серцы. Зноў заслухаласа яна, пакуль сьцемніе̑ло; зноў прышоў па яіе̑ каралевіч і зноў на берэмі панёс да гасподы. Зноў ёй было так радасно на серцы, так соладко кружыласа галава, што яна ўсю нуо̑чку прадумала пра свайго міленькаго. Але на трэйці дзень яна сустрэла ў вагаруо̑дчыку пачверу з сьвіным лычом, як ён зрываў ёй квіе̑ткі рожы, зірнула на яго да й загаласіла. Пачаў той угаворваць, дак куды там, — яна яшчэ гарыэ̑й плачэ да рве па сабіе̑ валасы. Нарэшце прагнала яго, каб і на вочы не паказваўса, а сама пабіе̑гла на бераг мора, каб паслухаць таго цудуо̑ўнаго сьпіе̑ву. Але ніхто не сьпеваў, туо̑лькі шаптаўса ліе̑с да раўло мора, ўзьбегаючы на бераг. Доўго седзіе̑ла яна там і так ёй стало цяжко на серцу, так моташно, што дарам прападае маладая жытка, што німа ніякаіе̑ надзіе̑і, каб злучыцца з сваім міленькім каралевічам, што нарэшце не вытрымала да й кінуласа ў мора. Тым часам аткуль ні ўзяўса сабачка таіе̑ жанчыны, рапгам шамелях ён у воду да й цягне яіе̑ да берага. Убачыла тое тая жанчына да й выцягла ўтопленіцу на бераг. От туды-сюды патрасла жанчына ўтопленіцу, дак тая й ачнуласа да як зірнула,

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

што кала̀ яі͡е знаёмая жанчы̀на, дак тро̀хі й легчы͡эй ста̀ло на сѐрцы. Пагавары̀лі яны̀ тро̀хі са̀мі з сабо̀ю да й пашлі̀ ра̀зам да ха̀ты. Паку̀ль яны̀ йшлі, дак і расказа̀лі адна̀ другу͡ой усе, як было̀, і як яны̀ дасталі̀са сюды̀. Прыхо̀дзяць яны̀ да ха̀ты, аж там беда̀. Засмуці̀ўса каралѐвіч, як купѐцкая дачка̀ прагна̀ла яго̀ з вачэ̀й, засмуці̀ўса так, як ніко̀лі. Ён усѐ ду̀маў, што дзеўчы̀на палю̀біць яго̀ за до̀брае сѐрцэ, за ла̀ску да за лаг(g)у͡одныі͡е сло̀вы, а тут уба̀чыў, што нема̀ надзі͡еі. Даста̀ў ён цудо̀ўнае люсцѐрко, каб пабачыць сваю мілую дзеўчы̀ну, аж тут яна̀ якра̀с кі̀нуласа ў мо̀рэ да й патану̀ла і так ця̀жко яму̀ ста̀ло, так закало̀ло яму̀ ў сѐрцы, што ён упа̀ў на зѐмлю да й згубі̀ў прыту͡омнасьць, ляжы̀ць, ба̀цэ не жыў. Узьбі͡егалі̀са тут слу̀гі, не ві͡едаюць, што рабі̀ць. У гэты са̀мы час і падышлі̀ купѐцкая дачка̀ з то̀ю жанчы̀наю туды̀. Ві͡едамо, саба̀чка заў̀жды бежы̀ць спѐраду. От і на гэты раз падбі͡ег ён да каралѐвіча да як нюхну̀ў яго̀ да як пачнѐ віжджа̀ць, віля̀ць хвасто̀м да лізаць каралѐвіча ру̀кі да сьвіны̀ лыч, дак жанчы̀на й дагада̀ласа, што гэто яі͡е сын, ту͡олькі, што ён ма̀быць заклятый. — Ой, заклятый гэто чалаві͡ек, — ка̀жэ яна̀. Шко̀да ста̀ло дзі͡еўцы, гэтаго нешча̀снаго чалаві͡ека, схілі̀ласа яна̀ к яму̀ да дава̀й яго̀ гла̀дзіць, дава̀й ласка̀ць да шапта̀ць мі̀лыя слаўцы̀. Ачну̀ўса каралѐвіч да ба̀чыць, што кала̀ яго̀ стая̀ць на калі͡енях дзеўчы̀на й та̀я до̀брая жанчы̀на, като̀рую ён так любі̀ў, і лёгко яму̀ ста̀ло на душы̀. Падня̀ўса ён, падзя̀куваў ім за ла̀ску да дава̀й іх частава̀ць. А саба̀чка ат яго̀ й не атхо̀дзіць да ўсе ла̀шчыцца. Праседзі͡елі яны̀ за стало̀м чуць не да вѐчара. Ста̀ла жанчы̀на прыла̀джваць сабі͡е мі͡ейсцо, дзі͡е паначава̀ць, а дзеўчы̀на з пачвѐраю з сьвіным лычо̀м пашлі̀ гуля̀ць. Вѐчар быў го̀жы: цёпло, ці̀хо, бы ў ву̀сі. Со̀нейко даўно зайшло̀, ту͡олькі яшчэ̀ чырвані͡елі хма̀ркі. І пача̀ў пачвѐра з сьвіны̀м лычо̀м пі͡ець пі͡есьні, пача̀ў пі͡ець так го̀жэ, што от го̀лас лі͡езе аж у са̀мую ду̀шу й ра̀зам хо̀чэцца пла̀каць і сьмея̀цца. І ду̀маецца дзеўчы̀не, што от так слу̀хала-б усѐ жы̀цьце й нічо̀го-б бу͡ольш не хаці͡ела. От ужэ̀ сьцемні͡ело; заблішча̀лі на нѐбе я̀сныя зу͡оркі да ту͡олькі мі̀га̀юць мі̀лымі ву͡очкамі да ба̀цэ шэ̀пчуць: го̀жы сьві͡ет, до̀брэ на

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ём жыць да любіць. Любі, дак усè адалīеш. А ён усе паè да паè да з такімі любòшчамі, што затапіў у дзеўчыны й гòлаў, і сèрцэ. Самà не вīедамо зачым схапіла янà страшèннага чалавīека за гòлаў да й пацалавàла. У той мòмант абернўўса ён у гòжаго каралèвіча, схапіў яīе на берэме да й панёс да гаспòды, дзīе ўжэ ягò чакàла руодная мàтка. Рàдасьці не было канцà. І стàлі яны жыць да пажывàць да бīедных людзèй не забывàць.

Рыэдкі.

В. Рожан.

77. Гусли.

Жыў кòлісь круглы сіратà Івàньчык. Яшчэ малèнькі астàўса ён без айцà й без мàткі. Узелà ягò к сабīе хрышчòная мàці, падгадавàла трòхі да й аддалà ў людзі пасці гусі. Пасè ён гусі да разглядвае бòжы свīет, а кругòм так гòжэ, так рàдасно. Яснае сòнейко свīеціць і хукае, бы на дзіцятко руодная мàтка. Вīетрык ціхенько калышэ зелёнае вīеце на вèрбах. Ракà бліщчыць праз рыэдкіе кусты алèшніку, бы тòе люстэрко, што дзяцько купіў сваёй дачцыэ Гàнне; а ў затòне атбівàюцца тòўстые, старые дубы, курыэнь дзīеда Ахрыэма калà паравòзу, стуог лèташняго сīена з плòтам кругòм і нàват карòвы сусīедняīе вёскі, што пасуцца на бèразе. Туолькі ўсе гэто дагары нагàмі. Задумаўса пастушòк Івàньчык, чаму гэто ў вадзè адбівàецца ўсе дагары нагàмі, задумаўса, алè не на дòўго, бо ў той сàмы мòмант гусàк выцягнуў шыю, крыкнуў і перасцеруог гусèй, што вòраг блізко. Зірнуў Івàньчык на нèбо, аж там хутко плывè велізазны шуляк да пазірàе на ягò гусенята. Закрычàў Івàньчык і памахàў хварасцінаю. Схавàўса шуляк за высòкім лīесам, а Івàньчык усе стаіць да пазірàе на нèбо, да так пазірàе, што забыўса й рот закрыць. І захацīеласо яму летàць па нèбу, як той шуляк, замахàў ён рукàмі да й пабīег па зелёнуй травīе, па квèтках, што так гòжэ раслі на пòплаве. Дòўго бīегаў Івàньчык, растапырыўшы рукі, бīегаў, кружыўса, бы птушкі ў нèбе, нарэшце ўтаміўса й

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

лёг на траву̀ дагары̀ вачамі й ўсе глядзѐў на нѐбо, як там пу-ду͡оўне го̀жэ ціхенько плылі лёгкіе бі͡елые хму̀ркі, бы гусіны пух, як яны̀ сустракаліса з ясным сонейкам, цалавалі яго̀ й плылі далей. Разглядаў Іваньчык, як го̀жэ й прамудро зро̀блен бо̀жы сьві͡ет. Сѐрцэ яго̀ радасно білaсо ў грудзях, ву͡очкі блішчалі, бы два дьяманты, яму̀ так было̀ лёгко, так вѐсело тут на по̀плаве, на зелёнуй трауцы, пасеру͡од сві͡ежых, ру͡озных калёраў кві͡етак, што ён нават забыў той час, калі трэба было̀ йці да до̀му абі͡е-дащь, бо дзянна была̀ сердзітая жанчына, вела̀ сву͡ой парадак і не любіла, калі хто пазніўса на абі͡ед. Усхапіўса ён, зірнуў на со̀нейко, аж яно̀ ўжэ схіляецца к захаду. — Ужэ паабі͡едалі, — ду̀мае пастушо̀к і гуляе да вѐчара не і͡еўшы. Так той Іваньчык перш пасьціў гу̀сі, по̀тым памагаў аўчару̀, а нарэшце, як вы̀рас, пачаў пасьціць гаўядо. Тут ён навучы̀ўса размаўляць з гаўядам, разумі͡еў мо̀ву ўселякаі͡е жыўёлы й нават расліны. Яму̀ здаваласо, што птушкі пaюць яго̀ пі͡есьні, што му̀шкі да по̀луднічкі жаласно гуду̀ць, дак гэто яны̀ плачуць над яго̀ гу͡оркаю, пастухо̀ваю до̀-ляю, што гаўядо пазірае на яго̀ да й хо̀чэ яму̀ сказаць: бі͡едны пасту̀х! ніко̀лі не быць табі͡е гаспадаро̀м... Кінь гэты край да йдзі ў сьві͡ет шукаць шчасьця. — Яму̀ здаваласо, што лі͡есківае яму̀ ві͡ецем, што траўка й кві͡еткі яму̀ шэпчуць ціхенько: йдзі ў сві͡ет. — Паслу̀хаў іх наш Іваньчык і пашо̀ў у сьві͡ет шукаць шчасця. Ха-дзіў, хадзіў, алѐ куды̀ ні пры̀дзе, ўсю̀ды гары̀эй як там, дзі͡е быў упѐрад. Кіне ён то̀е мі͡ейсцо да йдзе далей. Дахадзіўса нарэшце да таго̀, што й сьві͡ет не міл. От падышо̀ў ён к рацы͡э да й хаці͡еў утапіцца. Ту͡олькі ён ступіў на во̀ду, аж тая зрабіласа цьво̀рдая, бы лёд. І пашо̀ў наш Іваньчык па вадзі͡е, бы па су̀ху. Сустракае яго̀ якісь панічык да й кажэ: найміса ка мні͡е на слу̀жбу. — А чаму̀-ж ні͡е, — адмаўляе наш Іваньчык, — яко̀му чо̀рту ні слу-жы̀ць — усе ру͡оўно. — А пачу͡ом ты знаеш, што я чорт? — Сьпе-вай пі͡есню павам, а чорт бачан па халявам. — Бачу, што з цебѐ бу̀дзе до̀бры слуга, — кажэ чорт, — я-ж табі͡е заплачу̀ за то̀е ха-ро̀шые гро̀шы. — Дзі͡е гро̀шы там і во̀шы, — адмаўляе наш Іваньчык. — А чаго̀-ж ты хо̀чэш? — Ты таго̀ не маеш, хаць

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

менѐ служы̀ць наймàеш. Да што нам таргавàцца, лі͡епш хучы͡эй за дзі͡ело брàцца. Бу̀ду служы̀ць хаць у пѐкле, абы̀ было̀ пѐкне.— Згадзі̀ліса яны̀ на ту͡ом. Зняу̌ чорт сву͡ой капелю̀шык і махну̀у̌ ім трэйко. Тагды̀ наш Івàньчык сапрàу̌ды у̌бàчыу̌ у чòрта рòгі й па абàпал плі͡еч чòрные кры̀ла, бы у̌ кажанà. Зняу̌ і наш Івàньчык свая̀ рвàную кучòмку, памахàу̌ ею трэйко й вы̀раслі у̌ ягò кры̀ла, бы у̌ шулякà. От узнялі̀са яны̀ да й палецці͡елі, да ту͡олькі не у̌гòру, не к я̀сному сòнейку, а чорт ві͡едае куды̀, палецці͡елі у̌ якую̀сь прòпасць усе у̌ніз і у̌ніз. Дòу̌го леці͡елі яны̀, агарну̀ла іх кругòм цѐмень, хаць ты вòко вы̀каль. Алѐ ось па немàлум чàсе спѐраду штось заблішчàло. Ху̀тко янò разраслòсо, бы сухі̀м лі͡етам у лі͡есе пòжар. Падлетàюць яны̀ бліжы͡эй, аж там стая̀ць велізазные катлы̀, а у̌ іх гарыць смалà. Пòламъе шыбàе, а смалà кіпі̀ць, аж бу̀лбаткі падскàкваюць. Дагадàу̌са наш Івàньчык, што гэто пѐкло. Алѐ немà чагò рабі̀ць, калі̀ наня̀у̌са, та як запрадàу̌са, трэ служы̀ць. Азірну̀у̌са ён, а тут як шыбану̀ло пòламъе, дак ягò кры̀ла й згары͡элі. Астàу̌са там Івàньчык. І велі͡еу̌ яму̀ чорт дòу̌гаю залі͡езнаю качаргòю у̌ катлу͡ох смалу̀ памі͡ешваць. Павернуу̌ ён качаргòю, аж там у смалі͡е му̀чацца гры͡эшные ду̀шы. Варòчае ён качаргòю да разгля̀двае ты̀е гры͡эшные ду̀шы. Кагò ту͡олькі там не было̀. Перш-нà-перш вы̀нырнула лы̀сая галавà ксендзà, а пòруч з ѐю кіпі͡елі у̌ смалі͡е дòу̌гіе ку̀длы папà. Паверну̀у̌ ён качаргòю, дак рàзам вы̀скачылі з смалы̀ маладзѐнькая панѐнка, абня̀у̌шыса з стары̀м пàнам, старàя пàні, хурмàн з бізунòм, лѐкай з пля̀шкаю у̌ гòрле, камысàр з ксѐнжкаю пад пàхаю, пакаёу̌ка, ку̀хар, акаму͡он, ці̀вун і мнòго другі̀х дварòвых людзѐй. Паверну̀у̌ ён яшчэ раз качаргòю, дак тут ужэ былі̀ у̌се жыды̀: сам ландàр з Сòркаю, рàбін з бі̀бляю, цòдык з тòраю, малàмед з ксѐнжкаю, кавàль, шавѐц, кравѐц, крамàр і крамàрка, шàпар, нàват ану̀чнік, і той вы̀сунуу̌ з смалы̀ свая̀ гòлау̌ і патру͡ос пѐйсамі, алѐ яны̀ злі̀пліса й гары͡элі, бы зу̀бленка. Пашòу̌ Івàньчык да другòго катлà, паверну̀у̌ у ём качаргòю, дак тут ужэ паказàліса нàшы браты̀ хрысьція̀не й усѐ бу͡ольш сàмые набу͡ожные лю̀дзі да такі̀е, які̀х лічы̀лі пры жы̀цю чуць не сьвяты̀мі. Пабàчыу̌

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

тòе наш Іва̀ньчык да й ду̀мае сабі͡е: ні͡е, ма̀быць кyͦжнаму чалаві͡еку прьідзецца закаштава̀ць гара̀чаі͡е смальі. Хаці͡еу̌ ён іщі да̀лей, да зірк, аж тут і ягò хрyͦстная ма̀ці. Уба̀чыла яна̀ ягò да й ка̀жэ: ой, муͦй сынòчак, пакінула я цебè малèнькаго, дак за тòе тут му̀чуса. — Не справедлівы суд, мая̀ ма̀тачка, — адмòвіу̌ ёй Іва̀ньчык, — несправедлівы за тым, што я туͦлькі тагдьі й быу̌ шчаслівы, як ты менè атдала̀ пасці ґу̀сі. — Туͦлькі ён гэтае прамòвіу̌, як ягò хрòстная ма̀тка вьішла з катла̀ у̌ся у̌ бі͡елум убра̀ні, бы сні͡ег і ста̀ла пòруч з ім. — Дзя̀куй табі͡е, муͦй сынòчак, — ка̀жэ яна̀, — што аслабаніу̌ менè ат гэстаі͡е му̀кі. Уцека̀й ты атсю̀ль, бо чэ̀рці яшчэ̀ жыу̌цòм укінуць цебè у̌ смалу̀. Я памагу̀ табі͡е, як атсю̀ль вьібрацца. — От і павела̀ яна̀ свайгò сынка̀ з пèкла вон. Дòу̌го яньі йшлі па між катлуͦу̌ з гара̀чаю смалòю, якòі͡е му̀кі яньі там не ба̀чылі, якіх èнкау̌ не наслу̀халіса, нарэ̀шце падышлі к кра̀ю пèкла. Хрòстная ма̀ці ра̀зам і зьнікла, а наш Іва̀ньчык пакруціу̌ трэ̀йко сваèю кучòмкаю, дак і выра̀слі у̌ ягò крьіла. От узня̀у̌са ён і палеці͡еу̌ усе у̌гòру да у̌гòру. Леціць, аж ві͡ецер свішчьіць, хму̀ркі міна̀юць, туͦлькі міга̀юць. Далеці͡еу̌ ён да землі, вèльмі у̌таміу̌са да й лёг сапачьіць. Алè ось прышòу̌ Хрыстòс, а мòжэ гэто яму̀ прысніласо, да й дау̌ яму̀ гу̀слі. — На, — ка̀жэ, — у̌ гэстых гу̀слях усè тваè шча̀сце. — Да й знік. Уста̀у̌ Іва̀ньчык, узя̀у̌ тьіе гу̀слі да й зноу̌ пашòу̌ у сьві͡ет. Не дòу̌го ён хадзіу̌ да й наня̀у̌са у̌ жьіда пахцера̀ па̀сьціць карòвы. От вьіганіць ён карòвы на па̀шу, ся̀дзе сабі͡е на ку̀піну да як пачнè йграць на гу̀слях, дак і пу̀сьціцца у̌се скака̀ць. Ска̀чуць жыдуͦу̌ськіе карòвы у̌весь дзень, а малакò з цьіцак цыр-цыр! і выліва̀ецца. Прыгòніць ён карòвы дамуͦу̌, пачну̀ць іх даіць, а малака̀ німа̀-ш. Дзіву̀ецца пахця̀р, якòе-б гэто ліхо зрабіласо, да нічòго не прыду̀мае. Пашòу̌ ён к ра̀біну на ра̀ду, расказа̀у̌ сваю̀ беду̀. Той чыта̀у̌, чыта̀у̌ біблю да й ка̀жэ: гэто еля̀к ссè тваі͡е карòвы. — І ра̀дзіць ра̀бін пахцяру̀ у̌зяць ат усіх каруͦу̌ патрòху таго̀, што да̀рам выліва̀ецца, наліць у кашьіэрны гаршчòк, у пя̀тніцу зварьіць, а у̌ ша̀бас ужыва̀ць ра̀зам з г(g)у̌г(g)елям, а што астанèцца, дак тым вьішмаравàць у каруͦу̌ вьімъе. Падзя̀кувау̌ пахця̀р ра̀-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

біну, зрабіў рыхтык так, як ён радзіў, але нічого не памагае. Каровы не то, што не даюць малака, але й самі пачалі худзіец, пятрэць, от бы на іх якая хвароба прышла. Ходзіць жыд бы шалёны, не віедае, што рабіць, што парадзіць. Сустракае яго адзін пъянчужка, што называўса кавалём, а тым часам заўжды седзіеў у карчміе. Той і радзіць жыду, знайсці такого знахара, каб ён пазнаў, хто гэто прырабіў, што каровы не даюць малака. — А хто-ж будзе ліепшы знахар ат цебе? — А гэты пъянчужка сапраўды знахараваў. — Цуес, — прыстае к яму жыд, — я віедаю, сто ты добры цалавіек, віедаю, сто ты ліепс ат усіх знаесса. Зробі ласку. Я ўзэ дам табіе кварту гарыэлкі. — Што кварта, — упіраецца той пъянчужка. — Дасі тры кварты, дак усе скажу, як мае быць. — Таргаваўса, таргаваўса жыд, але мусіў згадзіцца на трох квартах. — Але-ж ты мніе цепер дай кварту, та паглянджу на зоры, хто гэто ўдзіеяў. — Даў жыд яму кварту гарыэлкі, от ён выпіў да й пацёгса на пашу цікаваць, як гэто наш Іваньчык пасе жыдуоўськіе каровы. Падходзіць ён, аж пастух іграе на гуслях, а каровы скачуць, аж з іх піена валіць. Дагадаўса той пъянчужка, чаму каровы не даюць малака да й павернуў, каб іці да карчмы, туолькі ось яму так захаціелaсо скакаць, што от так самі ногі й ходзяць. Але, віедамо, якіе скокі пъянаго. Паскакаў ён покуль іграў Іваньчык да й сунуўса ў канаву. На другі дзень прышоў ён к пахцяру да й кажэ: — ну, віедаю, хто гэто ўдзіеяў. Давай гарыэлку, та скажу. — Даў жыд яму дзьвіе кварты гарыэлкі да аселенец на закуску. От той пъянчужка й кажэ, што ваусём вінен пастух. Немае жыд віеры. — Ну, дак спраканайса сам, — кажэ пъянчужка, — сходзі на пашу да паглядзі, як тваіе каровы пасуцца. — Сходзіў жыд да як пачуў тую ігру, дак сам падняў лапсардак да як пусціўса скакаць, дак аж пейсы трасуцца. Скачэ, да думае, што каб тое ўбачыла Сорка, та падумала-б, што ён ашаліеў. Скакаў той жыд разам з сваімі каровамі датуль, пакуль Іваньчык здаволіўса да й палажыў тые гуслі. Нема чаго рабіць, заскаржыў той жыд на Іваньчыка ў суд. Разабраў суд справу да за такое ведзьмарство прысудзіў

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Іва̀ньчыка паві͡есіць. От схапілі яго й веду̀ць на шы̀беніцу. Ідзе ён і трыма̀е гу̀слі пад па̀хаю. А тут сабрало̀со людзѐй, як на кірма̀шы, каб паглядзі͡еце, як бу̀дуць ві͡ешаць ведзьмара̀. Ба̀бы гало̀сяць, дзецюкі̀ шутку̀юць, а і̀ньшые ка̀жуць, што калі̀ гэсто ведзьма̀р, та яго̀ не паві͡есяць. От ужэ̀ кат падаўе̄ў Іва̀ньчыка к шы̀беніцы да й хаці͡еў накла̀сці яму̀ на шы̀ю вяро̀ўку, алѐ той вы̀няў з пад па̀хі гу̀слі да як зайгра̀е, дак усі͡е й пусціліса скака̀ць, ба̀цца гаро̀х на гара̀чуй скаварадзі͡е. Ска̀чэ кат, абня̀ўшы шы̀беніцу, ска̀чэ судзья̀ з папі͡ерам у рука̀х, ска̀чэ пу͡оп з крыжам пѐрад но̀сам, ска̀чуць мужыкі̀ й ба̀бы, аж пу͡от з іх ва̀ліць, ска̀чэ ўсе мі͡есто, бы мо̀шкі мак таўку̀ць. Ігра̀ў, ігра̀ў Іва̀ньчык да ўсе да̀лей атхо̀дзіў ат шы̀беніцы, нарэ̀шце саўсі̀м знік. Схаменуліса ўсі͡е, разі̀нулі рот да й стаяць, як ду̀рні, а на̀шаго Іва̀ньчыка й слі͡ед прасты̀ў. Пачалі̀ яго̀ шука̀ць, каб злаві̀ць, алѐ-ж ка̀жуць, што не лёгко злаві̀ць ві͡ецер у по̀лі, да яшчэ̀ гары̀эй злаві̀ць таго̀ музы̀ку, като̀ры прымуша̀е ўсі̀х скака̀ць. Пашо̀ў наш Іва̀ньчык у тры-дзеся̀тае ца̀рство к Бі͡еламу Руськаму цару̀ да й пача̀ў яго̀ ці͡ешыць сваі̀мі гу̀слямі. Як збяру̀цца заму͡орські̀е го̀сьці да цары̀ да пачну̀ць выхваля̀цца ку͡ожын сваі̀мі шту̀камі, дак Бі͡елы Ру̀ські цар і велі̀ць Іва̀ньчыку зайгра̀ць на гу̀слях. Іва̀ньчык ігра̀е, а ўсі͡е ска̀чуць. Паска̀чуць пад гу̀слі таго̀ Іва̀ньчыка да й го̀дзі выхваля̀цца, бо за̀ўжды му̀сяць ска̀каць пад гу̀слі Бі͡елаго цара. Дак от які̀і͡е то былі̀ гу̀слі.

Ры͡эдкі.

В. Рожан.

78. Як чорт тапі̀ў пану͡оў.

Жыў сабі͡е адзі̀н чалаві͡ек і была̀ ў яго̀ ду̀жа го̀жая жу͡онка. Дак от на яі͡е лі̀хо, ку͡ожная го̀жая жанчы̀на за̀ўжды кру̀ціць хвасто̀м, за̀ўжды кала̀ яі͡е тру̀цца мужчы̀ны, бы саба̀кі кала̀ су̀кі. Ту͡олькі чалаві͡ек з ха̀ты, дак го̀сці к жу͡онцы ў ха̀ту як піць даць збіра̀юцца. Сабра̀ўса раз той чалаві͡ек у велі̀кую даро̀гу, насыпаў у мі͡ех ко̀ням аўса̀, напха̀ў велі̀зазную дзеру̀гу са̀мага лі͡еп-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

шаго муру͡ожнаго сі͡ена, палажы̀ў у тòрбу цы͡элы бòхан хлі͡еба да кусòк сàла, насы̀паў у мешэ̀чак круп да сòлі, кінуў на ву͡оз чагунèц, нібы̀то збірàецца ў дарòгу на цы͡элы ты̀дзень. От наказàў ён жу͡онцы, каб янà шчы̀лно даглядàла гаспадàрку да й пaі͡ехаў паціхеньку, нібы̀то аберагàе кòні, каб яны̀ не патамìліса ў велìкуй дарòзе. Папхàўса ён, а жу͡онка дỳмае, што цепèр не хỳтко вèрнецца да гаспòды. Сказàла янà сусі͡едцы, а тàя дру-гу͡ой, другàя трэйцюй. Праз часіну ўся вёска даві͡едаласа, што той чалаві͡ек паі͡ехаў у велìкую дарòгу. Ї пачалі збірàцца к ту͡ой гòжуй маладзìцы яі͡е кахàнкі. Яшчэ̀ на змрòку прыбі͡ег к ёй вèльмі гарàчы малады̀ панічык. Ту͡олькі ён ускòчыў у хàту, як хтось стỳкае ў дзвèры. Куды̀ тут дзевàцца... Ї ўлі͡ез ён у пі͡еч. Атчывìла маладзіца дзвèры, аж там другі пан. Чуць ту͡олькі янà ўпусціла ягò, як знòў хтось стỳкае ў дзвèры. Пашлà янà атчынàць, а пан шамелях у пі͡еч. Чỳе, што там хтось е, алè немà чагò рабіць, лежы̀ць мòўчкі, бы тху͡ор. Улі͡ез у хàту малады̀ купèц і пачàў захажàцца калà маладзіцы. Ту͡олькі рàптам хтось зноў стỳкае ў дзвèры. Спужàліса яны̀, не ві͡едаюць, што рабіць. Маладзіца дагадàласа, што гэто мàбыць вернỳўса гаспадàр. — Лі͡езь хучы͡эй у пі͡еч, — камèндуе янà купцỳ, — бо як цебè тут застàне му͡ой гаспадàр, та палòміць табè нòгі да адры͡эжэ вỳшы ці яшчэ̀ што нèбудзь. — Пакỳль янà атчынàла дзвèры, купèц і ўплішчыўса ў пі͡еч, дармò, што там ужэ̀ лежàло двòе. Ціснуць яны̀ адзін другòго, да нічòго не парàдзіш, бо ў стрàха вòчы велікі͡е. Тым чàсам і͡ехаў, і͡ехаў той чалаві͡ек да й сустры͡эў свайгò тавàрыша, з катòрым кòлісь яшчэ̀ хлапчукòм пàсціў кòні. З гэ̀стым тавàрышам яны̀ вèльмі дòбрэ жылі: нèмаль датỳль таварышавàлі, пакỳль ён і ажаніўса. У вадзін ру͡ок яны̀ пабрàліса, а тагò тавàрыша забрàлі ў маскалì. Цепèр ён атслужы̀ўса ў маскалёх і вертàўса да гаспòды. Маскàль вèльмі прыстàў у дарòзе й не здòлеў дàлей іці. От наш чалаві͡ек пасадзіў ягò на ву͡оз да й паўёз да гаспòды. Такім рàзам неўзначàй вернỳўса да гаспòды той гаспадàр да яшчэ̀ з маскалём. Чуць яны̀ ўлі͡езлі ў хàту, а гаспадàр і кàжэ жу͡онцы, каб янà хучы͡эй запалìла ў пèчы да гатòвіла

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

вечэраць дарагенькаму госьцю. Маладзіца тым часам усе агінаецца. От гаспадар сам схапіўса з лавы, напер у піеч сухіх дроў да й запаліў. Крупіліса ў піечы, крупіліса тые малайцы да й задохліса з дыму. От гаспадар пасылае жуонку ў карчму купіць кварту гарыэлкі на пачостку свайму таварышу. А тут маскаль кажэ, што ліепш ён пойдзе па гарыэлку, бо поцемку жанчыну яшчэ што небудзь спужае. Пашоў маскаль у карчму па гарыэлку да, віедамо, пакуль растурхаў серуод ночы ландара да купіў гарыэлкі, дак трохі й замарудзіў. Пакуль яго не было ў хаце, жуонка кінуласа ў ногі гаспадару, прызналаса яму ва ўсём да й кажэ: — што-ж ты нарабіў! гэто-ж людзі ў печы, — ты-ж іх мабыць спаліў. Прапалі мы цепер. — Да давай галасіць, аж рукі ломіць да валасы на сабіе рве перапалоханая маладзіца. — Ціхо, дурная баба! — сыкнуў на яіе гаспадар. От узяў ён ведро вады да шабуух у піеч. Разгруоб гэто ён галавешкі да давай выцягваць з печы малайцуоў, выцягне аднаго, запрэ да й паставіць у сіенцах. Выцяг гэто ён апуошняго, запер яго на двуор да й паставіў кала каморы. Тым часам ворочаецца з карчмы маскаль. Бачыць ён, што хтось стаіць кала хаджайськаіе каморы й падумаласо яму, што гэто мабыць злодзей. От ён падышоў ціхенько да як цюкне яго пляжкаю па мазгаўні, дак той і сунууса на землю. Уліез маскаль у хату да й расказвае таварышу, якая яму прыгода трапіласа. — Ну, нехай чэшэ патыліцу, — кажэ гаспадар, — а ты, бабо, падавай на стуол. — От выпілі яны пляшку гарыэлкі, закусілі, чым буог пасла̀ў і збіраюцца лажыцца спаць. Вышаў гэто маскаль да віетру да зірнуў у той буок, дзіе ён пачаставаў злодзея, аж бачыць, што той ляжыць і не варухнецца. Падышоў ён, памацаў, аж злодзей ужэ й ахалодаў. Прыбіег маскаль у хату біелы як палатнуо да й кажэ, якое нешчасце зрабіласо. Пагаварылі яны паміж сабою, парадзіліса, што тут рабіць і намеркаваліса, пакуль цёмно, зацягці мерцьвеца да й укінуць у воду. От схапіў маскаль таго мерцьвеца да й папер. Сустракаюць яго вартаўнікі. — Ты хто? — пытаюць яны. — Чорт. — Атказвае маскаль. — Каго несеш? — Пана. —

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Куды̀. — Тапіць. — Несі, несі хучэ̑й, — кажуць вартаўнікі й пашлі ў другі бу̑ок. Укінуў маскаль мерцьвеца ў воду да йдзе да-му̑оў. Тым часам гаспадар выцяг з сенец другого мерцьвеца да й палажыў яго на дварэ кала парога. Прышоў салдат (маскаль) да й бачыць, што мерцьвец зноў вернуўса на старое мі̑ейсцэ, от ён схапіў яго й зноў папёр тапіць. Але зноў сустракае вартаўніку̑оў, дак тые бачаць, што чорт прэ пана тапіць, от яны завернуліса й пашлі ў другі бу̑ок. Укінуў маскаль мерцьвеца ў воду да й папхнуў яго на дно пастырчаком. Прыходзіць да гасподы, аж гаспадар прыгатовіў яму трэйцяго мерцьвеца да яшчэ абліў яго вадою. — А, — кажэ маскаль, — ты зноў вылі̑ез з вады, дак я-ж к табі̑е прывежу камень. І зноў папёр ён трэйцяго мерцьвеца, прывезаў да яго цяжкі камень і ўкінуў у воду. Ідзе ён да дому да й сустракае вартаўніку̑оў. У той час і̑едзе сабі̑е вèрхам якісь пан. От вартаўнікі й крычаць маскалю: — чорт, чорт, бачыш, той пан вылез з вады да на каню ўцекае. — Пусціўса гэто маскаль за тым панам, звалу̑ок яго з седла, запёр к рацэ̑ да й укінуў у воду. — Ото-ж, дзякуй богу, — думаюць вартаўнікі, — адным панам меньш.

Рэ̑дкі.

В. Рожан.

79. Усè і ў галаві̑е не змі̑есціцца.

Жылі багатые людзі, было ў іх уселякаго дабра, ту̑олькі ат іх ніхто не мі̑еў дабра. Быў у іх адным-адзін сын. Не хаці̑еласо яму спажываць бацькаўськае дабро, а цягло яго ў сьві̑ет, каб усè знаць, што там робіцца. Ужэ ку̑олькі раз парываўса ён кінуць старых бацька й матку да й вандраваць па сьві̑ету, ту̑олькі не хаці̑еў, каб яны на старасці аб ём гаравалі. Але ось памірае матка. Бацько й кажэ: от твая матка памерла, а скоро й я памру, дак ты як пахаваеш мене, так прыдзе к табе першы старац, ты й дай яму цэ̑лы бохан хлі̑еба да ось гэты горшчык грошэй. — І даў ён сыну невелічкі горшчык, завязаны анучкаю. Скоро

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

бацько памёр і заставіў сыну мнуого ўселякаго дабра. От пахаваў ён бацька радам з маткаю, справіў памінкі да й збіраецца йці ў сьвіет. Але ось заходзіць к яму старац, сівенькі дзедок. А гэто быў сам буог. Даў гэто той чалавіек старцу цыэлы бохан хліеба, а аб грашуох і запамятаваў. Падзякуваў старац да й пашоў. Ходзіць той чалавіек да ўсе чагось шукае, а чаго — й сам не віедае. Хапіўса да й успаменуў, што не даў старцу грошэй. От пабіег ён даганяць таго старца. Нагнаў яго да й атдае горшчык грошэй. А дзедок сівенькі да й пытае: ці ты віедаеш, што ў гэстум горшчыку? — Ніе, не віедаю. — А як жэ ты хочэш знаць усе на свіеце, калі не віедаеш і таго, што ў цебе перад вачамі? Усе ў галавіе не зміесціцца, — дабавіў дзедок. Здзівіўса той чалавіек, аткуль гэто старац знае яго думкі, здзівіўса да й дагадаўса, што мабыць гэто не просты старац. От ён і просіць яго паказаць дарогу ў сьвіет, каб там навучыцца хаць таму, як жывуць людзі. — Ідзі ка мніе служыць, — кажэ сівенькі дзедок, — та мнуого навучышса. — Здзівіўса ён, але пашоў. — Пачакай трохі тут, я прышлю табіе каня, ён цебе давезе. Туолькі ты не пужайса, што ён трохі дзіўны. — Сказаў гэто да й знік. Стаіць той чалавіек, чакае, аж чуе, штось гудзе, бы дзіесь падае град. Азірнуўса ён, а тут і стаў перад ім куонь з залатымі крыламі. Скочыў ён на таго каня да й панесса як віхар. Атдзеліўса куонь ат землі да й палеціеў усе вышэ да й вышэ. От ужэ бачыць ён, што ў вёсцы людзі ходзяць па вуліцы маленькіе, бы мухі, а высокі ліес здаецца яму мурожнаю травою на сенажаці. Скоро ўбачыў ён усю зёмлю са ўсімі марамі, гарамі да палямі, ўбачыў усіе царства, гарады й вёскі. Але скоро й земля зрабіласа маленькаю, як блінец, а потым і саўсім знікла. Падняў яго куонь пад самае сонейко да й заўёз на нёбо; зліез ён з каня, каб атдыхаць, бо вельмі ўтаміўса, а той і знік. Супачыў трохі той чалавіек да пашоў аглядаць, што там робіцца. Аж бачыць, стаіць велізная хата, а ў ёй хтось крычыць: ой, ціесно! Вайшоў ён у тую хату, аж там туолькі адзін чалавіек і ён крычыць, што яму ціесно. Падзівіўса ён і незнае, што-б гэто было такое. Да

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

й пашòў дàлей. Ідзè ён цèраз пòплаў, а там густàя харòшая травà да квіеткі, хаць касì. На туом пòплаву пасўцца авèчкі да такіие худыіе, што чуць кòсці не разсыплюцца. Падзìвіўса ён да й пашòў цèраз гаёк. Выхòдзіць на пòле, дзіе немà-ш нігòднаіе травìнкі, алè бàчыць, што там пасўцца такіие тлўстыіе авèчкі, што чуць хòдзяць ат лòю. Дзіўно ямў стàло, алè невіедае, што гэто такòе. Пашòў ён у другì гаёк, бàчыць, аж там чалавіек лòвіць птўшачку, а янà ўсе пералетàе з аднагò гнездзèчка ў другòе, і ніяк ніельга яіе злавìць.—Закрый,—кàжэ ён,—аднòю рукòю гнездзèчко.— Той закрыў, а тут зàмест двух, стàло чатыры гнездзèчка, дак яшчэ труднiей злавìць тўю птўшачку. Пашòў ён дàлей да й падхòдзіць к варòтам рàя. Бàчыць праз частакуол, што там цьвітўць руозныiе квіеткі, летàюць да пaюць птўшкі, стаяць гòжые палàцы, што аж зяхацяць ат зòлата, а тут калà сàмых варуот валяецца якòесь пàдло, чэрві ў ём аж кішàць і ад ягò йдзе такì смуруод, што аж нуос вèрне. Плюнуў ён на тòе пàдло да й пашòў у рай. Сустракàе ягò àнял да й паўёў к буогу. Прышлì яны к буогу, àнял закрыў свуой твàр крылàмі да й вòчы панўрыў. А ён зірнўў на бòга да й бàчыц пèрад сабòю тагò сàмаго сìвенькаго дзедкà, што прыхòдзіў к ямў стàрцам. От буог і кàжэ: — прайшлà тваіе жыткі пèршая палавìна. Ты быў вèльмі цікàвы, хаціеў усе знаць, алè ўсе і ў галавіе не зміесціцца, давòлі й тагò, што я табіе растлумàчу. Слўхай. Той чалавіек, што крычыць у хàце, нібыто ямў ціесно, за жыце павыганяў з хàты ўсіх братуоў. Авèчкі тлўстыiе й худыіе, гэто дòбрыіе й грыэшныіе дўшы людзèй, птўшачку лòвіць чалавіек, гэто ён лòвіць сваю дўшу. Ты хаціеў ямў памагцì, да зрабіў яшчэ гарыэй. Ты плюнўў на пàдло да й саграшыў, бо то твуой бàцько ведзьмàр і мàтка віедзьма. Ось паглядзì, што ў туом гòршчыку, што ты мніе даў. Развезàў буог гòршчык, аж там кроў, слёзы й пуот людзèй. — От што людзі называюць грашàмі, от янò зòлато, што твуой бàцько й мàтка сабрàлі ў людзèй. Яны хаціелі пакàяцца й атдалì мніе ўсе, што за жытку награбілі ў біедных людзèй. Цепèр ты мнуого знàеш, алè не ўсе, бо ўсе і ў галавіе не зміесціцца.—І па-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

прасі̑ў той чалаві͡ек, каб бу͡ог пазво̀ліў яму̀ паглядзі͡ець гры͡эшных душ. Бу͡ог пазво̀ліў. Вы̀шаў ён з ра̀я да й пача̀ў абхо̀дзіць ты̀е катлы̀ з смало̀ю, дзі͡е му̀чыліса гры͡эшные ду̀шы, алѐ не му͡ог до̀ўго глядзі͡ець, бо яму̀ было̀ вѐльмі шко̀да тых людзѐй. Бо чым яны̀ вінава̀ты, што іх такі̀мі бу͡ог сатвары̀ў і так ім нараду̀ назна̀чыў. — Ні͡е, — ду̀мае ён, — бу͡ог дару̀е ім грахі̀, бо ён до̀бры, міласѐрды, дак несхо̀чэ, каб то̀е, што ён зрабі̀ў, да ста̀ласо ліхі̀м.— Ту͡олькі ён гэто паду̀маў, як паатчыня̀ліса катлы̀ да й вы̀шлі аттуль гры͡эшные ду̀шы да й пашлі̀ хвалі̀ць бо̀га. Ра̀дасно яму̀ ста̀ло на сѐрцы. Аглядзі͡еўса ён аж тро̀е рву̀ць то̀ненькае дзераўцо̀ да не мо̀гуць яго̀ вы̀рваць. А гэто была̀ яго̀ жы̀тка. Не знаў ён таго̀, рвану̀ў то̀е дзераўцо̀ да ра̀зам і вы̀рваў. Тут упа̀ў да й памѐр, бо нему͡ожна чалаві͡еку ўсе знаць.

Ры͡эдкі.

В. Рожан.

80. Два браты̀, бода̀ да до̀ля.

Ці блі̀зко, ці далѐко жылі̀ ко̀лісь два ру͡одные браты̀. Былі̀ яны̀ аднаі͡е ма̀ткі, аднаго̀ ба̀цька, да не ру͡оўную даў ім бу͡ог до̀лю. Аднаму̀ до̀ля спры̀яе, дак яму̀ ві͡ецер дзецѐй калы̀шэ, до̀жджык мы̀е, а со̀нцэ гры͡эе; а друго̀го до̀ля ледашчы̀ца па сві͡еце гуля̀е, аб дзі͡етках не дба̀е. Іх ві͡ецер хало̀дзіць, до̀жджык не даго̀дзіць, со̀нейко сма̀ліць, аж лі̀хо іх ва̀ліць. Адзі̀н брат бага̀ты, за што ні вазмѐцца, ўсе до̀брэ йімѐцца. Другі̀ брат без до̀лі, не ма̀е карысці ніко̀лі. Што зро̀біць старэ̀нно, ўсе гі̀не штодзѐнно. Зві͡ер гры͡эжэ целу̀шкі, шчур бу̀рыць каду̀шкі, негры͡эе як трэ̀ба штось пі͡ечка, буду͡оўлю спалі̀ла спрэс сві͡ечка. Беда̀ за бедо̀ю, хлі͡еб з лебедо̀ю, не стра̀ва, — вадзі̀ца. Ой, до̀ля, ледашчы̀ца. Нарэ̀шце на Ўшэсця хваро̀ба кару͡оўку сустры͡эла. Жанчы̀на ёй зѐлак са̀гры͡эла. — Ой, го̀рэ, ты-ж дзі͡еткам пажы̀ва!.. — Кару͡оўка не хо̀дзіць, чуць жы̀ва. Сплесну̀ла жанчы̀на рука̀мі. — Дзі͡етак загу̀бім мы са̀мі. — Берэ̀ш ты кару͡оўку, беры̀ш і веру͡оўку. — І бі͡едны дары͡эзаў кару͡оўку. З каро̀вы ён шку̀ру здыма̀е да

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ў жа̀лю ўздыха̀е. Падхо̀дзіць стара̀я жабра̀чка, пыта̀е, ці бу̀дзе пада̀чка. — Усе ру͡оўно прыдзѐцца памѐрці... — Атры͡эзаў наш бі͡едны паў чвѐрці, даѐ ён ту͡ой ба̀бе паўчвѐрці, а ба̀ба не здо̀ляе пѐрці. — Да хто ты, стара̀я? — Ён ба̀бу пыта̀е. — Беда̀ я, сако̀лік. Ці е ў цебѐ во̀лік? — Схапі̀ў ён тут ба̀бу пад клі͡ешні бы жа̀бу да ў вы̀жар глыбо̀кі заці̀снуў пад бо̀кі. Прайшла̀ знаць часі̀на ліха̀я; прыго̀да даму͡оўку міна̀е. Падня̀ўса наш бі͡едны на но̀гі, — засі͡еяў абмі͡ежкі да ло̀гі. Зрадзі̀ла пшані̀ца й друга̀я пашні̀ца. Не ма̀е мітрэн(g)гі і ста̀так; у ха̀це зъяві̀ўса доста̀так. Дак хто-ж з нас не зна̀е, што ў шча̀сцю нас ку͡ожын пыта̀е: як вашэ̀ здаро̀ве, маі͡е вы пано̀ве. Так брат той бага̀ты, захо̀дзіць да бі͡еднаго ха̀ты, пібы̀то здару͡оўе пыта̀е да со̀чыць, атку̀ль ён то ма̀е, што ў ха̀ці да ў сі͡енцах ускры̀ні, ў вабо̀рах да ў сві̀рні, ў вадры̀ні. — Зайшо̀ў я, брато̀чак да ха̀ты да й ба̀чу, што стаў ты бага̀ты. Не ту͡ойса, скажы̀ мні͡е, як бра̀ту, як мог ты збагаці̀ць сам ха̀ту? — У вы̀жары, бра̀це, ў бало̀це е до̀ля, што хо̀дзіць у зло̀це. — І про̀сіць бага̀ты паво̀лі: звадзі̀ менѐ, братко̀, да до̀лі. — Брат бі͡едны шука̀ць там не ра̀дзіць, — бо, — кажэ̀ ён, — мо̀жэ зава̀дзіць. — Не слу̀хаў ягѐ той бага̀ты, да ху̀ценько вы̀шаў ён з ха̀ты. Дак чуць ён беду̀ там з бало̀та даўѐў сабі͡е ху̀тко да пло̀та, яна̀ на гало̀дные зу̀бы схапі̀ла бага̀таго ў гу̀бы, схапі̀ла ў даму͡оўцы бага̀цье да й зні̀шчыла самае шма̀цьце. Дак гэтак за хці̀васць бага̀ты заста̀ўса пад ста̀расць без ха̀ты. І на̀крыж паві͡есі̀ўшы клу̀нкі ён хо̀дзіць, жабру̀е без жу͡онкі. Не ма̀е прыту̀лку нікол̀і, бо да̀рам шука̀е ён до̀лі. А до̀ля з бедо̀ю сако̀чэ, бо заўжды так зро̀біць, як зхо̀чэ.

Ры͡эдкі.

В. Рожан.

81. Хто вы̀думаў гро̀шы.

Быў сабі͡е адзі̀н чалаві͡ек да такі̀ скупы̀, што шкадава̀ў на̀ват даць лю̀дзям напі̀цца. У ягѐ ўсегѐ было̀ мну͡ого: по̀ўны хлевы̀ гаўя̀да, а ён трасѐцца, як здо̀хне паршы̀вае парася̀тко; сві̀ран ло̀міцца ат хлі͡еба, а яму̀ ўсе ма̀ло, — кру̀кам ві̀сіць над ку͡ожным

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

зерня̀ткам і ніко̀му не дась і панюхаць. Сваѐ гніѐ ў засіеках, а ён завѐдуе, калі̀ ўба̀чыць у людзѐй якую-нѐбудзь слімаза̀рную пашні̀цу. Ат хці̀васці вы̀сах як ражо̀н, а ні што̀ яго̀ не ната̀ліць. От ён пача̀ў ужэ̀ іесці туолькі адзін раз у дзень да й то бу̀льбу, або̀ мякі̀ну наміесіць з бу̀льбаю, спечэ̀ на вуго̀лі да й іесь з хало̀днаю вадо̀ю, а каб было̀ смачніей, дак яшчэ̀ пасы̀пле по̀пелам. Смеюцца лю̀дзі з таго дурно̀го чалавіека, што й сабіе шкаду̀е хліеба, да іесь мекі̀ну. І празва̀лі яго̀ Мекі̀ннікам. Трасѐцца Мекі̀ннік над сваі̀м дабро̀м да пражэ̀цца, каб нажы̀ць яшчэ̀ буольш. Алѐ віедамо, з працы рук мнуого не нажывѐш, бо ў гаспада̀рцы адно̀ прыбыва̀е, а друго̀е ўбыва̀е, от бы вада̀ ў рацы̀э. Скупы̀ збіра̀е, трасѐцца, а чорт з яго̀ смеѐцца, заханча̀е да ў міех забіра̀е. Не мажэ̀ Мекі̀ннік вы̀трымаць, аж пу̀каецца, так яму̀ хо̀чэцца ўсе буольш і буольш. Дачу̀уса ён ат людзѐй, што каб чалавіек знайшо̀ў цвіет па̀пераці̀, дак тагды̀ ўселя̀кае дабро̀ паўзло̀-б к яму̀ само̀. Пача̀ў ён распыто̀ўваць людзѐй, а ты̀е ка̀жуць, што па̀пераць цьвіцѐ туолькі аднэ̀йко ў руок на купа̀ло, алѐ што той цьвіет вѐльмі тру̀дно ўзяць, бо яго̀ сцерагу̀ць чэ̀рці да ўселя̀кая нѐчысь. Пражэ̀цца Мекі̀ннік, каб міець буольш дабра̀, так пражэ̀цца, што й страхаў не баі̀цца, бо не мажэ̀ вы̀трымаць, така̀я апанава̀ла яго̀ хці̀вась. Па нема̀лум ча̀се прыхо̀дзіць Купа̀ло. Яшчэ̀ со̀нейко не зайшло̀, а Мекі̀ннік узя̀ў то̀рбачку да й пашо̀ў у ліес. От со̀нейко схава̀ласо за зѐмлю; на нѐбе заблішча̀лі зуоркі, да туолько там іх, што й лі̀ку нема̀. І ду̀мае Мекі̀ннік, што так мнуого на свіеце ўселя̀кага дабра̀. І гарыэ̀й яго̀ берэ̀ хці̀вась, каб заўлада̀ць тым дабро̀м. Сцемніело ў ліесі, бы ў мешку̀, туолькі дзіе-ніедзе праз віеткі блішча̀ць зуоркі. — Мо так блішчы̀ць цьвіет па̀пераці, — ду̀мае Мекі̀ннік і прыгляда̀ецца на па̀пераць пад густы̀мі ла̀памі галья̀. Ла̀зіў ён, ла̀зіў у гушчэ̀чы, чуць во̀чы сабіе не павыдзіра̀ў, зайшо̀ў у глухі̀ ліес, так што й вы̀брацца не мажэ̀. Пача̀ў ён прыслухо̀ўвацца, ці не забрэ̀шэ дзіе саба̀ка, алѐ ніч̀ого не чува̀ць. Сіеў ён на пні̀ да й невіедае, куды̀ йці. Алѐ ось па ліесі штось загуло̀, затрашча̀ло, аж у яго̀ маро̀з пабіег па шку̀ры. Куды̀ ён не зірнѐ, дак ба̀чыць, аж чэ̀рці ска̀чуць

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

з вie͡дзьмамі абняўшыса, а ўселякая нѐчысь стаіць вокала да ў ладкі плѐшчэ, ту͡олькі вочы блішчаць бы жар да зубы ляскацяць. Спалохаўса ён да нема чагò рабіць, седзіць да трасѐцца, бы сабака на марозе. Ту͡олькі ось убачыў ён, што непадалѐчку ў паапераці штось блішчыць, от бы зу͡орачка. Дагадаўса ён, што гэто цвie͡т папераці да й кінуўса туды. Алѐ куды там! Не паспie͡ў ён і два-тры разы ступіць, як уселякая нѐчысь з крыкам і піскам налецie͡ла туды да й засланіла яму дарогу. Стаў ён, стаіць і не варухнѐцца, ту͡олькі зубы ляскочуць, бы ягò трасца трасѐ. Перш хацie͡ў ён перахрысціцца, алѐ падумаў, што багацьѐ туды йдзе, дзie͡ нема крыжа. — Ну, — думае, — серу͡оўно прападаць, чорту душу запрадаў-бы, каб ту͡олькі было за што.— Ту͡олькі ён гэтак падумаў, як адзін чорцік тут як тут. Падбie͡г к яму да й кажэ: ты зваў менѐ? Я тут. Дам табie͡ багатство, якое ту͡олькі ты зхочэш, а ты мнie͡ дасі тую сваю плюгавую душу, што яна табie͡ саўсім не патрэбна, бо часамі ту͡олькі ie͡сь да скрабѐ табie͡ сѐрцэ. — Згадзіўса Мекіннік аддаць чорту душу за багатство да й пытае ту͡олькі, які тэрмін ён будзе спажываць тое багатство. — Янò заўжды будзе тваѐ, — кажэ чорт, — бо цебѐ людзі нікòлі не забудуць, пакуль і свie͡т будзе стаяць, та будуць казаць, што ўсе багатство — тваѐ. — І пачалі яны таргавацца, ку͡олькі гадоў чорт дась яму жыць. Нарэшце старгавaліса, і чорт узяў з Мекінніка роспіску, каторую ён напісаў сваѐю кроўю з мie͡зенаго палца. От чорт даў Мекінніку цьвie͡т папераці да й наўчыў, як ягò ўжываць. С тых часаў пашлыло к Мекінніку ўселякае дабро, як вада ў рацэ; хутко ў ягò сабралосо ту͡олькі багатства, што й мie͡ста яму нема. Бачыць Мекіннік, што нie͡льга яму сабраць багатства са ўсяго свie͡ту, бо янò вѐльмі мну͡ого займае мie͡йсца да й такое цяжкае, што ягò й земля не выдзержыць, от і завѐ ён к сабie͡ таго чорта. А той і кажэ: — добрэ, я дам табie͡ такое зie͡лье, што яно зберэ к табie͡ ўсе багатство й мало будзе займаць мie͡йсца. — Отназбіраў чорт поту, слёз да крыві людзѐй, наліў у кацёл, варыў-варыў да й вывaрыў золато. Зірнуў Мекіннік на золато да й кажэ: давай сюды, бо

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ў менѐ яшчѐ нема̀ такоїе блiскучаїе рэчы.—Нїе,—ка̀жэ чорт,— мы ягѐ перш пу̀спiм у лю̀дзi; янѐ там заберэ ўсе бага̀тство й по̀тым прыдзе к табїе. — Ї выдумаў чорт гро̀шы да й пусцiў iх па свїету гуля̀ць да людзѐй абiра̀ць. Па нема̀лум ча̀се сабрало̀со ў Мекiннiка вѐльмi мнуого грошэй, так мнуого, што ён муог купiць увѐсь сьвїет з усiм бага̀тствам i з усiмi людзьмi. Алѐ ба̀чыць Мекiннiк, што ско̀ро канча̀ецца тэ̀рмiн i што прыдзецца памiра̀ць. Папро̀буваў ён падкупiць смерць, алѐ та̀я туолькi зарагата̀ла з дурно̀го чалавїека, так што аж усїе куостачкi яїе забрашча̀лi. Папро̀буваў ён падкупiць знахаруоў да дахтуруоў, каб ат смѐрцi атпѐрцi, алѐ тые ў вадзiн го̀лас ба̀юць, што ўсїе лю̀дзi памiра̀юць. Ба̀чыць ён, што нїельга выкрупiцца дак i пусцiўса на хiтрась. От зсыпаў ён зо̀лато ў по̀граб, набра̀ў сабїе ўселя̀каїе стра̀вы да й седзiць там, хава̀ецца от чо̀рта. Алѐ ось прыхо̀дзiць смерць да й ка̀жэ: — чым было̀, тым i стань, — як яна̀ гэто прамо̀вiла, дак усе зо̀лато разлiло̀со ў пуот, слёзы й кроў людзѐй да й залiло̀ по̀граб аж давѐрху й утапiло таго̀ хцiваго Мекiннiка. Тут якура̀т зъявiўса чорт па ягѐ ду̀шу, схапiў яїе да й ка̀жэ: пакуль маѐ сьвїет стая̀ць, датуль бу̀дуць цебѐ памiна̀ць, што ўсiх дурыў, по̀там, слёзкамi да кро̀ўю жыў.

Рыэдкi.

В. Рожан.

82. Су̀джано.

Жыў сабїе малы хлапчу̀к да вѐльмi ён любiў слу̀хаць ка̀зкi да руозные ба̀йкi. Куды нi збiра̀юцца лю̀дзi, дак, вїедамо, пажу̀пяць тро̀хi аб туом, аб сём, а нарэшце зна̀йдзецца памiж iх хтонiбуць да й пачнѐ хлусiць, пачнѐ плесцi, што было̀, й чаго не было̀, бо пра̀ўду ка̀жуць лю̀дзi, што ўселя̀кая хлуснїя, як устарыэе, та бу̀дзе й пра̀ўда. От той хло̀пец падкра̀дзецца цiхенько да й слу̀хае. Мо ўжэ ён знаў усїе ка̀зкi, алѐ ўсе слу̀хае да слу̀хае. Ї пача̀ў ён жыць на сьвїеце, бы ў ка̀зцы. Куды не зiрнѐ, та яму̀ здаѐцца, што гаўя̀до гаво̀рыць памiж сабо̀ю, што кусты й дзераўля̀кi шэпчуцца от так, бы й лю̀дзi. Уба̀чыць ён пчуолку, як

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

тàя на квїеткаx збірàе медòк, дак ён і пытàе яїе, што ямỳ сỳджано, ці якàя ягò бỳдзе дòля. Бзын! пчўолка палецìць, а ямỳ здаèцца, што янà сказàла — ліхо. Сустрыэне яўёрку, як янà грызè арыэшкі, падòйдзе к ёй бліжэй, каб запытàць аб сваёй дòлі, а тàя задзерэ̀ хвўост, пабежы̀ць угòру па дзэ̀раве да тўолькі цмок-цмок-цмок! І здаèцца ямỳ, што яўёрка кàжэ: ліхо табїе, ліхо! Бїегае хлапчỳк да прыслухòўваецца, а чўом шэ̀пчэцца вїетрык з я̀варам, што так гòжэ ўздымàецца аж у сàмае нèбо, прыслухòўваецца к стра̀шнаму ро̀ву цѐмнаго лїесу, як ён у бỳру матàе галавàмі, размàхвае вїеткамі бы чалавїек рукàмі да камỳсь грòзіцца, камỳсь выстаўля̀е кулакі̀, бàццэ хòчэ атагнàць ліхỳю дòлю да падỳжацца з сàмаю смѐрцью. Прыслухòўваецца й ямỳ здаèцца, што й лїес, і ракà, й сàмае камїене — усе жывè, ўсе дỳмае, мàе сваю гавўорку, тўолькі лю̀дзі яїе не разумїеюць, хібà адзін дзїед Гры̀шко, што ўсе знàе да так гòжэ бàе кàзкі, што ягò слỳхаў-бы дзень і нўоч. Пабїег той хлапчỳк к старòму Гры̀шку на пчальнік, каб абà ўсём распытàць ягò. Да як к ямỳ падступіцца? Гры̀шко хаць і дòбрэ бàе кàзкі, да такі̀ ён грўозны, такі̀ разỳмны, што хлапчỳк баіцца з ім і загавары̀ць. Падбїег хлапчỳк, зірнỳў праз плўот, аж дзїед Гры̀шко, ўжэ ўвесь сівенькі, як сусїеда кабы̀ла, з дòўгаю, дòўгаю барадòю па сàмы пòяс, седзіць на калòдачцы да плецè ла̀пці. Ускòчыў хлапчỳк у пчальнік нібы̀то не нарòкам да й пачàў хватàцца за свàю гіру, от як бы там пчалà заплỳталаса.

— А ты, дзїеткі, не бўойса, — гэто бòжая слугà. Янà не ўкỳсіць, — кàжэ дзїед. Хлапчỳк трòхі пасмелїеў да й памалѐньку бліжыэй падышòў к дзїеду. Вїедамо, старòму хацїеласо пагаманіць і ён падазвàў к сабїе хлапчукà, паглàдзіў ягò па галўоўцы да й кàжэ: пчўолка, дзїеткі, нòсіць нам медòк, а бòгу вашчòк. Гэто светòе стварэ̀не.

— А янà ўмїее гавары̀ць?

— Умїее, дзїеткі. Кўожнае стварэ̀не ўмїее гавары̀ць, тўолькі мы не разумїеем, бо так бўог велїеў, каб мы не знàлі, што бỳдзе ўпѐрад.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

— А пчӯ͡олка ві͡едае, што з нàмі бỳдзе?

— Ві͡едае, мў͡ой гòлубе, ві͡едае, што нам сỳджано й якỳю дòлю нам бў͡ог прызнàчыў.

— А янà мні͡е кàжэ, што мая̀ дòля ліхàя.

— Гэто, дзі͡еткі, як бў͡ог дась. Што сỳджано, тòе й бỳдзе.

— А я, дзі͡еду, нехачỳ слỳхаць, што так сỳджано, а бỳду дỳжацца, бỳду біцца з ліхòю дòляю.—І хлапчỳк аж пачырвані͡еў да й сашчапіў сваі͡е кулачкì. Паківаў дзі͡ед галавòю да патрў͡ос барадòю. Бàчыць, што гэсты хлапчỳк не абы̀ які, а што вèльмі жвàвы да цікàвы. І дòўго стары̀ Грышко размаўляў з ты̀м хлапчукòм, вучы̀ў ягò, як на сьві͡еце жыць, як ліхо абхадзіць, тў͡олькі аднò казàў, каб ён дòлі не чапàў, бо сỳджанаго ні абòйдзеш, ні канём не объі͡едзеш, што сỳджано, тòе й бỳдзе. Яшчэ стары̀ не пасьпі͡еў усяго сказàць тамỳ хлапчукỳ, як чỳе, што на вỳліцы якісь·крык. Падняўса ён з калòдачкі да, апірàючыса на кіёчак, вы̀цягса туды̀, аж сусі͡едзі кàжуць, што ўпаў азерў͡од да й на сьмèрць забіў бацькў͡оў тагò хлапчукà. Астàўса хлапчỳк крỳглаю сіратòю от бы віцінка ў пòлі. Немажэ ён малы̀ гаспадаравàць і немà ніякаі͡е радні. Сабрàўса схў͡од, абсудзіў дзі͡ело да й раздàў гаспадàрку хлапчукà людзям, пòкі ён падрасьцè, а ягò самòго прыняў сусі͡ед, бо ў ягò небы̀ло дзецèй. Жывè там хлапчỳк да пасè гỳсі. Прахòдзіць год, а мо й бў͡ольш, тў͡олькі ось затаўсьцці͡ела жў͡онка тагò гаспадарà, ў якòго ён жыў. Падхòдзіць ёй парà раджàць. Паслàлі тагò хлòпца пàсьціць кòні. А ён заўёў кòні на лужòк, там папỳтаў іх, а сам вернỳўса дамў͡оў, ціхенько лёг на палàці да й прытаіўса там, нібы̀то сьпіць да ўсе пазірàе, як гэто маладзіца бỳдзе раджàць. Алè ось бàчыць, што прышлì ў хàту перш сьмèрць з касòю, пòтым яшчэ дзьві͡е малады̀е жанчы̀ны. Зірнỳла сьмèрць на тỳю маладзіцу да й кàжэ: вазьмỳ я яі͡е.—Яшчэ не парà,—кàжэ маладàя жанчы̀на да й затулìла яі͡е ат сьмèрці. Паляскала сьмерць зубàмі да й кàжэ: я вазьмỳ хаця̀ дзіця̀.—Тут вы̀ступіла другàя жанчы̀на да й кàжэ: я ягò дòля. Тым чàсам радзілаcа дзі͡евачка да як убàчыла сьмерць, дак началà крычàць с усіх сіл. Алè дòля засланіла дзіця̀ ат сьмèрці. Пабàчыла

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

сьмерць, што ёй тут нема̀ чаго̀ рабіць, паля̀скала зуба̀мі, пабра̀зкала касьця̀мі, закінула ко̀су на плѐчы да й зьнікла. Асталіса тые дзьвіе маладые жанчыны да й пачалі размаўля̀ць, яка̀я жытка бу̀дзе таго̀ дзіця̀ці. До̀ля ка̀жэ, — харо̀шая. — Бу̀дзе гэто вѐльмі го̀жая дзіевачка, а як вырасце, дак пуойдзе за̀муж за таго̀ ціка̀ваго хлапчука̀, што жывѐ ў яіе ба̀цька. Яны бу̀дуць жыць вѐльмі згуодно да хо̀рашэнько. — А друга̀я жанчына, а то была̀ судзьба̀, зірну̀ла на дзіця̀ да й ка̀жэ: — алѐ яіе ўку̀сіць свіньня̀, дак яна̀ з таго̀ й памрэ. — Зьнiклі тые жанчыны, а хлапчу̀к зірну̀ў на ту̀ю дзіевачку, а яна̀ чырво̀ная, змо̀ршчаная бы жа̀ба й вѐльмі яму̀ неспадаба̀ласа. — Ото̀-ж не дачака̀не тваѐ, — ду̀мае той хлапчу̀к, — каб я з табо̀ю пажаніўса. — Расцѐ та̀я дзіевачка, алѐ віедамо, мало̀е дзіця̀, яко̀е там хараство̀. Пазіра̀е на яіе хлапчу̀к да от так і задушыў бы яіе як жа̀бу, каб прыміеў. Алѐ ось адзін раз пашла̀ кудысь маладзіца, а хло̀пцу веліела пакалыха̀ць ту̀ю дзіевачку, як ачнѐцца да бу̀дзе крыча̀ць. Ачну̀ласа дзіевачка, зірну̀ла на хло̀пца да пачала̀ так крыча̀ць, што аж захо̀дзіцца. Калыха̀ў, калыха̀ў хло̀пец, нічо̀го не памага̀е, крычыць дзіця̀, аж пу̀каецца. Паба̀чыў хло̀пец, што дзіевачка ат пла̀чу ста̀ла така̀я брыдкая, што аж зірну̀ць на яіе гідко да й ду̀мае: — і гэто яшчэ ма̀е быць мніе жуонка! Да не дачака̀не тваѐ! — Тут ён як шалёны схапіў на сталіе канча̀ты нуож, пырну̀ў ім раз дзіевачку, а кроў так і пасачыласа. Уба̀чыў ён кро̀ў, спало̀хаўса, схапіўса за валасы да чуць іх сусім не выдраў. — Што-ж я нарабіў! Яж зарыэзаў дзіця̀, — закрыча̀ў ён да кінуўса бего̀м з ха̀ты й уцёк у ліес. До̀ўго ён там скіта̀ўса, іеў туолькі грыбы, ягады да арыэхі, а по̀тым, як ста̀ло халадніей, пацёгса па сьвіету жабрава̀ць. Тым ча̀сам прышла̀ ма̀тка ў ха̀ту да як уба̀чыла, што дзіця̀ ў крыві, дак пачала̀ галасіць, аж галаво̀ю біцца аб сьціену. Збіегліса лю̀дзі, аглѐдзелі дзіця̀ да й пачалі яго̀ ратава̀ць, бо ра̀на хаць была̀ веліка̀я, алѐ яна̀ не глыбо̀кая. Ма̀быць нуож туолькі збо̀ку абрыэзаў шку̀ру да чуць крэнуў мя̀са. Знеслі ба̀бы су сёй вёскі ўселя̀кае зіелье да як пачалі, як пачалі, дак і атхадзілі ту̀ю дзіевачку. Пашука̀лі, пашука̀лі таго̀ хло̀пца, нідзіе не знайшлі

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

да й кàжуць: мàбыць спужàўса да ат стрàху й сỳнуўса ў вòду.

Расцè дзі͡евачка да ўсе харашы͡эе, ту͡олькі велìзны шрам астàўса на бакỳ. От вы̀расла янà велìкая й стàла такàя ўдàлая да гòжая, што лю̀дзі не мòгуць надзівìцца. Убàчыла яі͡е пàні да й узелà к сабі͡е ў дву͡ор. Спадабàласа янà пàні да й жывè там бы панèнка. Тым чàсам той хлапчỳк шлялўса, шляўса па сьві͡ету, надаі͡ело ямỳ ў чужы̀х краѐх вуглы̀ абціpàць і захаці͡еласо хаць адны̀м вòкам зірнỳць на сваю̀ ру͡одную ўѐску. От і пашòў ён туды̀. Прыхòдзіць у дву͡ор, дзі͡е былà тàя дзеўчы̀на ў пàні, да й прòсіцца на слỳжбу. Вы̀рас ён за той час да стаў вѐльмі гòжым да ўдàлым хлòпцам, так што ніхтò й не пазнàў ягò. Спадабàўса ён пàну да й наняўса служы̀ць намі͡есьнікам. Ці дòўго, ці мàло ён праслужы̀ў, ту͡олькі ось сустракàе раз тỳю гòжую дзеўчы̀ну. Да як убàчыў, так і не жыў! З пѐршаго пòгляду так закахàўса, што й жыць без яі͡е не мажэ̀. Дак і дзеўчы̀не ён вѐльмі спадабàўса, алè, ві͡едамо, дзеўчы̀на, — маўчы̀ць да ціхенько плàчэ. Застàла яі͡е заплàкануюраз пàні да й давàй дапытòўвацца, чагò янà плàчэ. Запірàласа, запірàласа дзі͡еўка, а нарэ̀шце й прызнàласа, што вѐльмі кахàе маладòго да гòжаго намі͡есьніка. — А ён што? — пытàеца пàні. — Не ві͡едаю, — адмаўляе заплàканая дзеўчы̀на. — Не плач, мая ку͡отка, — кàжэ пàні, — ты такàя гòжая, што ён не мажэ̀ цебè не кахàць. Ту͡олькі ты не плач, бо вы̀плачэш сваі͡е ясныі͡е ву͡очкі. — Спалòхаласа дзеўчы̀на да й гòдзі плàкаць. От зрабìла пàні так, што намі͡есьнік нібы не нарòкам сустракàе тỳю дзеўчы̀ну. А ямỳ тòе й трэ̀ба. Сустры͡элісa яны̀ да як глянулі аднò на другòго, дак і без слу͡оў дагадàліса, што вѐльмі кахàюцца. Хỳтко яны̀ пабрàліса, а тут пан зрабіў маладòго акамòнам, от і пашлì яны̀ кахàючыса жыць да бòга хвалìць. Раз убàчыў ён у жу͡онкі на бакỳ пісỳх да й запытàў, што гэ̀то такòе, з чагò янò зрабìласо. Янà й расказàла ямỳ ўсе, што чỳла ат небу͡ожчыцы мàткі. Дагадàўса ён, хто янà такàя, дагадàўса да й падỳмаў: — ці-ж ат судзьбы̀ ні͡ельга нідзі͡е схавàцца? — Успаменỳў ён, што казàла судзьбà, да аж сэ̀рцо аблі-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

лòсо крòўю, так яму̀ стра̀шно ста̀ло, каб тòе не збылòсо, што каха̀нуй жуонцы напісано на раду̀. От пача̀ў ён берагці̀ сваю̀ жуонку, бòльш як сваѐ вòко й каза̀ў ёй, каб яна̀ берагла̀са сьвінѐй. Жывѐ сабіе та̀я жанчы̀на, як у бòга за па̀зухаю, ўсе ў яіе е, ні я̀кага клòпату не ма̀е. От даў буог ім дзіеткі на ра̀дась да на ўціеху. І забы̀ўса ён на тòе, што чу̀ў ат судзьбы̀. — А мо, — ду̀мае, — гэто ўсе пра̀шкі. — От ужэ паднелі̀са на нòгі дзіеткі да бы залаты̀е калёса тарахця̀ць па падлòдзы. Любу̀юцца ба̀цько з ма̀ткаю на іх гля̀дзячы, да ра̀дуюцца, што буог пасла̀ў таку̀ю жы̀тку, такòе шча̀сьце, што не трэба й паміра̀ць. Туолькі ось узду̀ма̀ў пан паіехаць на палева̀не да й узяў з сабòю тагò акамòна. Напалева̀лі яны̀ мнуого зверыны̀. Акамуон быў уда̀лы стралѐц і забі̀ў ён двух дзікуоў. От прывезлі̀ ту̀ю зверыну̀ ў двуор, разлажы̀лі на дзедзі̀нцы да й сабралі̀са ўсіе разгляда̀ць да любава̀цца. Вы̀шла з пакòяў і жуонка акамòна. От і пау̀ёў ён яіе пака̀зваць тых дзікуоў, што сам застрэліў. Падышла̀ яна̀ туды̀, пагла̀дзіла цьвòрдую бы дрот шчаці̀ну на спіне дзі̀ка да й дзі̀віцца, якіе ў ягò дòўгіе да вòйстрые іклы̀. Тым ча̀сам тагò дзі̀ка не сусі̀м застрэлілі, а туолькі аглушы̀лі. Ачу̀хаўса ён да як ускòчыць ра̀птам да як марськанѐ лычòм, дак зачапі̀ў іклòм акамòна жуонку па са̀мых ля̀шках, так што чуць саўсі̀м нуог не атпя̀ў. Паку̀ль лю̀дзі хапі̀ліса за стрэлбы, дак ён так суну̀ў у ліес, што ні̀хтò й не дагна̀ў. А жуонка акамòна яшчэ паму̀чыласа трòхі да й кòнчыласа. Не пла̀каў акамòн, бо пазна̀ў, што ат судзьбы̀ нідзіе не схава̀ешса, а што ягò пасці̀гло такòе нешча̀сце затым, што ягò дòля така̀я ліха̀я.

Рыэдкі.

В. Рожан.

83. Не сіла, а сміеласць.

Была̀ ў вадно̀й вѐсцы малѐнькая рòстам дзіеўка. Мо ў яіе й сі̀ла была̀ як у камара̀. Смея̀ліса зь яіе дзеўча̀та. Ка̀жуць, што хлòпец дзьму̀хне, дак яна̀ й палеціць бы пух. Алѐ яна̀ была̀ вѐльмі сміелая, што нічòго й нікòго не бая̀ласа. — Чагò я бу̀ду

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

баяцца, — часам шуткуе яна, — богу не трэба, а ліхі не возьме, бо й ён на менè не пазарыцца; вiедамо тая, што ат вiетру хістае. — Туолькі ось кажуць дзеўкі, што яна не такая смiелая, як гаворыць, бо поўначы пабаіцца адна схадзіць на моглiцы. Спрачаецца яна, што сходзіць, але тые кажуць, што не даюць вiеры. Злосць узела тую дзiеўку, а яна хаць была маленькая, да злосці поўны косці. — Отож пайду, — кажэ яна. — Гэто ты пуойдзеш, бо вельмі ўпартая, а ў самуой душа ў пъяткі схаваецца, як убачыш пень, — смеюцца дзеўкі. — Ото-ж пайду, — піснула яна, тупнула бы каза нагою да й пабiегла на моглiцы, бежыць і не азіраецца. Падбiегла к моглiцам, супынілася да й пашла ціхо, а каб не было страшно, запiела пiесню, йдзе да пае. Тым часам зладзiеі абакралі пана да й носяць тое дабро кала каплічкі па вуоз. Пачулі яны пiесню, спужаліса людзей да й пабiеглі ў лiес. Падходзіць яна к каплічцы да й бачыць, што там стаяць запрэжаные коні. Запытала яна, хто гэто, але ніхто не абзываецца. Памацала яна на возе, аж там много ўселякаго дабра. От яна атвезала коней, сiела на вуоз да й паiехала да гасподы. Пагналіса зладзiеі за тою дзiеўкаю, але немаглі дагнаць, туолькі пацікавалі, куды яна паiехала. Вернула яна пану коней і ўсе дабро, дак той даў ёй гасьцінца мнуого грошэй. Жыве тая дзiеўка да снажывае паньскiіе грошы, а дзiеўкі туолькі аблізваюцца да завідуюць ёй. Шкода зладзiеям таго дабра, але яшчэ гарыэй сорам ім, што такая невялічкая дзiеўка не пабаялася, а яны разбiегліса от яiе бы зайцы. От і надумалі яны замсьціцца. Па немалум часiе прыходзіць адзін злодзей к ёй у сваты. Яна не згаджаецца, пакуль не пабачыць, як ён жыве. А таму тое туолькі й трэ. От і расказаў злодзей ёй, як яго знайці. От і збіраецца яна iехаць к таму злодзею. Матка давай атгаворваць да не пушчаць. Куды там, дзiеўка стаіць на сваём. Нема чаго рабіць з упартаю дачкою, — прэцца бы свіньня ў вагаруод. От запрагла яна сваю паршывую кабылку, сiела да й паiехала цераз поле. Ось падъежджае яна к лiесу, бачыць збоку — пуоваратка, а кала яiе на кусьцè закручана кукла. Думае яна, што гэто зладзiеі зра-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

білі прыкмі͡ету, каб не заблудзіць. Звернула яна на пу͡оваратку да й паі͡ехала лі͡есам. Праі͡ехала мо версту͡оў пъяць з хвастом да ўсе варочае на пу͡овараткі, дзі͡е е прыкмі͡еты. Падъі͡ехала к балу͡оцпу, аж і кончыласа дару͡ожка да пашоў такі густы лі͡ес, што й носа не ўбіць. Прывезала яна к берэзіне сваю кабылку да й палі͡езла ў той лі͡ес у самую гушчэчу. Разгортае яна абі͡еручкі калючые ві͡еткі да ціхенько лі͡езе праз гушчарню. Пралі͡езла яна мо з гоны, аж там прасьві͡ечваецца якаясь хатка. Падкраласа яна к ту͡ой хаццы, аж бачыць, што там зладзі͡еяў цы͡элая шайка. Яны дзі͡еляць праміж сабою накрадзенае, а мо й награбленэ дабро. Дзі͡еляць да лаюцца, крычаць, бъюцца, чуць не нажамі пыраюць адзін другого. Зірнула яна, аж тут і яі͡е жаніх. — Мабыць ён бу͡ольшы, — думае яна, — бо стаіць, размахвае велізазным нажом да разнімае другіх. Выглядзела яна, што там робіцца, прытаіласа ў кусце да й чакае, пакуль яны супакояцца. Алё ось старшы й кажэ: сонцэ нізко, вечар блізко. Хлопцы, за дзі͡ело, пакуль не сцемні͡ело. Час да касцёла нам памаліцца. Заўтра дзеліцца з ранку мы будзем, як грошэй дабудзем. Ту͡олькі ён гэто прамовіў, як усі͡е зладзі͡еі хуценько забралі сваё нажэндзе да й пашлі ў гушчэчу. Дагадаласа яна, што зладзі͡еі пашлі, каб ну͡очу абакрасці косцел. Пачакала яна трохі, вылезла з куста, зайшла ў тую хатку, аж там поўно крадзенаго дабра. Кінула яна тую хатку, выскачыла на дву͡ор да й хапі͡ела хучы͡эй бі͡егці да сваі͡е кабылкі, каб не спазніцца перасьцерагці ксендза, што зладзі͡еі хочуць абакрасці косцел. Кінуласа яна ў кусты да й не зацяміла, што паляначка заценена ві͡еткамі да ймхом. Ту͡олькі яна ступіла на му͡ох, як і шабоўсь у яму да такую глыбокую, што ў ёй саўсім цёмно. Папробувала вылезьці, дак нему͡ожне, бо сьці͡ены гладкіе. Пачала яна мацаць, што там на дні͡е, аж гэто лежаць забітые людзі. Схапіла яна аднаго да другого, аткуль і сіла ўзеласа, да давай іх складваць у кучу кала сьцены, наверх яшчэ пасадзіла аднаго, а сама стала яму на плечы да й схапіласа рукамі за ві͡еткі. Але ві͡етка абламаласа й тая дзеўчына грыманулаcа на мерцьвецу͡оў. Але як яна зачапіла ві͡еткі, дак сверху ўпаў у яму

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

му͡оцны сук. Схапіла янà той сук, стàла на мерцьвецà да давàй карпàць зèмлю да забівàць у песòк той сук; забіла ягò ў сьці͡ену, памацавàла, — вы̀трымае, — дўмае сабі͡е, стàла на сук нагòю да й схапіласа абі͡еручкі за край. От вы̀лезла янà з таі͡е ѝмы, азірнўласа да й пашлà абі͡еручкі расхіляць густы̀і͡е ві͡еткі да лі͡езці праз тўю нèтру. Плішчыласа янà, плішчыласа да й заблудзіласа ў гушчэ̀чы. Янà туды̀, янà сюды̀, немà кабы̀лкі да й шабàш. Бі͡егае, рўкі лòміць, чуць не плàчэ, што не мажэ̀ перасцерагці̀, каб зладзі͡еі не абакрàлі кòсцел. От вы̀бегла янà на палянаачку, а тут тыц ёй на сустры̀͡эк два ваўкі̀ да такіе здаравèнные, от бы пу͡одцелкі. Стàлі яны̀ да ту͡олькі зубàмі ляскаюць. — Ну, — дўмае янà, — зъі͡елі яны̀ маю̀ кабы̀лку. — Узелà гэто яі͡е злòсць, кінуласа янà з гòлымі рукàмі на тых ваўку͡оў, от ты̀е й спалòхаліса сьмі͡еласьці да й сунўлі ў лі͡ес. Ідзè янà дàлей; а тут ужэ̀ й сòнейко зайшлò; стàло цемні͡ець; птўшкі заціхлі, ту͡олькі пугàч крычы̀ць сваè пў-гу! да савà падлетàе к ёй на сваіх мягкіх кры̀лах, чуць не садзіцца на гòлаў, а як атлецiць да пачнè выгукòўваць, да пачнè плàкаць бы малòе дзіця̀, дак аж пòшчак ідзè па лі͡есу. Ту͡олькі ось зірнўла янà ўбу͡ок, аж на яі͡е кабы̀лцы і͡едзе якісь чалаві͡ек. Прыглядàецца янà, аж гэто сусі͡ед маскàль. Хадзіў ён у лі͡есі з сакі͡еркаю, ці не трàпіцца знаду͡обная дзераўляка, натрàпіў на кабы̀лку да давàй гукàць, звàць гаспадарà, алè не дагукàўса, бо ві͡едамо ў лі͡есі ат ві͡етру шумі̀ць і нічòго не чувàць. — Мàбыць зладзі͡еі, — дўмае маскàль, — укрàлі кабы̀лку сусі͡еда з драбінкамі да й схавàлі яі͡е ў лі͡есі. — От ён атвезàў кабы̀лку, сі͡еў на драбінкі да й папхàўса да гаспòды. Зірнўў ён, што з лі͡есу якурàт ідзè ямў на перары̀͡эз якàясь пачвèра й прышлò ямў ў гòлаў, што гэто мàбыць русàлка, ці якàя марà. Ён на кабы̀лцы, а дзі͡еўка бежы̀ць на перары̀͡эз да крычы̀ць: — дзяцько маскàль, дзяцько маскàль, пасту͡ой! Гэтò-ж мая̀ кабы̀лка. — Бàчыць маскàль, што ямў на кабы̀лцы ні͡ельга ўцечы̀ ат гэ̀стаі͡е мары̀, саскòчыў ён з вòза, схапіў сваю̀ сакі͡ерку да давàй бу͡ог нòгі, так сунўў, што ту͡олькі пъя̀ты замітусіліса. Сі͡ела дзеўчы̀на на ву͡оз да й завè сусі͡еда к сабі͡е. — Дзяцько маскàль, гэто-ж я, хібà-ж ты

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

менѐ не пазна̀ў? — Азірну̀ўса ён, перахрысьціўса да й пытàе: — калі гэто ты, дак чаму̀-ж у цебѐ кòсы распу̀шчаны бы ў русàлкі. —Тут туолькі дзеўчына аглѐдзеласа, што у яіе у гушчэчы звернуло ху̀стку да й распусціло кòсы. — Не лекàйса, — кàжэ янà, — бàчыш, я перахрысьціласа.—Тагды туолькі ён павіерыў да й падышоў к ёй. Сіеў ён на вуоз да й паіехалі яны хучыэй к таму̀ касцѐлу. Паку̀ль яны даіехалі, дак ужэ̀ пѐўне была̀ сàмая глу̀пась. Падышла̀ дзіеўка к касцѐлу, аж зладзіеі атчынілі дзьвѐры да й шàстаюць там. Зачыніла гэто янà дзьвѐры да й калòм падпѐрла, а зладзіеі там засталіса да й вылезці не мòгуць. Збіегліса лю̀дзі, палавілі іх да й забілі ў калòдкі. На другì дзень павѐла дзеўчына людзѐй у ліес да й паказàла, што там навычварàлі гэтые зладзіеі. Дак прàўду кàжуць, што берэ̀ не сìла, а сміеласць.

Рыэдкі.

В. Рожан.

84. Маскàль.

Ідзѐ маскàль шляхом да чуць ногі цягне, утаміўса да й у жываціе бурчыць, бàцпэ там бу̀бняць на трывòгу. Шляг шырòкі, паабàпал прысàды стаяць, бы маскалì на вучэні, а на трахту̀ нікагу̀сьсенько не зуорко, бàцпэ ўсіе вымерлі, ці паіехалі на кірмàш. Туолькі бàчыць ён, што сòнейко спусьціласо саўсім нізко, а тут нема̀ ніякаіе ўѐскі. Лàецца маскàль да ўжэ чуць дыбае дàлей. — Отò-ж старуонка! — бурчыць ён сабіе пад нуос, — хаць ты лажыса да й памірàй. От табіе віераю й прàўдаю слу̀жыў бòгу й цару̀ чуць не двàдцаць пъяць гадуоў да й даслужыўса, што цепѐр серуод пòля здыхàй з гòладу. — Хаціеў ён сіесці, каб трòхі атдыхаць, да пабаяўса, што, бадàй, як сядзе, та й не ўстàне. От закурыў ён лю̀льку да й пасу̀нуўса дàлей. Алѐ ось туолькі ўзышоў на ўзгуорачак да зірну̀ў у буок, аж бàчыць там яку̀юсь вѐску. Абрàдуваўса да хаціеў іці туды на ценькì, алѐ ўспòмняў, што лю̀дзі кàжуць: ценькì звòдзяць дзенькì да й пашòў шукàць пуоваратк і. Прайшòў ён мо гануоў двоі, аж прàўда, кала̀ крыжà

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

растанцы̀, і малѐнькая дару͡ожка паўз балу͡оцце праз хмы̀знік ідзѐ ў ту̀ю ўѐску. Насілу перабра̀ўса ён цѐраз грэблю да цѐраз бру͡од па бѐрвам і кла̀дкам, на расо̀ху апіра̀ючыса, паку̀ль ускара̀бкаўса на пешча̀ную гу͡орку да прышо̀ў у малѐнькую ўѐску. А тут ужэ̀ й со̀нейко зайшло̀. Пастухі̀ го̀няць даму͡оў ста̀так да ляскаюць пу̀гамі, ба̀ццэ з пісталі͡ета. Зайшо̀ў ён у вадну̀ ха̀ту, каб папрасіцца на нач, аж там ба̀бы гало̀сяць над паку͡ойнікам. Су̀нуўса ён у другу̀ю, — там хво̀рая ўдава з дру͡обнымі дзі͡еткамі, што ні͡екаму й вады̀ пада̀ць. Нема̀ чаго̀ рабіць, пашо̀ў шука̀ць лі͡епшаі͡е ха̀ты. От ба̀чыць, пѐрад ха̀таю зро̀блен агару͡одчык, а ў ём растуць го̀жые кві͡еткі. — Папыта̀юса тут, — ду̀мае маска̀ль да й пашо̀ў у ха̀ту прасіцца на̀нач. Улі͡ез туды̀, аж там малада̀я гаспады̀ня печэ̀ ала̀дкі. — Дабры̀вечар! — Здаро̀венек быў, служы̀венькі! — Пу̀сьці, хаджа̀ечка, паначава̀ць! — Я-б і ра̀да, му͡ой сако̀ліку, да ў мѐне такі̀ пага̀ны гаспада̀р, што як прыдзѐ пъя̀ны, дак ён набъѐ менѐ й цебѐ. — Непачу͡ом, хаджа̀ечка, — мні͡е не такіѐ трапля̀ліса. — Як зна̀еш, — ка̀жэ маладзіца, — мні͡е вугла̀ не шко̀да. — От і аста̀ўса тут маска̀ль начава̀ць. Накармі̀ла яго̀ гаспады̀ня ала̀дкамі, спекла̀ яму̀ яѐчню, прымасціла на̀ ла̀ве да й укла̀двае спаць. Ту͡олькі ўжэ маска̀ль хаці͡еў лѐгці да распра̀віць но̀гі, як ось лі͡езе ў ха̀ту пъя̀ны гаспада̀р, а пад па̀хаю трыма̀е скры̀пачку. А ён быў музы̀ка да ўсе йгра̀ў на весі͡ельлях. — От до̀брэ, — ка̀жэ ён, уба̀чыўшы маскаля̀, — што ты прышо̀ў к нам. Я бу̀ду йграць, а ты бу̀дзеш скака̀ць. — Пача̀ў маска̀ль атка̀звацца, што ў яго̀ но̀гі баля̀ць, бо ўвесь дзень скака̀ў на шляху̀ да на грэблі, по̀кі сюды̀ даско̀чыў. Куды̀ там, музы̀ка й слу̀хаць не хо̀чэ: скачы̀ да скачы̀. Зайгра̀ў музы̀ка на сваѐй скры̀пачцы, пішчы̀ць, бы парася̀ ў пло̀це, ві͡едамо, як пъя̀ны да й стру̀ны на весі͡ельлі парва̀ліса. — Скачы̀, такі̀-сякі̀, — крычы̀ць ён, на маскаля̀, — а то набъю̀ да й вы̀кіну за плот! — Нема̀ чаго̀ рабіць, папро̀буваў маска̀ль нібы скака̀ць, да куды̀ там, — но̀гі не слу̀жаць. Схапі̀ў музы̀ка таўка̀ч да к маскалю̀. Насілу той схапі̀ў свой клу̀нак да дава̀й бу͡ог но̀гі. Выскачыў з ха̀ты да й не ві͡едае, куды̀ дзева̀цца. Сцемні͡ело. Лю̀дзі

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

пакла̀ліса спаць. Куды̀ тут іці̀? Пастая̑ў ён, пастая̑ў на вѹ̀ліцы да й пацёгса на гу̀мна. Ба̀чыць — гумно̀ прачы̀няно. Зайшо̀ў туды̀, зірну̀ў у сто̀рану, аж там свіе͡жае сіе͡но. — Ото-ж до̀брэ бу̀дзе спаць! — І паліе͡з маска̀ль на сіе͡но. Чу̀е, што там лежы̀ць адзѐжа. — Ніе͡, — ду̀мае маска̀ль, — тут хтось спіць. — А над сіе͡нам угары̀ зро̀блены вы̀шкі, а на іх накі̀дано сіе͡на. Заліе͡з маска̀ль на вы̀шкі да й лёг сабіе͡, бы пан на перы̀не. От ужэ̀ пача̀ў маска̀ль драма̀ць, як прышла̀ дзеўчы̀на да й легла̀ на сіе͡не. Па нема̀лум ча̀се, скры̀пнулі варо̀ты да й прышо̀ў к дзеўчы̀не на̀нач малады̀ хло̀пец. Лежа̀ць яны̀ сабіе͡ абня̀ўшыса да жарту̀юць, а маскаля̀ й сон не берэ̀, — прыслухо̀ўваецца, як маладо̀сь ціе͡шыцца. Хло̀пец прынёс з сабо̀ю ква̀рту гары͡элкі да піе͡рнікаў і цукѐркаў на заку̀ску; вы̀піў ён сам ля разо̀ну да й дае дзіе͡ўцы. Та̀я лыкану̀ла тро̀хі з пля̀шкі да й запы̀рхаласа. От і пача̀ў хло̀пец жартава̀ць да прыстава̀ць к дзіе͡ўцы, а та̀я ка̀жэ: — атчапіса, мара̀! Я баю̀са, бо яшчэ̀ бу̀дуць дзіе͡ці, дак хто іх ста̀не гадава̀ць? — А той, што над на̀мі, — адмаўля̀е хло̀пец. Ён хаціе͡ў сказа̀ць, што дзецѐй буо͡г вы̀гадуе. Зачу̀ў то̀е маска̀ль да як кры̀кне: — А, хвары͡эць-жэ ва̀шуй ма̀гары! Ці-ж гэто я бу̀ду гадава̀ць ва̀шых байструку̀оў? — Спужа̀ліса ты̀е да ў но̀гі. Зліе͡з маска̀ль, забра̀ў гары͡элку да прысма̀кі, забра̀ў свуо͡й клу̀нак да й пашо̀ў да̀лей. Дак ужэ̀ мо дабра̀ўса да гаспо̀ды.

Мікіта Варабей.

В. Рожан.

85. Тры ксендзы̀.

Даўніе͡й ксендзы̀ валачы̀ліса па сьвіе͡ту да дуры̀лі людзѐй, каб яны̀ слу̀халі пану̀оў, шчы̀ро рабі̀лі да дава̀лі на хва̀лу бо̀жую. А дзіе͡ там то̀е буо͡г ба̀чыў. Лю̀дзі даду̀ць, а ксендзы̀ да паны̀ сажру̀ць. От раз сышлі̀са ра̀зам тры ксендзы̀: язуі̀та, барнады̀н да капуцы̀н. Блі̀зко не было̀ двара̀, каб наіе͡сціса да напі̀цца ў па̀на. Віе͡дамо, паны̀ за̀ўжды ксендзуо͡ў паважа̀лі да частава̀лі. Нема̀ чаго̀ рабі̀ць, трэ пацерпіе͡ць. Пашлі̀ яны̀ ра̀зам да й захо̀дзяць

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

пасілкавàцца ў адну̀ карчòмку. Зайшлì ў алькіе҃рык да й казàлі сабіе҃ даць гары҃элкі да заку̀скі. Карчмàр быў жыдòк біе҃дны да на той час апры̀ч гары҃элкі ў ягò нічòго не былò. Бо, віе҃дамо, ў малы̀х карчòмках заўжды нічòго немà. Мужыкì пъюць гары҃элку да заку̀сваюць языкòм, а хто хòчэ канèшне закусìць, та з дòму прынесè з сабòю ў кішэ̀ні, ці запàзухаю галу҃оўку кіслаіе҃ капу̀сты, акрàяц хліе҃ба, тарàн, угуpòк абò абы̀ што. От ксендзы̀ лыкну̀лі мо па адну҃ой ці па другу҃ой чàрцы, а закусìць ніе҃чым. Бàчаць яны̀, аж на двары̀ калà абу҃озьні хòдзіць ку̀рыца. Давàй яны̀ яіе҃ лавìць. Біе҃гаюць ксендзы̀, падняўшы пòлы, а ку̀рыцы не мòгуць злавìць. Біе҃гала янà, біе҃гала туды̀-сюды̀, а за èю ксендзы̀, нарэ̀шце згубіла яйцò да й заліе҃зла дзіе҃сь пад абу҃озьню. Схапілі ксендзы̀ тòе яйцò да й веліе҃лі жыду҃оўцы ягò звары̀ць. Звары̀ла да падалà жыду҃оўка яйцэ̀. Не віе҃даюць ксендзы̀, як ягò падзелìць. Рыхтавàлі яны̀, рыхтавàлі, алè нічòго не ўрàдзяць. Нарэ̀шце атаўбавàліса на ту҃ом, што той зьіе҃сь яйцэ̀, хто ліе҃пш другìх прыкàжэ. Узяў перш капуцы̀н яйцò, пачàў ягò лупìц да й прыкàзвае: ачы̀сь ягò ат шкарлу̀пы непрàўды. Ту҃олькі ён хациеў палажы̀ць тòе яйцэ̀ ў рот да праглыну̀ць, як ось з ягò рук берэ̀ барнады̀н. От узяў ён яйцэ̀, пасыпàе ягò су҃олью да прыкàзвае: і пасалì ягò су҃олью му̀драсьці. Сказàўшы тòе, хаціе҃ў ён палажы̀ць яйцэ̀ ў рòт да зъіе҃сьці. Алè ось берэ̀ тòе яйцэ̀ ў ягò з рук апу҃ошні ксёндз язуìта. Ён зірну̀ў на сваìх таварышу҃оў да й кàжэ: ачы̀сьціўса ат шкарлу̀пы непрàўды, абсы̀паўса су҃олью му̀драсьці, дак увайдзì да хвàлы твайгò пàна. Пры гэ̀тых слòвах язуìта ўнёс яйцэ̀ ў рот да й праглыну̀ў. От з тых чàсаў гòдзі капуцы̀ны й барнады̀ны таварышавàць з язуìтамі.

Ясіньські.

В. Рожан.

86. Сьвінòе ры̀ло.

У ніе҃якум цàрстве, ў ніе҃якум гасудàрстве жыў-быў адзìн Бòртнік. У ягò былà малàя гаспадàрка: старэ̀нькая хàтка да аднà кару҃оўка да й тàя безхвòстая. Ту҃олькі даў бу҃ог яму̀ мну҃ого пчу҃о-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

лак. Тые насілі яму̀ салòдзенькі медòк да збірàлі вуоск на хвàлу бòжую. Зрàна й да вèчара даглядàў Бòртнік сваіх пчуолак, рабіў ім вулы да сцеруог, каб жòўны не клевàлі да мышы не лàзілі, або̀ каб часàмі на пàсеку не забрàўса медзьвіедзь, ці які ліхі чалавіек. Быў ён ужэ ў серыэднюм віеку, а жыў адзін бы куол. Ужэ пагавòрвалі сусіедзі, што ён якісь шалапавàты, бо жывè не так, як лю̀дзі. І пачалі ягò сусіедзі цурàцца да абхòдзіць, бы ліхòго чалавіека. Туолькі жылà там дзіевачка-сіруотка. Засталàса янà з малèнства без айцà да без мàткі да так і гадавàласа невіедамо ў кагò і як. Мо ўжэ ёй было̀ гадуоў шыэсь, як пачалà янà пàсьціць гусі. От загòніць янà гусі на рыэчку, а самà забежыць к Бòртніку на пàсеку, назрывàе там квіетак да й плецè сабіе венòк, або̀ слухае дзяцька Бòртніка, як ён кàжэ кàзкі. Нèмаль з рàна й да вèчара куожын дзень седзіць янà на пàсецы да дзівіцца, як пчуолкі нòсяць медòк. І так палюбіў яіе Бòртнік, што як янà седзіць на пàсецы, та яму̀ здаèцца, што й не трэба ліепшаго жыцця. Падраслà янà да й стàла гòжаю дзеўчынаю, а Бòртніка не забывàе. Равèснiцы цягнуць яіе з сабòю на йгрышчэ, або̀ на весіелье, а янà бежыць на пàсеку да рве там квіеткі бы малàя блазніца. І пачалі калà яіе ўвівàцца хлòпцы, пачалі да яіе свàтацца, алè янà й слухаць не хòчэ, кàжэ, што янà лю̀біць туолькі квіеткі да бòжые пчуолкі. Залецàліса, залецàліса хлòпцы, нарэшце абазліліса да й кàжуць, што гэто той шалапавàты Бòртнік здурыў тую дзеўчыну, што пèўне й янà такàя-ж шалапавàтая, як і ён. Аткаснуліса ат яіе хлòпцы, як ат пакідзішча, а янà й рàда: плецè сабіе з квіетак венкі да паè піесні. А піела янà бы салавèй. Слухае Бòртнік і здаèцца яму̀, што ён не на пàсецы, а што ў ягò выраслі крыла і што ён бы бòжая пчуолка лецiць куды хòчэ, купàецца ў квіетках да пье салòдзенькі медòк. Алè ось янà запаè пра сваю гуоркую сіруочую дòлю, запàе так жàласліво, што ў ягò сàмі слёзы лью̀цца бы з лісця расà, і ўбàчыць ён усю сваю адзінòкую жытку й так цяжко яму̀ стàне на сэрцы, бàццэ сам себè пахавàў. Не рàдуюць ягò й бòжые пчуолкі, не рàдуе й яснае сòнейко. Седзіць Бòртнік, павіесіўшы гòлаў да

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ўсе слухае да ўсе плачэ. Зацiхне яна, налòжыць на ягò венòк да й кàжэ: — ты муой царэвiч, што я чула ў кàзцы. — Падвiме ён вòчы, зiрнè на яiе, й здàецца яму, што гэто не сiруотка, а тàя пракрàсная царэўна, што кàжуць у кàзках. От так мiлавàлiса янЫ да любавàлiса ўсе лiецечко, пакуль цьветòчкi заўялi, лiсткi пажуоўклi да пчуолкi насiць медòк перастàлi. Прышла вòсень з дòждкыкам да з туманòм. Павiеяў халòдны вiетрык. I пахаладзiело ў iх на сэрцы да й зрабiласо якась маркуотно. Седзiць Бòртнiк у сваёй старэнькуй хàце, слухае, як вiецер сьвiшчэ за вуглàмi да плàчэ ў кòмiне i ўспамiнàе ён як праз сон крàснае лiецечко, яснае сòнейко, да гòжые квiетачкi, як на iх пчуолкi збiрàюць медòк, алè буольш усягò ўспамiнàе тую дзеўчЫну, што так гòжэ пiела да так сòладко глядзiела ў вòчы. Стукае сэрцэ, як не вЫскачыць у ягò з грудзèй; i так захòчэцца яму ўспòмнiць твàр дзеўчЫны, што аж не мажэ вЫтрымаць, алè пiеснi чуе, а яiе нiяк не бàчыць, от расплывàецца, бы ў вадзiе, як яна лелiее. Усхòпiцца ён i бежЫць шукàць сваiе дзеўчЫны. А яна прадзè, а ёй здаèцца, што гэто не верацено гудзе, а паюць бòжые пчуолкi, збiрàючы з квiетак пахучы медòк. Пазiрàе яна на кудзèлю, а ёй здаèцца, што гэто куоскi Бòртнiка. I пачнè яна ўспамiнàц крàснае лiецячко, ясныя дзенькi да гòжые квiеткi. Алè буольш усягò ўспамiнàе Бòртнiка да так задумаецца, што й неўбàчыць, як ён увòйдзе ў хàту. Зiрнè яна, й рàзам загарЫцца бы мàкаў цвiет. Дòўго гэ янЫ ўздыхàлi, нарэшце дагадàлiса да й пабрàлiса. ЖывЎць янЫ ў беднаце, алè ў лàсцы да й згòдзе бы ў раю. Дачакàлiса янЫ крàснаго лiецечка да давàй завòдзiць гаспадàрку. Не надзiвяцца людзi, як гэто шалапавàты Бòртнiк i ягò жуонка старэнно да дòбрэ даглядàюць сваю гаспадàрку. I пачалi янЫ жыць як усiе дòбрые людзi. Разжылiса янЫ, а тут ось буог даў iм сынкà да такòго гòжаго, такòго ўдàлаго, што людзi не мòгуць надзiвiцца. Бàбы туолькi àхкаюць да пытàюць адна ў другоiе: — цi тЫ, руодная бàчыла, якòго хлапчукà прывелà Бòртнiчыха? Такi гòжы, такi гòжы, што мо такòго немà й на ўсём сьвiеце. — Не нарàдуюцца бацькi з тагò хлапчукà. А ён расцè бы на драж-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

джàх да ўсе харашы͡эе. Расцè хлòпец на падзìў усемỳ сьві͡ету. Хто ягò ні ўбачыць, та не мажэ̀ атарвàць ачỳ. І пашлà далèко прачỳтка аб хараствí͡е тагò хлòпца. Дайшлà янà аж да цары̀цы, мàтулькі Кацяры̀ны. Хòчэцца ёй убàчыць тагò харòшага хлòпца, алè не му͡ожна ягò патрэ̀бувань к сабí͡е, бо ён у другу͡ом цàрстве. От паслàла янà к тамỳ царỳ пасланцòў, каб яны̀ купìлі тагò хлòпца да й прывезлì к ёй. Пры͡ехалі пасланцы̀, прывезлì з сабòю мну͡ого зòлата й рòзных падàркаў, далì тамỳ царỳ да й прòсяць, каб цар даў іх цары̀цы тагò гòжаго хлапчукà. Цар велí͡еў ім абаждàць, а сам паслàў прыкàз Бòртніку, каб дастàвіў свайгò сы̀на. Немà чагò рабìць, трэ̀ слỳхаць цàрськаго прыкàзу. От запру͡ог Бòртнік сваю̀ кабы̀лку, пасадзìў сы̀на да й паўёз. Збі͡еглíса бàбы, маладзìцы й дзі͡еўкì са ўсягò селà да й плàчуць, бы тагò хлòпца хавàюць, ці везỳць у нèкруты. Лі͡езуць жанкì да дзі͡еўкì, каб яшчэ̀ хаць разòк зірнỳць на харòшага хлòпца, а той не ві͡едае куды̀ ад іх схавàцца, бо так яны̀ напры̀крылі, што прыстаю̀ць бы смалà жывìца, што лі͡епш-бы на іх і не пазірàў. Рад ён, што вы̀рваўса ад жанòк да й прòсіць бàцька, каб паганя̀ў кабы̀лку. Алè мỳсіць ужэ̀ так бу͡ог даў, што гòжаму хлòпцу нідзí͡е немà спакòю ат жанчы̀н. Куды̀ ён ні пры͡едзе, дак зàраз жанчы̀ны аднà пèрад другòю акрỳжаць ягò атусю̀ль да так прыстаю̀ць, што й ды̀хаць не му͡ожна. Замỳчылі ягò бàбы, бы жыды̀ Хрыстà, пакỳль ён дабрàўса да царà. Алè ось пашлà чỳтка, што к царỳ прывезлì такòго гòжаго хлòпца, якòго й сьві͡ет не бàчыў. Дачỳласа й цары̀ца. Адзі͡еласа гэ̀то янà ў сàмую лі͡епшую адзèжу і велí͡ела тагò хлòпца прывезцì к сабí͡е. Зірнỳла янà да й не жывà, так ёй спадабàўса той хлòпец. Зірнỳў на яí͡е цар да й кàжэ, што гэ̀стаго хлòпца прòсіць сабí͡е цары̀ца Кацяры̀на. — Трэ̀ба, — кàжэ, — ягò аддàць ёй. — Дак куды̀ там, цары̀ца й слỳхаць не хòчэ. — Не дам да й ту͡олькі, — кры̀кнула янà, — да й тỳпнула нагòю. Ві͡едамо, жанчы̀на, му͡ой бòжэ, заўжды̀ перамòжэ. Спужàўса цар і не ві͡едае, што рàбіць. І жу͡онкі баìцца да й баìцца цары̀цу Кацяры̀ну прагневìць. От пачàў ён рàдзіцца з панàмі да баяр̀амі, што тут рабìць. І парàдзілі яны̀, каб цар сам паі͡ехаў

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

к царыцы Кацярыне да й расказаў усю справу. Паіехаў цар к царыцы Кацярыне нібыто ў госьці. Пакуль ён іехаў, тым часам царыца пачала прыставаць к таму харошаму хлопцу. Уцёк ён ат царыцы да праклінае сваю долю, да чуць не наракае на бога, што даў яму такое хараство. І пачаў ён плакаць да ўбівацца. Але, чым буольш плачэ, тым харашыэйшы робіцца. Ліезуць к яму жанчыны бы мухі на мёд. І пачаў ён прасіць бога, каб узяў у яго хараство. Тым часам царыца Кацярына выслухала цара да й дагадаласа, што тая царыца праціўіцца, от яна затрымала цара ў себе, нібыто ён ёй вельмі спадабаўса, а тым часам веліела свайму вуойську забраць тое царство, а таго гожаго хлопца прывезці к ёй. Пашлі людзі ваяваць, пашлі кроў праліваць, пашлі царыцы гожаго хлопца дабываць. Ці доўго, ці мало яны ваявалі, ўёскі палілі, людзей забівалі, туолькі нарэшце тое царство забралі. Пакуль ішла вайна, буог учуў малітву таго хлопца, ўбачыў яго слёзы да й узяў у яго хараство. От ужэ непрыяцельськае вуойсько забрало сталіцу да й ходзіць у царськіе палацы. А царыца ні на чого не ўважае, абы туолькі ёй абняць таго гожаго хлопца. От веліела яна, й прывелі яго к ёй. Туолькі яна хаціела яго абняць да пацалаваць, аж зірне— яго твар абернуўса ў сьвіное рыло. Крыкнула тут царыца, а з яіе й дух вон выперло. Забрало вуойсько царськіе палацы, і пачалі шукаць таго харошаго хлопца, ператраслі ўсе царство, а яго нема. Пасадзіў Бортнік сына сьвіное рыло на вуоз да й паіехалі яны да гасподы. Зірнула матка да пазнала туолькі вуочкі свайго сынка. І пашоў ён у ліес да й зрабіў сабіе землянку. Доўго яшчэ жыў там, маліўса богу да вучыў і лечыў людзей. І пачалі ўсіе казаць: — сьвяты ён чалавіек, дарма што сьвіное рыло. — Кажуць людзі, што на туом міейсцы, дзіе яго была землянка, й цепер яшчэ стаіць каплічка, а ў ей абразок таго святого з сьвіным рылам.

Р. Кухталь.

В. Рожан.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

87. Іньшы сон як у руку дась.

Быў сабіе адзін пуоп да вельмі біедны. Прыхуод маленькі, людзі біедные, — немашака з іх ніякаго прыходу. Хундушовая земля — адзін песок жоўценькі бы золато. Трымаў ён сабіе парабка, гуоркаго пъяніцу Сьцепана Штукара. Яго дражнілі Штукаром за тым, што гэсты дохлы пъяніца часамі такііе вычвараў штукі, што й не прыдумаць. Жыве сабіе Штукар у папа да голадам падыхае, бо пуоп хаць біедны, але дзецей мае як бобу. Яны хаць друобные, але ядзяць бы саранча. Што пуоп ні заробіць, як хавае каго, або хрысціць, дзіецi адразу зъядзяць і не абліжуцца. А тут непадалечку паабапал папа жывуць сабіе да таусціеюць вельмі багатые пан і карчмар. Віедамо, калі людзі бедніеюць, та пан і карчмар заўжды багаціеюць. Чаго туолькі ў пана нема, хіба мо птушачаго малака. Да што й казаць! Віедамо, як у пана ў багатум двары. Аднаго сала мо дзесяць кублуоў. Іеж, хаць падавіса. У ландара сала саўсім немашака, хіба гусіны шмалац, дак затое ў яго абаранкаў цыэлае вясло, аселенцаў поўная бочка да гарыэлкі, хаць захлебніса. Падойдзе Сьцепан Штукар у двуор, палядзіць на паньскае дабро да туолькі сліну каўтае. І так у яго кала серпа заўе, так яму зробіцца моташно, што ён просто з двара й пабежыць у карчму. Туолькі як лыкне кручок ці два, дак трохі палегчае. Ужэ не раз Штукар зарыўса ўкрасці ў двары што-небуць, да ўсе баяўса, бо куды ты дзіенеш, калі немашака ніякаго прытулку. От раз вельмі яму захаціеласо іесці, от ён прышоў да папа да й кажэ: — бацюшко, ці віедаеш, што я прыдумаў. Пан багаты, ўселякаго ў яго дабра мнуого, аж з горла прэ, а нам нема чаго, каб душу падперці. Дзіе-ж праўда? — Раскірачыў Штукар ногі, растапырыў палцы да так пазірае, што пуоп аж зарагатаў. — Не сміейса, бацюшко! Нема праўды на сьвіеце. — Праўда ест, да мы яіе не бачым, бо сьвіет грыэшны, дак буог нас карае. — Ніе, бацюшко! Нема праўды, калі ў аднаго з горла ліезе, а другі дохне з голаду. Чаму пан багаты, а мы

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

бі͡едные? — Бо так бу͡ог даў. Ён ві͡едае, што ро̀біць. Ягò пуці ніхтò не знàе. — І пашòў пу͡оп вучы́ць Штукарà, пашòў ямỳ гавары́ць цыэлае казàньне да й кòнчыў на ту͡ом, што багàтые на том сьві͡еце бỳдуць у пèкле смàжыцца ў смалі͡е, а бі͡едные пу͡ойдуць у рай. Слỳхаў, слỳхаў Штукàр, нарэшце й кàжэ: — сам бу͡ог казàў вы́цягці з калòдзіся казлà, а мы, бàцюшко, вы́цягнем у пàна валà. — Што ты кàжэж? Якòго валà? — Глàдкаго, бàцюшко, валà. — Не разумі͡ею тваі͡е гаву͡оркі. — Укрàдзьмо у пàна валà, та й бỳдзе што і͡есці. — Гэто-ж гры͡эх. — Які гры́эх? У пàна крàсці не гры͡эх, бо пан багàты. Ён у нас накрàў, а мы сваè дабрò вòзьмем назàд. Дак гэто-ж не гры͡эх. — Дòўго адгавòрваў пу͡оп Штукарà, каб ён нічòго не краў у пàна, нарэшце махнỳў рукòю да й кàжэ: — рабі як знàеш. — Пачасàў Штукàр паты́ліцу да й вы́шаў. Ту͡олькі ось ухòдзіць да папà матỳлька да ўжэ з сàмаго парòга пачынàе крычàць да лàяцца, што пу͡оп седзіць дòма, нічòго не рòбіць, а тут дзі͡еці галòдные, ў хàце ні кру͡ошкі хлі͡еба й немà чагò ў гаршчòк палажы́ць. Заткнỳў пу͡оп вỳшы да бегòм з хàты, аж тут якраз сустракàе Штукарà. Хапі͡еў ён паслàць ягò на ўèску, каб пазы́чыць хлі͡еба да закрàсы, алè той не дàў і вы́мавіць да й пытàе: — Дак што-ж, бàцюшко, вòзьмем валà? — Вòзьмем, вòзьмем, — адмаўлàе пу͡оп бы шалёны. От Штукàр заўèў папà ў адры́ну, падвезàў ямỳ дòўгіе кỳдлы, падабрàў рàску, а звèрху надзі͡еў сваè лàпікло, да й пашлі яны́ ў хмы́зьнік, дзі͡е паслòсо скарбòвае гаўя̀до, занялі там сàмаго глàдкаго валà, загнàлі ў лі͡ес да й зары́эзалі. Немà чагò рабіць, завіхàецца пу͡оп калà валà, а Штукàр ту͡олькі камèндуе. От злупілі яны́ з валà шкỳру, паві͡есілі яі͡е на галіну сушы́цца, а мя̀со пачвертавàлі, закапàлі ў зèмлю да й засы́палі трухòю з сухòго балòта. Свèрху завалілі каладзьём, а сàмые лі͡епшые кускі прынеслі даму͡оў да й давàй спажывàць. Аглèдзеліса ў дворы́, што німàш сàмаго лі͡епшаго валà, от яны́ туды́-сюды́, бі͡егалі, бі͡егалі, — от бы скру͡ось зèмлю правалі́уса. Ну, дỳмаюць, мàбыць дзі͡е адбіўса ат гаўя̀да, дак ваўкі зары́эзалі. Алè пàну шкòда дòбраго валà, от ён велі͡еў пазвàць знахару͡оў, каб яны́ павара-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

жы̀лі да сказàлі ямỳ, дзі͡е той ву͡ол. Прыхòдзяць знахары̀, варòжаць, алè ку͡ожын гавòрыць інàк. Адзін кàжэ, што ву͡ол заплỳтаўса ў лі͡есе й не мажэ̀ вы̀брацца з балòта; другѝ гавòрыць, што ваўкѝ зары̑͡эзалі, трэ̀йці плецè, што цыганы̀ ўкрàлі, алè ніхтò дасканàло не скàжэ, дзі͡е ягò найцѝ. Тым чàсам Штукàр седзіць сабі͡е ў карчмі͡е пъя̀ненькі да пахваля̀еціа, што ён ві͡едае, куды̀ дзі͡еўса пàньські ву͡ол. Пачỳў тое ландàр да й пабі͡ег казàць аб ту͡ом пàну. Пакỳль ландàр збі͡егаў к пàну, Штукàр дастàў з кішэ̀ні дзьві͡е пàлачкі, вы̀няў з верэ̀нькі збанòк, прылажы̀ў тые пàлачкі к дну кỳпы з гары̑͡элкаю, да як упèрса калі͡енам пасерэ̀дзіне ў тые пàлачкі, яны̀ вы̀правіліса, да так распèрлі клепчы̀ны, што цèраз утòры й забурчàла гары̑͡элка. Нацадзіў ён сабі͡е пòвен збан да й пацёгса даму͡оў. — Дзі͡е ты быў? — пытàе пу͡оп, катòраму яшчэ̀ ву͡ол вèльмі карцìць. — У карчмè, бàцюшко, — аткàзвае пъя̀ны Штукàр. — Ось прынёс гары̑͡элкі на магары̀ч бàцюшку за тòе, што вèльмі смàчнае мя̀со. — Пу͡оп скрывіўса, аж ямỳ вòчы пад лоб завернỳло, алè ўсе-такѝ пераліў гары̑͡элку ў пля̀шкі да й схавàў. — Немà калѝ мні͡е з табòю дуры̀цца, — кàжэ пу͡оп. От ён адзі͡еў лі͡епшую рàску, прычасàў збу͡ольшаго кỳдлы да й пашòў к пàну, каб і ямỳ сказàць тамỳ прыѐмнае слаўцò ў нешчàсьці. Прыхòдзіць пу͡оп, аж там ужэ̀ мну͡ого сабралòсо ў пàна гасцèй. Седзя̀ць яны̀, пъюць, ядзя̀ць да размаўля̀юць аб ту͡ом, як цепèр кèпсько жыць на сьві͡еце, як мну͡ого ўселя̀кіх прыпàдкаў; як напры̀клад прыпàдак пàну з валòм гавòрыць і пу͡оп да яшчэ̀ складні͡ей ад усіх.Ківàе ямỳ пан галавòю, сам налівàе ямỳ вінà да гары̑͡элкі, чя̀стỳе дòбраго гаварунà да падклàдвае ямỳ лі͡епшые кускѝ. Жỳмрыць пу͡оп, ту͡олькі барадà трасèцца бы ў казлà. Тым чàсам паслàў пан па тагò Штукарà, каб ён сказàў, што ён знàе пра валà. Прышòў Штукàр, раскірàчыў нòгі, растапы̀рыў пàльцы да й стаіць сабі͡е ў парòзе. — А што скàжэш, кахàны? — пытàе пан. — Усе дòбрае, панòчку. — А на дòбрум што? — Дачỳўса я, што ў пàпа прапàў ву͡ол. — Прапàў. — А дòбры ву͡ол? — Дòбры. — І з рагàмі? — З рагàмі. — І з хвастòм? — Ну, вядòмо, з хвастòм, — кàжэ з нецерпѐньнем пан, ка-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

тòраму ўжэ надаіе͡ло слўхаць пъянаго мужыкà. — Дак пеўне-ж гэто той сàмы вуо͡л, — крыкнуў на ўсіе͡ пакòі Штукàр і сплеснуў рукàмі. — Які той сàмы? — пытàе пан, катòраго ўжэ ўзялà цікàвасць. — Да той, што я бàчыў. — Да дзіе͡-ж ты бàчыў? — На пòплаве калà хмызніку. — Калі-ж ты бàчыў? — От гэто дòбрэ певіе͡даю, панòчку, ці ўчòрэ, ці заўчòрэ, а мо й пазаўчòрэ, туо͡лькі дòбрэ памятàю, што тòе было ў дòсьветкі. — Дак што-ж было з тым валòм? — Нічòго, панòчку. От стаіць сабіе͡ вуо͡л да такі рагàты, што хаць ты вілы з руо͡г рабі, стаіць сабіе͡ да травў языкòм кòсіць, от бàцпэ касòю. Алѐ-ж у пàна й травà на пòплаве. Далібошто, муо͡жна касіць. — Дак кудыш пашòў вуо͡л? — з нецерпѐньнем пытàе пан. — Нікўды пе пашòў, панòчку. Гэто я сам ад ягò пашòў, панòчку. — Кудьі-ж ты пашòў? — Ой, віе͡дамо-ж, панòчку, хто мàе дамуо͡ўку, той ідзѐ да гаспòды, а ў менѐ яіе͡ немàш, дак я пацягса к папў. Дўмаю, ось матўлька дась якòіе͡ нѐбуць бўльбы лàнтух наледавàць. — Цо ты дўрню плѐцеш, — закрычàў пан да ўжэ хаціе͡ў і прагнàць пъяніцу. — Пап крычыць на менѐ, а я-ж дўмаў, што пан хòчэ віе͡даць, дзіе͡ прапàў вуо͡л. — Дак кажы, што знàеш. — Туо͡лькі нехàй пан не перабівàе да не крычыць, бо я й забўдуса. — Ну, кажы. — Дак от паглядзіе͡ў я на пàньськаго валà, які ён глàдкі да гòжы да й дўмаю: от каб мніе͡ такім быць. Што валуо͡м, мàбыць пàньськім сабàкам ліе͡пшая жытка, як нàша. Дзіе͡-ж тàя праўда на сьвіе͡це. Што-ж гэто буо͡г ròбіць!? І прыпамянўў я, што наш бàцюшко ўсе кàжэ: буо͡г віе͡дае, што ròбіць. От я ўзяў бàцюшку да й пашлі мы аглядàць тагò валà. Вѐльмі спадабàўса ён нам. От мы ягò загнàлі ў хмызнік да там і зарыэ͡залі. Бàцюшко злупіў шкўру. — Тут усіе͡ азірнўліса на папà, а ён не седзіць, а ўсе крўціцца бы на калў да та пачырваніе͡е, та пабеліе͡е, крўціцца, аж пот з ягò вàліць, бàцэ туо͡лькі што вышаў з лàзні. — Эгэ-ж, дай бòжэ пàмець. От і забыўса, што дàлей. Агà! От бàцюшко й пытàе, кудьі дзевàць шкўру? А я кажў: павіе͡сім на галіну, нехàй сўшыцца. От павіе͡сілі мы шкўру, пачвартавàлі мясо, падзелілі, пòтым пачалі кішкі дзеліць. Ухапіліса мы за кішку рà-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

зам. Я цягну̀ к сабі͡е, а ба̀цюшко к сабі͡е, я к сабі͡е, ба̀цюшко к сабі͡е, кі̀шка й парва̀ласа, а гну͡ой з яі͡е як сьві̀сне нам у во̀чы, дак я й прахапі̀ўса. — Дак гэто ты сніў? — Алѐж сніў, пано̀чку. Алѐ хаць сон гразь, ту͡олькі і̀ншы як у ру̀ку дась.

Саснуоўські.

В. Рожан.

88. Кравѐц з таго̀ сьві͡ету.

Даўні͡ей лю̀дзі яшчэ̀ не былі̀ такі̀і͡е хі̀трыі͡е, як цепѐр. Жылі̀ яны̀ про̀сто, як бу͡ог паказа̀ў; ніхто̀ ніко̀го не кры̀ўдзіў, бо бояўса граху̀; ніхто̀ ніко̀го не ашуко̀ўваў, каб і яго̀ лю̀дзі не ашука̀лі. Затым усі̀м і до̀брэ было̀ жыць на сьві͡еці. Ту͡олькі вось зьяві̀ліса такі̀я лю̀дзі, што захапі͡елі забагаці͡ець, от і пачалі̀ яны̀ ашуко̀ўваць да кры̀ўдзіць людзѐй. Дак за то̀е й і̀х пачалі̀ ашуко̀ўваць жыды̀ да цыганы̀, або̀ часа̀мі й сву͡ой брат, які̀-нѐбудзь круці͡ель. І нарэ̀шце пашло̀ на сьві͡еці тако̀е круці͡ельство, што ку͡ожын адзі̀н друго̀го ашуко̀ўвае да ту͡олькі наро̀віць, каб яму̀ было̀ до̀брэ. Алѐ тра̀сца яму̀ ў зу̀бы, а не дабро̀, бо за̀ўжды зна̀йдзецца яшчэ̀ хітры͡эйшы, што й яго̀ ашука̀е, або̀ гары͡эй скры̀ўдзіць. От жыў сабі͡е адзі̀н бі͡едны кравѐц. Ві͡едамо, з пра̀цы рук мну͡ого не заро̀біш. Ку͡олькі ні працу̀й, та й то хва̀ла бо̀гу, калі̀ заро̀біш кава̀лак хлі͡еба да які̀ злама̀ны гру͡ош на патрэ̀бу. А часа̀мі й нічо̀го нема̀, хаць ідзі̀ ў старцы̀. Гэ й той кравѐц, як ён ні стара̀ўса, як ні працава̀ў, а не мажэ̀ дзі͡етак пракарміць. От пача̀ў ён шыць ву͡опратку да прадава̀ць на кірмашы̀. Раз не было̀ яму̀ ча̀су само̀му йці на кірма̀ш, дак ён пасла̀ў жу͡онку, каб яна̀ прадала̀ ту̀ю ву͡опратку. — А ку͡олькі-ж прасі̀ць за гэ̀стую ву͡опратку? — пыта̀е яго̀ жу͡онка. — А як на то̀рзі, — атка̀звае ён. Несѐ жанчы̀на ву͡опратку, а лю̀дзі пыта̀юць яі͡е, ку͡олькі яна̀ хо̀чэ. — А як на то̀рзі, — адмаўля̀е яна̀. От прышлі̀ яны̀ на кірма̀ш. Людзѐй сьві͡ет, от бы на хвэ̀сьці. Усі͡е крыча̀ць, ла̀юцца, таргу̀юцца да бо̀жацца, аж глу̀шаць. Пыта̀юць і ту̀ю жанчы̀ну, ку͡олькі яна̀ хо̀чэ за ву͡опратку, а яна̀ ўсе адно̀ атка̀звае, што як на то̀рзі. Паслу̀-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

халі людзі да падумалі, што гэто мабыць якаясь шалапаватая ці саўсім дурная. От якіесь мешчаньчукі давай шуткаваць да кпіць з таіе жанчыны, а яна гаворыць ім усе адно, што як на торзі. —Бачыш, маладзіца,— кажуць яны,—на торзі патаргуюцца, патаргуюцца да й беруць уселякііе рэчы. От і мы ўжэ даволі патаргаваліса. — І забралі яны туую вуопратку ат жанчыны без грошэй да й пашлі сабіе. Пастаяла, пастаяла тая жанчына да й пашла да гасподы. Ці рано, ці пуозно прыходзіць яна дамуоў і без вуопраткі, й без грошэй. Распытаўса кравец, як яна прадавала вуопратку да й дагадаўса, што гэто яіе абшукалі. Абляяў ён жуонку, абазлаваўса на ашуканцаў да й годзі жыць па божаму, годзі гаварыць праўду.—Пачакай жэш,—крыкнуў ён,— цепер каго ні стрыэну, та ашукаю, пакуль за свае вазьму. — От узяў ён сваю краўцоўськую снасьць, а віедамо, якая ў краўца снасьць, голкі ў пазусі, напъерстак у кішэні да прас на кіечку, на каторум нарыэзаны локці да аршыны, да й пашоў у сьвіет. Прыходзіць ён у міесто да й гукае, што вельмі добры кравец, з таго сьвіету. Прыслухаласа адна пані, назвала к сабіе да й пытае, што робіцца на туом сьвіеці. А ў яіе, бачыце, недаўно памерла гожая дачка. — Чаго, на туом сьвіеці вельмі добрэ,— кажэ кравец, — туолькі адзіене хутко псуецца, бо ў землі трохі вільгаць.—А ці не бачыў ты там маіе Анелькі?—пытае пані.— Чаму ніе, бачыў. Ой, якая гожая паненка, дак моо ў ваўсем небе нема ей раўні, туолькі, прапрашаючы папю, сукенка парваласа да трохі, да трохі ззаду сьвіеціцца. — Ой муой міленькі, ці не можэш ты занесьці ей новую вуопратку? — Чаму ніе, занесу. — Пачаставала пані краўца, напхала яму поўны мешок руознаго адзіения да яшчэ дала й грошэй на дарогу. Ускінуў ён клунак на плечы да й пашоў. Тым часам прышоў дамуой гаспадар таіе пані. От яна й пачала казаць яму, як заходзіў кравец з таго сьвіету, што ён казаў аб іх дацці да й прызналаса, што наслала на той сьвіет добрую вуопратку. Дагадаўса той чалавіек, што кравец накпіў з яго жуонкі, распытаў, куды ён пашоў, сіеў хучыэй на каня да й пусьціўса наўздагуон. Чуе кравец, што хтось

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

гòніцца ззàду, кінуў хучы͡эй мешòк у кусты̀, а сам пашòў насустры͡эк. Ту͡олькі ось сустракàе ягò той гаспадàр да й пытàе, ці не сустры͡эў ён краўцà з клу̀нкам за плечàмі. — Як жэ, — аткàзвае кравѐц, — сустры͡эў такòго от тут саўсім блізенько, ту͡олькі ён пашòў у кусты̀. Пеўне ты ягò не трàпіш. От хібà-ж дай мні͡е свайгò каня̀, та я ду̀хам ягò даганю̀, атò, бàчыш, у менѐ нòгі штось падбіліса. От той гаспадàр злі͡ез з каня̀ да й седзіць на дарòзі, чакàе, пакуль вѐрнецца той кравѐц. А кравѐц тым чàсам сі͡еў сабі͡е на каня̀, ўскінуў на ягò клу̀нак з адзѐжаю да й паі͡ехаў да гаспòды. — Ну, — ду̀мае ён, — бу̀дзе з менѐ за тòе, што маю̀ жу͡онку лю̀дзі ашукàлі. — Седзі͡еў, седзі͡еў той чалаві͡ек на дарòзі, чакàў, чакàў краўцà да так і не дачакàўса. Ту͡олькі ось і͡едуць лю̀дзі да й кàжуць, што сустры͡элі такòго чалаві͡ека, алѐ што ён цепѐр ужэ вѐльмі далѐко, бо гнаў каня̀ звуса. Дагадàўса той гаспадàр, што кравѐц і яго ашукàў, пашòў даму͡ой пі͡ешкі да й кàжэ жу͡онцы, — дагнàў я тагò краўцà, сам распытàўса, як на ту͡ом сьві͡еці нàшуй Анѐльці да яшчэ пасляў ёй каня̀, каб пі͡ешкі не падбівàла сваіх ну͡ожак. — Я зàўжды знàю й кажу̀, што ты такі дòбры, такі харòшы, якіх і на сьві͡еці немà. — А ты ў менѐ такàя разу̀мная да дòбрая гаспады̀ня, што штоб ты ні рабіла, та мудрыэй ат усіх людзѐй.

Сасну͡оўські.

В. Рожан.

89. Харствò — сіла.

У ні͡еяку͡ом цàрстве, ў ні͡еяку͡ом государстве кòлісь жыў адзін цар і заду̀маў ён жаніцца. От сабрàлі к яму̀ сàмых гòжых дзі͡евак са ўсягò цàрства на пагля̀д. Аглядàў, аглядàў цар тых дзі͡евак, алѐ ніякая яму̀ не спадабàласа. Князі да міністры не ві͡едалі, што рабіць і давàй яны̀ шукàць гòжых дзі͡евàк у чужы̀х краёх. Назьбірàласо к цару̀ сàмых гòжых дзі͡евак са ўсягò сьві͡ету цьма-цьму̀шчая, алѐ ніякая яму̀ не спадабàласа. — Немà, — кàжэ ён, — такòі͡е гòжаі͡е дзі͡еўкі, каб янà былà мні͡е па сѐрцу, дак я сам пашукàю. — От пераадзі͡еўса ён па прòсту да й пашòў у сьві͡ет

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

наглядàць сабі͡е дзі͡еўку. Хадзіў, хадзіў, алѐ ўсю̀ды так мну͡ого гòжых дзевòк, што нія̀к ён не мажэ̀ вы̀браць, якàя ад іх харашы̀эйшая. Нарэ̀шце плю̀нуў ён на хараствò, да давàй выбìраць сабі͡е такỳю жу͡онку, каб янà лі͡епш усіх умі͡ела рабìць дзі͡ело.— От, — дỳмае сабі͡е, — каб мні͡е знайцì такỳю, каб янà з салòмы да з сі͡ена прàла залаты̀і͡е да едвàбные нìткі. — Давàй ён распытòўваць у баб, алѐ ты̀і͡е кàжуць, што дзэ̀ўкі вѐльмі гòжэ прадỳць лён, гòжэ ткуць палòтна да рушнікì, гòжэ нашываюць сабі͡е ўселя̀кіі͡е цàцкі на сарòчках да хвартуху͡ох, ту͡олькі такìх, каб яны̀ прàлі салòму да сі͡ено, тỳтачкі не чувàць. Дачỳласа аб ту͡омаднà бі͡едная ўдавà да й запрасìла царà к сабі͡е. А ў яі͡е былà вѐльмі гòжая дзі͡еўка, да такàя гультàйка, што нічòго не хаці͡ела рабìць; заты̀м яі͡е ніхтò не хаці͡еў браць зàмуж. Ві͡едамо, ў хаджàйстве немà чагò пазірàць на хараствò, а трэ дзі͡ело рабìць. От улі͡ез цар у хàту, а дзі͡еўка агінàецца бы сабàка да ту͡олькі папраўля̀е сабі͡е кòсы. От мàтка й крычы̀ць на яі͡е: — чамỳ ты не прадзѐш.— Немà кудзѐлі, — аткàзвае янà да й пабі͡егла з хàты гуля̀ць з дзеўкàмі на загумѐчы. — Ото-ж бедà, — жàліцца тàя ўдавà царỳ,— дзі͡еўка папрàла ўсі͡е кудзѐлі, папрàла ўсю салòму да сі͡ено, цепѐр хібà трэ зрывàць апу͡ошнюю салòму з хàты. — Пачỳў тòе цар да й узя̀ў тỳю дзі͡еўку к сабі͡е ў палàцы. Тут ён прыстàвіў к ёй тры стары̀е бàбы, каб яны̀ даглядàлі, як тàя дзі͡еўка прадзѐ салòму да сі͡ено. Бàчаць бàбы, што прòстая мужы̀чка бỳдзе цары̀цаю да давàй ёй памагàць. От дастàлі яны̀ сàмаго лі͡епшаго кỳжалю да й напрàлі шмат такìх нìтак, што мòо тані͡ей вòласу. Паглядзі͡еў цар на тỳю рабòту да й узя̀ў тỳю дзі͡еўку. Жывѐ сабі͡е янà цары̀цаю, нічòго не рòбіць да ту͡олькі камѐндуе, камѐндуе князя̀мі да міністрамі, а бу͡ольш усягò царòм. А тым стары̀м, змòршчаным бàбам у цары̀цы такàя жы̀тка, што й памìраць не трэ. От раз цар і пытàе цары̀цу, чамỳ янà не прадзѐ. А цары̀ца аткàзвае, — а хібà-ж ты хòчэш, каб тва̀я жу͡онка, тва̀я цары̀ца да былà такàя змòршчаная, як ось гэ̀стыі͡е бàбы, што прàлі ўсю жы̀тку. — Зірнỳў цар да й кàжэ: — нехàй бỳдзе па тву͡оййму, бо мàбыць на сьві͡еці хараствò — сìла.

В. Рожаи. Саспу͡оўські.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

90. Воўчая доля.

Даўно была тая справа, як буог зтварыў сьвіет і куождуй рэчы даў звычайнае назначэньне. Рыба паплыла ў вадзіе, зверы пабіеглі па землі, шукаючы сабіе міейсца. Адны зрабілі сабіе норы, другіе выкачалі куотла, або заліезлі ў нетры над вывараць, трэйціе ўбіліса ў гушчэчу, ці схаваліса ў луом, іншые ўзліезлі на дзэраво да й прыталіса ў густых віетках, або заліезлі ў дупленатые дзераўлякі. Птушкі пачулі сваю здольнасць, пырх і палецієлі ў нёбо высоко над землёю. Доўго яны кружыліса ў нёбе, падніманіса аж к самаму сонейку, але апалілі сабіе крылца да й мусілі спусціцца на зёмлю, каб аддыхаць і пасілкавацца. Спусціліса птушкі ўніз і пачалі віць сабіе гнездзэчка, пачалі жыравапь. Спалохаліса перш чэрві, жучкі, матылькі, потым спалохаліса яшчаркі, жабы, гады і руознае малое стварэне. Спалохаліса яны і пабіеглі, папаўзлі, паскакалі, палецієлі да й пахаваліса, хто куды муог: хто ў зёмлю, хто ў воду, хто заліез на расліну, або куды, а хто пачаў абараняцца жалам, зубамі, ці гойстрымі калючкамі. Як узрухаліса малые зверкі, дак затым узрухаліса й буольшые зверы й жыўёло. Спужаліса яны адзін другого да й пачалі біцца й кусацца, а хто не дужы, той уцекаў і хаваўса, куды муог. Ліс і барсук выкапалі сабіе норы, буобер і выдра схаваліса ў воду да й спалохалі там рыбу. Рыба пачала ўцекаць, пачала хватаць адна другую. Ментуз і ўюн заліезлі ў гразь, рак папоўз у норы, окунь настаўіў сваіе калючкі, туолькі адна шчука пачала сміело гуляць на глыбі да хватаць маленькую рыбку. Біегало, біегало тое жыўёло, што не мае муоцных зубуоў, каб абараняцца ат варагуоў і прыбіегло к чалавіеку. Узяў яго чалавіек к сабіе на паслугі да на карысць і пачаў яго ратаваць ат драпіежнаго зверъя. От так пачало жыць разам з людзямі говядо, пачало служыць людзям, працаваць на людзей, каб яны аберагалі ат ваўкуоў, медзьведзей і руознаго зверъя. Першым прыбіег к чалавіеку сабака да й пачаў лашчыцца, прасіць, каб

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

той укрыў ягò ат сваіх братуоў-ваўкуоў. Віедамо, што свуой гарыэй чужòго. Прылàшчыў чалавіек сабàку, за гэто той стаў сàмым віерным тавàрышам чалавіека, а сàмым заклятым вòрагам свайгò брàта-вòўка. Брэшэ сабàка на вòўка, брэшэ, не даè яму супакòю. Куды ні сунецца вòўк, усюды ён стрыэне сабàчы брыэх, а віедамо, не так воўк баіцца сабàкі, як ягò звягу. Біегаў, біегаў вòўк без прытулку, надаіело яму біегаць, бàццэ жыду без пàчпарта і пашòў ён да бòга жàліцца на сваю дòлю і пытàць, чаму ён баіцца чалавіека, хаць той і не мàе такіх муоцных зубуоў, як у вòўка. От стаў воўк пèрад бòгамі злажыў сваю скàрг(g)у. Выслухаў буог вòўка да й кàжэ: я даў табіе муоцные зубы, каб імі ты муог даставàць сабіе жыўнасць; даў табіе лёгкіе нòгі, каб ты муог уцекàць ат дужыэйшых за цебè варагуоў. А чалавіека табіе немà чагò баяцца, — не рабі яму шкòды, та й ён цебè не зачыэпіць. Пакланіўса воўк бòгу да й пашòў у сьвіет. Хадзіў ён, хадзіў, прагаладàўса бы воўк, а тут куды ні сунецца, на якòе жыўело не зхòчэ напàсьці, то янò ці палеціць, ці так хутко пабежыць, або схавàецца ў вòду, а то саўèцца ў клубòчак, як вòжык да й наставіць сваіе гòйстрые гòлкі. Туолькі тое жыўело лёгко адаліець, катòрае жывè рàзам з чалавіекам. Церпіеў, церпіеў воўк да й давàй рыэзаць і тое жыўело, што жывè пад апèкаю чалавіека. Абазліўса чалавіек да й пачàў ганяць да біць вòўка. І немà яму з тых час нідзè супакòю, бо ягò гòняць па сьвіету чалавіек і гòлад. І біегае ён, бы з вòўчым пàчпартам, бо такàя ягò дòля.

Саснуоўські.

В. Рожан.

91. Упàртая бàба.

Былà аднà вèльмі ўпàртая дзèўка. Янà нікòлі не згаджàласа з тым, што ёй гаварылі. Бàло ўсе рòбіць упèрак. На пакутавàліса з èю бацькі, алè нічòго не зрòбяць, віедамо, не выкінеш вон, бо ўсе-ж сваè дзіця, — хаць пагàнае, алè й пагàнаго шкòда. Расьцè тàя дзèўка да з куожным днём станòвіцца ўсе гарыэй да

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

гарыэй. Перш прыхòдзілі сусі͡едзі жàліцца, што янà абіждàе малыіх дзеўчàт, а пòтым давàй лàяцца, што янà й хлòпцам выдзірàе вòчы. Ві͡едамо, хлòпцы, хаць яны̀ й упраўні͡ей, алè паддаю̀цца, бо не хòчуць крыўдзіць дзèўку. А ту͡ой ту͡олькі тòе й трэба, чуць ту͡олькі янà закмі͡еціць, што ёй даю̀ць палёгку, дак янà лі͡езе к табі͡е, бы асà ў вòчы. Янà дỳмае, што гэто янà такàя му͡оцная.

От вы̀расла тàя дзі͡еўка; парà й чакàць сватy͡оў. А тут усі͡е бы змòвіліса, ніхтò й пàлкі не пакàжэ. Бацькì й так і сяк, пачалì загàдкамі да намёкамі жỳпіць та аднамỳ, та другòму, пачалì чуць не сàмі свàтаць сваю̀ дачкỳ, а ўсі͡е маўчàць, зỳбы зцяỳшы, бы вадỳ ў рот набрàлі. Нічòго не зрòбяць, гэстым тавàрам не набъèсса, маўчы̀ да чакàй, пòкуль знàйдзецца купèц-маладзèц. А тут чым дàлей, тым гарыэй, бо залежàлаго тавàру саўсім не хòчуць купавàць. Ужэ бацькì дỳмалі, што тàя пагàная дачкà застанèцца ў дзеўкàх, як ось знайшòўса адзін парабчỳк, што за ягò ніхтò не хаці͡еў іцì, да й узяỳ упàртую дзі͡еўку. Прàўда, гэто былà такàя-ж цапà, як і тàя дзі͡еўка, — ён ні ў кòго не му͡ог дажы̀ць гòду, бо быў такì гультàй, што й себè не хаці͡еў даглèдзяць, а такì задзірàка, што ягò абхòдзілі ўсі͡е дòбрые лю̀дзі. Алè бацькì рàды, што збылì дачкỳ з рук, што хаць такì знашòўса. От пабрàліса яны̀, алè жывỳць не палю̀цку, бо к ёй гаспадàр немажэ й падступіцца, бы к ту͡ой наравісту͡ой кабы̀лі. Маўчы̀ць гаспадàр, церпіць, бы гэто так і трэба. От жылì яны̀ так мòо гу͡од ці бу͡ольш, нарэшце ѝкась лю̀дзі даві͡едаліса да й пачалì кепкавàць з тагò гаспадарà, пачалì ямỳ выбірàць вòчы да гаварыіць, што ён мàбыць і сам бàба, калì ямỳ бàба не трэ. Усе му͡ог сьцерпі͡ець ён, алè сьцерпі͡ець, што назвàлі ягò бàбаю, ніякім прàвам не му͡ог і пастàвіў сабі͡е зламàць упàртасьць пагàнае бàбы. От раз кàжэ ён жу͡онцы, што хòчэ зъі͡ездзіць к яі͡е бацьку͡ом у гòсьці. — Отòж і я паі͡еду, — кàжэ упàртая бàба. А тамỳ тòе й трэба. От запру͡ог ён жарабіцу ў драбінкі, вы̀масьціў іх салòмаю аж павèрх аглабін, пасадзіў жу͡онку да й папхàўса ў гòсьці. Цесь жыў у другу͡ой вёсцы. Тудỳ і͡ехаць трэ былò цèраз ліхỳю, вèльмі трỳскую грэблю да цèраз лі͡ес. От узъі͡ехалі яны̀ на грэблю да

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

на каладзяны муост, дак драбінкі скачуць, бы здатны хлопец казачка. Трымаласа, трымаласа паганая баба, але ніякім правам утрымацца не мажэ. — Паціху, — крычыць яна, — бо ўпаду. — А ён яшчэ паганяе жарабіцу. Церпіела баба, церпіела, а нарэшце давай зневажаць гаспадара, што ён неўміее нават у госьці іезьдзіць. — Чаму неўміею? Я добрэ віедаю, што тут усіе добрые людзі прывязваюцца к возу, каб не зваліцца, але я знаю, што ты не зхочэш прывязвацца. — Чаму ніе? Отож прывежуса, туолькі ў цебе нема вероўкі. — Нема вероўкі, та е пояс. — Дак прывежы. — От ён распаразаў пояс да й прывезаў ліе ўдоўшкі к дробінкам. Лежыць паганая баба на саломі, бы на перынах дагары да лае гаспадара, што ён сам не дагадаўса ліе ўперад прывезаць. Маўчыць ён да паганяе жарабіцу. От пераіехалі яны грэблю да й уіехалі ў ліес. — Давай развежу, — кажэ ён. — Отож нехачу, — нехай людзі бачаць, які ты гаспадар. — Добрэ, нехай бачаць, што я гаспадар. — От ён трохі зьвернуў з дарогі да й захадзіўса кала паганае бабы. Тая крычаць, зьневажаць, але ніхто не чуе. Тым часам жарабіца як пачула, што вуожкі павісьлі, дак зачапіла за гнілы пень берэзіны да як абернула яго да спалохаласа да пабежыць, дак чуць не абернула вуоз. Скаціўса гаспадар з воза, а жарабіца так і паперла паганую бабу на ўёску. Гледзяць людзі да туолькі сьмеюцца, што й упартая баба на свайго наскочыла.

Саснуоўські.

В. Рожан.

92. Цьвіет папераці.

Гэто ўжэ праўда. Кажуць было ў Гаўрыльчычах ці што. Мніе казаў муой сябер, што ён сам знае таго чалавіека. От ён — каа — пашоў раз на Купало ў ліес шукаць здатнаго дзэрава на корбы ля прасьніцы віць вероўкі. Дзень быў хмурны. Сонейка не было з самаго рана. Ён мабыць пуозно пашуоў у ліес да й там пахадзіў якуюсь часіну. Зірне ён, аж ужэ й цемніее. Ён

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

барждҗэй пабіег да гасподы. Алѐ як пачаў хучыэй абхѳдзіць выварацьѐ да калѳды, завалы ці якѳе-нѐбуць ламачъе, дак саўсім заплутаўса й невіедае ў які буок іці. Хадзіў ён, хадзіў, а тут ужэ й саўсім сьцемніело да зрабіласо так, што хаць ты вѳко вы̀каль. Ба̀чыць ён, што нічѳго не бу̀дзе, што яму̀ пѳцемку не вы̀лезці з ліесу, от ён і заначаваў там. Віедамо, паліескі чалавіек у ліесі, бы дѳма, нічѳго не баіцца. А ён і забы̀ўса, што гэто было̀ на Купа̀ло. А на Купа̀ло куожнаму я̀кась су̀мно. Ці пра̀ўда, ці ніе, што ба̀юць лю̀дзі, нібы̀то на Купа̀ло пра̀віць ша̀бас уселя̀кая нѐчысь, алѐ ліепш начава̀ць дѳма, спакайніей, чым у ліесі. От наклаў ён агню̀ да тут і ўспамяну̀ў, што гэто Купа̀ло. Як успамяну̀ў, дак бы маруоз так і пачаў шчы̀паць плѐчы, а ша̀пка на галавіе й падняла̀са. Пачасаў ён плѐчы, нахлабу̀чыў ша̀пку да й седзіць сабіе кала̀ агѐньчыку. Хаць нуоч і так цѐплая, аж па̀рыць, алѐ кала̀ агѐньчыку я̀кась сьмеліей. От ён наламаў віецьця, паслаў ягѳ кала̀ агѐньчыку да й прылѐг. Ці дѳўго, ці ма̀ло ён лежаў, туолькі кры̀ху прыкархну̀ў, як ось чуе, што хтось ту̀пае, от ба̀ццэ капыта̀мі. Падня̀ў ён гѳлаў, зірну̀ў та ўвадзін буок, та ўдругі, — нікѳго нема̀, туолькі агѐньчык патухае, бо дрѳвы згарыэлі. От ён падня̀ўса да й пашѳў зьбіра̀ць ламачъе. Атышѳўса ён ат агню̀ мѳо з паўгануоў, а тут кругѳм па̀перацць па са̀мые па̀хі. Зірнѐ ён, аж яна̀ цьвіцѐ, бы агнѐм гары̀ць. Хаціеў ён сарва̀ць той цьвіет, да туолькі працягну̀ў ру̀ку, дак ось, маіе вы каха̀ненькііе, атку̀ль тѳе ўзелѳсо, якѳіе туолькі пля̀гі на ягѳ не кінуласо. От так атусю̀сь тырчкѳм у вѳчы й суѐ яму̀ ўселя̀кая нѐчысь што папа̀ло. Схапіў ён хучыэй аха̀пку ламачъя да бегѳм к агню̀. Бежы̀ць, туолькі па̀перацць лѳміцца. Зірнѐ ён, аж у ла̀пці набіласо пѳўно цьвіету па̀пераці, аж ён гары̀ць, бы зуоркі сіненькім агѐньчыкам. Ускі̀нуў ён на агѳнь ламачъя, ўзяў галавѐшку да й абчарціў ею кругѳм, от і заціхло ў ліесі, бы ў ву̀сі. Туолько ось падхѳдзіць к яму̀ які̀сь панічѳк у капелю̀шыку да й прѳсіць паменя̀ць ла̀пці на нѳвенькіе бѳты да яшчэ̀ даѐ прыда̀тку. Паменя̀ў ён ла̀пці па бѳты да ра̀зам з ла̀пцямі атдаў і цьвіет па̀пераці, а пѐчысьці туолькі тѳе й трэ̀ба было̀.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Лёг ён да й праспа̀ў да дня. Прахапі̀ўса, аж нема̀ ні бо̀таў, ні лапцѐй, ту͡ольк і засталі̀са галавѐшкі. Дак от яка̀я спра̀ва.

Сасну͡оўські.

В. Рожан.

93. Отѐж до̀брая пасу̀дзіна.

Жыў сабі͡е адзін чалаві͡ек. Было̀ ў яго̀ двое сыну͡оў. Адзін про̀сты, пічыры да рабо̀ты хло̀пец, а другі̀ які̀сь шарахву͡ост. Ён мну͡ого шля̀ўса па сьві͡ету, дзі͡есь быў у мі͡есьці, дак лічыў себѐ вѐльмі разу̀мным і нехаці͡еў рабі̀ць про̀стаго мужы̀цкаго дзі͡ела. Перш ба̀цько сварыўса, алѐ ба̀чыць, што ві̀чо̀го не памага̀е, дак плю̀нуў да й ду̀мае сабі͡е, — ну, неха̀й ту͡олькі чо̀рны ву͡ол насту̀піць на но̀гу, та ён кі̀не сваѐ вымышля̀ньне да бу̀дзе, як усі͡е лю̀дзі. — От па нема̀лум ча̀се ажані̀ўса той гультаева̀ты хло̀пец і ўзя̀ў сабі͡е жу͡онку да цу̀г(g)у таку̀ю-ж як і сам. Нема̀ ча̀го рабі̀ць, жу͡онка старо̀го даўно̀ памѐрла, ста̀ла маладзі̀ца по̀ўнаю гаспадыняю ў ха̀ці. Алѐ яна̀, што запарвѐ, та ўсе цягне сабі͡е, ні сваймý гаспадарý, а стары да працаві̀ты дзѐвер як сабі͡е хо̀чэ, неха̀й жыву̀ць абыя̀к. Ві͡едамо, лю̀дзі заўжды садзя̀цца за сту͡ол ку͡ожын на сваѐ мі͡ейсцо. От так раз і тые лю̀дзі сі͡елі абі͡едаць. Стары сі͡еў на куці͡е ў канцы стала̀, кала̀ старо̀го на зэ̀дліку сі͡еў старэ̀нны сын, а кала̀ другѝго канца̀ стала̀ жана̀ты сын. Кала̀ яго̀ прысі͡ела жу͡онка. Яна̀ та ся̀дзе, та ўста̀не да прынесѐ другу̀ю стра̀ву. Нарэ̀шце нрыно̀сіць яна̀ по̀ўну мі̀су ка̀шы; прынесла̀, паста̀віла посеру͡од стала̀, а сама̀ падсі͡ела к гаспадарý. Узелі̀са мужчыны за ло̀жкі̀ да дава̀й аплета̀ць ка̀шу. Жана̀ты сын з жу͡онкаю ядзя̀ць да ту͡олькі аблі̀зваюцца, а стары да яго̀ старэ̀нны сын насі̀лу глыта̀юць пу͡осную ка̀шу. Дагада̀ўса тут старэ̀нны сын, што ма̀быць братава̀я зрабі̀ла які̀есь кпінкі, от ён узя̀ў мі̀су з ка̀шаю да дава̀й яі͡е кру̀ціць. — Ото̀-ж до̀брая пасу̀дзіна, — ка̀жэ ён, — дзі͡е ту͡олькі яна̀ зро̀блена. — Ма̀быць у Капылі, — ка̀жэ стары, — бо там ро̀бляць до̀брую палі̀ву. — Пахвалі̀лі яны мі̀су да й пакруці̀лі яі͡е так, што к ім абернý ласа

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

каша з масламъ, а к жанатаму сыну — пуосная. Папробувала жанчына кашы да й ложку палажыла. — Іеж, галубко, — кажэ стары, — каша смачная, з масламъ. — Годзі яна з таіе пары падаваць на стуол не руоуную страву.

Саснуоуські.

В. Рожан.

94. Таварышы.

Даўно тое было, моо яшчэ дзедуоў і прадзедаў нашых не было на сьвіецi, жылі-былі два хлапцы, два ўдалые малайцы. Яны вельмі муоцно таварышавалі адзін з другім і не было на сьвіецi нічого такого, каб яно магло разлучыць іх таварыство. Жылі яны так душа ў душу, што ніколі не жывуць так і руодные браты. А была там вельмі гожая дзеўчына, якое й на сьвіецi буольш не найці. Спадабаласа яна ім вельмі муоцно, але не віедаюць яны, катораму яна мае дастацца. От парадзіліса яны па між сабою да й парашылі, што той яіе возьме, каго яна выберэ. Пашлі яны к туой дзеўчыні да й пытаюць яіе. Але яна сама не віедае, катораго яна больш кахае, бо абудва ёй вельмі спадабаліса. Прыхіліцца яна к аднаму, та к другому цягне; прыхіліцца яна к таму, та к першаму цягне. От так ніводнаго й не мажэ так пакахаць, каб аб другуом не баліело сэрцэ. Зсушыла яна тых хлопцаў, да й сама высахла, ходзіць, бы непрытуомная да та сьмеецца, та плачэ. Думалі, думалі хлопцы, што тут рабіць да й парашылі йці ў сьвіет, моо там хто стрыэне другую дзеўчыну, а мо дзіе загіне, та дась дарогу другому. Як парашылі, так і зрабілі; папрашчаліса яны з каханаю дзіеўкаю да й пашлі. Адзін пашоў направо, а другі на ліево. Яшчэ й да тых час на растанпуох лежыць велізазны камень, на каторум яны седзіелі, як прашчаліса з дзеўчынаю й між сабою. Яны тут так рашылі, што хто першы вернецца цераз тры гады, таго й будзе тая дзеўчына. От пашлі яны й не было аб іх ніякаіе чуткі. А яны тым часам сталі нажываць грошы, каб зрабіць дзіеўцы самы ліепшы

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

да са̀мы даро̀шшы пада̀рак. Адзін пача̀ў таргава̀ць, а другі̀ — купцу͡оў разбіва̀ць. Цѐраз тры гады̀ нажылі̀ яны̀ шмат бага̀тства. Ту͡олькі ось разбу͡ойніка й злавілі да й прысудзілі на шы̀беніцу. От атусю̀ль сагна̀лі людзѐй глядзі͡ець, як яго̀ бу̀дуць ві͡ешаць. Пры͡ехаў і той купѐц, до̀бры маладзѐц зірну̀ць на ту̀ю ціка̀васьць, як паві͡есяць разбу͡ойніка, што забіва̀ў купцу͡оў. Ён не знаў, што гэто яго̀ тава̀рыш. Прыгна̀лі туды̀ й ту̀ю іх каха̀ную дзеўчы̀ну. От зрабілі шы̀беніцу, да й прывелі̀ таго̀ разбу͡ойніка. Дзівяцца лю̀дзі, што разбу͡ойнік стаі̀ць пад шы̀беніцаю ба̀цца на кірма̀шы, ба̀ццэ ён і неві͡едае, што гэто шы̀беніца, а ўсе пазіра̀е на людзѐй, ба̀ццэ каго̀ шука̀е ачы̀ма. Ту͡олькі ось ра̀зам закрыча̀лі дво̀е людзѐй да й кі̀нуліса к шы̀беніцы. З аднаго̀ бо̀ку кінуўса той тава̀рыш-купѐц, а з друго̀го та̀я дзеўчы̀на. Яны̀ ра̀зам пазна̀лі, хто гэто такі̀ той разбу͡ойнік і кі̀нуліса, каб яго̀ аслабаніць. І дабі͡еглі яны̀ да шы̀беніцы ў вадзін мо̀мант. Дзоўчы̀на кінуласа разбу͡ойніку на шы̀ю да й пацалава̀ла яго̀. А зьві͡есно, што быў такі̀ звыча̀й, што калі̀ дзі͡еўка пакаха̀е разбу͡ойніка, та яго̀ аслабаня̀юць ат сьмѐрці. Алѐ яна̀ пад шы̀беніцаю ра̀зам з разбу͡ойнікам уба̀чыла й яго̀ тава̀рыша. От аслабанілі таго̀ разбу͡ойніка да й аддалі̀ яго̀ дзеўчы̀не. Пачалі̀ лю̀дзі зьбіра̀ць ім гро̀шы й назьбіра̀лі цы͡элую ша̀пку. Пасадзі̀ў іх купѐц на сву͡ой качо̀брык да й паў̀ёз да гаспо̀ды. Пры͡ехалі яны̀ да й неві͡едаюць, што рабіць, каму̀ павінна даста̀цца та̀я дзеўчы̀на. Ду̀малі яны̀, ду̀малі да так нічо̀го й не прыду̀малі, а пачалі̀ ра̀зам жыць да пажыва̀ць да дабра̀ нажыва̀ць.

Саснy͡оўські.

В. Рожан.

95. Што бу͡ог злучы̀ў, таго не разлуча̀й.

Ці ві͡едаеце вы, як ліхо жыць на сьві͡еці, калі̀ ўсю жы̀тку трэ служы̀ць другім лю̀дзям і ніко̀лі нема̀ табі͡е слабо̀ды, нема̀ свайго̀ вугла̀. Хаць ты служы̀ ў пала̀цах, да яны̀ чужы̀е, а ха̀тка хаць ку̀рная да бру̀дная, да свая̀. Пра̀ўду лю̀дзі ка̀жуць, што як

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

віек служыць, та лепіей не жыць. Які б там ні быў добры хаджаін, та ці хаджайка ліхая, ці яго дзіеці, або радня, дак ніколі нема табіе супакою. Як ты ні рабі, як ні старайса, та людзі ўсе-ж скажуць, што віедамо парабак, якая ат яго карысь. От быў такі нешчасны адзін чалавіек, што яму ўсе прыходзіласо парабкаваць. Як ні стараўса ён выбіцца на сваю гаспадарку, ніельга ніякім правам, бо як тут гаспадараваць, калі ў цебе ні кала, ні двара, калі нема за што рук заццяць. Перш ён часто меняў гаспадаруоў, але нарэшце пазнаў, што гэто гарыэй, чым жыць у аднаго. Бо ўсім гадзіць, усім рабіць шчыро да добрэ, та й сілы не хопіць (хваціць); а жывучы ў аднаго, та муожна яму нарабіць шмат так, што е чым пахваліцца. От так і служыў ён у ваднаго гаспадара, служыў віерно, шчыро працаваў, дак і гаспадар як-бы лічыў яго сваім семенінам. От прышлі Коледы, накалолі людзі сьвінеей, нарабілі каўбас да й балююць. А той парабак пазірае, пакуль дадуць, да яшчэ моо й не дадуць. Дак ось як раз на тое й вышло. Напрагла гаспадыня па скаварадзіе сала, палажыла туды цыэлае лычко каўбас да й падае на стуол. Каўбаса была парыэзана на кускі, але яны не саўсім атрыэзаны. Дзеўбануў гаспадар кусок каўбасы да так усю й пацёг к сабіе.— Прытрымай, — кажэ ён жуонцы, а тая адмаўляе, — што буог злучыў, таго не разлучай. — Управіў гаспадар адзін усю каўбасу, а парабак туолькі аблізаўса, дарам, што разам седзіеў пры сталіе. От на сьвята пашла гаспадыня ў госьці, там трохі падпіла да й замарудзіла. Вернуўса з карчмы гаспадар да й давай лаяць жуонку, а тая як пачала яго зьневажаць, дак яны слово-за-слово да й спелеліса біцца. Седзіць парабак на лаве да туолькі пазірае. Горачо прышлосо жанчыне, от яна й просіць парабка, каб ён іх разьвеў. А той і кажэ: — што буог злучыў, таго не разлучай. — От з тых час кінуў ён парабкаваць да пачаў сам гаспадараваць. Перш зрабіў будан, потым курыэнь, а нарэшце й хатку, хаць маленькую, да дарагенькую.

Саснуоўські.

В. Гожан.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

96. Аткỳль пашлì грыбы̀.[1]

Кàжуць, што дòбры казля̀к ліепш кèпськага мя̀са. А ў пуост і квас не квàсам, калì ў ём немà казлякуоў. Без казлякуоў, ці як кàжуць грыбуоў лю̀дзі не маглì-б пасьціць Петруоўку. Мòо затым у Петруоўку буольш усегò едзя̀ць грыбы̀, што яны̀ й пашлì з тагò, як святы̀ Петрò ўкраў у Хрыстà хліеб. От як гэто былò. Хадзіў Хрыстòс з Петрòм па землì да вучы̀ў людзèй, як жыць на сьвіеці. Хадзілі яны̀ ата ўёскі да ўёскі. Чàсам іх карміли дòбрые лю̀дзі, а чàсам пагàные й не прымàлі. От гэтак адзìн раз ішлì яны̀ цèраз велìкае пòле. Дòуго не былò нія̀кае ўёскі. Петрò любіў дòбрэ ўжывàць, а тут у ягò саўсìм калà сэрца завілò, бо вèльмі прагаладàўса. Былò ў іх трòхі хліеба. Петрò нёс ягò ў тòрбачцы, за плечàмі. Ідуць яны̀ да йдуць. Хрыстòс спèраду, а Петрò ззàду. Кòнчыласо пòле, вайшлì яны̀ ў ліес. Не вытрымаў Петрò, ўшчыпнуў крыху̀ хліеба да й іесь. Пазнàў Хрыстòс, што рòбіць Петрò да й пытàе ягò, што зрабіць лю̀дзям на патрэбу. Хаціеў Петрò атказàць да не мажэ, бо пòвен рот набіў хліебам; от ён вы̀плюнуў, а з тагò й пашлì расьцì грыбы̀. Зірнуў Хрыстòс да й кàжэ: нехàй гэто бу̀дзе на патрèбу лю̀дзям. І пашлì грыбы̀ на патрэбу людзя̀м.

Саснуоўські.

В. Рожан.

97. Цыгàнскае таварыство.

Прыхòдзяць два цыганы̀ ў вёску да й бàчаць, аж мужы̀к закалòў кòрмнага вапрукà да й смàліць ягò на агарòдзе. — Давàй, бàтю, памагуом, — кàжуць цыганы̀. — Ат вàшаіе памòгі немà запамòгі, — кàжэ мужы̀к. — Не хòчэце сьвінèй гадавàць да карміць, дак не чакàйце й спажы̀ць. — Эй, бàтю, буог даè на ўсіх дòлю, — кàжуць цыганы̀. — Алè-ж даè, — аткàзвае мужы̀к, —

---

[1] Гл. № 49.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

і воўку дае, бо й ён жывіцца. — Праўду кажэш, батю! От затым і мы хочэм пажывіцца. — Воўк жывіцца ў лiесі. От і вы там жывiецеса. У лiесі буог даў на ўсіх долю. — Бачаць цыганы, што не на такуоўськаго трапілі, от яны аблізаліса да й пашлі далей.—А што, моо й праўду бае мужык,—кажэ адзін,— што ў лiесі муожна пажывіцца. Хадзiем у лiес. — Хадзiем, — атказвае другі. От прышлі цыганы ў лiес да й бачаць, што там ваўёрка скачэ па дзераву. — От бачыш, які зьвiер, — кажэ адзін цыган. — Ён маленькі, да так хутко скачэ, а я буольшы, дак яшчэ не так скакану. Ты хучыэй зьбiегай да прынесі кацёл, а я тут налаўлю гэстых зьверкуоў, от у нас і будзе сьвежына. — Пашоў адзін цыган па кацёл, а другі ўзлiез на дзераво, дзiе была ваўёрка да й хацiеў яiе злавіць за хвуост. Туолькі ён сунуўса к ёй бліжыэй, як яна цмок, цмок! да й пераскочыла на другое дзераво. Цыган не доўго думаючы да як скокне за ею, дак і палецiеў долу бы камень. Урыэзаўса цыган зб зямлю так, што й зубы вышчарыў. Лежыць ён саўсім не прытуомны да чуць дышэ. Тым часам вернуўса таварыш з велізазным катлом да як убачыў, што той цыган лежыць, дак вельмі абазьліўса на яго, выразаў барждж ыэй пэпліску да давай яго перыэсьціць да прыгаворваць: — а, от гэто табiе за тое, што ты такі таварыш — сам наiеўса да й лежыш, а пра таварыша й забыўса. Дак я табiе прыпамену. Ось табiе, ось табiе прыпамін... — Лупіць цыган таварыша, а с таго й так чуць духі не выскачаць. Прышлі туды ў кусты нашы дзецюкі рваць арыэхі да й убачылі тых цыганоў. Насілу яны атратавалі таго цыгана. От с таiе пары годзі цыганы таварышаваць, а пачалі яны па аднуом красьці да абманваць людзей і тым жывіцца.

Саснуоўські.

В. Рожан.

98. Самая разумная.

Жыў сабiе адзін чалавiек не то, каб багач, а так сабiе добры гаспадар. Ён, як жэ кажуць людзі, небаяўса, што ў Петруоўку

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

выпадзе сніег, бо заўжды міеў пра запас берэме сіена. Быў у яго сын — удалы да працавіты хлопец, але на свуой віек моо ўжэ вельмі разумны. Бало яшчэ змалку не хочэ йграць ці сваволіць с таварышамі, а ўсе трэцца кала буольшых да прыслухоўваецца, што яны гавораць. А як стаў нелапым хлапчуком, дак ужэ такого набраўса розуму, што пачаў і старшых вучыць. Упікалі часамі яму людзі, кажучы, што яйца курэй вучаць, але ён не слухаў. От прышоў ужэ час, што пара яго й жаніць. Пачалі бацькі наглядаць яму гаспадарлівую да гожую дзіеўку. Віедамо, ў нашум стане туолькі на тое пазіраюць, каб жанчына была добрая гаспадыня, каб уміела зпекці хліеб да зварыць страву, а ў зімку паставіць кросна да абшыць гаспадара да дзецей, каб не сьвеціли ціелам. А той хлопец шукаў сабіе жуонку самую разумніейшую, каб яна была такая цікавая да растаруопная, як і ён сам. Але дзіе такую ўзяць, бо віедамо, які ў жанчыны розум. От наглядзялі яму бацькі адну дзеўчыну ў сусіедней весцы ў сябра, з каторым былі ў іх заедные пчолы. От сказалі яны аб туом сыну, да й кажуць яму, каб ён пашоў у тую ўеску зірнуць на дзіеўку. От была недзіеля, ці які другі сьвяток, апрануў той хлопец новую сьвіту да й пашоў к сябру ў сусіеднюю ўеску аглядаць тую дзіеўку. Прыходзіць ён туды. А гэто было па весьніе, от якась кала Велікдзеня. Высыпалі дзеўкі з курнікаў на загумеччэ, паюць піесьні да скачуць там на дошках. Убачыў ён, што тая дзіеўка сьмеецца, ляскочэ бы клекуотка да так скачэ на дошцы, што спадніца аж на голаў задзіраецца. Зірнуў ён да й думае, што гэто самая дурніейшая дзіеўка. От прыходзіць ён дамуоў да й кажэ бацькуом, што да тых час не будзе жаніцца, покуль не знайдзе сабіе самаіе разумнаіе (жанчыны). Нема чаго рабіць, згаджаюцца бацькі й на тое, да туолькі качаюць галавою, бы не даюць віеры таму, што дзіе небудзь е такая жанчына. Віедамо, людзі кажуць, што ў жанчыны волас доўгі, да вум кароткі. От і пашоў той вельмі разумны хлопец у сьвіет шукаць самаіе разумнаіе жанчыны. Хадзіў ён моо гуод, два, ці буольш, абхадзіў усе царство, а такоіе жанчыны нідзіе

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

немàш. Усю̀ды жанчы̀ны, як жанчы̀ны. Яны̀ яшчэ̀ дурні͡ей, чым ся̀брава дачкà. От і начàў ён пытàць у жано̀к, ці не знàюць яны̀ дзі͡е сàмаі͡е разумні͡ейшаі͡е жанчы̀ны. А тые й кàжуць: — ой, сако̀ле ты наш я̀сны, чаму̀ не ві͡едаем. Былà ў нас тут аднà дзі͡еўка, якìсь вы̀радак. Янà ўсе рабìла не палю̀цку, лічы̀ла себѐ вѐльмі разу̀мнаю. — Не хачу̀, — кàжэ, — быць як другìе дзеўкì, я хачу̀ быць разумні͡ей мужчы̀н. — Алѐ ві͡едамо, вы̀шэ но̀са не плю̀неш. Хвабры̀ласа янà, хвабры̀ласа да на ту͡ой сàмуй... і сі͡ела. А цепѐр такàя-ж дурнàя, як і ўсі͡е бàбы, бо якì бàбські ро̀зум! — От пашо̀ў ён зірну̀ць на ту̀ю сàмаю разу̀мную да й бàчыць, што янà ні бàба, ні мужы̀к, аж яму̀ штось зану̀дзіло. Го̀дзі ён бу͡ольш шукàць разу̀мнаі͡е жанчы̀ны, верну̀ўса да гаспо̀ды да й пабрàўса з дачко̀ю ся̀бра, бо янà дурнàя, а другìе яшчэ̀ дурні͡ей, ці бо ўсі͡е сàмые разу̀мные.

Сасну͡оўські.

В. Рожан.

99. Каму̀ бу͡ог судзі̀ў, той і спажы̀ў.

Жыў сабі͡е не то, што пано̀к, а так сабі͡е багàты шля̀хціц. Ат бàцька яму̀ дастало̀се до̀брае по̀ле да велìкая гаспадàрка, бо ў яго̀ было̀ сі͡ем брату͡оў, алѐ яны̀ ўсі͡е памѐрлі. Загру͡об ён у сваі͡е ру̀кі ўсе бàцькаўскае дабро̀ да й кàжэ, што до̀брэ жыць на сьві͡еце багàтаму чалаві͡еку. А старэ̀нькая мàтка гаво̀рыць яму̀, што не таму̀ до̀брэ жыць на-сьві͡еце, хто багàты, а таму̀, каму̀ бу͡ог су̀дзіць. — Ці су̀дзіць, ці не су̀дзіць, — аткàзвае сын, — а што я мàю, то̀е маѐ. — Ні͡е, сыно̀к. Так казàлі й тваі͡е браты̀, да бàчыш, каму̀ бу͡ог судзі̀ў, той і спажы̀ў. — Яко̀е мні͡е дзі͡ело, каму̀ што там бу͡ог судзі̀ў, ту͡олькі я знàю, што багаці͡ей ат менѐ немà ў ваўсём засці͡енку, а мо̀жэ й у цы̀элуй акру̀зе. — Ой, не грашы̀ бо̀гу, му͡ой сыно̀к, бо бу͡ог скарàе. — Ту͡олькі гэ̀то янà прамо̀віла, як чу̀юць яны̀, што хто̀сь гаво̀рыць звѐрху, от нìбы з нѐба: — багàты зажабру̀е, а кавàль запану̀е. — Спужàлісе яны̀, не ві͡едаюць, што рабìць. Алѐ той шля̀хціц наду̀маўся абману̀ць

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

бога. От ён узяў усе золато, панёс к рацыэ да й схаваў яго ў дупленатуй вербіе. — От-жэ цепер, — кажэ, — нехай каваль запануе. — Туолькі ён гэто прамовіў, як зноў з неба хтось кажэ: — багаты зажабруе, а каваль запануе.— Спужаўсе шляхціц, прадаў жыдуом усю сваю гаспадарку, а грошы схаваў у вербу. — Ото-ж пабачым, хто запануе, — кажэ ён. Туолькі ён гэто прамовіў, як зноў чуе тое самае, што багаты зажабруе, а каваль запануе. Спужаўсе ён і чакае беды. Але ось яна не за гарамі. Па не доўгум часе захварыэла яго матка да й памерла. Туолькі пахаваў ён матку, як усхадзіласе велікая бура й спала такая навальніца, што яго будынак увесь раскідало да й занесло невіедама куды, а тую вербу, у каторуй былі грошы, вырвало з карыэнем і ўнесло вадою. Астаўсе той шляхціць праве голы, як маць радзіла. Нема чаго рабіць, пашоў жабраваць у далекі край, каб знаёмые людзі не бачылі й не калолі яму ачэй тым, што ён хваліўсе сваім багатствам. Тым часам тую вербу вадою выкінуло кала кузні біеднаго каваля. Убачыла каваліха да й кажэ свайму гаспадару: — нехай-бы ты хаць насіек мніе берэмцо дроў. Бачыш, што нема чым у печы запаліць, каб зварыць якую небуць калатушу. — Узяў каваль з кузні чужую ломаную сакіеру да й пачаў шчапаць на дрова тую вербу. Туолькі ён трохі атшчапіў, як аттуль пасыпалосе золато. Забраў ён золато ў хвартух да й панёс дадому. Скоро накупіў ён усего, што трэба й стаў панаваць. От прышоў раз к кавалю той жабрак, заначаваў да й расказаў, як буог скараў яго. Пачулі тое каваль і каваліха да й дагадалесе, што гэто яго грошы яны спажываюць. Думалі яны, думалі, як ім даць таму шляхціцу золата, каб яму хапіло пражыць да смерці, а не жабраваць. Надумалісе яны палажыць золато ў булку хліеба да тую булку даць жабраку, та ён як пачне іесці хліеб, та й знайдзе там золато. Так і зрабілі. Узяў той жабрак з золатам булку хліеба, падзякуваў да й пашоў. Туолькі трохі атышоўся ён, бачыць, аж біедны чалавіек арэ на полі дзераўянаю сахою без сашнікоў. — Што ты, — кажэ, — чалавіечэ, арэш без жаліезных сашнікоў; гэтож ты туолько мучыш жыуёло.—Калі-ж,

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

браткò, я бі͡едны чалаві͡ек і не мàю за што купіць сашнікòў.— Узяў жаль тагò жабракà. От і атдàў ён таму бі͡еднаму чалаві͡еку цы͡элую бу̀лку хлі͡еба, каб ён купіў у каваля̀ сабі͡е сашнікì. Пашòў той чалаві͡ек к кавалю̀ да й атдàў яму̀ за сашнікì ту̀ю бу̀лку хлі͡еба. Разры͡эзала кавалìха той хлі͡еб, ажнò там тòе зòлато, што яны̀ палажы̀лі. От кавàль запру͡ог дòбраго каня̀, ўзяў тòе зòлато да й паі͡ехаў даганя̀ць тагò жабракà. От абагнàў ён ягò да й бàчыць, што ўпèрадзе цèраз ры͡эчку зрòблен му͡ост. — Ну, — ду̀мае, — жабрàк не мінè гэтаго мòста. — Насы̀паў гэто ён у шàпку зòлата, палажы̀ў шàпку пасеру͡од мòста да й ціку̀е, як жабрàк заберэ̀ зòлато. Ту͡олькі ось жабрàк падышòў к мòсту да й ду̀мае сабі͡е: отò-ж ці я ўмі͡ею хадзìць не бàчачы, бы слепы̀. От ён заплю̀шчыў вòчы да й перайшòў цèраз му͡ост, нічòго не бàчачы. — Ні͡е, — ду̀мае кавàль, — што бу͡ог судзіў, тòе й бу̀дзе. Прàўду кàжуць: каму̀ бу͡ог судзіў, той і спажы̀ў. — Ї забрàў сабі͡е зòлато.

Шляхцянка Умінская.

Крыжы.

100. У пъя̀тніцу не смі͡ейсе, а ў недзі͡елю не плач.

Ві͡едамо, гаспадàрка, — таўчы̀се ад рàна да вèчара ку͡ожын дзень і нікòлі немà табі͡е спачы̀нку. Пры̀дзе сьветàя недзі͡елька, дак хòчэцце схадзìць па грыбы̀, ці па я̀гады, бо зайздру͡осно, што лю̀дзі назбірàюць грыбòў да я̀гад на ўсю зìму, а ў цебè немà чагò й хвòраму даць. От і рòбіш так, як лю̀дзі, да ту͡олькі ўздыхнèш, нехàй бу͡ог дару̀е ця̀жкі гры͡эх. Дак от-жэ так аднà кабі͡еціна ў недзі͡ельку пакìнула дòма двòе дзі͡етак да й пашлà ў лі͡ес па грыбы̀. Былò мòкрае, алè вèльмі цѐплае лі͡ецячко, зарадзìло грыбу͡оў, хаць касì. Назбірàла тàя кабі͡еціна пòўну карòбку грыбу͡оў сàмых малèнькіх да маладзèнькіх да яшчэ̀ наклàла цы͡элы прыпу͡ол, так што ця̀жко несцì дадòму. Паседзі͡ела янà трòхі на пеньку̀ да й пашлà на дарòгу, расхіля̀ючы ві͡еткі. Выхòдзіць янà на паля̀начку, дзі͡е былì растанцы̀, а на іх якìсь нàбажны чала-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

віек паставіў крыж, да й сустракае кала таго крыжа якуюсь маладую да вельмі харошую жанчыну. Павіталася яна з ею да й хаціела йці далей, але тая й кажэ: кепсько ты робіш, што не сьвяткуеш недзіельки, а ходзіш па грыбы. — Перахрысцілася тая кабіеціна на крыж да й кажэ: нехай буог даруе цяжкі грыэх, бо ніельга ў гаспадарцы сьветкаваць. — Ой, мая міленькая, — кажэ тая, — паслухай мене. У пъятніцу не сміейсе, а ў недзіельку не плач да дзіела не рабі, та буог табіе ўсе дасць. — А сама й знікла. Здзівіласе тая кабіеціна да й дагадаласе, што гэто была матка божая. Памаліласе яна перад крыжам да й пашла да дому, туолько маўчыць нікому аб туом нічого не гаворыць. Прышла пъятніца, сабралісе жанкі, пачалі паміж сабою сакатаць, пачалі прыдумоўваць уселякіе сміешные здарэня да й смеюцце, аж заходзецце. Туолькі тая кабіеціна маўчыць, бы вады ў рот набрала. Прыкміеціў тое чорт да й пачаў хадзіць за тою кабіеціна ю, як ціень, не атступае ат яіе ні на крок. Сцеражэцце яна, каб у пъятніцу не засмеяцце, а ў недзіельку не заплакаць да дзіела не рабіць. І пашло з тых часаў ёй шанцаваць у гаспадарцы, пашло ўсе на карысць, так што людзі пачалі завідуваць. Туолькі ось у адну недзіельку пашоў гаспадар к людзям на схуод. Пачалі яны там гаманіць да радзіцце, як ліепш весці гаспадарку да абрабляць поле, загаманілісе да й доўгі час седзяць сабіе на ўзгуорачку пад ліпамі. Тым часам тая кабіеціна пакінула адных дзецей у хаце да й пабіегла ў цэркаў памаліцце да паставіць сьвіечку. Уходзіць яна ў цэркаў, а чорт чмыхнуў носам, ніельга йці туды, от ён абазліўсе, пабіег у хату да й задушыў у калышцы маленькае дзіцятко таіе жанчыны. Памаліласе яна богу да йдзе да дому. Убачыў яіе гаспадар, да й пашлі яны разам. Уходзяць яны ў хату, аж бачаць, што маленькае дзіцятко нежывое, а буольшаго саўсім нема й невіедамо, куды яно дзіеласе. А яно як убачыло, што маленькае дзіця памерло, дак спалохаласе да й заліезло ў піеч. Божкае гаспадар, плачэ, аж рукі ломіць, а матка смеецце да кажэ: буог даў, буог і ўзяў. Яго светая воля. Пабачыў гаспадар, што жуонка смеецце да й думаў,

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

што янà з гòра ашалі͡ела. От ён наклàў у пі͡еч дроў, запалìў і прыстàвіў чагỳн вады̀, каб былò чым памы̀ць тòе дзіця̀. Тым чàсам і бòльшае дзіця̀ ў пèчы затòхласе. Агледзі͡еўсе гаспадàр да чуць не ашалі͡еў з гòра. А жу͡онка хòдзіць сабі͡е па хàце да смеèцце з гаспадарà. А чòрт залі͡ез над пі͡еч да там ту͡олькі хвастòм крỳціць ат рàдасці да дỳмае, што от цепèр пачнỳць тыя людзі сварыцце, лàяцце да наракàць на бòга, што даў ім такòе нешчàсце. Пабòжкаў чалаві͡ек, пагаравàў, алè як пачàла ягò жу͡онка вèсело ўмаўля̀ць, дак прышòў у себè да й гòдзі турбавàцце. Тым чàсам нагры͡элася вадà; памы̀лі, убрàлі яны̀ сваìх дзецèй да й вы̀неслі на гòру. Прыбрàлі яны̀ ўсе ў хàце да й сі͡елі вечэраць. Ту͡олькі ось схаменỳласе тàя жанчы̀на, што забы̀ла калà дзецèй пастàвіць сьві͡ечкі. От запалìла янà сьві͡ечкі да й палі͡езла на гòру. Падхòдзіць янà к дзі͡ецям, аж яны̀ абòе жы̀вы й здарòвы, седзя̀ць сабі͡е на рукàх у таі͡е сàмаі͡е жанчы̀ны, якỳю янà сустры͡эла калà крыжà, да йгрàюць. Пакланìласе янà мàтцы бòжуй да сàмаі͡е землì. Тàя аддалà ёй дзецèй, благаславìла іх і тỳю жанчы̀ну да й знікла. Прынеслà янà ў хàту дзецèй. Убàчыў тòе гаспадàр да й сам пачаў смея̀цце ат рàдасці. От і расказàла янà гаспадарỳ ўсе, як тòе былò. Мòжэ й цепèр яшчэ жы̀вы тыя людзі. Слỳхаюць яны̀ бòга, дак і бу͡ог ім усе даè. Дак от бàчыце, якòе былò здарэне.

Шляхцянка Умінская.

Крыжы.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Зьмест.

Прадмова . . . . I—VI

Казкі і апавяданьні:

СТАР.

1. Цуд 1
2. Кальвінські пуост 4
3. Сабàка й грòшы 5
4. Закалдòваная шàпка 7
5. Ліхо абхòдзь, а дабрà не мінàй 9
6. Камỳ грыэх, а камỳ ніе 10
7. Прамỳдры Салімуон 11
8. Хлапèц-Удалèц 13
9. Нехàй, так бỳдзе 16
10. Чорт перарабіỳ 19
11. Сусіецкая спрàва 20
12. Сьвяты чалавіек 23
13. Упàртая жанчына 25
14. Мужык, цыгàн і жыд 28
15. Дзіеỳкі й чорт 30
16. Смàчно 32
17. Не тут, дак там 36
18. Нехàй панічуом лагòдкі 38
19. Цèсьля 39
20. Два каменì 40
21. Стралèц і рыбàк 42

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

стар.

22. Пан і мужык 45
23. Безногі багатыр 47
24. Мужык дурэнь як варона, а хіцер як чорт 52
25. Дзевочы набуор 55
26. Цікавасць 57
27. Першы бровар 61
28. Дурная жуонка 64
29. Праўда й крыўда 66
30. Палешукі й палевікі 69
31. Шчодрая й скупая жанчына 73
32. Як Хрыстос вучыў людзей 75
33. Валачашчыса парабак ці служачы хлиеб сабачы 77
34. Як браты дзеліліса 79
35. Хітры мужык 81
36. Завуоцкіе коні 85
37. У бабы чортава галава 87
38. Пъяніца 89
39. Хітрыэй сьвіету не будзеш 91
40. Першае яечко 93
41. Агонь у серцу, а розум у галавіе 94
42. Аткуль узяласа сьвіньня 97
43. Не любіць 98
44. Упарты хахол 100
45. Разумны й дурэнь 102
46. Медзьвіедзь 105
47. Аўсяная двуорня 107
48. Здатны палешук 109
49. Аткуль узяліса грыбы 112
50. Дурэнь . . . . —
51. Валасны суд 119
52. Хармазонскіе гроши 122
53. Багаты й біедны 126
54. Слепы, глухі й безногі 128
55. Калі-б старшыною 130

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

		стар.
56.	Шчаслі̀вы пасту̀х	131
57.	Цікàвая жу͡онка	132
58.	Пъя̀тніца	135
59.	Недапàд	137
60.	Сьвятòе падры̀гваньне	140
61.	Вòко на пàлцы	141
62.	Хто меня̀е, ў тагò хаму̀т гуля̀е	143
63.	Князь Радзіві̀л Кахàнко	145
64.	Дзеўчы̀на	148
65.	Ведзьмàр	152
66.	Як гòжэ	159
67.	Марцыпàны	160
68.	Дабрò й лі̀хо	162
69.	Плату͡он казàк	166
70.	Цыгàн	167
71.	Цыгàн музы̀ка	169
72.	Бу͡ог ві͡едае, што рòбіць	170
73.	Камі͡ене	174
74.	Вòўчае ку͡отло	176
75.	Канакрàд	179
76.	Любòшчы	183
77.	Гу̀слі	192
78.	Як чорт тапі̀ў пану͡оў	197
79.	Усè й у галаві͡е не змі͡есціцца	200
80.	Два браты̀, бедà да дòля	203
81.	Хто вы̀думаў грòшы	204
82.	Су̀джано	207
83.	Не сі̀ла, а смі͡еласць	212
84.	Маскàль	216
85.	Тры ксендзы̀	218
86.	Сьвінòе ры̀ло	219
87.	І̀ньшы сон як у ру̀ку дась	224
88.	Кравèц з тагò сьві͡ету	228
89.	Хараствò — сі̀ла	230

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

СТАР.

90. Вѐўчая дѐля 232
91. Упàртая бàба 233
92. Цьвіет пàпераці 235
93. Отѐж дѐбрая пасўдзіна 237
94. Тавàрышы 238
95. Што буог злучыў, тагѐ не разлучàй 239
96. Аткўль пашлì грыбы̀ 241
97. Цыгàнскае тавары̀ство . . . . —
98. Сàмая разўмная 242
99. Каму̀ буог судзіў, той і спажы̀ў 244
100. У пъя̀тніцу не смiейсе, а ў недзіелю не плач 246

1236

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Зауважаныя абмылкі.

Стар.	*Радок:*	*Надрукована:*	*Трэба:*
2	6 зьнізу	ніхадзìлі	ні хадзìлі
16	5 зьверху	весіельлье	весіельле
23	5 »	нà нач.	нàнач.
44	8 »	наловìў	налавìў
49	4 »	чуляе,—	гуляе,—
59	1 »	цікàвасц°.	цікàвасьць.
82	10 »	іешто	ніешто
88	7 зьнізу	то	што
132	10 »	ў кàго.	ў кòго.
156	6 зьверху	нàрабка,	пàрабка,
176	10 »	да муоўкі,	дамуоўкі,
177	6 зьнізу	ён.	ём.
199	8 зьверху	растỳрхаў	раскатỳрхаў
204	13 »	ускрыні,	у скрыні,
205	17 »	купàло,	Купàло,
215	7 зьнізу	Ён на кабылцы,	Ён па кабылцы,
221	10 »	да й	да ў
228	9 зьверху	бояўса	баяўса
233	4 зьнізу	На пакỳтава-	Напакỳтава-
235	3 зьверху	— бо ўпадỳ. —	— ой, упадỳ!—

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Дарма.

Фп
С32

Склад выданьня: Менск, Рэволюцыйная, 21.

Інстытут Беларускае Культуры.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/